МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ»

Кавалева Н.М., Стралец М.В.
Малыхіна Л.Ю.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (У КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ): выбраныя лекцыі

Брэст 2007

УДК 947 (476) (07)
ББК 63.3 (4 Бел) Я73
К 56

**Рэцэнзенты:**
***Галімава Н. П.*** – дэкан гістарычнага факультэта УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна", кандыдат філасофскіх навук дацэнт
***Здановіч У. В.*** – загадчык кафедры "Гісторыі Беларусі» УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна", кандыдат гістарычных навук дацэнт

**Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый):** выбраныя лекцыі /
К 56 Агуль. рэд. Н. М. Кавалёва, Склад. Н. М. Кавалёва, Л. Ю. Малыхіна, М. В. Стралец. Брэст, 2007. 128 с.

ISBN 978-985-493-061-9

**Складальнікі:**
***Кавалёва Н. М.*** – загадчык кафедры СПіГН БрДТУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (уступ, лекцыі 2, 4, 5)
***Стралец М. В.*** – прафесар кафедры СПіГН БрДТУ, доктар гістарычных навук, прафесар (лекцыі 1, 8, 9)
***Малыхіна Л. Ю.*** – дацэнт кафедры СПіГН БрДТУ, кандыдат гістарычных навук (лекцыі 3, 6, 7)

**Агульная рэдакцыя:**
***Кавалёва Н. М.*** – загадчык кафедры СПіГН БрДТУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

ISBN 978-985-493-061-9
Установа адукацыі
© "Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт", 2007

# УСТУП

Вывучэнне курса “Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый)” мае на мэце фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ў грамадзян рэспублікі. Фарміраванне патрыятызму пачынаецца з усведамлення адметнасці свайго народа сярод іншых этнічных супольнасцей. Нельга вывучыць гісторыю асобнай краіны, не характэрызуючы агульны ход гістарычнага працэсу, не раскрываючы ўплыву знешніх фактараў на развіццё гэтай краіны. Вывучэнне гісторыі Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый) дазваляе аб'ектыўна вызначыць месца ў гісторыі канкрэтнага народа – беларусаў, ацэніць духоўныя каштоўнасці і дасягненні нацыянальнай культуры ў гістарычным кантэксце і, значыць, паспяхова рэалізаваць галоўную выхаваўчую мэту курса. Такім чынам, для засваення праграмы курса студэнту неабходна ведаць не толькі гісторыю Беларусі, але і мець пэўныя веды па розным раздзелам сусветнай гісторыі.На жаль, бібліятэкі вышэйшых навучальных устаноў (за выключэннем тых, якія вядуць падрыхтоўку прафесійных гісторыкаў) не ў дастатковым памеры забяспечаны літаратурай па гісторыі старажытнасці, сярэднявечча, новай і найноўшай гісторыі. Між тым, вывучэнне значнай часткі курса здзяйсняецца шляхам арганізацыі самастойнай работы студэнтаў: праграма разлічана на 92 гадзіны, з якіх аудыторных – 72 (на некаторых спецыяльнасцях – 68). Як правіла, на самастойнае вывучэнне выносяцца праблемы ўсеагульнай гісторыі.

Дадзены навучальна-метадычны дапаможнік разлічаны на студэнтаў усіх спецыяльнасцей дзённай і завочнай форм навучання. Студэнтам дзённай формы навучання ён дапаможа арганізаваць самастойнае вывучэнне асобных тэм курса і належным чынам падрыхтавацца да тэставага кантролю, залікаў, экзаменаў. Студэнты завочнай формы навучання могуць выкарыстоўваць дапаможнік пры выкананні катрольных работ і таксама пры падрыхтоўцы да заліку, альбо экзамену.

Дапаможнік складзены такім чынам, што ў ім выдзелены ўсе асноўныя палажэнні, якія трэба дакладна ведаць, дадзены тлумачэнні пэўных тэрмінаў і паняццяў, зроблены спасылкі на выкарыстаную літаратуру, каб студэнты атрымалі інфармацыю аб тым, да якіх падручнікаў, ці іншых крыніц трэба звярнуцца з мэтаю атрымання больш поўнага ўяўлення аб падзеях і з'явах.

## *Лекцыя першая*

## ПЕРШЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

1. Лагічная структура паняцця "цывілізацыя", яго значэнне для вывучэння сусветна-гістарычнага працэсу.
2. Неалітычная цывілізацыя: агульная характэрыстыка.
3. Раннякласавая цывілізацыя: адметныя рысы.
4. Антычная цывілізацыя, яе месца ў сусветнай гісторыі.
5. Антычная спадчына на Беларусі.

### 1. Лагічная структура паняцця "цывілізацыя", яго значэнне для вывучэння сусветна-гістарычнага працэсу

Зыходны пункт комплекснага аналізу першых цывілізацый, які складае прадмет дадзенай лекцыі, – разбор самаго паняцця "цывілізацыя". Яго дэфініцыі даюцца самыя разнастайныя. Спачатку цывілізацыя трактавалася як сінонім паняцця "культура". Быў час, калі цывілізаванымі называліся капіталістычныя краіны ў адрозненне ад тых, якія знаходзіліся на ніжэйшых ступенях развіцця. На наш погляд, найбольш удала сутнасныя рысы цывілізацыі паказаны ў "Найноўшым філасофскім слоўніку". У гэтым выданні чытаем: "Цывілізацыя (лац. civilis – дзяржаўны, грамадзянскі) – у вышэйшай ступені эклектычнае і шматзначнае паняцце, якое можа абазначаць: 1) адзін з разнаякасных станаў грамадства ў яго змяненні ў рэальным гістарычным часе; 2) этап у эвалюцыі чалавечага грамадства, які прыйшоў на змену "першабытнаму варварству" (Морган); 3) сукупнасць арганізацыйных сродкаў (праграм дзейнасці), дзякуючы якім людзі імкнуцца дасягнуць тых грамадзянскіх мэт, якія зададзены існуючымі ўніверсаліямі культуры і грунтоўнымі сімваламі апошняй".[1] У прыведзеных вызначэннях цывілізацыі ўвогуле яна падаецца як спецыфічны грамадскі стан, у рамках якога створаны якасна новыя ўмовы для самарэалізацыі чалавека.

Трэба мець на ўвазе, што частка аўтараў атаясамлівае першыя дзяржавы з першымі цывілізацыямі і, тым самым, звужвае паняцце "цывілізацыя".

Важна адрозніваць **сусветныя і лакальныя цывілізацыі. Лакальныя цывілізацыі** выяўляюць культурна-гістарычныя, этнічныя, рэлігійныя, эканоміка-геаграфічныя асаблівасці асобнай краіны, групы краін, этнасаў. Яны звязаны агульным лёсам, адлюстроўваюць і праламляюць рытм агульнагістарычнага прагрэса, то аказваючыся ў яго эпіцэнтры, то аддаляючыся ад яго. Кожная лакальная цывілізацыя мае свой почырк, свой рытм, які больш ці менш сінхранізаваны з рытмам сусветных цывілізацый. Звяртаючыся да лакальных цывілізацый, сур'езныя даследчыкі падкрэсліваюць "узаемаўплыў іх дынамікі ў рамках агульнагістарычных рытмаў развіцця чалавецтва, як адзінай супольнасці.[2]

Англійскі сацыёлаг А. Тойнбі, які зрабіў прадметам сваіх навуковых пошукаў менавіта лакальныя цывілізацыі, вылучаў цывілізацыі трох пакаленняў. Прычым мысліцель адносіць часовы адрэзак трэцяга пакалення да апошняга тысячагоддзя. Датычна гэтага часу Тойнбі выявіў пяць жывых цывілізацый:

1) **заходняе грамадства**, якое аб'яднана заходнім хрысціянствам;

---

[1] Новейший философский словарь. 2-е изд., перераб. и дополн. – Мн., 2001. – С. 1170.

[2] Яковец Ю.В. История цивилизаций: Учебное пособие для студентов вузов гуманитарного профиля 2-е изд. перераб. – М., 1997. – С. 42.

2) **праваслаўна-хрысціянскае**, або візантыйскае грамадства, якое размешчана ў Паўднёва-Усходняй Еўропе і Расіі;

3) **ісламскае грамадства** – ад Паўночнай Афрыкі і Сярэдняга Ўсходу да Вялікай Кітайскай сцяны;

4) **індуісцкае грамадства** ў трапічнай субкантынентальнай Індыі;

5) **далекаўсходняе грамадства** ў субтрапічным і памяркоўным раёнах Паўднёва-Усходняй Азіі.[3]

Расійскі навуковец Ю. Якавец прапануе разглядаць гістарычны працэс, як працэс узнікнення і развіцця **"сусветных цывілізацый".** На яго думку, "сусветная цывілізацыя – гэта этап ў гісторыі чалавецтва, які характэрызуецца канкрэтным узроўнем залатрабаванняў, здольнасцяў, ведаў, інтарэсаў чалавека, тэхналагічным і эканамічны спосабам вытворчасці, палітычнымі і эканамічнымі адносінамі".[4] Гэтае паняцце роднаснае паняццю грамадска-эканамічнай фармацыі, але пазбаўлена эканамічнага дэтэрмінізму, прымата матэрыяльнага над духоўным.

Ю. Якавец уводзіць паняцце тысячагадовага цыкла, так званага **гістарычнага суперцыкла,** які аб'ядноўвае некалькі шматвяковых цыклаў (роднасных цывілізацый), што маюць агульныя глыбінныя асновы. Першы суперцыкл ахоплівае **неалітычную, раннякласавую і антычную** цывілізацыі – першыя тры стадыі станаўлення чалавечага грамадства (7–8 тыс. гадоў). Другі суперцыкл бярэ пачатак з сярэдзіны I тыс. н. э. і цягнецца 1,5 тыс. гадоў, ахопліваючы **сярэднявечную, перадіндустрыяльную, раннекапіталістычную і індустрыяльную** цывілізацыі. Гэта былі этапы зараджэння, станаўлення і трыумфа індустрыяльнага грамадства. З канца XX ст. пачаўся пераходны перыяд для наступнага суперцыкла, які, верагодна, ахопіць **постіндустрыяльную** і дзве цывілізацыі, якія ідуць следам за ёй (тры шматвяковых гістарычных цыкла) і будуць мець працягласць каля паловы тысячагоддзя.[5]

Змена сусветных цывілізацый вызначаецца па эпіцэнтрам гістарычнага прагрэсу. На працягу **першага суперцыкла эпіцэнтр знаходзіўся ў міжземнаморска-блізкаўсходняй групе лакальных цывілізацый.** У пачатку другога суперцыкла эпіцэнтр сусветнага прагрэсу змясціўся ў азіяцкую групу, а потым – ў заходнееўрапейскі рэгіён.

У дадзенай лекцыі мы звяртаемся да першага суперцыклу сусветных цывілізацый (неалітычная, раннякласавая і антычная: VIII тыс. да н.э – сяр. I тыс. н. э.), эпіцэнтр якога знаходзіўся ў міжземнаморска-блізкаўсходнім рэгіёне. Менавіта тут узніклі і існавалі цывілізацыі старажытнага Двурэчча, Старажытнага Егіпта, Старажытнай Грэцыі, Старажытнага Рыма.

## 2. Неалітычная цывілізацыя: агульная характэрыстыка

Кропка адліку гісторыі цывілізацый і, натуральна, першай, неалітычнай, – **неалітычная рэвалюцыя** (гэты тэрмін уведзены ў 1925 г. Г. Чайлдам).

Неалітычная рэвалюцыя ўяўляе сабой найбольш глыбокі і значны за ўсю гісторыю чалавецтва гаспадарчы ўздым, які выклікаў рэзкія перамены ва ўзаемаадносінах чалавека і прыроды. Сутнасць гэтай рэвалюцыі выражаецца ў **трох групах радыкальных змяненняў.**

**Першая група** закранула **кардынальныя зрухі ў змесце гаспадарчай дзейнасці.** Калі раней ён зводзіўся да паляўнiцтва, збіральніцтва, рыбнай лоўлі, то ў рамках

---

[3] Яковец Ю.В История цивилизаций. – С. 42.
[4] Там жа. – С. 41.
[5] Там жа. – С. 40.

неалітычнай цывілізацыі набылі рэальныя абрысы **земляробства, жывёлагадоўля, рамяство**. Людзі, якія адносіліся выключна да паляўнічых, збіральнікаў, натуральна, нічога не выраблялі і таму ўвасаблялі **прысвойваючую гаспадарку.** У адрозненне ад іх земляробы, жывёлаводы, рамеснікі вытваралі, аднаўлялі матэрыяльныя каштоўнасці. Яны ўжо прадстаўлялі **вытвараючую,** аднаўляючую **гаспадарку**, якая характэрна для ўсіх цывілізацый – як сусветных, так і лакальных.

Базіс **другой групы змяненняў – грамадскі падзел працы**. Гэты падзел азначаў, што ўпершыню ў гісторыі чалавецтва суб'екты эканамічных адносін былі згуртаваны ў асобных устойлівых групоўках. Адны непасрэдныя вытворцы на пастаянным грунце сталі аселымі, іншыя – займелі статус качэўнікаў. Аселыя сканцэнтраваліся на земляробстве, качэўнікі – на жывёлагадоўлі. Канчатковыя прадукты працы непасрэдных вытворцаў дзяліліся на дзве часткі: 1) аб'екты ўнутрыплемяннога ўжывання; 2) аб'екты куплі-продажу. Купля-продаж выступала як змест дзейнасці новай сацыяльнай страты – купцоў. Дадзеныя суб'екты эканамічных адносін з'яўляліся звязуючым звяном у гандлёвых стасунках паміж плямёнамі. У працэсе грамадскага падзелу працы сваю нішу занялі і рамеснікі. У аналізуемую эпоху канчатковай прадукцыяй апошніх былі посуд, прылады працы, важнае месца ў іх вытворчай дзейнасці таксама займалі прадзенне, ткацтва.

І, нарэшце, адметнай рысай неалітычнай рэвалюцыі з'явілася **вертыкальная дыферэнцыяцыя сваяцкай абшчыны**, гэта значыць выдзяленне ў абшчыне людзей з асобымі паўнамоцтвамі і функцыямі (правадыроў, шаманаў, калдуноў, знахараў). Сябры кроўнасваяцкіх абшчын пастаянна ставіліся да іх як да даволі аўтарытэтных постацяў.

Археолагі неаднойчы знаходзілі вынікі шліфавальнай і свідравальнай працы, што адносяцца да часу неалітычнай цывілізацыі. Вынікі іх даследаванняў сведчаць аб тым, што ў гэты перыяд прасочваецца відавочная эвалюцыя ў тэхналагічным базісе земляробчай вытворчасці. Стартавая кропка ў дадзенай эвалюцыі – наяўнасць палкі-капалкі. У плане тэхнічнай дасканаласці пэўным прагрэсам было з'яўленне ў арсенале земляробаў матыгі. Прадукцыйнасць працы непасрэдных вытворцаў раслінаводчай галіны аграрнага сектара неалітычнай эканомікі істотна ўзрасла, калі яны сталі мець пад рукой прыладу, якая складалася з дзвюх частак: 1) сярпа; 2) насадкі. Для вырабу першай часткі ў якасці зыходнага матэрыяла выступала дрэва, другога – крэмній. Істотным здабыткам неалітычнай цывілізацыі была структураўтваральная роля абпаленай гліны ў вытворчым цыкле, які меў на мэце задавальненне патрэб насельніцтва ў посуду, культавых рэчах, у павелічэнні колькасці пабудоў, будынкаў.

Трэба мець на ўвазе, што **неаліт** (новы каменны век) і "неалітычная рэвалюцыя" не з'яўляюцца ідэнтычнымі паняццямі. У асобных рэгіенах гэта рэвалюцыя адбывалася па-за межамі неаліту. Неалітычная рэвалюцыя скончылася ў перыяд пераходу да ранняга жалезнага веку (сярэдзіна І тыс. да н. э.), калі эканоміка ўсяго насельніцтва канчаткова стала вытвараючай.

Надыход эпохі неаліту ў Еўропе часта вызначаецца на наяўнасць прыкмет авалодання новымі спосабамі гаспадарання. Так, земляробчыя культуры спрыялі вынаходніцтву і развіццю керамічнай вытворчасці, ткацтва, мастацтва. Лічыцца, што тыповае неалітычнае грамадства Еўропы вызначаецца чатырма галоўнымі асаблівасцямі – з'яўленнем земляробства, жывёлагадоўлі, глінянага посуду і шліфавальных каменных вырабаў. Але гэтыя складальнікі неалітычнай культуры далёка не заўсёды выступаюць адначасова. Вядома, што на ўсходзе і поўначы Прыбалтыкі мясцовае насельніцтва ўмела шліфаваць свае каменныя сякеры, долаты і цёслы яшчэ з пачатку сярэдняга каменнага веку (мезаліту), а з вытвараючымі формамі гаспадаркі пазнаёмілася толькі ў эпоху бронзы і,

надварот, некаторыя супольнасці Міжземнамор'я, якія рана перайшлі да жывёлагадоўлі і земляробства, доўгі час не выраблялі керамічны посуд.[6]

**Дзе і калі пачалася неалітычная рэвалюцыя?** Пры адказе на гэта пытанне трэба мець на ўвазе **нераўнамернасць развіцця, выкліканую прыродна-кліматычнымі ўмовамі**. У навуковым супольніцтве агульнапрызнанай з'яўляецца **канцэпцыя поліцэнтрызму "неалітычнай рэвалюцыі"**. Вылучана некалькі ачагоў узнікнення земляробства.[7] Геаграфічны аспект генезіса дадзенай галіны вытвараючай гаспадаркі выглядае наступным чынам.

Упершыню земляробствам пачалі займацца плямёны, якія ў VII – VI тыс. да н. э. жылі паблізу ад цэнтраў паходжання продкаў культурных раслін (дзікія продкі пшаніцы вядомы ў Малой Азіі і Закаўказзі, проса – у Сярэдняй Азіі). Першыя земляробчыя культуры ўзніклі ў VII тыс. да н.э. ў Малой Азіі і на Блізкім Усходзе, праз 1-2 тыс. г. – у Месапатаміі, Егіпце і даліне Інда. У VI – V тыс. да н. э. земляробства стала пашырацца на Балканскім паўвостраве (культура каранова – старчава – крыш-кёраш), басейне Дуная (буга-дняструоўская, культура баян), пазней – на лёсавых глебах у Вярхоўях Віслы і на Валыні (культура лінейна-стружкавай керамікі). Акрамя пшаніцы, тут вырошчвалі ячмень, магчыма, проса, чачавіцу. У IV тыс. да н. э. земляробствам займаліся плямены трыпольскай культуры, якія дасягнулі паўднёвых раёнаў Палесся і Сярэдняга Падняпроўя.[8]

Пераход да вытвараючай гаспадаркі даў чалавеку новы магутны сродак вытворчасці – зямлю. "Неалітычная рэвалюцыя" не адмяніла паляўніцтва і збіральніцтва, якія доўга заставаліся галоўнымі пастаўшчыкамі харчу. З развіццём земляробства з'явілася даволі адчувальная гарантаваная прыбаўка да звычайнага рацыёна. Яна і вызначыла эканамічную выгаду першапачатковага земляробства, тым больш што яго прадукцыю няцяжка захоўваць доўгі час.[9] Неалітычная рэвалюцыя прывяла да істотных змен у дэмаграфічных працэсах, садзейнічала замацаванню племянных тэрыторый.

Паводле археалагічных дадзеных, прыручэнне буйной і дробнай рагатай жывёлы і свіней у Еўропе і Азіі адбылося 8-11 тыс. гадоў таму назад, коней – 6-8, трусоў, гусей і галубоў – 3, курэй – 4-5, качак – 3-4 тыс. гадоў таму назад. Самыя старажытныя звесткі пра ўзнікненне жывёлагадоўлі адносяцца да канца VIII – першай паловы VII тыс. да н. э. і звязаны з Балканскім паўостравам і востравам Крыт.

Вытвараючая гаспадарка распаўсюдзілася ў VI тыс. да н.э. носьбітамі культур каранова (Балгарыя), старчава (Югаславія), крыш (Румынія), кёраш (Венгрыя), у VII – пачатку V тыс. да н. э. ў плямён культуры керамікі імпрэса, помнікі якой размяшчаліся ўздоўж паўночнага ўзбярэжжа Адрыятычнага і Міжземнага мораў. У апошняй чвэрці VI – першай палове V тыс. да н. э. плямёнамі лінейна-стружкавай керамікі жывёлагадоўля прасунулася ў Цэнтральную Еўропу. Раннія этапы развіцця жывёлагадоўлі ў паўднёвых раёнах Усходняй Еўропы вядомы па помніках буга-дняпроўскай культуры (другая палова VII – першая палова V тыс. да н.э.), пад уплывам якой пачалося станаўленне вытвараючай гаспадаркі ў паўночных раёнах. Да пачатку V тыс. да н. э. першыя свойскія жывёлы з'явіліся ў плямён днепра-данецкай культуры, дзе ў другой палове V – першай палове IV тыс. да н. э. усталявалася развітая жывёлагадоўля. У паўночнай лясной зоне паляўніцтва і рыбалоўства дамініравалі да канца існавання культуры.[10]

---

[6] Гісторыя Беларусі. У 6 тамах. Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд) і інш. – Мн., 2000. – С. 34.

[7] Чытай падрабязней: "Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций / Н. И. Полетаева, В.И. Голубович, Л.Ф. Пашкевич и др. Под общ. ред. В. И. Голубовича. – Мн., 1996. – С. 23-24."

[8] Жывелагадоўля // Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн., 1993. – С. 461.

[9] Экономическая история зарубежных стран. – С. 23-24.

[10] Жывёлагадоўля // Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. – С. 461.

Фармаванне неалітычнай цывілізацыі было адзначана важнай зменай культуралагічнага характару. Узнікла міфалогія, людзі навучыліся складаць першыя календары, валодалі адносна глыбокімі медыцынскімі ведамі і навыкамі, пачалі выкарыстоўваць піктаграфічнае пісьмо, ведалі лічбы і маглі выконваць працейшыя арыфметычныя дзеянні. У мастацтве ўпершыню ўзніклі выявы неба, зямлі, агню, сонца. Чалавек стаў асноўным аб'ектам першабытнага мастацтва. Дынамічна развіваліся музыка, песні, танцы, пантаміма. Узніклі і атрымалі распаўсюджванне казкі, прыказкі і прымаўкі, апавяданні. Хутка развівалася прыкладное мастацтва. Культура перастала быць адзінай, аднароднай (гамагеннай) і пазней распалася на мноства этнічных культур.[11]

На тэрыторыі Беларусі, ў сілу шэрагу прычын, галоўным з якіх з'яўляўся, канешне, прыродна-кліматычны фактар, неалітычная цывілізацыя стала фармавацца толькі з V тыс. да н. э. У гэты час пачалася эпоха неаліта, але прыкметы ўласна "неалітычнай рэвалюцыі" праяўляюцца значна пазней:

- пераход да вытвараючай гаспадаркі завяршаецца на мяжы III – II тыс. да н.э. (у век медзі і бронзы);
- аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі і далейшы працэс дыферэнцыяцыі кроўнасваяцкай абшчыны адбываецца яшчэ пазней – у жалезным веку (сярэдзіна I тыс. н. э.).

Змены, якія адбыліся ў тэхналагічнай і эканамічнай базе, сведчылі аб зацвярджэнні неалітычнай цывілізацыі. Такім чынам, можна казаць аб перыядзе неалітычнай цывілізацыі, які зацягнуўся да жалезнага веку.[12]

Трэба мець на ўвазе, што ў час неаліту на тэрыторыі Беларусі былі прадстаўлены культуры, агульныя як для яе, так і для іншых рэгіёнаў. Тут жылі плямёны днепра-данецкай культуры, верхнеднястроўскай культуры, нёманскай культуры, культур тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі, лейкападобных кубкаў, шарападобных амфар і інш.[13] Кожная з гэтых культур падрабязна ахарактэрызавана ў энцыклапедыі "Археалогія і нумізматыка Беларусі". Знаемства з імі дазваляе дэталёва разабрацца са спецыфікай неаліту на Беларусі.

### 3. Раннякласавая цывілізацыя: адметныя рысы

Пераход да земляробства, разлажэнне абшчыны, пашырэнне рамак прыватнай уласнасці выклікалі маёмасную і сацыяльную няроўнасць, абумовілі **ўтварэнне дзяржавы.** Працэс складвання класавых грамадстваў не быў сінхронным. Адны народы стваралі свае дзяржавы ў IV – III тыс. да н.э., другія – пасля распаду Рымскай імперыі ў пачатку нашай эры, трэція – у XVIII – XIX стст. н. э. Прычым раней за ўсё дзяржавы ўзніклі ў тых абласцях, дзе прадукцыйнасць земляробства была асабліва значнай. Як правіла, такой інтэнсіўнай сістэмай было ірыгацыйнае земляробства.

Старажытны Ўсход стаў калыскай цывілізацыі. Прыкладна ў сярэдзіне IV тыс. да н. э. тут узніклі **першыя дзяржаўныя ўтварэнні** – спачатку ў **Месапатаміі**[14], **Егіпце,** затым у **Персіі** і **Індыі.** Ранняму развіццю земляробства ў гэтых рэгіёнах спрыялі цёплы клімат, наяўнасць урадлівых рачных далін, лёгка апрацоўваемай глебы, магчымасць штогадовага яе арашэння.

---

[11] Дубянецкі Э.С. Сусветная культура. – Мн., 2001. – С. 11.

[12] Ковалева Н.Н. Ритмы цивилизаций в Беларуси // Вестник Брестского государственного технического университета. Гуманитарные науки. – 2002. – № 6. – С. 38.

[13] Неаліт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. – Мн., 1999. Т. 5. – С. 317.

[14] Месапатамія (Двурэчча), вобласць у сярэднім і ніжнім цячэнні рэк Цігр і Еўфрат (у Заходняй Азіі), адзін са старажытных ачагаў цывілізацыі. На тэрыторыі Месапатаміі ў IV – III тыс. да н. э. сфарміраваліся раннякласавыя дзяржавы (Ур, Урук, Лагаш і інш.) // Советский энциклопедический словарь. – М., 1980. – С. 802.

**Спосабу вытворчасці,** які склаўся ў краінах Усходу і атрымаў назву **азіяцкага,** былі ўласцівыя наступныя рысы:

1) дзяржаўнае або дзяржаўна-абшчыннае ўладанне зямлёй;
2) наяўнасць моцнага аб'яднаўчага пачатку:
а) дэспатычнага (калі супольніцтвам кіруе кіраўнік найбольш важнай у племяні сям'і);
б) дэмакратычнага (калі ўлада ў супольніцтве належыць бацькам сямействаў);
3) фармальная свабода членаў супольніцтва.

Узнікненне і існаванне абшчынных адносін у многім звязана з тым, што будаўніцтва і выкарыстанне ірыгацыйных каналаў (арасіцельных сістэм) было магчыма толькі ў выпадку аб'яднання калектыўных намаганняў. У гэтых абставінах ні адзін будаўнік не мог прэтэндаваць на якую-небудзь частку пабудаванай ірыгацыйнай сістэмы, у сілу чаго сама гэтая сістэма магла знаходзіцца выключна ў дзяржаўнай (абшчыннай) уласнасці. Неабходна таксама ўлічваць і тую акалічнасць, што ва ўмовах засушлівага клімата каштоўнасць мае не ўсялякі, а толькі такі зямельны ўчастак, які можа атрымаць неабходнае ўвільгатненне. Гэта яшчэ больш узмацняла пазіцыю ўладальнікаў арасіцельных сістэм, давала ім фактычна неабмежаванае права прыцягваць свабодных абшчыннікаў да нясення працоўнай павіннасці. Такім чынам, у азіяцкай (па крайней меры, пераважна) форме вытворчасці не існавала ўласнасці асобнай асобы, а існавала толькі яе валоданне, пры гэтым сапраўдным уласнікам з'яўлялася абшчына. Важна адзначыць, што ў краінах Усходу адным з вызначальных фактараў эканамічнага росту было выкарыстанне метала, перш за ўсё медзі.

У краінах Старажытнага Усходу паступова сфарміраваліся тры асноўных класа: клас рабоў і блізкіх ім паднявольных работнікаў, клас дробных свабодных вытворцаў і пануючы клас, куды ўваходзілі землеробчая, прыдворная і служылая арыстакратыя, камандны склад арміі, жрэчаства, заможная вярхушка землеробчых абшын. Кожны клас не быў маналітны і аднародны, а складаўся з некалькіх слаёў, якія адрозніваліся па юрыдычнаму і бытавому становішчу, маёмаснай заможнасці.[15]

Асаблівасцю адносін раннякласавай цывілізацыі было пераўтварэнне ў суб'ект уласнасці чалавека – рабоў (ваеннапалонных, трапіўшых у рабства). Спачатку, пакуль рабская праца, якая патрабавала нагляду і прымусу, была нявыгаднай, ваеннапалонных альбо ператтваралі ў непаўнапраўных членаў абшчыны (хатняе рабства), альбо забівалі, а часам – прыносілі ў ахвяру пры рэлігійных цэрымоніях, або пахаваннях знаці. Але з часам рабская праца стала прыносіць прыбавачны прадукт, рабаўладальніцкая гаспадарка стала шырока распаўсюджанай (хоць і непаўсюдна – у Паўднёвай і Усходняй Еўропе яна не была пераважнай). Аднак, як паказалі даследванні археолагаў і гісторыкаў, рабаўладанне не было эканамічным грунтам, характэрнай адзнакай бронзавага веку. Асноўная маса прыбавачнага прадукта, які прысвойваўся эксплуатуючым класам і дзяржавай, ствралася працай сялян-абшыннікаў і рамеснікаў, а таксама залежных дзяржаўных і храмавых работнікаў.[16]

Вынікі развіцця раннякласавай цывілізацыі наступныя:

1) стварэнне рацыянальна арганізаванай эканомікі, якая прыносіць значны прыбавачны прадукт, што трапляе ў распараджэнне грамадства;

2) стварэнне інстытута прыватнай уласнасці і валодання маёмасцю, уключаючы і зямлю, а як вынік, з'яўленне магчымасці канцэнтрацыі багаццяў у

---

[15] История Древнего Востока: Учеб. для студ. вузов, обучающихся по спец. "История" / А. А. Вигасин, М. А. Дандамаев, М. В. Крюков и др.; Под ред. В. И. Кузищина. – М., 1999. – С. 5-6.
[16] Яковец Ю.В. История цивилизаций. – С. 82-83.

руках адных і страты ў другіх. Гэта прыводзіць да сацыяльнага расслаення, з'яўлення груп багатых і бедных;

3) з'яўленне асаблівага органа, які рэгулюе сацыяльныя адносіны і канфлікты, а менавіта, дзяржавы і права;

4) з'яўленне горада як гаспадарчага, адміністрацыйнага, ваеннага і культурна-рэлігійнага цэнтра вобласці ці рэгёна, як месца канцэнтрацыі матэрыяльных і інтэлектуальных рэсурсаў рэгёну, розуму, энергіі і прадпрымальніцтва яго жыхароў. Горад становіцца моцным арганізатарам сацыяльнага прагрэса грамадства;

5) з'яўленне магчымасці манументальнага будаўніцтва, стварэнне здзіўляючых ўяўленне збудаванняў: пірамід і храмаў Егіпта, месапатамскіх зікуратаў, царскіх палацаў. Гэтыя пабудовы сталі яскравай дэманстрацыяй велізарных магчымасцяў цывілізацыі, якая нараджалася, манеўрыравання яе запасамі і працоўнымі рэсурсамі;

6) стварэнне пісьменнасці, гэта значыць сістэмы графічных знакаў і сімвалаў, здольных фіксаваць і перадаваць нашчадкам чалавечую мову з інфармацыяй, якая з ёй утрымліваецца, назапашаным у розных сферах жыцця вопытам. Вынаходніцтва пісьменнасці – гэта сведчанне нараджэння новага менталітэту, гіганцкі скачок у галіне матэрыяльных і інтэлектуальных магчымасцяў цывілізацыі.

Па сутнасці кажучы, аж да нашых дзён грамадства ідзе па тых шляхах, якія былі вызначаны першымі цывілізацыямі, нарадзіўшыміся ў краінах Старажытнага Ўсходу, і ў гэтым іх сусветна-гістарычнае значэнне.

## 4. Антычная цывілізацыя, яе месца ў сусветнай гісторыі

**Антычная цывілізацыя** – "вяршыня першай хвалі ў гісторыі чалавецтва, час нялёгкага, але прыгожага яго юнацтва, якое сфарміравала генатып грамадства ва ўсім багацці і разнастайнасці складаючых яго элементаў. Храналагічныя рамкі антычнай цывілізацыі: VIII ст. да н. э. – сярэдзіна V ст. н. э. – больш дванаццаці стагоддзяў, хоць рамкі зараджэння "жалезнага века" можна адсунуць на чатыры стагоддзі назад, а рэліктавую фазу ў Візантыйскай імперыі працягнуць да канца І тыс. У гісторыі гэтай цывілізацыі выразна вылучаюцца некалькі лакальных цывілізацый: **грэчаская** (перыяд росквіту – Старажытныя Афіны, V– IV стст. да н. э.) і **Рымская** (перыяд росвіту II ст. да н. э. – І ст. н. э.). Часам вылучаюць паміж імі эліністычны або александрыйскі перыяд (330 – 220 гг. да н. э.), калі эпіцэнтр культуры перамясціўся ў Александрыю. Самастойны рух са сваімі эпіцэнтрамі мелі лакальныя цывілізацыі Індыі і Кітая".[17]

**Гісторыю Старажытнай Грэцыі** можна падзяліць на пяць перыядаў:

1) **эгейскі, ці крыта-мікенскі** (III – II тыс. да н. э.), перыяд разлажэння радавога ладу, узнікнення і развіцця ў асобных раёнах раннякласавых рабаўладальніцкіх дзяржаў, спыніўшых сваё існаванне ў выніку дарыйскага перасялення;

2) Грэцыя XI – IX стст. да н. э. – перыяд часовага адраджэння першабытнаабшчынных адносін пасля **дарыйскага заваявання** і далейшага агульнагрэчаскага развіцця класавых адносін на аснове антычнай формы ўласнасці;

3) **архаічны перыяд** (VШ – VI стст. да н. э.) – працяг папярэдняга перыяду, час станаўлення антычнага рабаўладальніцкага грамадства;

4) **класічны перыяд** (V – IV стст. да н. э.) – перыяд найвялікшага развіцця рабаўладальніцкіх адносін у антычных полісах;

---

[17] Яковец Ю.В. История цивилизаций. – С. 89.

5) **эліністычны перыяд** (другая палова IV – сярэдзіна I ст. да н. э.) – час далейшага развіцця рабаўладальніцкага грамадства пасля грэка-македонскага заваявання Пярсідскай дзяржавы. Гэты перыяд скончыўся заваяваннем заходняй часткі эліністычнага свету Рымам, а ўсходняй (да Еўфрата) – Парфіяй".[18]

Пры разглядзе старажытнагрэчаскай гісторыі ў глабальным кантэксце найвялікшую цікавасць уяўляюць Вялікая грэчаская каланізацыя, стварэнне імперыі Аляксандра Македонскага, спадчына, пакінутая эліністычнымі дзяржавамі.

У антычную эпоху цывілізацыя выйшла за параўнальна вузкія лакальныя рамкі, упершыню узніклі сусветныя імперыі. Першы рух да іх на заранку антычнай цывілізацыі выявіўся ў некалькіх хвалях грэчаскай каланізацыі; найбольш буйная з іх – **Вялікая грэчаская каланізацыя (VIII – VI стст. да н. э.)**, калі значная частка грэчаскіх дзяржаў-полісаў заснавала калоніі практычна па ўсяму ўзбярэжжу Міжземнага, Чорнага і часткова Азоўскага і Іанічнага мораў. Гэта яшчэ не імперыя, бо кожная калонія была незалежна ад метраполіі, хоць і звязана з ёй тысячамі духоўных і эканамічных нітак, сямейнымі вузамі грамадзян.

Па сутнасці, перад намі – прыклад множання і распаўсюджвання ачагоў антычнай цывілізацыі. Але трэба адзначыць і новую якасць, новы элемент сусветнага прагрэса. Каланізацыя спрыяла развіццю мараплавання, патоку новых ведаў, узнікненню геаграфіі і сусветнай гісторыі, выхаду мышлення за вузкія лакальныя рамкі невялікай групы полісаў. Эканамічныя наступствы каланізацыі заключаліся ў асваенні новых багатых прыроднымі рэсурсамі рэгіенаў, бурным развіцці гандлю калоній з метраполіямі і паміж сабой, узбагачэнні асартымента тавараў, узаемнай сувязі культур розных плямён і народаў.[19]

У старажытнай гісторыі адно з ключавых месцаў заняло праўленне цара **Аляксандра Македонскага (334 – 324 г. да н. э.).** "Перамогшы персаў пры Граніцы (334 г. да н. э.), Ісе (333 г. да н. э.), Гаўгамелах (331 г. да н. э.), ён падпарадкаваў царства Ахеменідаў,[20] уварваўся ў Сярэднюю Азію (329 г. да н.э.), заваяваў землі да ракі Інд, стварыўшы буйнейшую сусветную імперыю старажытнасці".[21]

Прынцыпова важна спецыяльна падкрэсліць, што перыяд існавання імперыі А. Македонскага ёсць адначасова другі пасля Вялікай грэчаскай каланізацыі перыяд узаемапранікнення еўрапейскай і ўсходняй культур, выхада цывілізацыі за вузкія межы лакальных цывілізацый. Трэці перыяд супадае з эпохай элінізма. З кожным з названых перыядаў адбывалася ўзмацненне ўзгаданага ўзаемапранікнення.

Пад **эпохай элінізма** разумеюць амаль 300-гадовы перыяд гісторыі Грэцыі, Македоніі, краін Усходняга Міжземнамор'я, Ірана, Сярэдняй Азіі і раёнаў, якія да іх прымыкалі пасля заваяванняў Аляксандра Македонскага (карта 9). Перыяд пачаўся распадам імперыі А. Македонскага на шэраг эліністычных краін і скончыўся іх заваяваннем з захаду Рымам, а з усходу – Парфіяй. Традыцыйнай датай, што завяршае гісторыю эпохі элінізма, лічаць 30 г. да н. э., калі апошняя незалежная эліністычная дзяржава – царства Пталемеяў – была заваявана Рымам.[22]

Імперыя Аляксандра Македонскага распалася, калі прайшло без малага паўстагоддзя пасля яго смерці. У новых умовах тэрытарыяльны масіў, які супадаў з яе велізарнымі абшарамі, уключаў як буйныя, так і невялікія эліністычныя дзяржавы.

---

[18] История древнего мира. Ч. 2. Учеб. пособие для пединститутов / Под ред. Ю. С. Крушкол. – Л. – М., 1971. – С. 4-5.

[19] Яковец Ю.В. История цивилизаций. – С. 91.

[20] Ахеменіды – дынастыя старажытнаперсідскіх цароў у 558 – 330 гг. да н. э. Заснавальнік Кір II. Дзяржава Ахееменідаў уключала большасць краін Блізкага і Сярэдняга Усходу, дасягнула найвялікшага росквіту пры Дарыі I (Гл.: "Советский энциклопедический словарь. – С. 94").

[21] Советский энциклопедический словарь. – С. 36.

[22] История древнего мира. Ч. II. – С. 150.

У эліністычным свеце па тэрытарыяльных памерах, геапалітычнаму становішчу вылучаўся перш за ўсе **Егіпет** (царства Пталемеяў) (карта 6). Пталемеі мелі ў якасці сваіх падданых не толькі егіпцян. Статус егіпецкіх калоній быў характэрны для Кірэнаікі (часткі сучаснай Лівіі), Кіпра, Паўднёвай Сірыі, Фінікіі (старажытнай краіны на ўсходнім узбярэжжы Міжземнага мора), нямалых па плошчы малаазійскіх абшараў. Эліністычны Егіпет быў магутнай марской дзяржавай. Прысутнасць егіпецкіх караблёў была ключавой у пэўных стратэгічна важных частках Міжземнага і Чырвонага мораў.

На тэрыторыі былой імперыі Аляксандра Македонскага ў якасці аднаго з цэнтраў сілы выступала **дзяржава Селеўкідаў**. Праўда, яе месца і роля ў эліністычным свеце не заставаліся нязменнымі. Пік уплыву гэтай дзяржавы ў дадзеным свеце прыпадае на III ст. да н. э., аб чым сведчылі памеры тэрытарыяльнага абшару, падуладнага Селеўкідам. У той час ён перавышаў абшар, які быў заняты астатнімі эліністычнымі дзяржавамі, разам узятымі. Аб'ектамі ўладных паўнамоцтваў Селеўкідаў былі абшары на поўнач ад Індыі, частка сучасных Ірана і Сярэдняй Азіі. Наяўнасць моцнага ўласнага флота дазваляла Селеўкідам адыгрываць адну з ключавых роляў у міжнародным гандлю, на роўных сапернічаць у гэтым плане з Егіптам. Трэба таксама мець на ўвазе, што ў III ст. да н. э. прасочваліся і першыя істотныя тэрытарыяльныя страты дадзеных цароў. Дзяржава Селеўкідаў уступіла ў другую палову III ст. да н. э. без Ірана, Сярэдняй Азіі.[23]

Відавочным цэнтрам сілы ў эліністычнай частцы Еўропы была **Македонія.** Яна, як і Егіпет, і Царства Селеўкідаў, мела становішча ключавой дзяржавы на ўсёй эліністычнай прасторы.

У III – I стст. да н. э. адносіны паміж эліністычнымі дзяржавамі былі складанымі. Аб гэтым сведчылі пяць сірыйскіх войнаў паміж дзяржавай Селеўкідаў і Егіптам, агрэсіўныя памкненні Македоніі, якая зноў займела пазіцыю гегемона ў эліністычным свеце ў першай палове II ст. да н. э. і г. д.

У развіцці **старажытнарымскай цывілізацыі** можна выдзяліць 4 асноўныя перыяды:

**- першы перыяд – этруская цывілізацыя** (I тыс. да н. э.). Плямёны этрускаў стварылі даволі высокаразвітую ўнікальную культуру, якая папярэднічала ўласна рымскай і аказала на яе прыкметны ўплыў;

**- другі перыяд – царскі** (VIII – канец VI ст. да н. э.). З таго часу захаваліся імёны 7 цароў, прычым першыя 4 былі хутчэй за ўсё міфічнымі, легендарнымі, а 3 апошнія – рэальнымі (мелі этрускае паходжанне). Пры гэтых царах г. Рым дасягнуў вядучага становішча ў Лацыі – вобласці ў цэнтральнай частцы Апенінскага паўвострава, дзе пражывала племя "лацінаў";

**- трэці перыяд – Рымскай рэспублікі** (каля 510 – 27 гг. да н. э.). Пачаўся з моманту выгнання цара Тарквінія Гордага і ўстанаўлення Рэспублікі. Склалася сістэма кіравання дзяржавай полісната тыпу, заснаваная на выбарнасці магістратаў, а таксама на дзейнасці сената і народнага сходу. Уладзе горада-дзяржавы Рыма былі падначалены практычна ўся Італія і Міжземнамор'е. Аформілася класічная форма рабаўладальніцтва, адбываліся шматлікія знешнія і ўнутраныя (грамадзянскія) войны;

---

[23] Змяншэнне тэрыторыі Царства Селеўкідаў нярэдка мела сваім лагічным наступствам узнікненне новых дзяржаў. У выніку паўстання селеўкідскай грэка-македонскай арміі, падтрыманага мясцовай арыстакратыяй, у Сярэднай Азіі ўтварылася незалежнае Грэка-Бактрыйскае эліністычнае царства. Амаль адначасова на захад ад яго, паміж Каспійскім морам і Персідскім залівам, на тэрыторыі Ірана адбылося паўстанне мясцовых плямёнаў супраць эліністычных заваявальнікаў. Утварылася незалежнае Парфянскае царства як вынік вызваленчай антыэліністычнай барацьбы мясцовага насельніцтва. Яшчэ ў часы фармавання дзяржавы Селеўкідаў ад яго на захадзе аддзялілася, або умацавала сваю незалежнасць некалькі невялікіх дяржаў, сярод якіх у III ст да н.э. асабліва прыкметную ролю стала адыгрываць эліністычная дзяржава Пергам. ( Гл.: "История Древнего мира. Ч. 2. – С. 157").

- **чацвёрты перыяд – Рымскай імперыі** (27 г. да н. э. – 476 г. н. э.). Яшчэ больш пашырыліся межы Рымскай дзяржавы, узмацнілася пастаяннае войска, сфарміраваўся бюракратычны апарат кіравання. Улада рымскіх імператараў стала фактычна неабмежаванай, пачаўся палітычны і эканамічны крызіс у грамадстве. У **395 г. н. э.** па завяшчанню імператара Феадосія I **Рымская імперыя была падзелена на Заходнюю і Ўсходнюю**, а ў **476 г.**, ў сувязі са звяржэннем германскім правадыром Адаакрам апошняга заходня-рымскага імператара Ромула Аўгустула, **Заходняя Рымская імперыя перастала існаваць. Усходняя Рымская імперыя (Візантыя) праіснавала яшчэ каля тысячагоддзя – да 1453 г.**

Найбольшай магутнасці Рымская дзяржава дасягнула ў час існавання Рымскай імперыі. Станаўленне Рымскай імперыі пачалося у III ст. да н. э., калі Старажытны Рым стаў гвалтоўным аб'яднаннем гарадоў і племянных тэрыторый усёй Італіі і мацнейшай дзяржавай Заходняга Міжземнамор'я.[24] Менавіта ў гэтым стагоддзі адбыліся першая і другая Пунічныя войны, якія вяліся паміж Рымам і Карфагенам.[25]

У час першай Пунічнай вайны (264 – 241 гг. да н. э.) Рым выйшаў пераможцай, што было адлюстравана ў мірнай дамове ад 241 г. да н.э. Ён станавіўся поўным гаспадаром у Сіцыліі, атрымліваў ад карфагенян без малага 84 тоны срэбра, вяртаў сабе ўласных ваеннапалонных, нічога не заплаціўшы. Важна мець на ўвазе, што праз некалькі год пасля падпісання дадзенай дамовы Карфаген будзе страчваць пэўныя тэрыторыі не дэ-юрэ, а выключна дэ-факта. Размова ідзе пра Сардынію і Корсіку, якія ўвойдуць у гісторыю як першыя рымскія правінцыі.

Другая Пунічная, або Ганібалава, вайна (218 – 201 гг. да н. э.) звязана з іменем галоўнакамандуючага карфагенскай арміі Ганібала. Рымлянам прыйшлося супрацьстаяць перш за ўсе яго ваеннаму генію. Праўда, Карфагену гэтага генія аказалася недастаткова, каб вырашыць лёс вайны. Ён зноў пацярпеў паражэнне. Наступствы дадзенага паражэння для Карфагена былі катастрафічнымі. Гэтая дзяржава пазбаўлялася ўсіх заморскіх уладанняў, ўсяго ваеннага флота (500 караблёў), яе тэрыторыя абмежавалася невялікай гарадской акругай у Афрыцы. Карфаген губляў права мець ваенны флот, не мог без дазволу Рыма весці войны і павінен быў выплачваць кантрыбуцыю ў 10 тыс. талантаў на працягу пяцідзесяці гадоў.

Пасля Ганібалавай вайны Рым набыў шмат новых тэрыторый за межамі Апенінскага паўвострава: Сіцылію, Сардынію і Корсіку[26], карфагенскія валоданні Іберыі, якая была перайменавана рымлянамі у Іспанію, Паўночную Італію. Нумідыйскае царства[27] і грэчаскі горад Масілія шукалі абароны і заступніцтва. Валоданні Рыма ахоплівалі ўжо ўсё Міжземнамор'е.

Першыя заморскія валоданні Рыма – Сіцылія, Сардынія і Корсіка – атрымалі статус правінцый у 227 г. да н. э. У 197 г. да н. э. з захопленых Іберыйскіх тэрыторый былі ўтвораны дзве новыя правінцыі: Іспанія Блізкая (г. зн. размешчаная бліжэй да Рыма) і Іспанія Далёкая – паўднева-усходняя частка паўвострава.[28]

---

[24] История древнего Рима. Учеб. для вузов по спец. "История" / В. И. Кузищин, И. Л. Маяк, И. А. Гвоздева и др.; Под ред. В. И. Кузищина 4-е изд. перераб. и доп. – М., 2000. – С. 3.

[25] Карфаген – старажытны горад-дзяржава ў Паўночнай Афрыцы, у раёне сучаснага горада Туніс. Заснаваны ў 825 г. да н.э. фінікійцамі. Да пачатку III ст., заваяваўшы Паўночную Афрыку, Сіцылію (акрамя Сіракуз), Сардынію і Паўднёвую Іспанію, пераўтварыўся ў магутную рабаўладальніцкую дзяржаву Міжземнамор'я, што прывяло да сутыкнення паміж ім і Рымам (Гл.: "Советский энциклопедический словарь. – С. 561").

[26] Зараз астравы Сіцылія і Сардынія ўваходзяць у склад Італіі, а востраў Корсіка – у склад Францыі.

[27] Нумідыя – усходняя частка сучаснага Алжыра.

[28] История Древнего Рима. – С. 84-86.

Першая палова II ст. да н.э. адзначана змяшчэннем акцэнтаў у агрэсіўнай палітыцы Рыма. У ёй трывалы прыярытэт быў аддадзены элiністычнаму напрамку. На гэтым напрамку Рым супрацьстаяў Македонii, царству Селеўкідаў, а таксама саюзу грэчаскіх гарадоў. Першы крок да ўсталявання яго кантроля над эліністычным светам – Рымска-Ілірыйская вайна (229 – 228 гг. да н. э.). Далучыўшы Ілірыйскае узбярэжжа[29], Рымская імперыя займела моцны геастратэгічны аргумент у адносінах да Македоніі. Яна атрымала перамогу ў Рымска-Македонскай вайне 200 – 197 гг. да н. э. Прайграўшы бок падпісаўся пад вельмі нявыгаднай для яго дамовай. Гэты факт азначаў страту ўсіх наяўных тэрытарыяльных набыткаў, якія атрымала Македонія ў выніку войн, што вялі цар Філіп V і яго папярэднікі. Рым атрымліваў ад дадзеннага цара 1000 талантаў, базісную частку ваеннага флота, юрыдычна абавязковае абяцанне прытрымлівацца толькі такога курсу ў міжнародных справах, які б задавальняў перамогшы бок.

Не менш значнымі былі і вынікі вайны рымлян з дзяржавай Селеўкідаў, аб чым сведчыў Анамейскі мір ад 188 г. да н. э. Пазіцыі імперыі былі істотна ўмацаваны ў выніку Трэцяй Македонскай вайны, вайны з Ахейскім саюзам. У 146 г. да н. э. у выніку III Пунічнай вайны быў знішчаны Карфаген. Яго абшар набыў новых гаспадароў, гэта значыць, што па-першае, на карце Рымскай імперыі з'явілася новая правінцыя – Афрыка, і, па-другое, тэрытарыяльнае прырашчэнне атрымала Нумідыя. Праз некаторы час у сферу рымскага панавання ўвашла Лузітанія.[30] Перамога Рыма над Пергамам[31] у 129 г. да н.э. пры Стратанікеі прадвызначыла ўключэнне ў гэтую сферу правінцыі Азія. Калі II ст. да н. э. блізілася да свайго заканчэння, ў выніку Югурцінскай вайны адбылося пашырэнне Рымскай імперыі за кошт Нумідыі.

У I ст. да н. э. агрэсіўныя памкненні Рыма спачатку знайшлі лагічны працяг перш за ўсе ў выправах Лукула і Пампея. Выкарыстанне імперыяй вайсковага аргумента ў выглядзе дадзеных выпраў прывяло да набыцця статуса рымскіх правінцый Віфініяй і Понтам, былой Селеўкідскай дзяржавай (Сірыя), рэальнай залежнасці ад яе Кападокіі, Камагены.[32]

58 – 51 гг. да н. э. адзначаны гальскімі войнамі, якія вёў Гай Юлій Цэзар. Дзякуючы выдатным здольнасцям апошняга, Рым стаў поўнасцю панаваць ва ўсім рэгіёне. Калі звярнуць увагу на карту Еўропы XXI ст., то стане відавочна, што гэты рэгіён уключаў абшары, на якіх жывуць французы, падданыя англійскай каралевы, караля бельгійцаў, грамадзяне швейцарскай канфедэрацыі, а таксама тыя заходнія немцы, якія не распаўсюджваюць зону свайго рассялення за раку Рэйн. Заўважым, што далекія і блізкія папярэднікі Цэзара зрабілі сваімі падданымі толькі адносна невялікую частку галаў.

Трэба мець на ўвазе, што да часоў Актавіана (рымскі імператар з 27 г. да н.э да 14 г. н. э.) тэрмін "Рымская імперыя" нідзе не ўжываўся. Яна фактычна існавала ўжо даўно ў тым сэнсе, які тычыўся міжнароднага становішча Старажытнага Рыма. Пры Актавіане імперская структура стала ядром палітычнай сістэмы грамадства, поўнасцю выцiснула рэспубліканскі лад. Актавіан, яшчэ не маючы статуса першага рымскага імператара пад тытулам Аўгуст, далучыў да сваей краіны Егіпет. З імем імператара Аўгуста звязана ператварэнне ў яго падданых усіх жыхароў Іспаніі, вельмі выніковыя выправы ў альпійскім напрамку, з якімі генетычна звязана з'яўленне такіх рымскіх правінцый, як Панонія, Норык, Рэцыя, Ілірык, Мезія.[33]

Пры імператары Тыберыі (14–37 гг. н. э.) была падведзена юрыдычная рыса пад фактычным становішчам Кападокіі і Камагены. Яны папоўнілі лік рымскіх правінцый. Эра

---

[29] Ілірыйскае ўзбярэжжа ўключае тэрыторыі сучасных Славеніі, Харватыі.

[30] **Лузітанія** – большая частка сучаснай Партугаліі.

[31] **Пергам** – дзяржава ў Малой Азіі.

[32] Віфінія, Понт, Кападокія, Камагена знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Турцыі

[33] **Панонія** – частка сучаснай Аўстрыі, Венгрыі, Югаславіі. Норык знаходзіўся паміж верхнім цячэннем Дравы і Дуная. Мезія – паміж ніжнім Дунаем і Балканамі.

Клаўдзія (І ст. н. э.) была адзначана ўсталяваннем поўнага кантроля над Паўднёвай Брытаніяй, Фракіяй[34], Маўрытаніяй[35] Цінгітанскай, Маўрытаніяй Цэзарэйскай. Пры Дамініцыяне ўся Брытанія, за выключэннем Шатландыі стала рымскай.

Найвялікшы росквіт Рымскай імперыі прыпадае на прынцыпат Траяна (рымскі імператар у 98–117 гг. н. э.). Яна дасягнула пры гэтым імператары самых вялікіх памераў у сваёй гісторыі. У эру Траяна ў склад імперыі ўвайшла Дакія[36], гэта значыць вельмі працяглае левабярэжжа Дуная. Для дадзенага імператара першапачаткова ўдала складвалася парфянская кампанія. Без асаблівых праблем быў усталяваны кантроль над Арменіяй. Такі ж вынік, але ж з большымі складанасцямі, быў дасягнуты ў адносінах да Месапатаміі. З'явіліся новыя правінцыі: Арменія, Асірыя[37], Месапатамія. Аднак у далейшым рымскія легіёны павінны былі пакінуць Месапатамію. Пры Марку Аўрэлію складовай часткай імперыі стала Паўночная Месапатамія.

Такім чынам, у І – ІІ стст. **Рымская дзяржава** дасягнула найвялікшага тэрытарыяльнага пашырэння. **У яе склад увайшлі Паўночная Афрыка, большая частка Заходняй, Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, Усходняе Міжземнамор'е да Арменіі і ракі Еўфрат. Упершыню ў сусветнай гісторыі ўзбярэжжа Міжземнага мора было аб'яднана ў рамках аднаго дзяржаўнага ўтварэння. На тэрыторыі былой Рымскай імперыі зараз існуе каля 30 дзяржаў. Рымская імперыя стала сусветнай, па тых маштабах, дзяржавай.**

Побач з Рымскай імперыяй у тагачасным свеце існавалі іншыя вялікія дзяржавы – Парфянскае царства,[38] Кушанская дзяржава,[39] Ханьская імперыя ў Кітаі, але сярод іх Рымская імперыя вылучалася на свайму ваенна-палітычнаму патэнцыялу, культурнаму ўзроўню і агульнаму гістарычнаму значэнню.

Калі **азіяцкі спосаб вытворчасці** дапускаў у якасці свайго базіса зямельную плошчу як такавую, то аснову **антычнай формы** складаў горад як створанае месца пасялення (цэнтр) землеўладальнікаў (зямельных уласнікаў), пры гэтым ралля з'яўлялася тэрыторыяй горада, і селянін быў гараджанінам (гэта значыць грамадзянінам дадзенай дзяржавы) толькі ў сілу таго, што быў уласнікам часткі раллёвых зямель. Такім чынам, у антычных народаў, класічным прыкладам якіх з'яўляюцца рымляне (у іх гэта праяўляецца ў самай чыстай форме), дзяржаўная зямельная ўласнасць адначасова выступала ў дзвюх якасцях: дзяржаўнай зямельнай і прыватнай зямельнай уласнасці.

Важнейшым аспектам вытворчага працэса ў антычным грамадстве было выкарыстанне рабскай працы. Перш за ўсё разгледзім антычнае рабства ў кантэксце ўсёй старажытнай эпохі.

"**Рабаўладальніцкі лад** – першая ў гісторыі класавая грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на эксплуатацыі рабоў, прыватнай уласнасці рабаўладальніка на сродкі вытворчасці і на асноўнага вытворцу матэрыяльных даброт – раба. Рабства ў пэўных відах існавала ва ўсіх народаў, хоць не ўсюды развілося ў грамадска-эканамічную фармацыю.

---

[34] **Фракія** – частка сучаснай Грэцыі.

[35] **Маўрытанія** – паўночная частка сучаснай Турцыі.

[36] **Дакія** – частка сучаснай Румыніі.

[37] **Асірыя** – старажытная дзяржава ў Паўночным Двурэччы (на тэрыторыі сучаснага Ірака. У XV – IX стст. да н. э. неаднаразова падпарадкоўвала ўсю Паўночную Месапатамію. Перыяд найвялікшай магутнасці Асірыі – другая палова VIII – першая палова VII стст. да н. э. У 605 г. да н.э. знішчана // Советский энциклопедический словарь – С. 85.

[38] **Парфянскае царства** – дзяржава, якая ўзнікла ў 250 г. да н. э. к паўднёваму ўсходу ад Каспійскага мора. Назва ад парфян – іранскага племені. У перыяд росквіту (сярэдзіна І ст. да н.э.) распрасціралася ад Двурэчча да ракі Інд. Сапернік Рыма на Усходзе. З 224 г. яго тэрыторыя ўваходзіла ў дзяржаву Сасанідаў // Советский энциклопедический словарь. – С. 984.

[39] **Кушанскае царства** – старажытная дзяржава. Узнікла з княства ў Бактрыі, узначаленага племенем (або родам) кушан у І ст. н.э. У перыяд росквіту ўключала значную частку тэрыторый сучасных Сярэдняй Азіі, Афганістана, Пакістана, Паўночнай Індыі і, магчыма, Сіньцзяна // Советский энциклопедический словарь. – С. 686.

Рабаўладальніцкі лад як фармацыя існаваў з V ці IV тыс. да н. э. да III – V ст. н. э. Росквіту дасягнуў у Старажытнай Грэцыі і Рыме. У Кітаі рабаўладальніцкі лад заменены феадальным яшчэ у I тыс. да н. э. У старажытных славян, германцаў і іншых народаў рабства было толькі ў выглядзе ўкладу. У рабаўладальніцкім грамадстве асноўнымі антаганістычнымі класамі былі рабы і рабаўладальнікі, існаваў таксама клас дробных вытворцаў – свабодных сялян, рамеснікаў.

Паводле становішча, замацаванага юрыдычнымі нормамі, раб быў рэччу: гаспадар мог яго купіць, прадаць і нават забіць. У залежнасці ад гістарычных тыпаў і разнавіднасцей рабаўладальніцкіх грамадстваў і дзяржаў, а таксама этапаў развіцця адрозніваюць патрыярхальнае рабства (характэрна для часоў распаду абшчынна-радавога ладу і зараджэння класаў, усходняе (у Старажытнай Індыі і Кітаі рабы належалі дзяржаве, храмам, уладарам і асобным прадстаўнікам знаці) і антычнае (краіны міжземнаморскага басейна). На тэрыторыі Беларусі ў час распаду абшчынна-радавога ладу існавала патрыярхальнае рабства, але рабаўладальніцтва не набыло тут класічных рыс і не стала асновай вытворчасці".[40]

**Гістарыяграфія вылучае 3 этапы развіцця антычнага рабства**:

1) складванне антычнага рабства – IX – VIII стст. да н. э. (Грэцыя "Гамераўскай эпохі") да VIII – VI стст. да н.э. (Італія). Адметная гаспадарча-эканамічная рыса першага этапа – рост вытворчасці за кошт працы рабоў, якая пашыралася;

2) зацвярджэнне і развіццё антычнага рабства – V – IV стст. да н. э. (Грэцыя эпохі полісаў у перыяд іх росквіту) да III – I стст. да н. э. (Італія часоў Рымскай рэспублікі позняй пары). Другі этап звязаны з дасягненнем максімальнай рэсурсааддачы працы рабоў; гэта этап росквіту гарадоў-дзяржаў, зведзеных да аднаго цэнтра (**"полісу"** – у Грэцыі, **"цывітасу"** – у Італіі), гэта этап умацавання ўласнасці і набыцця ёю двайнога зместу (аб чым сказана вышэй);

3) распад антычнага рабства – I ст. да н. э. – V ст. н. э. (Рымская імперыя на Захадзе). Гэта этап неадпаведнасці магчымасцяў паднявольнай працы ўсё больш узрастаючым грамадскім запатрабаванням, у сувязі з чым рабаўладальніцкае грамадства прыходзіць да вырашэння дзвюх узаемазвязаных праблем: 1) змяненню статуса рабочай сілы, яе распрыгоньванню (што аб'ектыўна вядзе да нараджэння феадальных адносін; 2) аснашчэнню працы больш эфектыўнымі абсталяваннямі (тэхналогіяй), што з'яўляецца неабходнай умовай таварнай вытворчасці.

Менавіта на гэтай стадыі ў Рымскай імперыі адбываецца **нараджэнне феадальных адносін** (ад лац. feudum – феод, валоданне) у форме **каланата** – такой формы адносін паміж дробнымі сельскімі вытворцамі (калонамі) і буйнымі землеўладальнікамі, пры якой арандатар зямельнага ўчастка плаціць арэндную плату натурай або грашыма і выконвае натуральныя павіннасці. Такім чынам, разлажэнне антычнага рабства ў Рымскай імперыі суправаджалася змяненнем сацыяльнага статуса раба: гэты працэс ішоў, напрыклад, у накірунку ад калона да **вілана**-селяніна, які знаходзіўся ў пазямельнай залежнасці ад феадала (пры захаванні асабістай свабоды).

Гістарычнае месца антычнай цывілізацыі заключаецца ў наступным. "Непаўторная антычная грэчаская культура стала асновай усёй еўрапейскай культуры... Менавіта ў старажытнагрэчаскай культуры ўпершыню сфарміраваліся адносіны да чалавека як да "меры усяго існага", вышэйшай сапраўднай каштоўнасці. У ёй знайшлі падрабязную распрацоўку такія актуальныя і вядомыя сёння паняцці і тэрміны, як грамадзянская свабода і раўнапраўе, грамадзянскі доўг, гарманічнае развіццё асобы. Вытокі сучасных

---

[40] Рабаўладальніцкі лад // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі У 6 тамах. – Мн., 2001. Т. 6. Кн. 1. – С. 26.

**лiбералiзму** i дэмакратыi знаходзяцца ў дэмакратычных асновах жыццядзейнасцi тагачасных грэчаскiх гарадоў-дзяржаў (полiсаў). На працягу многiх стагоддзяў грэчаскае мастацтва было ўзорам для пераймання. Практычна да сёняшнiх дзён у асноўных рысах дайшла старажытнагрэчаская сiстэма адукацыi i выхавання. У Старажытнай Грэцыi былi створаны i практычна ўсе асноўныя жанры лiтаратуры сярэдневякоўя, новага i найноўшага часу: iдылiя, трагедыя, камедыя, ода, элегiя, сатыра, эпiграма, байка i iнш. Старажытнагрэчаская мiфалогiя i лiтаратура на працягу многiх стагоддзяў з'яўляюцца невычэрпнай крынiцай натхнення паэтаў, пiсьменнiкаў, мастакоў, кампазiтараў... Менавiта ў Грэцыi канчаткова i акрэслена выдзелiлiся дзве разнавiднасцi працоўнай дзейнасцi – фiзiчная i разумовая, першая з якiх лiчылася нявартай свабоднага чалавека (была справай рабоў), а другая, наадварот, разглядалася як вартая свабоднага чалавека".[41]

**Антычная фiласофiя** з'яўляецца першым ў гiсторыi Еўропы феноменам мета-культуры i не толькi першым гiстарычным тыпам фiласофствавання, але i першай формай канцэптуальнага мышлення ўвогуле. У сiлу гэтага яна ўтрымлiвае ў сабе такiя прадметныя галiны, якiя ў будучым канстытуiруюцца як самастойныя тэарэтычныя дысцыплiны (**матэматыка, астраномiя, медыцына, лiнгвiстыка** i iнш.). Развiццё антычнай фiласофii з'яўляецца важнейшым этапам гiстарычнай дынамiкi прадмета фiласофскага пазнання, адыграўшы прынцыповую ролю ў разварочваннi праблемных палей фiласофii як такавой.

У рамках антычнай фiласофii былi канстытуiраваны **анталогiя i метафiзiка, гнасеалогiя i логiка, антрапалогiя i псiхалогiя, фiласофiя гiсторыi i эстэтыка, маральная i палiтычная фiласофiя.**[42]

Сярод культурных дасягненняў старажытных рымлян можна назваць **лацiнскую мову, рымскае права**, выдатныя грамадзянскiя пабудовы, грандыёзныя акведукi, тэрмы, зручныя i шырокiя дарогi i iнш.

Гiсторыя лацiнскай мовы распачынаецца ў VI ст. да н. э. За вялiкi перыяд iснавання Рыма гэта мова мянялася, развiвалася неадназначна. "Найбольшага росквiту лiтаратурная лацiнская мова дасягнула ў перыяд "залатой латынi" у творах Цэзара, Цыцэрона, Вергiлiя, Гарацыя, Авiдзiя. Да пачатку II ст. н. э. лацiнская мова запанавала ва ўсёй Заходняй Еўропе i на частцы Цэнтральнай Еўропы. Пасля гiбелi Заходня-Рымскай iмперыi (V ст. н. э.) з дыялектаў лацiнскай мовы пачалi фармавацца раманскiя мовы, i сама яна была запазычана хрысцiянствам i набыла асаблiвы статус сакральнай, а таксама стала мовай школы, адмiнiстрацыi, суда, навукi i iншых сфер. Да сярэдзiны XIX ст. латынь заставалася асноўным кампанентам сiстэмы класiчнай адукацыi, што грунтавалася на вывучэннi антычнай лiтаратуры, культуры, гiсторыi, а таксама класiчных грэчаскай i лацiнскай моў i асноў хрысцiянскага веравучэння. Адначасова класiчная адукацыя была часткай антычнай традыцыi, якая разам з хрысцiянскай i народнай традыцыйнай плынямi складала духоўнае ядро еўрапейскiх нацыянальных культур. Зараз латынь з'яўляецца афiцыйнай мовай Ватыкана i каталiцкай царквы.[43]

Рымскае права было найбольш дасканалым i распрацаваным у тагачасным цывiлiзаваным свеце. Яно аказала прыкметны ўплыў на развiццё прававой сiстэмы розных народаў свету. **Першы звод рымскiх законаў**, складзены **ў 450 г. да н. э.**, быў **вядомы пад назвай "12 таблiц"**. Яны рэгламентавалi правы ўласнасцi, наследавання, грамадскiя паводзiны, грашовыя аперацыi, адказнасць за злачынствы. Пазней узнiкла грамадзянскае права, якое склалi старажытнарымскiя мудрацы. Тут ужо больш дакладна i падрабязна (у параўнаннi з законамi "12 таблiц") апiсвалiся практычна ўсе бакi жыццядзейнасцi рымскага

[41] Дубянецкi Э.С. Сусветная культура. – С. 76-77.
[42] Новейший философский словарь. – С. 43.
[43] Лацiнская мова // Энцыклапедыя гiсторыi Беларусi. У 6 тамах. – Мн., 1997. Т. 4. – С. 342.

грамадства. Гэтыя прававыя нормы рэгулявалі пытанні землеўладання і наследавання ўласнасці. Зямля лічылася ўласнасцю таго чалавека, які карыстаўся ёю на працягу двух гадоў (так званы абшчынны прынцып "працоўнай уласнасці"). Уся ўласнасць сям'і юрыдычна належала толькі бацьку, які распараджаўся не толькі ўласнасцю, але і людзьмі. Напрыклад, ён мог прадаваць свайго ўласнага сына, сын не меў ніякай уласнасці.[44]

Замацаванне неабмежаванай прыватнай уласнасці, развітая сістэма дагавароў, яснасць фармулёвак, дакладнасць аргументацыі зрабілі рымскае права ўжывальным для розных прававых сістэм. З XI ст. пачалося аднаўленне рымскага права ў феадальных краінах Заходняй Еўропы, таму што ў ім было "ужо ў гатовым выглядзе ўсё тое, да чаго бюргерства позняга сярэднявечча імкнулася пакуль яшчэ толькі неўсвядомлена".[45] Аднак у краінах Заходняй Еўропы нормамі рымскага права карысталіся толькі тады, калі пытанне не магло быць вырашана на аснове мясцовага права. Выключэнне складала Германія, дзе рымскае права з канца XV ст. было абвешчана дзеючым правам краіны. На рымскім праве заснавана кананічнае права, асабліва ў галіне рэгулявання шлюбна-сямейнага, спадчыннага права і ўнутрыцаркоўных маёмасных адносін. Рэцэпцыя рымскага права ў значна меншай ступені закранула краіны Усходняй Еўропы, але і тут адчуваўся яго ўплыў. Некаторы ўплыў рымскага права можна прасачыць і ў сучаснай прававой практыцы.[46]

Адметнай рысай рымскіх гарадоў эпохі I – III стст. н. э. былі каменныя маставыя, водаправоды (акведукі), падземныя сточныя канавы для спуску брудных вод (клаакі). Водаправоды (акведукі) ўяўлялі сабой працяглыя рады арак, якія падтрымліваюць цагляныя трубы, па якім вада з горных крыніц за шмат кіламетраў накіроўвалася ў той ці іншы горад. У горадзе трубы заходзілі пад зямлю, а адтуль – у розныя вадаемы. У сучасным Рыме працягваюць падаваць ваду дзве старажытныя пабудовы гэтага тыпу. Рэшткі вялікіх водаправодаў захаваліся ў Стамбуле (Канстанцінопалі), на поўдні Францыі (каля горада Арля), у розных частках Малой Азіі, Афрыкі. У Рыме, а таксама ў многіх гарадах правінцый будаваліся цудоўныя будынкі грамадскіх купален (тэрмаў), у якіх былі басейны з цёплай і халоднай вадой, гімнастычныя залы, пакоі адпачынку. Асабліва раскошныя тэрмы былі пабудаваны ў Рыме пры імператары Каракале.[47]

## 5. Антычная спадчына на Беларусі

У беларускай гісторыі нельга вылучаць раннякласавую і антычную цывілізацыі. Але айчынная культура ўзбагачалася антычнай спадчынай. Прыблізна з XIV ст. элементы антычнай культуры (літаратуры, філасофіі, гісторыі, мастацтва) пачалі інтэнсіўна пранікаць у Беларусь з Заходняй Еўропы. На працягу XVI – XVII стст. з-за мяжы траплялі і асядалі ў прыватных, пераважна магнацкіх, царкоўных, манастырскіх, школьных, ордэнскіх бібліятэках кнігі антычных аўтараў. Па дадзеных старых вопісаў у бібліятэках Беларусі меліся сачыненні Гамера, Арыстоцеля, Платона, Герадота, Сафокла, Лукрэцыя, Цыцэрона, Сенекі, Ціта Лівія, Тацыта, Вергілія, Авідзія, Гарацыя, Ювенала, Лукіяна, Цэрэнцыя і інш.

У XV – XVII стст. на беларускіх і ўкраінскіх землях былі шырока распаўсюджаны сачыненні Псеўда-Діянісія Арэанагоцікі, якія прапагандавалі ідэі познеантычнага і хрысціянскага неаплатанізма. У эпоху Адраджэння на Беларусі кнігі антычных аўтараў перакладаліся, каменціраваліся і выдаваліся айчыннымі культурнымі дзеячамі і мысліцелямі пераважна на польскай мове.

---

[44] Дубянецкі Э.С. Сусветная акультура. – С. 106-107.
[45] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2 изд. Т. 21. – С. 412.
[46] Паўлава Л. В. Рымскае права // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. – Мн., 1988. – С. 522.
[47] История Древнего мира. Ч. 2. – С. 401-402.

З XV ст. на Беларусі распаўсюджваліся ідэі эпікурызма, а ў XVI – XVII стст. ужо існаваў зусім відавочны матэрыялістычна-атэістычны рух. Вялікую папулярнасць у рэнесанснай думцы Беларусі XVI – XVII стст. меў антычны эпікурэйска-стаічны прынцып следавання прыродзе, які з'яўляўся адной з крыніц фармавання канцэпцыі "натуральнай маралі" і "натуральнага права". Пад уплывам твораў антычных філосафаў у айчыннай думцы сфармаваліся ідэі дыялектыкі. Антычная культура, філасофія, паэзія, міфалогія аказалі значны ўплыў на творчасць грамадскіх дзеячоў, пісьменнікаў, паэтаў, мысліцеляў Беларусі эпохі позняга Рэнесанса і барока.[48]

Да антычнай гісторыі звярталіся ў палітычных мэтах кіруючыя колы ВКЛ (афіцыйная летапісная легенда пра "рымскае паходжанне" вялікіх князёў літоўскіх).

У канцы XVI – пачатку XIX ст., дзякуючы працы прафесароў Віленскага ўніверсітэта і Полацкай езуіцкай акадэміі, выдадзены творы антычных гісторыкаў на лацінскай і польскай мовах: Ціта Лівія (1827), Салюстыя (1830), Карнелія Непота (1808, Юлія Флора (1790), Еўтропія (1817), Курцыя Руфа (Нясвіж, 1763) і інш. Выдаваліся падручнікі і манаграфіі: "Кароткі выклад егіпецкай і карфагенскай гісторыі" (Гродна, 1776), "Слоўнік старажытнасці" (1813), "Кароткі выклад рымскай гісторыі" (1817), "Кароткі курс грэцкай гісторыі" (1819).

У XX ст. цэнтрам даследаванняў па антычнай гісторыі на Беларусі стала кафедра гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ.[49] Гэтая кафедра выконвае дадзеную функцыю і сёння.

Адным з аспектаў уздзеяння антычнай спадчыны на Беларусь з'яўляецца цікавасць да лацінскай мовы. "На Беларусь лацінская мова прынесена разам з хрысціянствам і развівалася тут у адпаведнасці з агульнаеўрапейскімі тэндэнцыямі. З X ст. яе вывучалі ў школах пры храмах і ў княжацкіх дварах, з XIII – XIV стст. яна стала неад'емным элементам культурнага жыцця. Да сярэдзіны XIX ст. на лацінскай мове вялося школьнае навучанне, пісаліся навуковыя трактаты і мастацкія творы, яна ўжывалася ў судовай справе і фінансавых дакументах. Латынь была састаўной часткай жыцця нацыянальнай эліты, без ведання якой нельга было лічыцца адукаваным чалавекам. На ёй вяліся дзённікі, асабістая перапіска, дыспуты і прыватныя гутаркі, быў створаны своеасаблівы элітарны фальклор (творы К. Жэры, студэнцкія канспекты, зборнікі розных гісторый). Была створана багатая літаратура высокай мастацкай вартасці".[50]

І, нарэшце, трэба адзначыць некаторы ўплыў рымскага права на айчынную прававую думку. Так, нормы рымскага права, якія рэгулююць сямейна-шлюбныя адносіны, адлюстраваны ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. (раздзелы 5, 8).

**Заключэнне.** Такім чынам, сусветная гісторыя ў прамежку паміж неалітычнай рэвалюцыяй і падзеннем Заходне-Рымскай імперыі ўмясціла неалітычную, раннякласавую і антычную цывілізацыі. Яны ўтварылі першы суперцыкл сусветных цывілізацый, у рамках якога ўзніклі рэальныя магчымасці для самарэалізацыі, самазацвярджэння людзей, пераўтварэння чалавецтва ў актыўны суб'ект гістарычнага працэсу, кардынальна змянілі і яго запатрабаванні, здольнасці, веды, звычкі, інтарэсы, адбыўся рэвалюцыйны прарыў у тэхналагічным і эканамічным спосабе вытворчасці, набыла канкрэтныя абрысы дзяржаўнасць, неад'емнымі элементамі сацыяльнай рэальнасці сталі ўрбанізацыя, сацыяльная стратыфікацыя, тыпізацыя чалавечай асобы, вонкавая жыццядзейнасць, упершыню атрымаў унутраную дынаміку працэс духоўнага ўзнаўлення.

---

[48] Античная литература и философия в Беларуси в 15–17 вв. // Франциск Скарина и его время. Энциклопедический справочник. – Мн., 1990. – С. 235-236.

[49] Антычная гісторыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. – Мн., 1993. Т. 1. – С. 136.

[50] Лацінская мова // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 4. – С. 342.

## *Лекцыя другая*

# ЕЎРОПА Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

1. Узнікненне сярэднявечнай цывілізацыі ў Еўропе.
2. Станаўленне феадалізму як грамадска-эканамічнай фармацыі. Асаблівасці фарміравання і развіцця феадальных адносін на беларускіх землях.
3. Палітычная структура і культура сярэднявечнага грамадства.

Гісторыю сярэднявечча[51] прынята падзяляць на наступныя этапы:

1) ранняе сярэднявечча (канец IV–XI стст.), калі актыўна фарміраваліся перадумовы сярэднявечнай цывілізацыі, ішоў працэс станаўлення феадалізму, складваліся асноўныя рысы новай сярэднявечнай цывілізацыі;

2) высокае сярэднявечча (XI – першая палова XIII стст.), калі сярэднявечная цывілізацыя дасягае свайго росквіту;

3) позняе сярэднявечча (другая палова XIII – пачатак XVI стст.), калі пачынаюць праяўляцца першыя прыкметы крызісу сярэднявечнай цывілізацыі.

## 1. Узнікненне сярэднявечнай цывілізацыі ў Еўропе

У перыяд з 476 г. (ад часу краху Заходняй Рымскай імперыі) і да канца VIII ст. у Еўропе актыўна фарміраваліся перадумовы новай сярэднявечнай цывілізацыі.

Ужо ў канцы IV ст. пачынаецца другое "Вялікае перасяленне народаў"[52] (этнічнае перамяшчэнне германскіх, сармацкіх, славянскіх і іншых "варварскіх" плямёнаў на тэрыторыю Рымскай імперыі), у выніку якога ўтвараюцца **"варварскія каралеўствы"** (карта 3).

У пачатку V ст. вестготы, якія жылі на тэрыторыі Балканскага паўвострава, рушылі на чале з каралём Аларыхам на Рым і, дасягнуўшы перамогі, атрымалі тэрыторыю паміж Пірэнеямі, Атлантычным акіянам і Гаронай з галоўным цэнтрам Толозай (сучасная Тулуза). Заснаванае ў 419 г. Тулузскае каралеўства вестготаў (яно існавала да 507 г.) было першай "варварскай" дзяржавай на тэрыторыі Заходняй Рымскай імперыі.

Другое "варварскае" каралеўства ў межах Заходняй Рымскай імперыі было заснавана германскім племенем вандалаў, якія жылі спачатку па берагам сярэдняга цячэння Одэра, а потым з баямі прайшлі праз Галію і Іспанію. Пераправіўшыся праз праліў (сучасны Гібралтарскі), вандалы заваявалі рымскую правінцыю Афрыку (439 г.). Каралеўства "вандалаў" (з цэнтрам у Карфагене) праіснавала да 534 г.

У сярэдзіне V ст. на тэрыторыі Заходняй Рымскай імперыі, спачатку ў Сабаўдзіі (сучасная Савойя), а потым у раёне рэк Верхняй Роны і Соны, утварылася трэцяе "варварскае" каралеўства – Бургундскае. Германскае племя франкаў заснавала Франкскае каралеўства ў Паўночна-Усходняй Галіі. Германскія плямёны англаў, саксаў і ютаў, якія жылі на Ютландскім паўвостраве, а таксама на захад і поўдзень ад вусця

---

[51] **Сярэднявечча** (лац. medium aevum) – назва эпохі паміж старажытнасцю (антычнасцю) і Адраджэннем. Уведзена ва ўжытак італьянскімі гуманістамі 15-16 стагоддзяў, якія імкнуліся супрацьпаставіць свой час папярэднім стагоддзям, што трактаваліся імі як перыяд заняпаду культуры. (Гл.: "Сярэднія вякі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 5. – С. 481").

[52] **Вялікае перасяленне народаў** – масавая міграцыя насельніцтва, якая пачалася яшчэ ў перыяд бронзавага веку (каля 3 тыс да н. э.). Пачатак ёй паклалі фіна-угорскія плямёны, якія рушылі ад узбярэжжа Паўночнага Ледавітага акіяну і з-за Уралу ва Ўсходнюю Еўропу, дасягнулі Балтыкі, засялілі Фінляндыю, не абмінулі тэрыторыю Беларусі. Яшчэ больш магутную хвалю першага Вялікага перасялення народаў склалі індаеўрапейцы, якія з тэрыторыі Малой Азіі рассяліліся на вялікіх абшарах ад Рэйна на захадзе да Волгі на ўсходзе і ад Прычарнамор'я на поўдні да Скандынавіі на поўначы. (Гл.: "Котов А.И. История Беларуси и мировая цивилизация. – Мн., 2004. – С. 25").

Эльбы, пачалі заваяванне Брытанскіх астравоў, населеных кельцкімі плямёнамі брытаў і, зламаўшы іх супраціўленне, стварылі там некалькі англа-саксонскіх каралеўстваў.

У старажытных германцаў ійшоў актыўны **працэс разлажэння першабытнаабшчыннага ладу**, што звязана з павышэннем прадукцыйнасці працы. Актыўнае выкарыстанне металічных прылад працы, удасканаленне сістэм земляробства і жывёлагадоўлі прывяло да разлажэння радавой абшчыны, пераўтварэння яе ў суседскую, тэрытарыяльную і стварыла ўмовы для фарміравання буйнога землеўладання. Унутры тэрытарыяльнай абшчыны – **маркі** – ішоў працэс маёмаснага расслаення, які значна ўзмацніўся з узнікненнем прыватнай уласнасці на зямельныя надзелы абшчыннай зямлі, атрымаўшыя назву **алода** (свабодна адчужаемай зямлі). Уладанне алодам было звязана з выкананнем канкрэтных абавязкаў перад дзяржавай, у першую чаргу з удзелам у паходах, будаўніцтвам умацаванняў, рамонтам мастоў.

Зямля апрацоўвалася ў асноўным свабоднымі сялянамі, але ў германцаў (у прыватнасці, у франкаў) былі і напаўсвабодныя людзі (літы) і рабы. Рабы працавалі ў асноўным ва ўладаннях знатных германцаў (старэйшын, правадыроў), якія атрымлівалі значна большыя зямельныя надзелы, чым простыя воіны. Рабоў германцы набывалі падчас няспынных паходаў супраць Рымскай імперыі і ў працэсе гандлю з тымі ж рымлянамі. Германскае грамадства рабілася ўсё больш неаднародным у маёмасным і сацыяльным сэнсе. Расла ўлада правадыра, павялічвалася роля дружыны, знатных асоб. Эканоміка набывала шматукладны характар, але з цягам часу феадальны ўклад стаў пераважаць.

Заняпад Рымскай імперыі вёў да значнага скарачэння гандлю, паступовага знікнення гарадской (поліснай) сістэмы і аграрызацыі эканомікі.

У сувязі з разлажэннем першабытнаабшчыннага ладу мяняецца і палітычная арганізацыя грамадства. Некалі выбіраемы на пасаду караля ваенны правадзіцель атрымлівае спадчынную ўладу, сімвал улады – карону, права на размеркаванне зямельнага фонду дзяржавы праз бенефіцыі, кантроль над падатковай сістэмай. Савет старэйшын пераўтвараецца ў савет знаці пры асобе караля. Характэрны элемент ладу ваеннай дэмакратыі – народны сход – распадаецца на дзве часткі: простыя воіны збіраюцца ў рамках дробных адміністрацыйных адзінак для вырашэння пытанняў мясцовага ўзроўню, а бенефіцыярыі склікаюцца каралём некалькі разоў у год на асобныя сходы. Мясцовая ўлада знаходзіцца ў руках каралеўскіх службовых асоб – графаў, маркграфаў, віконтаў. Але гэтыя службовыя асобы, а таксама буйныя землеўладальнікі выступалі канкурэнтамі караля ў справе кіравання краінай, і паступова палітычная ўлада пераразмяркоўваецца паміж каралём і альтэрнатыўнымі цэнтрамі палітычнага ўплыву.

Пануючаму класу спатрэбілася свая ідэалогія, і **такую ідэалогію (устойлівую сістэму ўяўленняў і каштоўнасцяў) яму дало хрысціянства**[53], якое сфарміравала рэлігійна-царкоўнае вучэнне, стаўшае асновай для выхавання людзей у духу "выратавання душы", "дасягнення царства божыя". Хрысціянская царква з часоў рымскага імператара Канстанціна I (306–337) з'яўлялася дзяржаўнай, і менавіта яна стала носьбітам новай ідэалогіі. Яшчэ ў часы існавання Заходняй Рымскай імперыі на чале царкоўных абласцей сталі епіскапы, якія мелі права суда і валодалі вялікай маёмасцю. Асаблівым уплывам карыстаўся епіскап Рыма, які, пачынаючы з IV ст., стаў называцца Папай Рымскім.

Паступова многія правінцыяльныя епіскапы ў Заходняй Рымскай імперыі сталі схіляцца да саюзу з "варварскімі" каралямі, імкнучыся ўнушыць ім уяўленне аб святасці і неабмежаванасці іх улады і даказаць сучаснікам непазбежнасць заняпаду Рымскай імперыі. Царкоўныя пісьменнікі IV ст. Аўгусцін і Азорый стварылі ўласную філасофію

[53] **Хрысціянства** – адна з трох сусветных рэлігій (нароўні з будызмам і ісламам), якая ўзнікла ва ўсходніх правінцыях Рымскай імперыі у сярэдзіне першага стагоддзя.

гісторыі, сцвярджаючы, што Рымская імперыя панесла заслужаную кару за свае злачынствы, "варварскія" ж каралі больш чыстыя і маральныя, чым рымляне, а таму перамагаюць іх. Так царква прыстасоўвалася да змяніўшыхся ўмоў і пераходзіла на службу да новага пануючага класа, які фарміраваўся ў феадальным грамадстве.

Такім чынам, **да IX ст.** ў ранейшай "варварскай" Еўропе **завяршаецца працэс складвання перадумоў сярэднявечнай цывілізацыі,** аб чым сведчаць змены ў тэхналагічным і эканамічным спосабе вытворчасці, сацыяльна-палітычных адносінах і ў грамадскай свядомасці.

Перыяд існавання сярэднявечнай цывілізацыі ў Еўропе ахоплівае IX – пачатак XVI ст. Да сярэдзіны XIII ст. сярэднявечная цывілізацыя дасягае свайго росквіту, а з сярэдзіны XIV ст. пачынаюць праяўляцца першыя прыкметы яе крызісу. Сярэднявечная цывілізацыя характэрызуецца наступнымі рысамі:

1) у эканоміцы – панаваннем феадальнага спосабу вытворчасці;
2) у палітычнай сферы – існаваннем феадальных манархій;
3) у духоўнай сферы – панаваннем сусветных рэлігій.

Да цывілізаванага развіцця далучаліся і славянскія плямёны, якія ўступалі ў кантакт з магутнай Візантыйскай імперыяй.[54] Перасяляючыся на Балканскі паўвостраў, славянскія плямёны стварылі тут шэраг сваіх дзяржаў (Балгарыю, Сербію, Харватыю) (карта 4). Эканамічны лад Візантыі, які яшчэ ў V–VI стст. можна было вызначыць як рабаўладальніцкі, паступова эвалюцыянізіраваў у бок феадалізму. Разам з гэтым ідзе феадалізацыя эканомікі і славянскіх дзяржаў.

Фарміраванне перадумоў сярэднявечнай цывілізацыі ў гэты ж перыяд (V–VIII стст.) здзяйсняецца і на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У выніку другога "Вялікага перасялення народаў" (IV–VI стст.) славяне рушылі са сваёй прарадзімы[55] і засялілі тэрыторыю Беларусі. Развіццё ў далейшым кантактаў з Візантыяй, спадкаёмніцай культуры антычнасці, дапамагло Беларусі і Расіі "пераскочыць" цывілізацыі 1-га суперцыкла і практычна адначасова з еўрапейскімі народамі, ад якіх яны адставалі ў развіцці на некалькі стагоддзяў, а можа і тысячагоддзяў, падыйсці да сярэднявечнай цывілізацыі. У V–VIII стст. у насельнікаў Беларусі, дзякуючы выкарыстанню жалезных прылад працы і пераходу да ворыўнай сістэмы земляробства, з'яўляецца лішак прадуктаў, што стымулюе наступныя працэсы:

1) звязаны з індывідуалізацыяй працэсу працы пераход ад сваяцкай абшчыны да суседскай, у межах якой з'яўляецца прыватная ўласнасць на зямлю і захоўваецца агульная абшчынная ўласнасць на ўгоддзі;
2) узнікненне элементаў патрыярхальнага рабаўладання;
3) аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі і рост гарадоў;
4) развіццё гандлю і ўзбагачэнне ў працэсе гандлёвых зносін родапле-мянной вярхушкі;
5) звязанае з частымі войнамі павышэнне ролі ваенных правадыроў плямён і фарміраванне ладу "ваеннай дэмакратыі".

Гэтыя сацыяльна-эканамічныя працэсы ствараюць перадумовы для ўзнікнення дзяржаўнасці ў форме племянных княжэнняў. Праўда, насельніцтва Беларусі захоўвае пакуль што адданасць політэістычнай язычніцкай рэлігіі. Хрысціянства нашы продкі прынялі значна пазней, толькі ў X ст.

---

[54] Візантыйская, альбо Усходняя Рымская, імперыя была утворана ў 395 г. ў выніку падзелу Рымскай імперыі на дзве часткі. У VI ст. Візантыя (сталіца Канстанцінопаль) уключала, акрамя Балканскага паўвострава і шматлікіх астравоў Эгейскага мора, Малую Азію, Сірыю, Палестыну, Егіпет, частку Месапатаміі, Закаўказзе і паўднёвае ўзбярэжжа Крыма.

[55] Славяне займалі тэрыторыю Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ад Эльбы і Одэра на захадзе, у басейне Віслы, у Верхнім Падняпроўі і да Сярэдняга Падняпроўя на ўсходзе. Частка славян (усходнія славяне) у VI–VII стст. пачала масавы рух на усход і , такім чынам, з'явілася на тэрыторыі Беларусі.

## 2. Станаўленне феадалізму як грамадска-эканамічнай фармацыі. Асаблівасці фарміравання і ўдасканалення феадальных адносін на беларускіх землях

Працэс станаўлення феадалізму ў Заходняй Еўропе, як лічаць даследчыкі, ішоў дзвюма шляхамі:

1) сінтэзным (у выніку сінтэзу протафеадальных элементаў познеантычнага і варварскага грамадстваў: узор – паўночна-французская мадэль феадалізму);

2) безсінтэзным (пры поўнай адсутнасці грэка-рымскага ўплыву на фарміраванне класавага грамадства: узор – Англія (за выключэннем паўднёвых раёнаў), Паўднёвая Шатландыя, часткова Германія).

Класічным узорам эвалюцыі феадальнага спосабу вытворчасці з'яўляецца Паўночная Галія, дзе ў 486 г. узнікла Франкскае каралеўства, якое займала большую частку кантынентальнай Заходняй Еўропы.

Буйная зямельная ўласнасць у франкаў фарміравалася дзвюма шляхамі:

– за кошт каралеўскіх зямельных падараванняў свецкай і духоўнай знаці;

– за кошт масавага разарэння сялян-аладзістаў, якія былі вымушаны аддавацца пад апекаванне буйных землеўладальнікаў, а тыя, у сваю чаргу, станавіліся іх сеньёрамі, што прыводзіла да асабістай залежнасці селяніна. Для селяніна існавала таксама магчымасць атрымання ад буйнога землеўладальніка надзела ў часовае карыстанне на пэўных умовах (прэкарый), што вяло да пазямельнай залежнасці. Што датычыцца сярэдняга слоя (аладзістаў), то ён размываўся: частка з іх пераходзіла ў разрад бенефіцыярыяў, а частка трапляла ў пазямельную ці асабістую залежнасць ад магнатаў альбо царквы.

Важную ролю ў станаўленні феадалізму адыграла дзяржава. Каралі здзяйснялі шырокую раздачу зямель сваім прыбліжаным. Кіраўнік франкскага каралеўства Карл Мартэл (715 – 741) правёў **бенефіцыяльную рэформу**, у працэсе якой перадаваў воінам-рыцарам на ўмовах нясення ваеннай службы зямельныя надзелы. На працягу IX – X стст. бенефіцый[56] стаў пераўтварацца з пажыццёвага **ўмоўнага** ў спадчыннае **безумоўнае** землеўладанне (феод альбо лен).

Гэтая рэформа ўмацавала слой дробных і сярэдніх феадалаў, якія сталі асновай ваеннай арганізацыі,[57] і павялічыла сялянскую залежнасць, таму што зямля давалася разам з сялянамі. Адначасова рэформа садзейнічала фарміраванню феадальнай іерархіі, атрымаўшай назву сістэмы сюзэрэнітэта-васалітэта.[58] Яе сутнасць заключалася ў тым, што кожны феадал залежыў ад больш буйнога феадала, у адносінах да якога ён з'яўляўся васалам. Старэйшы феадал, у сваю чаргу, мог залежыць ад больш буйнога сеньёра і г. д. Такі ланцужок адносін асабістай залежнасці адных феадалаў ад другіх даходзіў да самога караля, які і ўзначальваў гэтую феадальную лесвіцу. Гэтая сістэма арганізацыі пануючага класа павінна была ахоўваць ва ўмовах слабасці цэнтральнай улады манапольную ўласнасць феадалаў на зямлю і здзяйсняць пазаэканамічны прымус у адносінах да залежнага сялянства.

Феадальная эканоміка характэрызуецца наступнымі рысымі:

1) панаваннем буйной зямельнай уласнасці, якая знаходзілася ў руках класа феадалаў;

---

[56] **Бенефіцый** – (лац. beneficium) – дабрадзейства.

[57] Дарэчы, менавіта неабходнасць стварэння замест пешага народнага апалчэння цяжкаўзброеных конных атрадаў – рыцарскай конніцы – і выклікала патрэбу правядзення бенефіцыяльнай рэформы. Рыцарства даказала сваю баяздольнасць у барацьбе з арабамі і паклала пачатак фарміраванню асобнага саслоўя – дваранства.

[58] **Васал** (фр. vassal) – у сярэднявеччы, галоўным чынам у Заходняй Еўропе, – феадал, які атрымаў зямлю ад другога больш буйнога феадала, за што быў абавязаны яму ваеннай службай і іншымі павіннасцямі.

**Сюзэрэн** (фр. suzerain) – ў Заходняй Еўропе ў эпоху феадалізма буйны феадал (кароль, князь, граф і г.д.), які з'яўляўся гаспадаром у дачыненні да залежных ад яго васалаў.

2) спалучэннем яе з дробнай індывідуальнай гаспадаркай непасрэдных вытворцаў – сялян, якія часта захоўвалі ў індывідуальнай уласнасці асноўныя сродкі вытворчасці, жывёлу і сядзібу;

3) своеасаблівым статусам сялян, якія не з'яўляліся землеўладальнікамі, а толькі карысталіся зямлёй на розных умовах аж да права спадчыннага землекарыстання;

4) рознымі формамі і ступенямі пазаэканамічнага прымусу сялян: асабістая і пазямельная залежнасць, судовае падпарадкаванне ўладзе феадала, саслоўнае непаўнапраўе сялян;

5) перавагай аграрнага сектара над гандлёвым і прамысловым;

6) нізкім руцінным станам тэхнікі і ведаў.

Аснову заходнееўрапейскай эканомікі ў перыяд Высокага Сярэднявечча (XI – першая палова XIII стст.) па-ранейшаму складала сельская гаспадарка, якая развівалася па экстэнсіўнаму шляху – праз пашырэнне плошчаў апрацоўваемых зямель.

Асноўнай **гаспадарчай адзінкай у аграрным сектары стала вотчына** (сеньорыя – у Францыі, ці манор – у Англіі), у якой панская запашка (дамэн) займала большую частку ўладання, меншая адводзілася пад сялянскія надзелы, за карыстанне якімі сяляне павіны былі выконваць павіннасці. Эканамічнай формай рэалізацыі ўласнасці феадала на зямлю і сродкам пазаэканамічнага прымусу стала феадальная рэнта. **Феадальная рэнта – гэта частка дадатковага прадукту залежных сялян, якая прысвойваецца землеўладальнікам**. Вядома **тры формы феадальнай рэнты:** адпрацовачная (паншчына), прадуктовая (натуральны аброк), грашовая (грашовы аброк). У перыяд станаўлення феадалізма пераважала адпрацовачная рэнта ў спалучэнні з прадуктовай. У XI–XV стст. у сувязі з ростам гарадоў, распаўсюджваннем таварна-грашовых адносін набывае значэнне грашовая рэнта. Перавод сялянскіх павіннастяў у пераважна грашовую форму (часткова і ў форму натуральнага аброка) атрымаў вызначэнне **камутацыі рэнты.** Вялікую ролю ў гэтым працэсе адыгралі крыжовыя паходы XI–XIII стст., падчас якіх рыцары, выпраўляючыся ў далёкія краіны, скарачалі сваю гаспадарку і перадавалі панскую зямлю ў карыстанне сялян. Асобныя сяляне выкарысталі гэтую акалічнасць для таго, каб цалкам вызваліцца ад феадальнай залежнасці, заплаціўшы грашовы аброк за некалькі гадоў наперад.

Вотчынная гаспадарка арыентавалася ў асноўным на ўласныя патрэбы і ўласныя рэсурсы, што вяло да замацавання арыентацыі на эканамічную самадастатковасць. Вотчына з'яўлялася адасобленай эканамічнай адзінкай, амаль не звязанай з суседнімі гаспадаркамі, з горадам, чым і тлумачыцца агульны натуральны характар гаспадаркі ў эпоху феадалізму.

З XI ст. значную ролю пачынае адыгрываць гарадскі сектар эканомікі. Утварэнне сярэднявечных гарадоў было звязана з ростам прадукцыйных сіл, аддзяленнем рамяства ад сельскай гаспадаркі, развіццём таварнай вытворчасці і абмена.[59]

Імкненне гарадоў да вызвалення з-пад улады феадала, на зямлі якога знаходзіўся горад,[60] прывяло да так званых **камунальных рэвалюцый** (барацьбе паміж гарадамі і сеньорамі). У выніку камунальнага руху гарады дабіваліся не толькі скарачэння пабораў і гандлёвых прывілегій, але і, у шэрагу выпадкаў, гарадскога самакіравання. Гарады-камуны (Марсэль, Тулуза, Брюгге, Ипр і інш.) мелі выбарных саветнікаў, мэраў (бургамістраў), сваё гарадское

---

[59] Гарады, існаваўшыя да XI ст., у сваёй большасці былі спадчынай рымскай эпохі. Яны не з'яўляліся цэнтрамі рамеснай вытворчасці, а былі часцей за ўсё рэзідэнцыямі феадалаў.

[60] Новыя гарады ўтвараліся звычайна вакол замкаў феадалаў (адсюль канчатак назвы многіх гарадоў на "бург"), альбо манастыроў (назвы такіх гарадоў звычайна пачынаюцца словамі "санкт", "сан", "сен" – "святы").

права, суд, фінансы, права самаабкладання і раскладкі падаткаў, права абвяшчэння вайны і г. д. Асобныя гарады Італіі (Генуя, Венецыя, Фларэнцыя) навогул сталі гарадамі-дзяржавамі, а вось большасць гарадоў Францыі (Парыж, Арлеан, Нант і інш.), атрымаўшы шэраг прывілегій, так і не набылі права на самакіраванне, выбарныя ўстановы ў іх знаходзіліся пад кантролем каралеўскіх чыноўнікаў.

Камунальныя рэвалюцыі мелі важныя наступствы:

1) садзейнічалі ўтварэнню саюза гарадоў з каралеўскай уладай, што ў далейшым адыграла сваю ролю ў барацьбе з феадальнай анархіяй і ўмацаванні ўлады караля;

2) паскорылі працэс утварэння рамесных цэхаў.

**Цэхі (гільдыі, брацтвы) – уяўляўшыя сабою аб'яднанні асоб канкрэтных прафесій** у межах горада, павінны былі абараняць інтарэсы членаў цэха ад канкурэнцыі з боку нечленаў цэха (партачоў), феадалаў, сельскіх рамеснікаў і г. д. Але галоўнае прызначэнне цэха заключалася ў рэгламентацыі вытворчасці (абмежаванні колькасці прадукцыі, цэн на яе і на сыравіну і г. д.) з тым, каб захаваць дробны характар вытворчасці. Рамесная вытворчасць павінна была забяспечыць рамесніку толькі сродкі для існавання, але не даць яму магчымасці стаць буйным прадпрымальнікам. Ва ўмовах неразвітых таварна-грашовых адносін, калі рамеснікі павінны былі арыентавацца толькі на пакупніцкія здольнасці насельніцтва свайго горада і навакольных вёсак, такая рэгламентацыя была мэтазгоднай. Але з канца XIV ст., па меры пашырэння ўнутранага і знешняга рынку, цэхі сталі перашкодай на шляху далейшага развіцця прадукцыйных сіл.

На этапе ранняга сярэднявечча, ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі, гандаль выяўляўся, галоўным чынам, у продажу лішкаў прадуктаў феадальнымі вотчынамі, альбо сялянамі з таго, што ў іх заставалася пасля задавальнення ўласных запатрабаванняў. Міжнародны гандаль быў развіты слаба. Самым галоўным напрамкам міжнароднага гандлю доўгі час быў **Левантыйскі**.[61] Дзякуючы яго развіццю, з XIII ст. пачаўся працэс узвышэння паўночна-італьянскіх гарадоў – Генуі і Венецыі, дзе досыць рана ўзнікаюць банкі і фарміруюцца перадумовы для стварэння мануфактур.

Пасля крыжовых паходаў і каланізацыі нямецкімі рыцарамі польскіх, латышскіх і эстонскіх зямель, ствараюцца перадумовы для ўзнікнення новага напрамку міжнароднага гандлю – **Ганзейскага**: па Балтыйскаму і Паўночнаму марам. Тут ствараецца **Ганзейскі саюз**,[62] дзякуючы чаму ў гандлёвыя сувязі з Еўропай уключаюцца польскія, беларускія, рускія землі. З гэтага часу актывізуецца гандаль паміж Італіяй і Фландрыяй,[63] на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў праводзяцца традыцыйныя ярмаркі (напрыклад, ярмарка ў графстве Шампань).

Міжнародны гандаль спрыяў эканамічнаму збліжэнню еўрапейскіх дзяржаў і паступова ствараў перадумовы міжнароднага падзелу працы, пераадольвання цэхавых абмежаванняў, развіцця вытворчасці.

---

[61] У XIII ст. **Левантыйскі** (Levant – усход) **гандаль** – пасрэдніцкі гандаль з Усходнім Міжземнамор'ем. На працягу стагоддзяў цэнтрам Левантыйскага гандлю з'яўляўся Канстанцінопаль. Пасля таго, як у 1204 г. ён быў разрабаваны крыжакамі, першанство перайшло да Генуі і Венецыі. Значэнне Левантыйскага гандлю для краін Заходняй Еўропы вызначалі, перш за ўсё, вострыя прыправы, шоўкавыя тканіны, каштоўныя камяні. Еўрапейскія рамесныя вырабы не карысталіся попытам на Усходзе: Еўропа разлічвалася пераважна золатам і серабром.

[62] **Ганза** – (Hansa – ням. саюз, таварыства) – гандлёвы саюз купецтва паўночна-еўрапейскіх гарадоў з цэнтрам ў Любеке, які здзяйсняў сваю дзейнасць у басейне Паўночнага і Балтыйскага мораў. У саюз увайшлі анямечаныя гарады Шчэцын, Гданьск, Рыга, Рэвель, як пастаўшчыкі збожжа. У абарот ганзейскага гандлю паступалі воўна з Англіі; рыба, лес, жалеза – са Швецыі; збожжа і бурштын – з Балтыкі; пушніна, мёд і воск – з рускай Поўначы.

[63] **Фландрыя** – адна з буйнейшых правінцый Нідэрландаў (галоўныя гарады – Брюгге, Гент, Іпр), якая ўжо з XIII ст. з'яўлялася цэнтрам развітага цэхавога рамяства і вяла шырокі, па маштабам таго часу, гандаль. Гарады Фландрыі ўвайшлі ў Ганзейскі саюз і спецыялізаваліся на вытворчасці сукна, якое выраблялася з англійскай воўны.

**Працэс фармавання і развіцця феадальных адносін на беларускіх землях меў пэўныя асаблівасці:**

Як ужо згадвалася раней, на беларускіх землях у V–VIII стст. ідуць працэсы разлажэння першабытнаабшчыннага ладу, фарміруецца шматукладная эканоміка. Па меры фарміравання дзяржаўнасці (утварэння Полацкага, Тураўскага і інш. княстваў) феадальны ўклад становіцца дамінуючым:

- ідзе працэс росту колькасці буйных феадалаў і плошчаў іх уладанняў;
- узмацняецца феадальная залежнасць сялян.

Крыніцамі фармавання буйнога землеўладання былі:

- захоп свабодных зямель;
- захоп абшчынных зямель шляхам прамога насілля.

Буйнейшымі землеўладальнікамі становяцца мясцовыя князі, прадстаўнікі родаплемяннай вярхушкі, вышэйшыя чыны княжацкага двара. Асноўнай формай феадальнага землеўладання выступае вотчына, якая знаходзіцца ў поўнай уласнасці феадала. У адрозненне ад Заходняй Еўропы феадальнае землеўладанне на беларускіх землях адразу набывае форму **безумоўнага** спадчыннага землеўладання.

Адначасова з ростам феадальнага землеўладання з асяроддзя вольных сялян-абшчыннікаў выдзяляюцца катэгорыі залежных сялян: радовічаў, закупаў, удачаў і халопаў.[64]

Далейшы працэс фармавання і ўдасканалення феадальных адносін працягваецца на беларускіх землях у наступны перыяд XIII–XVI стст.:

1) ідзе рост феадальнага землеўладання. Прычым, побач са спадчыннымі ўладальнікамі зямлі (**магнатамі, панамі**) з'яўляецца новая катэгорыя землеўладальнікаў – **баяры-шляхта**, якія атрымлівалі зямлю ад вялікага князя за службу на розных умовах. Буйныя зямельныя ўладанні канцэнтруюцца ў руках царквы;
2) вялікакняскія падараванні зямлі вядуць да росту колькасці залежнага сялянства. Перадача ў прыватную ўласнасць феадалаў зямель у **валасцях**[65] пераўтварае сялян з землеўладальнікаў у землекарыстальнікаў. За карыстанне зямельнымі надзеламі сяляне былі абавязаны выконваць шматлікія павіннасці. У XV–XVI стст. асноўнай формай феадальнай рэнты становіцца паншчына (адпрацовачная рэнта). Выплату феадальнай рэнты арганізоўвала абшчына (**грамада**), якая выконвала і шэраг іншых функцый па арганізацыі сялянскага жыцця. Па ступені феадальнай залежнасці сяляне на працягу доўгага часу падзяляліся на чэлядзь нявольную, непахожых і пахожых людзей. Пахожыя сяляне маглі пераходзіць ад аднаго феадала да другога, непахожыя – гэта права страцілі, яны павінны былі жыць на адным месцы і выконваць павіннасці па спадчыне. Чэлядзь нявольная знаходзілася ў поўнай уласнасці феадала.[66]

Аграрная рэформа 1557 г.[67] прывяла да замацавання сялян за зямлёй, пераўтварыла розныя іх катэгорыі ў адзін клас-саслоўе – прыгоннае сялянства. Гэта знайшло адлюстраванне і ў заканадаўстве.[68] У цэлым, у канцы XVI – першай палове XVII ст. у Вялікім княстве Літоўскім фактычна і юрыдычна аформілася прыгоннае права.

---

[64] Гл. падрабязней: "Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад рэд. В. І. Галубовіча. – Мн., 1996. – С. 72-76".

[65] **Воласць** – адна з двух катэгорый дзяржаўных зямель (гаспадарскія двары і воласці). Вялікі князь лічыўся вярхоўным уласнікам усіх зямель ВКЛ. Але калі гаспадарскія двары належалі непасрэдна князю, то зямля ў валасцях была ў асабістым карыстанні сялян, ці належала абшчыне.

[66] Гл. падрабязней: "Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 84-86".

[67] Гл. падрабязней: "Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 89-93"

[68] Там жа. – С. 93-94.

Як і ў Заходняй Еўропе аснову эканомікі беларускіх зямель складаў аграрны сектар. Але разам з сельскай гаспадаркай у Вялікім княстве Літоўскім у XIII–XVI стст. адбываецца бурнае развіццё рамеснай вытворчасці. Цэнтрамі рамяства з'яўляюцца гарады, якія, імкнучыся пазбавіцца ад феадальнай залежнасці, змагаюцца за Магдэбургскае права.[69] Для абароны сваіх інтарэсаў рамеснікі, па прыкладу Заходняй Еўропы, аб'ядноўваюцца ў цэхі, а купцы ствараюць свае аб'яднанні – брацтвы ці гільдыі.

### 3. Палітычная структура і культура сярэднявечнага грамадства

Сярэднявечча – гэта час існавання **феадальнай дзяржавы**, якая ўяўляла сабою арганізацыю класа феадальных уласнікаў, створаную ў інтарэсах эксплуатацыі і падаўлення прававога становішча сялян. У адных краінах свету яна ўзнікла ў якасці непасрэднага пераемніка рабаўладальніцкай дзяржавы (напрыклад, Візантыя, Індыя, Кітай), а ў іншых утваралася, як непасрэдны вынік узнікнення і зацвярджэння прыватнай уласнасці, з'яўлення класаў, мінуючы рабаўладальніцкую фармацыю (як, напрыклад, у германскіх і славянскіх плямёнаў).

У перыяд існавання сярэнявечнай цывілізацыі тыповай формай дзяржавы з'яўлялася **манархія.**[70] Феадальная рэспубліка была характэрна для параўнаўча нямногіх сярэднявечных гарадоў Паўночнай Італіі, Германіі, Расіі (баярская рэспубліка ў Ноўгарадзе). За час свайго існавання феадальная дзяржава прайшла ў сваім развіцці шэраг этапаў.[71]

**1. Раннефеадальная манархія (V – IX стст.) –** характэрна для перыяду станаўлення феадальнай уласнасці, калі фарміруючыйся клас феадалаў групуецца вакол караля. У Заходняй Еўропе ўлада каралёў у манархіях германскіх плямёнаў (каралеўствах, герцагствах, графствах) была нетрывалай. Толькі асобныя з іх здолелі, як, напрыклад, кіраўнік франкскай дзяржавы Карл Мартэл, абапіраючыся на сярэднія і дробныя ваенаслужачыя элементы, усталяваць нейкую цэнтралізацыю дзяржавы. Дарэчы, К. Мартэл нават не меў каралеўскага тытулу, а насіў толькі тытул майордома – герцага. Прызнанне Папай Рымскім яго пераемніка Піпіна Кароткага у 754 г. каралём франкаў, які стаў лічыцца выбраным богам і сваім народам, стала важным крокам да ўмацавання каралеўскай улады. Сын Піпіна Кароткага Карл, празваны Вялікім (768-814) здолеў стварыць імперыю – самую буйную дзяржаву сярэдніх вякоў – Франкскае каралеўства (карта 7).[72] Але і Карл Вялікі не быў сапраўдным гаспадаром у сваёй краіне. Негледзячы на сваю ваенную моц  і славу буйнейшага заваёўніка, ён знаходзіўся ў залежнасці ад федальнай знаці. Далейшы працэс феадалізацыі вёў да росту буйнога землеўладання, а значыць, да павышэння ўплыву буйных землеўладальнікаў.

На ўсходнеславянскіх землях таксама фарміруецца дзяржаўнасць у форме гарадоў-княстваў. Найбуйнейшымі цэнтрамі дзяржаўнасці становяцца Кіеў, Ноўгарад і Полацк. Улада кіраўнікоў дзяржаў (князёў) носіць выканаўчы характар і абмяжоўваецца вечам (заканадаўчым органам улады). У канцы IX ст. (каля 862 г.) запрашэннем на княжэнне ў Ноўгарад нарманаў (так мясцовыя жыхары называлі насельнікаў Скандынавіі) быў пакладзены пачатак узнікненню дынастыі Рурыкавічаў. Каля 882 г. пераемнік Рурыка Алег здзясняе паход на Кіеў, падпарадкоўвае яго сваёй уладзе і тым самым кладзе пачатак фарміраванню Старажытнарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве.

---

[69] **Магдэбургскае права** – феадальнае гарадское права, якое ўзнікла ў 13 ст. у г. Магдэбург і дзейнічала у гарадах Усходняй Германіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. (Гл.: "Магдэбургскае права // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 5. – С. 5").

[70] **Манархія** (грэч. Monarcha – адзінаўладдзе) форма кіравання, пры якой вярхоўная ўлада належыць персаніфікаванай асобе (манарху), спадчыннаму кіраўніку дзяржавы.

[71] Перыядызацыя дадзена па кн.: "История государства и права зарубежных стран / Под ред С. К. Лазарева. – М., 2000. – С. 6-7".

[72] Межы дзяржавы ішлі ад р. Эбро, Пірэнееў і Атлантычнага акіяна на захадзе да Эльбы, Сярэдняга Дуная і ўзбярэжжа Адрыятычнага мора на ўсходзе, ад Фрызскага (ці Нямецкага) і Балтыйскага мораў на поўначы і да Паўднёвай Італіі на поўдні. (Гл.: "В.Ф. Семёнов. История средних веков. – М., 1975. – С. 44-48").

**2. Васальна-сеньёрыальная манархія (X – XIII стст.)** – у гэты час назіраецца росквіт феадальнага спосабу вытворчасці і панаванне натуральнай гаспадаркі, што выклікала ўзнікненне феадальнай раздробленасці і арганізацыю дзяржаўнай улады на аснове васальных сувязей. Феадальная раздробленасць паўстае як заканамерны этап у развіцці феадалізма. Рост буйной зямельнай уласнасці ва ўмовах, калі палітычная ўлада была цесна звязана з зямельнай уласнасцю і нават абумоўлена ею, вёў да раздробленасці палітычнай улады. Буйны федальны маёнтак з'яўляўся не толькі адасобленай эканамічнай адзінкай, але і амаль незалежнай палітычнай адзінкай.

Большая частка сучасных еўрапейскіх дзяржаў утварылася менавіта ў гэты перыяд. Узнікшыя ў Еўропе пасля распаду імперыі Карла Вялікага[73] новыя дзяржавы (Францыя, Германія, Італія) не былі палітычна цэнтралізаванымі дзяржавамі (карта 8). Улада каралёў, большай часткаю выбарных, была, можна сказаць, намінальнай. Кароль лічыўся толькі "першым сярод роўных".

Завяршыўся працэс фарміравання асноўных класаў федальнага грамадства: феадалаў і залежных сялян. Склаліся саслоўныя структуры, галоўнай прыкметай якіх была прыналежнасць кожнага члена грамадства да пэўнага саслоўя. Кожнае саслоўе павінна было займацца сваёю справаю, і ў гэтым сярэднявечны чалавек бачыў гармонію і сэнс жыцця. Феадал-рыцар абараняў краіну і свае ўладанні, святары маліліся за ўсіх. Сяляне працавалі на існаванне сваё і іншых саслоўяў. Трошкі выбіваліся з гэтай карціны светабудовы гарады з іх гандлем, рамёствамі і імкненнем пазбавіцца ад апекі феадалаў. Але і ў гарадах склаўся свой падзел насельніцтва па карпарацыям.

На землях усходних славян у перыяд кіравання князя Уладзіміра (980–1015) завяршаецца працэс утварэння Старажытнарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве, якая, дарэчы, таксама не была жорстка цэнтралізаванай дзяржавай, а з'яўлялася "шматковай імперыяй". Прымусова аб'яднаныя рукою кіеўскага князя асобныя княствы вялі амаль пастаянную барацьбу за сваю незалежнасць з цэнтральнай уладай. Так, Полацкае княства, страціўшы самастойнасць у 980 г., ужо пры Ўсяславе Чарадзее (1044–1101) становіцца цалкам незалежным. А ў 1132 г. Кіеўская Русь навогул распадаецца на асобныя ўдзельныя княствы. Палітычныя і эканамічныя прычыны феадальнай раздробленасці ўсходнеславянскіх зямель былі тыя ж, што і заходнееўрапейскіх. Але ў тым, што разробленасць набыла больш працяглы, можна сказаць, разбуральны характар, значную ролю адыграў фактар знешнепалітычны: у выніку пахода хана Батыя на Русь усходнеславянскія землі (тэрыторыя сучаснай Расіі і Украіны) апынуліся пад уладаю мангола-татараў і на працягу 240 гадоў выпрабоўвалі на сабе мангола-татарскае іга. Улада татарскіх ханаў запаволіла эканамічнае развіццё славянскіх зямель і перашкаджала іх палітычнай кансалідацыі. І той жа знешнепалітычны фактар, які ў дачыненні да рускіх і украінскіх зямель адыграў дэцэнтралізуючую ролю, стаў галоўным стымулам да ўтварэння новай дзяржавы на беларускіх землях: перад пагрозай нападаў рыцараў-крыжакоў і мангола-татарскага нашэсця княствы Верхняга Панямоння (Навагрудскае, Ваўкавыскае, Гарадзенскае і Слонімскае) у першай палове XIII ст. на добрахвотнай аснове аб'ядноўваюцца ў Вялікае княства Літоўскае.

---

[73] Па Вэрдэнскаму дагавору 843 г. ўнукі Карла Вялікага падзялілі імперыю на тры часткі: Заходне-Франкскае каралеўства, якое ўключыла у сябе ў асноўным землі будучай Францыі, Усходне-Франкскае каралеўства, якое размясцілася на тэрыторыі сучаснай Германіі, і каралеўства Лотара, якое ўключала Італію і доўгую паласу зямель на поўнач ад яе. У Германіі ў 919 г. на прастол уступіла Саксонская дынастыя, у Францыі – нацыянальная дынастыя Капецінгаў у асобе парыжскага графа Гуга Капета зацвердзілася на прастоле у 987 г. Каралеўства Лотара не мела нацыянальнай асновы і распалася, прычым тэрыторыі за межамі Італіі падзялілі паміж сабою Германія і Францыя, а адзінства самой Італіі засталося чыста фармальным. (Гл.: "В. Ф. Семёнов. История средних веков. – С. 44-48").

**3. Саслоўна-прадстаўнічая манархія (XIV-XV стст.)** – для гэтага перыяду характэрны працэс цэнтралізацыі дзяржавы і ўзмацнення каралеўскай улады. Рост аўтарытэту каралеўскай улады ў Заходняй Еўропе пачаўся ячшэ ў працэсе крыжовых паходаў, калі самыя ваяўнічыя рыцары пакідалі межы еўрапейскіх краін, спыняліся міжусобныя войны, а каралі ўмела выкарыстоўвалі гэтыя акалічнасці. Далейшы працэс палітычнай цэнтралізацыі стымулюецца развіццём гарадоў і таварна-грашовай гаспадаркі. Развіццё таварна-грашовай гаспадаркі выклікала змену форм феадальнай эксплуатацыі, паслабляла феадальную залежнасць сялян, стымулявала рост свабоднага гарадскога насельніцтва. Дзякуючы гэтаму каралеўская ўлада атрымлівала новую сацыяльную базу для барацьбы з феадальнай анархіяй. Фінансавыя сродкі багатых гараджан далі магчымасць каралям перайсці да выкарыстання наёмных армій і тым паслабілі іх залежнасць ад феадальнага рыцарскага войска (тым больш, что ў XIV ст. стала выкарыстоўвацца агнястрэльная зброя, што паменшыла значэнне рыцарскай конніцы). Такім чынам, каралеўская ўлада ў Францыі, Англіі і іншых заходніх дзяржавах у барацьбе з арыстакратыяй абапіралася на дваранства і вольныя гарады. Прывілеяваныя саслоўі ў гэтых дзяржавах у мэтах абароны сваіх інтарэсаў дабіваліся права стварэння прадстаўнічых органаў улады. У **1265 г. ў Англіі быў створаны першы ў гісторыі парламент**, у якім засядала па 2 рыцара ад кожнага графства і па 2 прадстаўніка ад горада. У Францыі Генеральныя штаты (агульны сход саслоўяў) пачалі склікацца з 1302 г. У Германіі ў якасці прадстаўнічага органа ўлады ствараецца Рэйхстаг, у Іспаніі – Картэсы.

**Вялікае княства Літоўскае** ў час свайго фарміравання і актыўнага тэрытарыяльнага росту (**XIV – першая палова XV ст.**) было **неабмежаванай манархіяй.** У працэсе свайго далейшага развіцця яно ўспрымала традыцыі заходнееўрапейскай цывілізацыі, дзе дзяржава з'яўлялася зброяй эканамічна пануючых класаў. У выніку перадачы значнай часткі дзяржаўных зямель у рукі феадалаў, расла не толькі эканамічная моц, але і палітычны ўплыў шляхецкага саслоўя. У часы княжэння Аляксандра Казіміравіча (1492–1506) улада вялікага князя абмяжоўваецца **радай** (ад слова раіцца) – спачатку толькі дарадчым, а потым заканадаўчым і распарадчым органам дзяржаўнай улады ВКЛ. У канцы XV ст. канчаткова афармляецца другі вышэйшы орган дзяржаўнага кіравання ў ВКЛ – **вальны (агульны) сойм**, на пасяджэннях якога, акрамя паноў-радных і службовых асоб, маглі прысутнічаць усе феадалы ВКЛ, а пазней – па два дэпутаты ад кожнага павета. Па прывілею 1506 г. вялікі князь быў пазбаўлены права аднаасобна выдаваць законы. Статут ВКЛ 1588 г. яшчэ больш абмежаваў правы вялікага князя, захаваўшы за ім толькі права заканадаўчай ініцыятывы, і зацвердзіў прынцып падзелу ўлады: заканадаўчая ўлада замацоўвалася за соймам, выканаўчая – за вялікім князем і радай, а судовая – за Галоўным Літоўскім Трыбуналам.[74] У канцы XVI ст. завяршаецца працэс фарміравання асноўных саслоўяў феадальнага грамадства. Паны і шляхта былі пароўнены ў правах, усё феадальнае саслоўе стала называцца шляхтай, былі юрыдычна замацаваны асобныя саслоўныя прывілеі і абавязкі шляхты.

Такім чынам, **у канцы XV – пачатку XVI ст. ВКЛ трансфармуецца ў саслоўна-прадстаўнічую манархію**, дзе існуе, хоць і абмежаваная, але усё ж-такі "дваранская дэмакратыя".

**4. Абсалютная манархія (XVI – XVII стст.)** – гэты перыяд характарызуецца засяроджваннем усёй паўнаты дзяржаўнай улады, у тым ліку заканадаўчых, судовых і фіскальных функцый, у руках караля, утварэннем вялікай прафесійнай арміі і бюракратычнага ўрадніцкага апарату, што забяспечвала яму прамое кіраванне і кантроль за краінаю. У Англіі ўжо з XV ст. пачынае зніжацца роля парламента, саслоўна-прадстаўнічая

---

[74] Юхо І.А. Крыніцы беларуска-літоўскага права. – Мн., 1991. – С. 89-90.

манархія ў Францыі і Іспаніі ў пачатку XVI ст. цалкам трансфармуецца ў абсалютную. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, ВКЛ па-ранейшаму застаецца краінай "дваранскай дэмакратыі", а пасля утварэння ў 1569 г. Рэчы Паспалітай ідзе працэс далейшага павелічэння правоў шляхецкага салоўя і памяншэнне паўнамоцтваў цэнтральнай улады.

Што датычыцца **духоўнай сферы жыцця сярэднявечнага грамадства**, то яна цалкам знаходзілася пад кантролем царквы. У сярэднявеччы адбываецца станаўленне **еўрапейскай хрысціянскай цывілізацыі**[75], якая фармавалася на тэрыторыі былой Рымскай імперыі. Негледзячы на супярэчнасці паміж усходняй і заходняй царквамі (у 1054 г. адбыўся раскол хрысціянскай царквы на ўсходняе і заходняе хрысціянства – **праваслаўе і каталіцызм**), хрысціянства заставалася духоўнай асновай гэтай цывілізацыі, фармавала адзіны духоўны светапогляд, нормы маралі і паводзін. Рэлігія ў феадальным грамадстве станавілася адным з магутных сродкаў зацвярджэння і захавання класавага панавання эксплуататараў. Абяцаючы нябесную асалоду ва ўзнагароду за зямныя пакуты, царква ўсялякімі шляхамі адцягвала ўвагу народных мас ад барацьбы з феадаламі, апраўдваючы феадальную эксплуатацыю і настойліва спрабуючы выхаваць працоўных у духу поўнай пакорнасці.

Духавенства ў сярэднявеччы з'яўлялася носьбітам феадальнай культуры, яно было адзіным адукаваным саслоўем. Шырокай адукацыі ў VI –X стст. навогул не існавала. Усе школы знаходзіліся пад кантролем духавенства. Царква вызначала праграму навучання, акцэнтуючы ўвагу на вывучэнні асноў хрысціянскага веравучэння і латыні. Праўда, у імперыі Карла Вялікага быў перыяд адноснага ўздыму культурнага развіцця (так званае "каралінгскае адраджэнне"). Досыць адукаваны для свайго часу імператар (ён ведаў лацінскую і грэчаскую мовы) запрасіў да свайго двара многіх замежных навукоўцаў, наладзіў перапісванне лацінскіх і грэчаскіх рукапісаў (такім чынам для нашчадкаў былі захаваны творы антычных аўтараў). Але дзейнасць гэтых навукоўцаў не азначала адраджэнне антычнасці ў поўным сэнсе гэтага слова: з багатай антычнай спадчыны яны бралі толькі невялікую яе частку.

Безумоўна, феадальнае грамадства не магло абысціся без элементаў свецкай адукацыі. Па меры развіцця эканомікі, фармавання цэнтралізаваных дзяржаў адбываліся змены і ў сістэме адукацыі. Цэнтрамі асветнай дзейнасці станавіліся манастыры, якія мелі бібліятэкі, майстэрні па перапісцы кніг і школы. У праграму школьнага навучання былі ўключаны антычныя дысцыпліны, так званыя "7 вызваленых мастацтваў": граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, астраномія, музыка, геаметрыя. Але "вызваленыя мастацтвы" сярэднявечча мелі толькі аддаленае падабенства з тым, што выкладалася ў антычных школах, таму што рэлігійныя асветнікі бачылі карысць ад ведаў толькі ў тым выпадку, калі яны дапамагалі засвоіць царкоўнае вучэнне. Трывалыя традыцыі рэлігійнага асветніцтва ўзнікаюць і на беларускіх землях (Е. Полацкая, К. Смаляціч, К. Тураўскі). Шырокаму распаўсюджванню пісьменнасці ў Заходняй Еўропе перашкаджала тое, што мовай навучання заставалася лацінская. На ўсходнеславянскіх землях у XI ст. была створана і ўжывалася старажытнаруская мова, што садзейнічала павелічэнню колькасці пісьменных, нават сярод простых людзей. Пачынаючы з XI ст. у Еўропе з'яўляюцца ўніверсітэты: Балонскі, Парыжскі, Оксфардскі і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, пасля гібелі Заходняй Рымскай імперыі ў сярэдзіне V ст. цэнтр сусветна-гістарычнага прагрэсу перамяшчаецца ў Еўропу, дзе фармуецца сярэднявечная цывілізацыя, якая кладзе пачатак другой трыадзе цывілізацый (сярэднявечная, перадіндустрыяльная, індустрыяльная). Насельнікі беларускіх зямель таксама далучаюцца да цывілізаванага развіцця дзякуючы кантактам з Візантыяй і другому Вялікаму перасяленню народаў. Сярэднявечная цывілізацыя на Беларусі складваецца і развіваецца амаль у той жа час што і ў Заходняй Еўропе і мае тыя ж адметныя рысы.

---

[75] Котов А.И. История Беларуси и мировая цивилизация – Мн., 2004. – С. 33.

*Лекцыя трэцяя*

## АДРАДЖЭННЕ І РЭФАРМАЦЫЯ Ў ЕЎРОПЕ

1. Эпоха Рэнесансу: агульнаеўрапейскі і беларускі аспекты.
2. Рэфармацыйны рух у Еўропе і яго вынікі.
3. Контррэфармацыя.

### 1. Эпоха Рэнесансу: агульнаеўрапейскі і беларускі аспекты

**Адраджэнне**, Рэнесанс (фр. Renaissance – "вяртанне", "аднаўленне"), у канкрэтна-гістарычным значэнні – эпоха ў развіцці духоўнай культуры Еўропы ў пераходны перыяд ад сярэднявечча да новага часу (XIV ст. – першая палова XVII ст.), якая характарызавалася ўздымам свецкай навукі і мастацтва, станаўленнем нацыянальнай мовы, літаратуры і нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычным светапоглядам.[76] У развіцці Еўропы эпоха Адраджэння была абумоўлена якаснымі зменамі ў эканамічным і палітычным жыцці краін: зараджэннем капіталістычных адносін, фармаваннем нацыянальных дзяржаў і абсалютных манархій, узмацненнем антыфеадальнай і рэлігійнай барацьбы.

Асноўныя дасягненні эпохі Адраджэння – Вялікія геаграфічныя адкрыцці (падарожжы Х. Калумба, Ф. Магелана), якія садзейнічалі пераадоленню сярэдневяковага правінцыялізму, падцвердзілі шарападобнасць Зямлі, астранамічныя і фізіка-матэматычныя тэорыі (М. Капернік, Г. Галілей, І. Кеплер і інш.); станаўленне тэхнічных навук, біялогіі, медыцыны, даследаванняў, якія садзейнічалі тэхналагічнаму прагрэсу і чалавеказнаўству; высокі ўзровень гуманітарных навук – свецкай філасофіі, археалогіі, адкрыццё кнігадрукавання, узлёт рэалістычнага мастацтва і станаўленне нацыянальных культур.

Літаратурна-навуковы рух XIV ст. – **гуманізм**, сваё найменне атрымаў ад таго, што яго прадстаўнікі, кажучы словамі Цыцэрона, ад вывучэння "божаскага" (studia divina) звярнуліся да вывучэння "чалавечага" (studia humana). Гуманізм праяўляў цікавасць да чалавека, яго асобы, пакланяўся яе творчым сілам і імкненням; прызнаваў натуральнасць і законнасць патрабаванняў прыроды чалавека, на якія царква глядзела як на грахоўныя. Гуманізм стаў цікавіцца і навакольным, зямным, асяроддзем чалавека, якое раней лічылася ўвасабленнем зла.

Крыніцаю для гуманізма была класічная антычная культура: рымскае права, літаратура давалі матэрыял для барацьбы са схаластыкай і аскетызмам. Перайманне лепшых узораў антычных помнікаў мастацтва і архітэктуры парадзіла асобы стыль – **рэнесанс**. Каб узбагаціць недастатковыя веды, італьянскія гуманісты вандравалі ў Грэцыю і прывозілі адтуль цэлыя скрыні, напоўненыя каштоўнымі рукапісамі. Асабліва ўзмацніліся сувязі з Візантыяй пасля падзення Канстанцінопаля (1453 г.), калі грэчаскія перасяленцы ў Італіі зрабілі сваю мову не менш папулярнай, чым лацінскую (невыпадкова і лацінская, і грэчаская мовы сталі акадэмічнымі ў навучальных установах ВКЛ). Высокапастаўленыя асобы аказвалі дапамогу гуманістам, сярод мецэнатаў называюць нават імёны Папы Рымскага Мікалая V (1447–1455), які быў ініцыятарам будаўніцтва сабора святога Пятра ў Рыме, а таксама Папы Пія II (1458–1464).[77]

Адраджэнне прынята падзяляць на тры перыяды:

**І. Ранняе Адраджэнне (Протарэнесанс)** – (пачатак XIV ст. – канец XV ст.) пачынаецца ў Італіі, у якой класічная антычная культура з'яўлялася культурай продкаў. Вялікую ролю ў станаўленні ідэалогіі гуманізма адыгралі такія італьянскія пісьменнікі і

---

[76] Адраджэнне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 тамах. Т. 1. – С. 58.

[77] Виппер Р.Ю., Реверсов И. П., Трачевский А. С. История Нового времени. – М., 1995. – С. 15.

паэты, як Д. Аліґьеры, Ф. Петрарка, Д. Бакачча, якія былі родам з Фларэнцыі. Рэнесансны стыль у архітэктуры развіваў Л. Альберці, у жывапісу – Джота.[78]

**ІІ. Высокае Адраджэнне** – (канец XV ст. – першая чвэрць XVI ст.) да гэтай эпохі адносіцца творчасць геніальных мастакоў Італіі – Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла Буанароці і Рафаэля Санці.[79]

**ІІІ. Позняе Адраджэнне** – (другая палова XVI ст. – пачатак XVII ст.) найбольш поўна раскрываецца ў выяўленчым мастацтве і літаратуры, дзе акцэнт быў пераведзены з прыгожага і ўзвышанага на камічнае і трагічнае (А. Дзюрэр, І. Босх, П. Брэйгель Старэйшы, У. Шэкспір, Ф. Рабле, М. Сервантэс).[80]

Неабходна ведаць, што тэрмін "Адраджэнне" абазначае два розныя неаднародныя паняцці: 1) **гуманістычнае** адраджэнне як культурна-гістарычную эпоху еўрапейскай культуры і 2) **нацыянальнае** адраджэнне – як заканамернасць культурна-гістарычнага развіцця пэўных рэгіёнаў і народаў. У рамках пераходнага перыяду ад Сярэднявечча да Новага часу гуманістычнае адраджэнне ў дачыненні да нацыянальнага адраджэння выступае як цэлае адносна сваёй часткі, бо якраз у гэтую эпоху ў еўрапейскім рэгіёне адбывалася станаўленне нацыянальных дзяржаў, нацыянальных літаратурных моў і культур, абуджаўся патрыятызм. Еўрапейскае адраджэнне XIV ст. – пачатку XVII стст. з'явілася той пераломнай эпохай, калі быў устаноўлены новы гуманістычны светапогляд, сцверджана зямная каштоўнасць гарманічнага, усебакова развітога чалавека – майстра, мастака, вучонага і філосафа, быў паступова пераадолены дагматызм, схаластыка і ішло станаўленне крытычнай думкі.

Паняцце адраджэння як заканамернасці развіцця нацыянальных культур, а ў сукупнасці – сусветнай культуры, слаба распрацавана. Гістарычны вопыт славянскіх народаў (балгараў, чэхаў, беларусаў, украінцаў і інш.) сведчыць, што за заняпадам альбо застоем нацыянальнай культуры ў спрыяльных гістарычных умовах наступае перыяд іх уздыму, паскоранага развіцця, які справядліва называюць нацыянальным адраджэннем. Яго зыходным імпульсам заўсёды была генетычная памяць народа, увасобленая ў сімвалах, культурных здабытках і святынях, нацыянальнай мове. Перыядычнае адраджэнне пасля заняпаду – заканамернасць развіцця беларускай

---

[78] **Дантэ Аліґьеры** (1265–1321) разглядае адносіны папы і імператара ў творы "Аб манархіі", напаўняе каханнем да Беатрычэ "Абнаўлённае жыццё", а каб засцерагчы ад мітусні і паўсядзённасці, выказвае думкі аб вечнасці пачаткаў рэлігіі і маралі ў манументальным творы "Божая камедыя". **Франчэска Петрарка** (1304–1374) быў добра знаёмы з сачыненнямі Вергілія, Цыцэрона, чытаў Платона. Ён першы правёў ідэю аб магчымасці аб'яднання старажытнаязычніцкай філасофіі з хрысціянскім вучэннем. Збор санетаў Петраркі ў гонар Лауры паказаў, што паэт на першае месца ставіць чалавечыя пачуцці. **Джаванні Бакачча** (1313–1375), які нават напісаў некалькі даследаванняў па антычнасці, больш вядомы нам па белетрыстычнаму твору "Дэкамерон".

[79] Сюжэты ў мастацтве Адраджэння былі па-ранейшаму царкоўныя, але вылучылася і антычная міфалогія, а галоўнае – выступілі **рэалістычныя** формы: партрэт, жанр і пейзаж. **Леанарда да Вінчы** (1452–1519) даследаваў законы анатоміі, фізікі, хіміі, перспектывы, геаметрыі. А яго першая ў свеце вялікая карціна масляннымі фарбамі "Тайная вячэра" і партрэт "Джаконда" увайшлі ў скарбніцу сусветнага мастацтва. Гуманіст, паэт, мастак **Мікеланджэла** (1475–1564) ўразіў рэалістычнасцю каласальных фрэсак "Стварэнне Света", "Страшны Суд". "Давід", скульптурнае тварэнне Мікеланджэла уражвае адзінствам духоўнага і фізічнага ў чалавеку. Велічным тварэннем новага дойлідства стаў сабор Св. Пятра ў Рыме архітэктара Брамантэ, купал якога распісаў Мікеланджэла. **Рафаэль Санті** (1483–1520) ўдасканаліў ідэалістычны стыль у мастацтве, укладваючы ўсюды "душу Мадонны" – гэтага свайго любімага вобраза ("Сікстынская мадонна", "Афінская школа", "Мадонна Канестабіле").

[80] Жывапіс у Італіі з 1540-х гг. прыходзіў у заняпад у сувязі з развіццём папскай рэакцыі і абсалютызма. **Альбрэхт Дзюрэр** (Германія) сачыняў трактаты па геаметрыі і анатоміі і фартыфікацыі, рэзаў па камню, медзі, дрэву, а, галоўнае, пісаў карціны маслам, акварэллю, вуглем, мелам, пяром. Гравюры майстра "Святы Іеранім", "Меланхалія", "Чацвёра коннікаў" адлюстравалі гатычную накіраванасць яго мастацтва. **Пітэр Брэйгель Старэйшы і Іеранім Босх** (трыптых "Сад зямных уцех", "Карабель дурняў") з Нідэрландаў у сваіх жывапісных работах выражаюць сатыру на сквапнасць, распушчанасць. **Мігель Сервантэс** геніяльную сатыру на тагачасную Іспанію дае ў рамане "Дон-Кіхот". **Франсуа Рабле** (1494–1553) быў галоўным прадстаўніком гуманістаў у Францыі (шырока вядома два яго сатырычных рамана "Гарганцюа" і "Пантагруэль"). Мастацтва Рэнесансу ў Англіі было прадстаўлена слаба, але краіна падаравала свету такіх знакамітых філосафаў, як утапіст **Томас Мор** (1478–1535), які пад уплывам Платона напісаў фантастычны твор "Утопія", матэрыяліст **Фрэнсіс Бэкон**. Там жа пачынае творчасць геніяльны драматург **Уільям Шэкспір**

культуры. Гуманістычнае Адраджэнне было адначасова і раннім нацыянальным адраджэннем. Пачыналася яно з абвяшчэння роднай мовы фундаментальнай духоўнай каштоўнасцю, якая жывіць культуру, стымулюе яе паскоранае развіццё.

Зыходзячы з ідэй марксісцкай тэорыі, эпоха Адраджэння выступала апазіцыйна адносна феадалізму і яго ідэалагічнага інстытута – каталіцкай царквы, характарызавалася як буржуазная па сваёй сацыяльнай структуры. Пазней гэтае ўяўленне пра гуманістычную культуру Адраджэння было заменена канцэпцыяй шматфактарнасці, паводле якой эпоха Адраджэння была абумоўлена ростам гарадоў, развіццём таварна-грашовай гаспадаркі, зараджэннем капіталістычных адносін, складваннем нацыянальных дзяржаў, манархічным абсалютызмам, узмацненнем антыфеадальнай і рэлігійнай барацьбы. Аднак у гэтым матэрыялістычным тлумачэнні не хапала дыялектыкі і разумення ўзаемавызначальнасці матэрыяльных і духоўных з'яў, не заўсёды ўлічвалася адносная аўтаномнасць культуры, яе ўнутраныя заканамернасці і пераемнасць у развіцці.

Культура Рэнесансу на поўнач ад Альпаў, у адрозненне ад класічнага італьянскага Адраджэння, атрымала назву **"Паўночнае Адраджэнне"**.[81] Яго характэрныя рысы – сувязь з Рэфармацыяй і нацыянальным адраджэннем і пэўная залежнасць ад сярэдневяковых і рэлігійных традыцый. Да гэтага тыпу Адраджэння прымыкае культура славянскага рэгіёна.

"Беларусь з прычыны свайго геапалітычнага становішча з'яўлялася своеасаблівай міжкультурнай мяжою, скрыжаваннем дзвюх цывілізацый, дзе ў XV – XVI стст. сышліся асноўныя еўрапейскія культурныя традыцыі – заходняя і ўсходняя. У X – XIII стст. вызначальны уплыў на культуру Беларусі рабіла візантыйская, ці ўсходняя традыцыя, а ў XIV ст. – першай палове XVI ст. – як усходне-, так і заходнееўрапейская. Пэўны час яны ўраўнаважвалі адна адну, а з другой паловы XVI ст. вызначальнай стала заходняя культурна-ідэалагічная, філасофская і рэлігійна-царкоўная традыцыя".[82]

Беларуска-літоўска-польскі рэгіён добра ўпісваўся ў тагачасную еўрапейскую культуру. Ідэі гуманізму пранікалі ў педагогіку, прасочвалася імкненне пашырыць школьную адукацыю, вывесці яе за рамкі "сямі вольных мастацтваў". Пашыраліся эканамічна-культурныя сувязі з Заходняй Еўропай. З купецкімі караванамі ў Беларусь завозіліся кнігі антычных пісьменнікаў і філосафаў, еўрапейскіх гуманістаў і рэфарматараў. Беларуская моладзь ехала вучыцца ва ўніверсітэты Прагі, Кракава, Кёнігсберга, Базеля, Падуі, Лейпцыга, што спрыяла працэсу фармавання беларускай інтэлігенцыі.

У XIV–XV стст. сфармавалася старабеларуская мова, якая амаль да канца XVII ст. была дзяржаўнай мовай ВКЛ. У галіне архітэктуры поруч з готыкай у XVI ст. складваўся рэнесансавы стыль (замкі-палацы ў Міры, Любчы, Нясвіжы, цэрквы ў Сынкавічах, Супраслі, Маламажэйкаве і інш.). Манументальны жывапіс XVI ст. перажываў адметны ўплыў рэнесанснага стылю – імкненне да перадачы аб'ёму, перспектыў, святлоценявой і колеравай мадэліроўкі. З распаўсюджваннем ідэй Адраджэння звязана і развіццё свецкага жывапісу, пераважна партрэтнага па жанры. Сярод манументальных роспісаў захаваліся выявы партрэта Ягайлы ў касцёле ў Сандаміры (Польшча). У Трокскім замку знаходзіцца шэраг фрэсак, прысвечаных Вітаўту. Паступова партрэт набывае самастойнае значэнне. Беларускія магнаты пачынаюць збіраць творы еўрапейскіх мастакоў, запрашаць вядомых майстроў. З XVI ст. – першай паловы XVII ст. дайшлі творы жывапісу (сармацкі партрэт, творы іканапісу з прыкметнымі рэалістычнымі і этнаграфічна-бытавымі рысамі).

---

[81] **Эразм Ратэрдамскі** (1466 ці 1469–1536) з Галандыі – найбольш яскравая постаць Паўночнага Адраджэння, "кароль гуманістаў", які праславіўся выданнем грэчаскага тэксту Новага Завету, сачыненняў класічных аўтараў і "айцоў царквы" з навуковымі заўвагамі. Самы таленавіты яго твор "Пахвала глупству" уяўляў сабою сатырычнае выкрыванне каталіцкай царквы.

[82] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый / І. П. Крэнь, І. І. Коўкель і інш. – Мн., 2000. – С. 430.

Характэрныя рысы адраджэння на Беларусі наступныя: развіццё гарадоў, рамёстваў, гандлю, утварэнне беларускай народнасці, росквіт кнігадрукавання, асветы, свецкай мастацкай і філасофска-палітычнай літаратуры, перакладчыцкай дзейнасці (антычных аўтараў). У светапоглядзе найбольш перадавых прадстаўнікоў беларускага феадальнага грамадства адбываецца пэўны перaлом, які выяўляецца ў адмаўленні ад многіх традыцыйных уяўленняў сярэднявечча і ўспрыманні ідэй новай гуманістычнай культуры. Эканамічнае адставанне ВКЛ ад перадавых краін Заходняй Еўропы стрымлівала ўсебаковае развіццё свецкіх форм культуры на Беларусі. Развіццё рэнесансавай культуры засталося незавершаным, не да канца аддзеленым ад рэлігійнай ідэалогіі.

Вялікай з'явай эпохі Адраджэння стала ўзнікненне кнігадрукавання. **Кнігадрукаванне** было вядома ў Кітаі яшчэ ў IX ст. (першае друкаванае выданне "Алмазная сутра" убачыла свет у 868 г.), дзе выразалі неабходны тэкст на дошках, а потым друкавалі яго на тканінах. Гэты спосаб стаў вядомы ў Заходняй Еўропе пасля крыжовых паходаў. Ураджэнец Майнца **Іаган Гутэнберг** замяніў такія дошкі металічнымі літарамі, якія рухаліся і, пры дапамозе Фуста і Шэфера, пабудаваў друкарню. У 1450 г. (1444) у ёй была надрукавана першая кніга – лацінскі пераклад Біблii. За першае паўстагоддзе існавання еўрапейскай друкарскай справы чытачы краін Заходняй Еўропы атрымалі болей за 40 тысяч назваў агульным тыражом 10 мільёнаў экзэмпляраў. Толькі ў Венецыі дзейнічалі 150 друкарань, яны зафіксаваны на той час у 200 гарадах Заходняй Еўропы. Так што, калі Скарына вучыўся ў Кракаўскай акадэміі, кніга была ўжо нармальнай з'явай жыцця.[83]

Станаўленне рэнесансна-гуманістычнай культуры ў Беларусі ажыццяўлялася ў спецыфічнай моўнай сітуацыі. Полілінгвізм – развіццё культуры на старабеларускай, царкоўна-славянскай, лацінскай і польскай мовах – з'яўляецца асаблівасцю духоўнага жыцця беларускага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага. На працягу XIV – XVI стст. беларуская літаратурная, ці "руская" (паводле крыніц) мова раней за іншыя еўрапейскія мовы становіцца дзяржаўнай, яе дзяржаўны статус фіксуецца ў Статуце ВКЛ.

Сімвалічна, што і першая кніга, якую падрыхтаваў да друку ў Празе (1517–1519 гг.) ураджэнец Полацка **Францыск Скарына** ўяўляла сабою пераклад Свяшчэннага пісання на царкоўна-славянскую мову, з элементамі лексікі і граматыкі жывой беларускай мовы. Патрэба асабістага знаёмства вернікаў з Бібліяй прывяла да перакладаў яе і на іншыя нацыянальныя мовы.[84] Пазней Скарына займаўся кнігавыдавецтвам ў Вільні, тут ён выдаў "Малую падарожную кніжыцу", "Апостал".

Першым беларускім горадам, у якім, дзякуючы старасце Мікалаю Радзівілу Чорнаму, ў 1558 г. з'явілася друкарня, быў горад Берасце. З імем М. Радзівіла Чорнага (у далейшым канцлера ВКЛ) і Сымона Буднага было звязана развіццё рэфармацыйнага кнігадрукавання і ў Лоску, Любчы, Нясвіжы. На Полаччыне выдавецкую дзейнасць ажыццяўляў В. Цяпінскі (выдаў "Евангелле" на беларускай і царкоўна-славянскай мовах, 1570).[85]

---

[83] Першыя старадрукі кірыліцкага шрыфту "Актоіх" і "Часаслоў", якія выдадзены немцам Ш.Фіёлем у Кракаве ў 1491 г., з'яўляюцца **інкунабуламі** – кнігамі выдадзенымі да 1501 г.

[84] Цікава даведацца, што пераклад Біблii на нацыянальную мову адбыўся на Украіне ў 1555 г., Польшчы – у 1561, Літве – 1660, Расіі – ажно ў 1751 г.

[85] Пераемнікамі Скарыны ў беларускім кірыліцкім кнігадрукаванні былі нясвіжскія кнігавыдаўцы С. Будны, Л. Крышкоўскі – з іх выданняў да нас дайшоў "Катэхізіс" на беларускай мове 1562 г. Першая руская датаваная кніга "Апостал" была выдадзена ў 1564 г. І. Фёдаравым і П. Мсціслаўцам. У другой палове XVI ст. гэтыя майстры ўладкаваліся ў беларускім мястэчку Заблудава. Праз паўстагоддзе пасля Скарыны друкарня Мсціслаўца ў Вільні аднавіла кірыліцкае кнігадрукаванне. У ёй былі выпушчаны прыгожа аформленыя кнігі "Евангелле", "Псалтыр", "Часоўнік". Мініяцюра рукапісных кніг стала папярэдніцай графікі, якая ўключае ў сябе ўсе разнавіднасці малюнка, а таксама яго адбіткі метадамі гравюры, літаграфіі. Асаблівасць гравюр скарынінскіх выданняў выяўляецца ў іх аб'ёмнасці, наяўнасці перспектывы.

Дзейнасцю віленскай друкарні Мсціслаўца і В. М. Гарабурды (1580-я гг.) фактычна скончыўся перыяд існавання прыватных беларускіх кірыліцкіх друкарняў. Выключэнне складала друкарня Мамонічаў, якая, дзякуючы супрацоўніцтву з урадам і ўніяцкай царквою, нават надрукавала славутыя прававыя зборнікі "Трыбунал" (1586) і "Статут Вялікага княства Літоўскага" (1588).

У адрознянне ад заходнееўрапейскіх краін, дзе развіваліся новыя жанры літаратуры свецкага характару, друкаваныя творы ў ВКЛ, дзе ідэалогія мела тэалагічную форму, мелі рэлігійны характар. Таму, у залежнасці ад таго, які характар мелі выданні, кнігадрукаванне на беларускіх землях умоўна падзяляецца на **езуіцкае, рэфармацыйнае** і **брацкае** (ажыццяўлялася ў праваслаўных брацтвах).[86]

Такім чынам, **Адраджэнне было** не простай рэстаўрацыяй, а **спосабам фарміравання новай буржуазнай культуры. Характэрнай рысай эпохі Рэнесансу быў працэс фармавання народных літаратурных моў ва ўсіх еўрапейскіх краінах, станаўлення нацыянальных культур. Кнігадрукаванне стала ўмоваю дэмакратызацыі навукі, літаратуры і асветы, садзейнічала духоўнаму росту еўрапейцаў, распаўсюджванню гуманістычных ідэй**. Такім чынам гуманізм саставіў для свайго часу вялікую культурную эпоху, паслужыў падмуркам, на якім заснавана сучасная еўрапейская цывілізацыя. Гуманістычнае вольнадумства падрыхтавала глебу для царкоўнай рэфармацыі. Працэс пераадолення сярэдневяковай схаластыкі адбываўся двюма шляхамі – з аднаго боку, праз Рэнесанс, а з другога боку – праз еўрапейскую Рэфармацыю.

## 2. Рэфармацыйны рух у Еўропе і яго вынікі

**Рэфармацыя** (ад лац. Reformatio – пераўтварэнне) – шырокі грамадскі антыфеадальны рух у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе, які прыняў форму барацьбы супраць засілля каталіцкай царквы ва ўсіх сферах жыцця. У вузкаканфесіянальным сэнсе Рэфармацыя азначала перагляд дагматаў каталіцызму і рэлігійныя пераўтварэнні, што прывялі да ўзнікнення новага накірунку ў хрысціянстве – пратэстантызму. XVI ст. было азнаменавана буйным крызісам рымска-каталіцкай царквы, які адбіўся на яе вучэнні, кульце, інстытутах, ролі ў жыцці грамадцтва, характары адукаванасці і маралі духавенства. Вышэйшае каталіцкае духавенства на чале з папай Рымскім імкнулася ўсталяваць палітычную гегемонію, падпарадкаваць і свецкае жыццё дзяржавы ў цэлым. Папскія дыпламаты, зборшчыкі пабораў і прадаўцы індульгенцый запаланілі ўсю Еўропу.

Прэтэнзіі каталіцкай царквы выклікалі незадаволенасць нават у асяроддзі буйных свецкіх феадалаў. Яшчэ большая незадаволенасць прапагандай царквы пагарды да свецкага жыцця адчувалася ў жыхароў развіваючыхся і багацеючых гарадоў, дзе нараджалася новая буржуазная ідэалогія. Ініцыятарам і авангардам руху была буржуазія, якая выступіла супраць феадалізму і яго апоры – каталіцкай царквы. Вялікую колькасць элементаў, якія апярэдзілі рэформу царквы, утрымлівалі ўжо выступленні ідэолагаў Рэнесанса. Так, трактат Джордана Бруна "Сто шэсцьдзесят тэзісаў супраць філосафаў нашага часу" змяшчае шмат выпадаў супраць таго жывёльнага стану, які насаджала царква пад выглядам высокай духоўнасці: "Да таго ж дайшлі бессаромнасць і боязнь айцоў невуцтва, што яны нават наклалі забарону на дыспуты, загадалі пастаянства ў лекцыях, абвясцілі пахвальным трымацца аднойчы ўспрынятага меркавання".[87] Невыпадкова лічыцца, што апошнім храналагічным перыядам Адраджэння з'яўляецца эпоха Рэфармацыі, якая завяршыла гэты велічны прагрэсіўны пераварот у развіцці еўрапейскай культуры.

Вылучаюць тры асноўныя напрамкі Рэфармацыі.

**1. Бюргерска-буржуазны,** прадстаўнікі якога выступалі з тэзісам "абсалютнага прадвызначэння", пропаведдзю "мірскога аскетызму" і рэспубліканскага ўладкавання царквы. (М. Лютэр, Ж. Кальвін, Ульрых Цвінглі).

---

[86] Чытай падрабязней: "Кнігадрукаванне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 4. – С. 209-210".
[87] Виппер Р. Ю., Реверсов И. П., Трачевский А. С. История Нового времени. – С. 57.

Фармальна Рэфармацыя пачалася з таго, што 31 кастрычніка 1517 г. манах ордэна аўгусцінцаў і прафесар Вітэнбергскага ўніверсітэта **Марцін Лютэр** выдаў 95 тэзісаў, якія былі накіраваны супраць продажу індульгенцый. Упэўненасць М. Лютэра ў апраўданне верою стала асноваю яго веравучэння. Французскі тэолаг **Жан Кальвін** (1509–1564) большасць жыцця правёў у Швейцарыі, рэзідэнцыяй яго з'яўлялася Жэнева. Кальвінізм быў накіраваны на развіццё індывідуальнай свядомасці і рэлігійнасці, адмаўляўся ад культу Багародзіцы і святых, пакланення рэліквіям, зароку бясшлюбнасці для духавенства, патрабаваў роспуску манаскіх ордэнаў, прыніжаў ролю духоўных асоб у царкве. Асноўным зместам кальвінізму было вучэнне аб назапашванні зямнога скарбу, якое з'яўляецца богаўгодным. Кальвіністы больш сур'ёзна, чым любы іншы напрамак у хрысціянстве, успрынялі словы апостала Пятра: "Хто не працуе, той не есць!" Пад ідэйным сцягам кальвінізму адбываліся Нідэрландская (1566–1609) і Англійская (XVII ст.) буржуазныя рэвалюцыі.

**2. Народны** – дзеячы якога вялі барацьбу за закрыццё каталіцкай царквы, за вызваленне ад феадальнага прыгнёту, устанаўленне роўнасці (Томас Мюнцэр, баптысты).

Для першых крокаў народнага рэфармацыйнага руху вялікую значнасць мела дзейнасць чэшскага багаслова Яна Гуса. Вучэнне англійскага прафесара з Оксфарда Джона Уікліфа (аб непатрэбнасці пасрэдніка паміж Богам і чалавекам, свяшчэнства, аб непрызнанні пераўтварэння хлеба і віна ў цела і кроў Хрыста) знайшло сабе паслядоўнікаў сярод прафесароў Пражскага ўніверсітэту. Асаблівае месца сярод іх займаў магістр **Ян Гус**, які, прапаведуючы ў Віфліемскай часоўні на чэшскай мове, ўплываў на шырокія масы насельніцтва. Крытыка ў бок духавенства прывяла да анафемы гэтага пратэстанта – Ян Гус быў спалены ў 1415 г. Цэнтральныя ідэі **гусітаў**: Біблія – адзіная аснова веры, індульгенцыя не мае сэнсу без раскайвання, царкоўная маёмасць павінна быць аднята, асабістыя перакананні ў справе выратавання душы займаюць галоўнае месца. Гусіцкія войны (1419–1437) у Чэхіі мелі рэлігійны і патрыятычны характар, сталі першай праявай рэфармацыі сярод славянскіх народаў. **Табарыты** (па месцу сходаў на гары) вылучылі са сваіх радоў славутага Яна Жыжку. Праз паўстагоддзе такі ж царкоўны прапаведнік, як Я. Гус і Я. Жыжка, **Томас Мюнцэр** (1490–1525) стаў лідэрам Сялянскай вайны ў Германіі (1524–1526 гг.).

**3. Каралеўска-княскі** – быў накіраваны на ўмацаванне ўлады манархаў і свецкіх феадалаў, секулярызацыю (захоп зямельных надзелаў каталіцкай царквы).

Англійскі парламент яшчэ з 1307 г, у час "авіньёнскага паланення пап" (1309–1377) выдаў шэраг пастаноў, якія абмежавалі папскую ўладу над Англіяй. З'езд курфюрстаў у Германіі ў 1338 г. аб'явіў імперыю незалежнай ад пап, а абранага князямі імператара – легітымным без папскага зацвярджэння. Гэтыя падзеі, безумоўна, сведчылі аб пачатку фарміравання абсалютных манархій. Галоўным ініцыятарам Рэфармацыі ў Англіі быў кароль Генрых VIII, які правёў рэформу царквы ў 1537–1539 гг. Англіканская царква выйшла з пад улады папы Рымскага, але падпарадкоўвалася каралю. Былі ліквідаваны манастыры, служба вялася на англійскай мове, але дагматычных разыходжанняў з каталіцызмам не назіралася. Паслядоўнікаў кальвінізму ў Англіі сталі называць **пурытане**.

Рэфармацыя, якая распачалася ў Германіі, ахапіла шэраг еўрапейскіх краін і прывяла да аддзялення ад пратэктарату каталіцкай царквы Англіі, Шатландыі, Даніі, Швецыі, Нарвегіі, Нідэрландаў, Фінляндыі, Швейцарыі, Чэхіі, Венгрыі, часткова Германіі. Рэфармацыя вылучыла ідэю нацыянальнай царквы, дала пачатак яшчэ аднаму накірунку хрысціянства – **пратэстантызму** (ад лац. – "якія пярэчаць", "якія не згаджаецца").[88]

---

[88] Чытай падрабязней: "Пратэстантызм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 тамах. Т. 5. – С. 568".

Пратэстантызм – гэта сукупнасць самастойных і розных рэлігій, цэркваў (лютэранства, кальвінізм, англіканская царква, метадысты, баптысты, адвентысты і інш.), якія адрозніваюцца адзін ад аднаго дагматычнымі і кананічнымі асаблівасцямі. Галоўнае адрозненне пратэстантызма ад каталіцызму і праваслаўя – у вучэнні аб непасрэднай сувязі Бога і чалавека. З сямі таінстваў пратэстанты пакінулі два – хрышчэнне, прычасце (а ў англіканскай царкве яшчэ – царкоўны шлюб). Сэнс вучэння аб "апраўданні верай" заключаўся ў адмаўленні прывілеяванага становішча духавенства і ў адмаўленні ад царкоўнай іерархіі і супрэматыі папства. Агульнымі для ўсіх накірункаў пратэстантызму сталі патрабаванні правядзення набажэнстваў на роднай мове і свабоды выбара веравызнання. Тым самым Рэфармацыя ў Еўропе аб'ектыўна садзейнічала станаўленню нацыянальных моў і культур, спрасціла, дэмакратызавала царкву, паставіла веру вышэй знешніх праяўленняў рэлігійнасці, надала нормам буржуазнай маралі божую санкцыю.

**Рэфармацыя на Беларусі.** У ВКЛ упершыню пратэстанцкія ідэі былі прынесены ў 1521 г. італьянцам Францыскам Лісмані – прыдворным прапаведнікам Жыгімонта І Старога і любімцам каралевы Боны. Рэфармацыю падтрымала частка гарадскога насельніцтва, незадаволеная распаўсюджваннем каталіцкіх і праваслаўных юрыдык, царкоўнымі паборамі. Узнікненне рэфармацыйнага руху на Беларусі было падрыхтавана існаваннем антыклерыкальных і антыфеадальных настрояў, ерасяў, гуманістычнага рацыяналізму і паскорана непасрэдным пранікненнем ў ВКЛ розных плыняў заходнееўрапейскага пратэстантызму. На думку некаторых вучоных, рэфармацыйны рух у форме брацтваў, ерасей закрануў і праваслаўную царкву. Гэта адлюстравала антыцаркоўныя настроі часткі гарадскіх і плебейска-сялянскіх мас насельніцтва. Рэфармацыйны рух на беларускіх землях прайшоў тры этапы свайго развіцця.[89]

**Першы этап (1553 – 1570 гг.)** доўжылася з часу ўзнікнення першых пратэстанскіх абшчын да з'яўлення езуітаў у ВКЛ, калі ішло фарміраванне і хуткае развіццё руху, вызначыліся яго наступныя накірункі:

*1)* **лютэранства,** якое ў Вялікім княстве Літоўскім шырокага распаўсюджвання не атрымала. Яго прытрымліваліся ў асноўным гараджане іншаземнага паходжання, пераважна ў Жамойці. Хаця з летапісаў вядома, што слуцкі князь Юрый Алелькавіч выдзяліў зямельны надзел для будаўніцтва лютэранскай царквы ў Слуцку;

*2)* **кальвінізм.** Лідэрам кальвінісцкіх секцый стаў Мікалай Радзівіл Чорны, які заснаваў у 1553 г. першую кальвінісцкую абшчыну, распачаў асветніцкую дзейнасць, у канцы 1550-х гг. заклаў у Берасці першы на Беларусі збор – рэфармацыйную царкву. У 1557 г. канцлер ВКЛ М. Радзівіл Чорны запрасіў кальвінісцкіх прапаведнікаў з Прусіі, Бельгіі і Швейцарыі на першы ўстаноўчы сход літоўскіх пратэстантаў у Вільні. Да 60-х гг. у кальвінізм перайшла большасць беларускіх магнатаў – Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы, Кішкі, Тышкевічы – і значная частка шляхты. Кіравалі гэтымі людзьмі як практычныя меркаванні – секулярызацыя царкоўнай маёмасці, скарачэнне выдаткаў на ўтрыманне царквы, так і палітычныя – яны імкнуліся "з дапамогай новай веры ідэалагічна і духоўна абараніць ВКЛ і ад Польшчы і ад Масковіі".[90] Вакол кальвінісцкіх асяродкаў у Менску, Полацку, Віцебску, Беліцы, Заслаўі, Глыбокім, Койданаве, Навагрудку, Смаргоні, Любчы, Гальшанах, Слуцку, Шклове і інш. групаваліся выдатныя вучоныя, прапаведнікі, пісьменнікі, кнігавыдаўцы;

*3)* **антытрынітарызм** (ці "арыянства" – ад імя заснавацеля ў IV ст. Арыя). Больш радыкальны напрамак кальвінізму, які з 1560-х гг. аб'яднаў тых, хто адмаўляў існаванне замагільнага свету, не згаджаўся з уяўленнем аб святой троіцы. Ідэолагам антытрынітарызму

[89] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – С. 399-400.
[90] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – С. 400.

ў XVI ст. стаў іспанскі вучоны Мігель Сервет. У 40-я гг. XVI ст. большасць італьянскіх антытрынітарыяў уцякала ад інквізіцыі ў Швейцарыю, а затым у Польшчу і на Беларусь.

Прадстаўнікі памяркоўнага напрамку антытрынітарызму на беларускіх землях – Сымон Будны, Васіль Цяпінскі – адлюстроўвалі інтарэсы часткі гараджан, шляхты, выступалі супраць боскай прыроды Хрыста, за частковыя рэформы. У нясвіжскай друкарні былі выдадзены працы С. Буднага "Апокрыф", "Аб зачацці сына божага", "Аб свецкай уладзе", "Апраўданне грэшнага чалавека перад богам", прадмова да так званай Брэсцкай Бібліі. Будны першы ў еўрапейскай навуцы зрабіў крытычны аналіз Новага запавета, а пад канец жыцця нават стаў атэістам.

Радыкальны напрамак антытрынітарызму ўзначальвалі Пётр з Ганёндза, Марцін Чаховіц, Якуб з Калінаўкі, Павел з Візны. Яны імкнуліся да карэнных сацыяльна-палітычных змяненняў: ліквідацыі паншчыны, прыватнай уласнасці, феадальных прывілеяў, выступалі супраць свецкай улады, войнаў, нацыянальнай і рэлігійнай няроўнасці. Прыхільнікі названага пратэстанцкага накірунку мелі шмат сваіх абшчын у Іўі, Лоску, Любчы, Навагрудку, Клецку і іншых гарадах, а таксама свае органы самакіравання. Утапічнасць іх наіўна-сацыяльных летуценнняў, унутраная супярэчнасць прывялі да заняпаду антытрынітарызму, а ў сярэдзіне XVII ст. пад уціскам феадальна-каталіцкай рэакцыі яго паслядоўнікі былі выгнаны за межы Рэчы Паспалітай.

Значным укладам ў развіццё свабоды веравызнання ў ВКЛ стаў прывілей 1563 г. віленскага Сейма, які ўраўнаваў у правах з каталікамі ўсіх хрысціян. Мысліцелі, захопленыя ідэямі Рэфармацыі (С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан і інш.), у сваёй творчасці нярэдка выходзілі за межы царкоўна-рэлігійных спрэчак і ўздымалі важныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця. Яны ўпершыню паставілі і па-свойму растлумачылі праблемы бедных і багатых, прыватнай уласнасці і ўладання зямлёй, адносін да вайны і свецкай улады, узаемаадносін паміж царквой і дзяржавай.

**Другі этап (1570 – 1596 гг.)** беларускай Рэфармацыі характарызаваўся ўскладненнем грамадска-палітычнага жыцця, нарастаннем контр-рэфармацыйных тэндэнцый, умацаваннем пазіцый каталіцкай царквы ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Звужалася сацыяльная база Рэфармацыі – адбываўся масавы пераход шляхты, якая раней падтрымлівала яе, у каталіцтва.

**Трэці этап** ахопліваў перыяд **з 1596 г.** (года падпісання Берасцейскай царкоўнай уніі) **да сярэдзіны XVII ст.**, калі востра адчуваўся крызіс руху, выкліканы наступленнем контррэфармацыі, унутранымі супярэчнасцямі ў асяроддзі пануючага саслоўя, звужэннем сацыяльнай базы, расколам сярод пратэстантаў, а таксама ўзросшай роллю Польшчы ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай. У другой палове XVII ст. рэфармацыйны рух сярод насельніцтва беларускай часткі Рэчы Паспалітай згас. Засталася народжаная ім пратэстанская царква, роля якой у духоўным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі сталася мізэрнай.

### 3. Контррэфармацыя

**Контррэфармацыя** – рэлігійна-палітычны рух у Еўропе ў другой палове XVI ст. – XVII ст., узначалены папствам і накіраваны супраць Рэфармацыі.[91]

Вызначальнай падзеяй контррэфармацыі стала заснаванне былым рыцарам, іспанцам Ігнаціем Лайолай ў 1534 г. манаскага ордэна "Воінства Ісуса Хрыста" (**езуіты**) для барацьбы з пратэстантамі і ерэтыкамі. Для гэтага "Святая інквізіцыя" (1542) заснавала вярхоўны трыбунал у Рыме. На кастры былі спалены Дж. Бруна і Лючыліа Ваніні, праследаваліся Т. Кампанела, Г. Галілей.

[91] Чытай падрабязней: "Контррэфармацыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 тамах. Т. 4. – С. 230-232".

Мэтам узмацнення каталіцызма паслужыў **Трыдэнцскі сабор** (1545–1563 гг.). Дзякуючы намаганням папскіх легатаў і езуітаў, якія пасяхова кіравалі саборнымі справамі і заключылі асобыя пагадненні з галоўнымі манархамі Еўропы (германскім, іспанскім і французскім), на саборы атрымала перавагу ідэя папскага паўнаўладдзя. Папа Рымскі прызнаваўся адзіным аўтарытэтам у царкоўных справах, а ў рашэннях свецкіх пытанняў быў пастаўлены вышэй кіраўнікоў дзяржаў, замацоўвалася набажэнства на лацінскай мове. Было перагледжана вучэнне каталіцкай царквы, пры гэтым увага надавалася палеміке з пратэстантамі ("Трыдэнцскі сімвал веры"). Адмяняліся індульгенцыі, уводзіліся пастановы аб уздыме адукацыі і маралі каталіцкага духавенства. Папы Павел III, Пій IV і Пій V першымі паказалі ўзор аскетычнага жыцця і энергічнай барацьбы з Рэфармацыяй. Наступны папа, Грыгорый XIII (які ўвёў новае летазлічэнне) праявіў свой рэлігійны фанатызм у час знішчэння некалькіх тысяч французскіх гугенотаў ("Варфаламееўская ноч" у 1572 г.). Адраджэнню каталіцызма садзейнічалі такія ганіцелі Рэфармацыі, як каралі Іспаніі, Францыі, германскія князі і імператары.

Усялякае адхіленне ад пастаноў сабора разглядалася як ерась і падлягала ганенням. У 1559 г. выйшаў у свет "Індэкс забароненых кніг", чытанне якіх пагражала каталікам адрачэннем ад царквы. За спробу развіцця нерэлігійнай філасофіі трагічны лёс напаткаў і нашага земляка з Берасцейшчыны Казіміра Лышчынскага. Сам былы езуіт, за рукапіс "Аб неіснаванні бога" ён быў прыгавораны да смерці 30 сакавіка 1689 г. Паўтарэнне трагедый, рэгулярныя паляванні "на ведзьмаў", пагоні за **дысідэнтамі (некаталікамі ў Рэчы Паспалітай)** расцягнуліся да канца XVIII ст.

Найбольшай уладай інквізіцыя карысталася ў Іспаніі, дзе ёй аказаваў падтрымку фанатычны католік кароль Філіп II. Пры садзейнічанні езуітаў у адных краінах распаўсюджванне Рэфармацыі было замаруджана, у другіх – рэфармацыйны рух зусім знішчаны. Да ліку апошніх можа быць аднесены і славянскі рэгіён.

**Контррэфармацыйны рух на Беларусі** атрымаў перавагу па прычыне слабай падтрымкі пратэстантаў сярод простага люду. У ВКЛ пачаткам Контррэфармацыі лічыцца 1569 г., калі ў Вільню прыехала 13 першых езуітаў, якіх запрасіў віленскі біскуп В. Пратасевіч для арганізацыі ўніверсітэта. У ахопленыя Рэфармацыяй землі былі накіраваны дасведчаныя місіянеры, багасловы, прапаведнікі, сярод якіх знаходзіўся галоўны ідэолаг Контррэфармацыі ў ВКЛ **Пётр Скарга**. Яшчэ ў 1557 г. ён выдаў сваю кнігу "Аб еднасці царквы Божай і аб грэчаскім ад гэтай еднасці адступленні", дзе даводзіў прычыны, па якіх у праваслаўнай царкве ніколі не будзе парадку. Амаль адразу езуіты атрымалі прыхільнікаў сваёй асветніцкай дзейнасці – школы езуітаў давалі бясплатную адукацыю, побач з калегіумамі яны адчынялі аптэкі, шпіталі, прытулкі для бяздомных, дапамагалі ў часы народных бедстваў. (Руіны, якія мы зараз можам убачыць перад Вечным агнём Брэсцкай крэпасці ўяўляюць сабой рэшткі езуіцкага касцёла і калегіума XVII ст.).

Выпрацаваныя стагоддзямі раней нормы рэлігійнай талерантнасці не дапусцілі тут такіх жудасных формаў барацьбы з пратэстантызмам, як у Заходняй Еўропе, хаця каралеўская ўлада Рэчы Паспалітай актыўна падтрымлівала езуітаў, асабліва Стэфан Баторый. "Люблінская унія, Рэфармацыя і контррэфармацыя, завяршэнне працэсу фарміравання ўсходнеславянскіх народнасцяў, ускладнёнае дэнацыяналізацыяй сацыяльных вярхоў, стварылі новую геапалітычную сітуацыю ва Усходняй Еўропе і новую культурна-рэлігійную сітуацыю на тэрыторыі Беларусі і Украіны. Праваслаўная царква, што з'яўлялася адной з асноўных крыніц і носьбітаў духоўнасці, асветы, літаратуры, мастацтва, этнічнай адметнасці, знаходзілася тады, паводле слоў сучасніка, у стане "упадку, знішчэння і апушчэння". Стала відавочным культурнае "спазненне"

беларускага і ўкраінскага грамадства, арыентаванага на Візантыю і яе культуру, якая страціла лідзіруючае становішча ў хрысціянскім свеце, ад цэнтральна- і заходнееўрапейскіх краін".[92] Захопленая туркамі Візантыя страціла палітычны, рэлігійны і культурны прэстыж, а шукаць праваслаўным падтрымкі ў створанага ў 1596 г. Маскоўскага патрыярхата, які прысвоіў сабе місію "трэцяга Рыма", не прыходзілася – пасля спусташальнай Лівонскай вайны распаўсюджвання ўплыву Масковіі баяліся. Затое прыцягальны прыклад духоўнага ўздыму даў, пераадолеўшы рэфармацыйны крызіс, каталіцкі Захад. Контррэфармацыя ў ВКЛ была накіравана не толькі супраць пратэстантызму, але і супраць праваслаўя. На хвалі яе нарадзілася **Берасцейская ўнія 1596 г.** і была створана **уніяцкая (грэка-каталіцкая) царква**. На думку шэрагу даследчыкаў, гэтая унія паміж каталіцызмам і праваслаўем з'яўлялася спробай стварэння беларускай нацыянальнай царквы. Сапраўды, уніяцкая вера, якую ў канцы XVII ст. вызнавала ўжо ¾ насельніцтва беларускіх зямель, спалучала падпарадкаванне Папе Рымскаму і абрадавасць праваслаўнай царквы. У ёй ужывалася родная мова, што, несумненна, адпавядала духу Рэфармацыі. З другога боку, справядліва адзначаецца, што ўнія, план якой выкладаўся яшчэ папскім легатам Антоніо Пасевінам, была спробай паступова схіліць да каталіцтва праваслаўных вернікаў.

Супраць каталіцкай экспансіі змагаліся пратэстанцкія абшчыны і праваслаўныя брацтвы, царкоўныя пісьменнікі-палемісты. У 1599 г. акт аб узаемнай дапамозе падпісалі 168 беларускіх і літоўскіх магнатаў і шляхціцаў гэтых канфесій. Берасцейскі ігумен **Афанасій Філіповіч** за абарону праваслаўя быў залічаны да ліку святых. У канцы XVI ст. адбылося Полацкае паўстанне супраць увядзення грыгарыянскага календару, у 1623-м – Віцебскае антыўніяцкае паўстанне, антыкаталіцкую накіраванасць мела і антыфеадальная вайна 1648–1651 гг.

Асаблівым ганенням падлягалі антытрынітарыі: сейм 1658 г. прыгаварыў іх да выгнання з Рэчы Паспалітай. Найбольш адчувальная да палітычнай кан'юнктуры кальвінісцкая шляхта ў новых абставінах стала пераходзіць у каталіцтва. **Мілецій Сматрыцкі**, вядомы абаронца праваслаўнай царквы, ў творы "Фрынас" (1610 г.) назваў 47 магнацкіх праваслаўных родаў, якія далучыіся да каталіцкай канфесіі, ў тым ліку прынялі дзяржаўную веру і сыны пратэктара Рэфармацыі ў ВКЛ М. Радзівіла Чорнага, дзеці і ўнукі "стаўпа праваслаўя" К. Астрожскага.[93]

Хаця ў абставінах рэлігійнай барацьбы ў "Статут ВКЛ 1588 г." зноў быў унесены артыкул аб верацярпімасці, гэта не змяніла сітуацыі. З цягам часу Контррэфармацыя перамагла, рэлігійная талерантнасць ВКЛ была скасавана. Наступ Контррэфармацыі працягваўся і ў другой палове XVII ст. – XVIII ст. Толькі ў 1769 г. сейм забараніў езуіцкі ордэн у Рэчы Паспалітай, а маёмасць і зямельныя ўладанні канфіскаваў. Адбывалася амаль поўная клерыкалізацыя культуры і падпарадкаванне яе рэлігіі. Навуковыя веды абвяшчаліся грахоўнымі. Былі страчаны многія бліскучыя дасягненні навукі і культуры папярэдніх стагоддзяў. У параўнанні з эпохай Адраджэння ўзровень адукацыі панізіўся. Але ў сучаснай айчыннай навуцы існуе два падыходы да ацэнкі Контррэфармацыі. Першы разглядае яе як пераўтварэнне Беларусі ў канцы XVII ст. у амаль што інтэлектуальную пустыню, другі – сцвярджае, што духоўна-культурная функцыя конртррэфармацыі на беларускіх землях была шматзначная.

Беларускі гуманістычны, а таксама рэфармацыйны рух, які адлюстроўваў тэндэнцыі Адраджэння, выклікаў у прадстаўнікоў прагрэсіўнай грамадскай думкі Беларусі рэлігійны скептыцызм (Ф. Скарына, С. Будны, Л. Зізаній). Ён праявіўся ў суб'ектыўным падыходзе да

[92] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – С. 414.

[93] Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн., 1996. – С. 41.

веры, пераглядзе многіх артадаксальных рэлігійна-філасофскіх паняццяў, спробе самастойнай інтэрпрэтацыі Бібліі, пратэсце супраць рэлігійнага фанатызму і нецярпімасці.

**Заключэнне**. Калі гуманізм як рух за новую свецкую культуру апеляваў да найбольш адукаванай часткі грамадства, то Рэфармацыя, якая ставіла мэту абнавіць на аснове Евангелля жыццё кожнага хрысціяніна, звярталася да шырокіх мас. У краінах, дзе перамагла Рэфармацыя, царква апынулася ў залежнасці ад дзяржавы, карысталася меншаю ўладаю, ад праведзенай секулярызацыі згубіла сваю эканамічную моц. Усё гэта аблягчыла развіццё свецкай культуры і навукі.

Пратэстантызм выпрацаваў функцыяніруючую сёння ў разуменні мільёнаў людзей асаблівую этыку – этыку працы, эканамічнай дзейнасці, дагаворных адносін, беражлівасці, педантызму і іншых бюргерскіх дабрадзейнасцяў, якія ўвайшлі ў паўсядзённы побыт краін Еўропы і Новага Света. Буржуазія, якая станавілася ўсё больш уплывовай, атрымала "танную" і зручную рэлігію, якая адпавядала інтарэсам гэтага класа. Такая рэлігія не патрабуе вялікіх сродкаў на будаўніцтва храмаў і абслугоўванне пышнага культу, што мае месца ў каталіцызме. Яна не адбірае шмат часу для малітваў, паломніцтваў да святых месцаў, іншых абрадаў і рытуалаў. Яна не абмяжоўвае жыццё і паводзіны чалавека выкананнем пастоў, выбарам ежы, не патрабуе якіх-небудзь праяўленняў сваёй веры. Такая рэлігія задавальняе і сучаснага чалавека.

## *Лекцыя чацвёртая*

# РАЗВІЦЦЁ І ЗАЦВЯРДЖЭННЕ КАПІТАЛІЗМУ Ў ЕЎРОПЕ І АМЕРЫЦЫ

1. Станаўленне капіталізму як грамадска-эканамічнай фармацыі.
2. Зацвярджэнне капіталізму ў Еўропе і Амерыцы, фармаванне еўра-амерыканскай індустрыяльнай цывілізацыі.
3. Зацвярджэнне капіталізму на Беларусі.

## 2. Станаўленне капіталізму як грамадска-эканамічнай фармацыі

Развіцце і зацвярджэнне капіталізму пачалося ў перыяд гісторыі, які прынята называць "новым часам".[94] **Капіталізм** – гэта грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі наёмнай працы капіталам. Асноўныя рысы капіталізму:

– панаванне таварна-грашовых адносін і прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці;

– наяўнасць развітога грамадскага падзелу працы;

– пераўтварэнне рабочай сілы ў тавар;

– эксплуатацыя наемных рабочых капіталістамі,[95] (прычым капіталізм вызначаецца панаваннем эканамічнага прымусу, у адрозненне ад форм пазаэканамічнага прымусу, уласцівых для феадалізма і рабаўладальніцтва).

Раней за ўсё элементы капіталізму пачалі праяўляцца ў гарадах Італіі і Нідэрландах, дзе ўжо ў XIV ст. з'явіліся першыя капіталістычныя мануфактуры. Але для таго, каб зацвердзіўся капіталістычны ўклад, патрэбна было фармаванне шэрагу эканамічных, тэхнічных і сацыяльных перадумоў.

Перадумовы для зацвярджэння капіталізму сталі фармавацца ў эпоху **Адраджэння.** Пашырэнне гуманістычных ідэй нарадзіла новы ідэял чалавечай асобы: дзеючага, энэргічнага, актыўнага, высокаадукаванага чалавека – прадпрымальніка, вандроўніка, вынаходніка. Вызваленне чалавека ад рэлігійных дагматаў паклала пачатак **Вялікай навуковай рэвалюцыі XV – XVII стст**., калі зацвердзілася новая геліяцэнтрычная, а потым поліцэнтрычная сістэма свету (М. Капернік), быў адкрыты, маючы фундаментальны характар, закон сусветнага цягацення. (І. Ньютан), атрымаў развіццё матэрыялістычны накірунак у філасофіі (Ф. Бэкан, Р. Дэкарт). У сваю чаргу, дасягненні ў навуцы і тэхналогіі вытворчасці стварылі перадумовы для індустрыяльнага пераўтварэння свету.

Пачаўшаяся ў XVI ст. **Рэфармацыя** прывяла да ўзнікнення **пратэстантызму.** Пратэстантызм, асабліва адна з яго плыняў, **кальвінізм**, у найбольшай ступені адпавядалі псіхалогіі нараджаючагася класа буржуазіі, таму што кальвінізм дазваляў назапашваць зямное багацце (у той час, як каталіцкая царква адмоўна ставілася да ўзбагачэння, асуджала ліхвярства.) Не выпадкова менавіта кальвінізм стаў ідэйным сцягам першых буржуазных рэвалюцый: Нідэрландскай і Англійскай.

Такім чынам, **Адраджэнне, Вялікая навуковая рэвалюцыя і Рэфармацыя** ідэйна падрыхтавалі зацвярджэнне капіталізму. А матэрыяльныя перадумовы для зацвярджэння новага грамадска-эканамічнага ладу стварылі Вялікія геаграфічныя адкрыцці.

**Вялікія геаграфічныя адкрыцці** (карта 5) (пачынаючы з адкрыцця Амерыкі Х. Калумбам у 1492 г., марскога шляху ў Індыю Васка да Гама ў 1498 г., Бразіліі П. Кабралам у 1500 г.) і

---

[94] Новы час – перыяд гісторыі, які пачынаецца з XV ст. і доўжыцца да заканчэння Першай сусветнай вайны (1918 г.). Гл.: "Новая і навейшая гісторыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 5. – С. 329".

[95] Глядзі больш падрабязна: "Капіталізм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 4. – С. 98".

каланіяльныя захопы еўрапейцаў у Амерыцы, Афрыцы і Азіі ў XVI ст. за кароткі тэрмін улілі ў эканоміку хрысціянскага Захаду велізарныя рэсурсы. Вялікія геаграфічныя адкрыцці **(ВГА)** прывялі да пашырэння сусветнага рынку, уключылі ў тавараварот новыя, раней невядомыя еўрапейцам тавары, садзейнічалі ўзнікненню новых цэнтраў міжнароднага гандлю векселямі, валютай, таварамі, перамясцілі гандлевыя шляхі ў акіяны, паклалі пачатак каланізацыі адкрытых тэрыторый.

Гэтыя наступствы ВГА істотна паскорылі працэс **першапачатковага накаплення капіталу (ПНК), які лічыцца зыходным пунктам зацвярджэння капіталізму.** Для засваення сутнасці ПНК трэба мець на ўвазе, што у яго аснове ляжала аддзяленне дробнага вытворцы ад уласных сродкаў вытворчасці і яго пераўтварэнне ў наёмнага рабочага. Для арганізацыі капіталістычнай вытворчасці былі неабходны дзве ўмовы:

1) наяўнасць юрыдычна свабодных людзей, пазбаўленых сродкаў вытворчасці і вымушаных прадаваць сваю рабочую сілу;

2) накапленне грашовых сродкаў у руках пэўнай групы прадпрымальнікаў (купцоў, ліхвяроў, цэхавых майстроў).

ВГА якраз-такі і садзейнічалі ўтварэнню гэтых умоў. У дадатак да пералічаных вышэй наступстваў ВГА трэба згадаць і пра так званую **"рэвалюцыю цэн"**.[96] Рэвалюцыя цэн змяніла эканамічную сітуацыю ў еўрапейскіх дзяржавах. Для адных краін рост цэн прывёў да ўпадку гандлю і прамысловай вытворчасці (Іспанія, Партугалія), для другіх – да развіцця пасрэдніцкага гандлю. Падзенне рэальных заробкаў у шэрагу дзяржаў садзейнічала павышэнню прыбыткаў капіталістаў. Абясцэньванне грашовых сродкаў дваранства вяло да заняпаду ўсёй феадальнай сістэмы. Павышэнне цэн на тавары выклікала разарэнне дробных вытворцаў.[97]

Найбольш актыўна фармаванне капіталістычных вытворчых адносін ішло ў краінах, якія мелі выгаднае геаграфічнае становішча – знаходзіліся ў цэнтры шляхоў сусветнага гандлю (Галандыя, Англія).

З канца XV ст. да пачатку XVII ст. найбольш дынамічна развівалася **Галандыя.** Яе сталіца, Амстэрдам, з'яўлялася фінансавым цэнтрам свету.[98] Галоўнымі напрамкамі ўкладання галандскага капіталу сталі: знешні гандаль, развіццё суднабудаўніцтва, марскія перавозкі, рыбалоўства, банкаўская сфера і мануфактурная вытворчасць. Прычым, менавіта ў Галандыі ўпершыню з'явілася цэнтралізаваная **мануфактура.**[99] Камерцыйнаму росквіту Галандыі спрыяла ўсталяванне ў ёй (першай з еўрапейскіх краін) верацярпімасці. Рэлігійная свабода заахвочвала да перасялення ў Галандыю яўрэяў з Іспаніі і Партугаліі, англійскіх пурытан, французскіх гугенотаў.

---

[96] **"Рэвалюцыя цэн"** была выклікана напльівам каштоўных металаў у Еўропу (золата і серабра). За стагоддзе колькасць каштоўных металаў павялічылася амаль утрая. Пры гэтым золата і серабро былі атрыманы ў калоніях на аснове прымусовай, бясплатнай працы абарыгенаў. Таму грошы з высакародных металаў значна патаннелі, а цэны на тавары адпаведным чынам узраслі.

[97] Трэба згадаць, што працэс юрыдычнага вызвалення залежных сялян пачаўся ў Заходняй Еўропе значна раней у выніку **камутацыі** рэнты (перавода павіннасцей у грашовую форму)

[98] Амстэрдам з'яўляўся сусветным цэнтрам гандлю і крэдыту, тут былі заснаваны першая біржа сучаснага тыпу, банк, Ост-Індская кампанія. Гэтая кампанія стала першым дзелавым прадпрыемствам, арганізаваным у форме акцыянернага таварыства. У абмен на долю прыбыткаў урад Галандыі надаў кампаніі шырокія паўнамоцтвы: права мець уласную армію, весці дыпламатычныя перагаворы з туземнымі ўладарамі, чаканіць манету і інш. Галандцы падпарадкавалі свайму кантролю Малуокскія астравы ("астравы вострых прыпраў") і іншыя астравы Малайскага архіпелагу, паўвостраў Малаку, востраў Цэйлон, поўдзень Індастана, а цэнтрам Галандскай Індыі зрабілі г. Батавію (зараз Джакарта) на востраве Ява, адкуль паслалі экспедыцыю ў Японію і Аўстралію (да к. XVIII ст. называлася Новай Галандыяй), дзе сустракаліся з кітайцамі-гандлярамі чаем і фарфорам, шоўкам. На астравах Малайскага архіпелага галандцы насаджалі цукровыя і кафейныя плантацыі. Каланіяльная экспансія Галандыі ахапіла таксама Афрыку (апорныя кропкі – на поўдні – Капская калонія, на экватары – Залаты Бераг і астравы Зялёнага мысу) і Новы Свет (Новы Амстэрдам у Паўночнай Амерыцы; астравы ў Карыбскім моры, частка Бразіліі). Галандцы завалодалі і ключавымі пазіцыямі ў гандлі паміж поўднем і поўначчу Еўропы. (Гл.: "Всемирная история. В 10 томах. Т. 4. – М., 1958. – С. 700-706").

[99] **Мануфактура** (ад лац. manus – рука і faktura – выраб) – форма арганізацыі вытворчасці, заснаваная на выкарыстанні наёмнай працы і падзеле тэхналагічнага працэсу на шэраг асобных аперацый. Выдзяляюць тры асноўных тыпа мануфактур: цэнтралізаваная, альбо "канцэнтрыраваная", мануфактура з падзелам працы, якая нагадвала капіталістычную фабрыку; "рассеяная", ці дэцэнтралізаваная, якая была заснавана на хатняй прамысловасці; мануфактура змешанага тыпу, якая спалучала ў сябе элементы першых дзвюх тыпаў.

У сярэдзіне XVII ст. Галандыя пачынае саступаць эканамічнае лідэрства Англіі. Асноўнымі перадумовамі эканамічнага ўзвышэння Англіі сталі:

- ВГА, якія паставілі краіну ў цэнтр новых гандлёвых шляхоў са Старога ў Новы Свет;
- разлажэнне феадалізму, знішчэнне прыгоннага права;
- значны уздым суконна-воўнавай вытворчасці;
- сістэма каланіалізму;[100]
- гандаль рабамі;
- буржуазная рэвалюцыя (1640–1688), якая замацавала доступ буржуазіі да кіравання дзяржавай.

Англія пасяхова здзейсніла працэс першапачатковага накаплення капіталу. Гэтаму садзейнічалі :

- аграрны пераварот, у працэсе якога лендлорды выгналі сялян з зямельных надзелаў, пераўтварыўшы іх ў пашу;
- секулярызацыя зямлі (захоп англійскім дваранствам царкоўных зямель);
- сістэма дзяржаўнай запазычаннасці, пры якой каралеўская ўлада пад высокія працэнты пазычала ў ліхвяроў грошы, і, тым самым, садзейнічала павелічэнню капіталаў маладой буржуазіі;
- дзяржаўная **палітыка пратэкцыянізму**[101] (усталяванне высокіх мытных падаткаў на імпартныя тавары, прынятце Навігацыйнага акту, які забараняў увозіць у Англію караблям іншых краін тавары з трэціх краін і гандляваць з брытанскімі калоніямі).

Такім чынам, з XVI ст. ў Заходняй Еўропе пачаўся працэс узнікнення новага тыпу грамадства – капіталістычнага. Дзякуючы гэтаму Заходняя цывілізацыя пачынае развівацца больш дынамічна і імклівa ў параўнанні з іншымі цывілізацыйнымі сістэмамі, становіцца эпіцэнтрам развіцця чалавецтва.

Гісторыю развіцця **капіталізму** падзяляюць на **3 асноўныя стадыі**:

I – генэзіс капіталізму, мануфактурны перыяд развіцця (XVI ст. – апошняя трэць XVIII ст.);

II – даманапалістычная стадыя, якая характарызавалася прамысловым пераваротам і індустрыялізацыяй (апошняя трэць XVIII ст. – апошняя трэць XIX ст.);

III – пераход ад свабоднай канкурэнцыі да панавання манаполій (70-я гг. XIX ст. – пач. XX ст.)

У перыяд XVI ст. – апошняй трэці XVIII ст. адбываецца станаўленне **перадіндустрыяльнага грамадства**. У гэты час **у сацыяльна-палітычнай сферы** праяўляюцца разнародныя тэндэнцыі:

- фарміруюцца стабільныя абсалютныя манархіі (Францыя, Іспанія);
- ідзе барацьба за палітычную роўнасць, узмацняецца ўплыў трэцяга саслоўя, пачынаецца эра **буржуазных рэвалюцый**[102] (Нідэрландская, Англійская);
- абвастраюцца сацыяльныя канфлікты, уздымаюцца народныя паўстанні.

---

[100] У гады кіравання Елізаветы Цюдор (1558–1603 гг.) пачынаецца ўзвышэнне Англіі як марской дзяржавы. У 1579 г. была заснавана першая англійская калонія ў Паўночнай Амерыцы, атрымаўшая назву ў гонар каралевы Вірджынія ("Нявінніца"). Быў створаны шэраг купецкіх кампаній, атрымаўшых ад каралевы манапольныя правы на вядзенне заморскага гандлю. Самай прыбытковай з іх стала англійская Ост-Індская кампанія. З цягам часу Англія перамагла Галандыю ў гандлёвых войнах, дамаглася статуса гегемона на сусветным акіяне і ў каланіяльным гандлі. (Гл.: "Всемирная история. В 10 томах. Т. 4. – С. 706-709").

[101] **Пратэкцыянізм** (ад лац. protectio – абарона, ахова) – сістэма эканамічных мерапрыемстваў па ахове прамысловасці і сельскай гаспадаркі якой-небудзь краіны ад замежнай канкурэнцыі (у прыватнасці, мытная палітыка). (Гл.: "Краткий словарь иностранных слов. Изд. 5. – М., 1977. – С. 225").

[102] **Буржуазная рэвалюцыя** – гэта тып сацыяльнай рэвалюцыі, якая аб'ектыўна накіравана на ліквідацыю феадалізму і ўсталяванне палітычнай улады буржуазіі, стварэнне ўмоў для развіцця капіталізму. Не мяняючы карэнным чынам прыватнага характару ўласнасці на сродкі вытворчасці, буржуазная рэвалюцыя здымае з яе абмежаванні і надае першаступеннае значэнне фінансаваму і прамысловаму капіталу. На гэтай аснове ствараецца новы тып рынку – капіталістычны. Новая сацыяльная сіла, што прыходзіць да ўлады ў выніку буржуазнай рэвалюцыі, кардынальна мяняе форму дзяржаўнага ладу: на змену абсалютысцкай манархіі прыходзіць абмежаваная (канстытуцыйная) манархія, або рэспубліка. Першай пераможнай буржуазнай рэвалюцыяй была Нідэрландская (1566 – 1609), другой – Англійская (1640 – 1688). (Гл.: "Буржуазная рэвалюцыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 2. – С. 138-139").

## 2. Зацвярджэнне капіталізму ў Еўропе і Амерыцы, фарміраванне еўраамерыканскай індустрыяльнай цывілізацыі

Другі перыяд развіцця капіталізму (перыяд панавання свабоднай канкурэнцыі) пачынаецца з прамысловага перавароту.

**Прамысловы пераварот** – гэта сукупнасць эканамічных, сацыяльных і палітычных зрухаў, азнаменаваўшых пераход ад мануфактурнай стадыі капіталізму да фабрычнай сістэмы вытворчасці, заснаванай на машыннай тэхніцы. У выніку гэтых зрухаў капіталістычны спосаб вытворчасці атрымаў адпавядаючы яго характару тэхнічны базіс і зацвердзіўся як фармацыя.

Прамысловы пераварот – гэта досыць працяглы працэс, які ахапіў больш за стагоддзе (з 60-х гг. XVIII ст. – да канца 80-х гг. XIX ст.) і разгарнуўся на прасторы ад Паўночнай Амерыкі да Расіі, уключаючы большую частку Еўропы.

Першай здзяйсняе прамысловы пераварот Англія, дзе пераход ад мануфактуры да фабрыкі пачаўся раней, чым у іншых краінах. Галоўнымі перадумовамі прамысловага перавароту сталі:

- першапачатковае накапленне капіталу, у выніку чаго з'явілася армія наёмных рабочых;
- тэхнічныя нававядзенні і вынаходніцтвы (галоўнае з іх – універсальная паравая машына);
- шырокая каланіяльная экспансія[103], якая дала капітал і сыравінныя рэсурсы;
- прыродна-кліматычныя ўмовы краіны і павелічэнне тэмпаў прыросту насельніцтва.

Першая здзейсніўшы прамысловы пераварот, Англія становіцца “майстэрняй свету”, на доўгі час усталёўвае сваю прамысловую і гандлёвую гегемонію.[104] Пачаўшыся ў Англіі, у XIX ст., прамысловы пераварот ахапіў і іншыя краіны Захаду. Першай з кантынентальных еўрапейскіх краін яго здзейсніла **Бельгія.** Прамысловы пераварот у Францыі пачаўся яшчэ ў канцы XVIII ст., але яго завяршэнню перашкаджалі непаслядоўнасць Французскай буржуазнай рэвалюцыі і напалеонаўскія войны. Прамысловы пераварот у Германіі затрымаўся па прычыне наяўнасці вялікіх феадальных пережыткаў і раздробленасці гэтай краіны. У абедзвюх краінах прамысловы пераварот завяршыўся толькі ў другой палове XIX стагоддзя( 50-я– 70-я гады).

Калі капіталізм стварае адпавядаючую сабе базу (сістэму машын і фабрыку як яе арганізацыйнае ўвасабленне), пачынае фармавацца **індустрыяльнае грамадства**. Для індустрыяльнага грамадства характэрны машынны характар арганізацыі працы, што накладвае адбітак на эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя адносіны. Галоўнымі сацыяльнымі наступствамі прамысловага перавароту становяцца: маёмасная дыферэнцыяцыя насельніцтва, зніжэнне заробкаў, павышэнне інтэнсіўнасці працы, павелічэнне працягласці працоўнага дня і інш. Гэта выклікае сацыяльную напружанасць у краіне, стыхійныя выступленні рабочых. Расце ўрбанізацыя краіны, зніжаецца ўдзельная вага сельскага насельніцтва.

---

[103] У XVIII ст Англія удзельнічала у 119 канфліктах, звязаных з каланіяльнымі пытаннямі. Сямігадовая вайна (1756–1763) прынесла Англіі адабраныя ў французаў Канаду і Луізіану (вобласць басейна р. Місісіпі ў Паўночнай Амерыцы) і Бенгалію, якая стала плацдармам для заваёвы Індыі. Да канца 40-х гг. Ост-Індская кампанія завяршыла заваёву Індыі. У 1819 г. быў захоплены Сінгапур, у 1839 г. – Аден, які стаў апорным пунктам для падпарадкавання плямён поўдня Аравійскага паўвострава. У 1824 г. па Нанкінскаму дагавору востраў Ганконг быў перададзены Англіі ў “вечнае валоданне”. У 1852–1853 гг. была захоплена ўся Паўднёвая Бірма і далучана да Індыі. Такім чынам, да сярэдзіны XIX ст. Англія стала цэнтрам агромістай каланіяльнай імперыі. (Гл.: “Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 106-107”).

[104] У 1850 г. англійская буржуазія дамагаецца адмены законаў, якія абмяжоўвалі свабоду гандлю. Дзякуючы гэтаму больш танныя і якасныя англійскія тавары выцясняюць з рынкаў тавары іншых краін. Кантынентальная Еўропа трапляе ў залежнасць ад англійскіх паравых машын, станкоў, метала, вуглю. Дзякуючы хуткаму развіццю новых відаў воднага транспарту, Англія стала не толькі сусветным фабрыкантам, але і сусветным перавозчыкам тавараў. Гэтая краіна таксама замацавалася на становішчы сусветнага банкіра: Лондан быў фінансавым цэнтрам свету, а брытанскі фунт стэрлінгаў дамінаваў у міжнароднай валютнай сістэме залатога стандарту, прынятай у 1870-я гг. ЗША і кантынентальнай Еўропай па англійскаму ўзору.

У эпоху прамысловага перавароту нараджаецца і новая ідэалогія – **Асветніцтва**[105], якая сцвярджала прыярытэт асветы, навукі, розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Усталяванню Асветніцтва спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве і дасягненні гуманітарных ведаў. Ідэолагі Асветніцва верылі ў вялікія магчымасці чалавека па пераўтварэнню прыроды, рацыянальнаму выкарыстанню яе багаццяў. А асобныя асветнікі вылучалі ідэі пабудовы грамадства на справядлівых пачатках. Такім чынам, ідэалогія Асветніцтва падрыхтоўвала глебу для распаўсюджвання ў грамадстве рэвалюцыйных ідэй. Пад уплывам ідэй Асветніцтва стала фармавацца своеасаблівая культура індустрыяльнай эпохі, галоўнай рысай якой быў яе выразна свецкі характар. У шэрагу краін ідэі Асветніцтва спрыялі пераходу ў другой палове XVIII ст. ад абсалютнай манархіі да **асветнага абсалютызму** (Аўстрыя, Прусія, Расія часоў Кацярыны II). Гэтая палітыка праяўлялася ў пераўтварэнні "зверху" (адукаваным манархам) састарэлых феадальных інстытутаў: ліквідацыі некаторых саслоўных прывілегій, памягчэнні цэнзуры, знішчэнні інквізіцыі, секулярызацыі царкоўнай маёмасці, падпарадкаванні царквы дзяржаве, рэформе школьнай адукацыі і г. д. Але пераўтварэнні асветнага абсалютызму насілі, безумоўна, абмежаваны характар. Далейшы прагрэс грамадства патрабаваў ліквідацыі абсалютызму.

Англійская буржуазная рэвалюцыя прывяла да ўсталявання ўлады буржуазіі і, што асабліва важна, (чым яна, дарэчы, аказала вялікі ўплыў на ход сусветнага і еўрапейскага развіцця) садзейнічала фармаванню ўяўлення аб вяршэнстве закона над усім астатнім, у тым ліку над уладаю каралёў. Абвешчаныя Англійскай рэвалюцыяй новыя прынцыпы і ідэі, новы эканамічны парадак ляглі ў аснову новай індустрыяльнай цывілізацыі, для якой характэрна зацвярджэнне новага палітычнага ладу – **буржуазнай дэмакратыі.** Яго тыповымі ўзорамі сталі: прэзідэнцкая рэспубліка ў ЗША, парламенцкая рэспубліка ў Францыі, канстытуцыйная манархія ў Англіі. На палітычнае жыццё Еўропы і Паўночнай Амерыкі ў XIX ст. вялікі ўплыў аказалі ідэі **лібералізма і нацыяналізма**, абвешчаныя Вялікай французскай буржуазнай рэвалюцыяй (1789–1794 гг). Лібералы змагаліся за сцвярджэнне **новых прынцыпаў дэмакратыі: улада народа, яго ўдзел у кіраванні, свабода слова, сумлення, друку.** Абуджэнне нацыянальных пачуццяў народаў, іх барацьба за аб'яднанне, за вызваленне з-пад гнёту замежных захопнікаў прывялі да ўтварэння шэрагу **новых нацыянальных дзяржаў: Грэцыі (1829), Румыніі (1861), Італіі (1870), Германіі (1870).**

Вайна брытанскіх калоній у Паўночнай Амерыцы за незалежнасць (1776–1783 гг.), якая мела характар буржуазнай рэвалюцыі, прывяла да ўтварэння новай дзяржавы – Злучаных Штатаў Амерыкі (1776). **17 верасня 1787 г. ў ЗША была прынята першая ў свеце Канстытуцыя.** Пасля завяршэння вайны за незалежнасць ў краіне адразу пачынаецца прамысловы пераварот. Але наяўнасць рабаўладальніцтва на поўдні краіны перашкаджала яго завяршэнню. Грамадзянская вайна паміж Поўднем і Поўначчу 1861 – 1865 гг., якая мела характар другой буржуазнай рэвалюцыі, расчысціла шлях хуткаму развіццю капіталізма ў ЗША. Зручнае геаграфічнае становішча краіны, хуткі рост насельніцтва за кошт перасяленцаў з іншых кантынентаў, адмена рабства, адсутнасць феадальных перажыткаў, выкарыстанне сусветнага тэхнічнага вопыту садзейнічалі высокім тэмпам эканамічнага развіцця і да 70-х гг. XIX ст. пераўтварылі ЗША ў высокаразвітую індустрыяльную дзяржаву, якая па асноўным паказчыкам выйшла на 2-е месца ў свеце.

---

[105] **Асветніцтва** – антыфеадальная, буржуазная паводле сваёй сацыяльна-палітычнай сутнасці ідэалогія перыяду станаўлення капіталізму. У кожнай краіне Асветніцтва мела сваю храналогію і асаблівасці. Найраней яно выявілася ў Галандыі (У. Акоста, Б. Спіноза), у Англіі пасля перамогі буржуазнай рэвалюцыі набыло больш вольнадумны характар (Т. Гобс, Дж. Лок). Найвышэйшай ступені развіцця Асветніцтва дасягнула ў Францыі (Вальтэр, Ж.Ж. Руссо, Д. Дзідро). На Беларусі ідэі Асветніцтва распаўсюдзіліся ў другой палове 18 ст. (Б. Дабшэвіч, К. Нарбут, М. Пачобут-Адляніцкі, А Нарушэвіч і інш.). (Гл. падрабязней: "Асветніцтва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі У 6 тамах. Т. 1. – С. 211-212").

Усталяванне фермерскага шляху развіцця сельскай гаспадаркі і актыўнае развіццё вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі далі магчымасць ЗША актыўна экспартаваць таннае збожжа і іншую сельскагаспадарчую прадукцыю ў Еўропу, што выклікала ў шэрагу еўрапейскіх краін, у тым ліку і на беларускіх землях, аграрны крызіс.[106]

Да 70-х гг. XIX ст. завяршыўся працэс капіталізацыі Еўропы. Еўрапейскія краіны і краіны Паўночнай Амерыкі, завяршыўшыя мадэрнізацыю, атрымалі перавагу над астатнім светам, заснаваным на пачатках традыцыяналізма.

Такім чынам, на працягу XIX ст. адбываюцца важныя структурныя змены ў развіцці заходняга тыпу цывілізацыі: станаўленне і развіццё ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы індустрыяльнай цывілізацыі. XIX ст. стала часам канчатковага ўсталявання **заходняга тыпу цывілізацыі як тэхналагічнай цывілізацыі,** заснаванай на паскараючымся прагрэсе навукі і тэхналогіі. У гэты ж час народы Азіі, Афрыкі і Амерыкі (за выключэннем Паўночнай) заставаліся на даіндустрыяльнай стадыі развіцця.

### 3. Зацвярджэнне капіталізму на Беларусі

Працэс станаўлення капіталізму на беларускіх землях пачаўся значна пазней, чым у Заходняй Еўропе. Нягледзячы на тое, што ў культурным сэнсе беларускія землі знаходзіліся пад пераважным уплывам заходняй культурнай традыцыі (тут актыўна распаўсюджваліся і адыгрывалі важную ролю ў развіцці культуры ідэі Адраджэння і Рэфармацыі), у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі панавалі зусім іншыя тэндэнцыі.

Калі ў XVI ст. у Заходняй Еўропе пачаўся працэс генэзісу капіталізму, Усходняй Еўропе, у адпаведнасці са склаўшымся сусветным падзелам працы, была адведзена роля "аграрнай перыферыі" Заходняй Еўропы. З зямель, якія размяшчаліся на ўсход ад Эльбы (Вялікае княства Літоўскае, Польшча, Усходняя Прусія) на захад вывозілася сельскагаспадарчая прадукцыя. Рост попыту на збожжа ў краінах Заходняй Еўропы (пры тым, што гаспадарка развівалася на экстэнсіўнай аснове), стымуляваў працэс далейшага запрыгоньвання сялянства, прымацавання яго да зямлі і стварэння фальваркаў.[107]

Стварэнне на ўсход ад Эльбы фальварачна-паншчыннай сістэмы гаспадаркі ўвайшло ў гісторыю як **"другое выданне прыгонніцтва"** (значна больш жорсткае, чым у IX – XV стст.). Такім чынам, на беларускіх землях на доўгі час закансерваваліся феадальна-прыгонніцкія адносіны.

Фарміраванню капіталістычных адносін у далейшым перашкаджала адсутнасць моцнай каралеўскай улады і шляхецкая анархія. У Рэчы Паспалітай (у складзе гэтай дзяржавы беларускія землі знаходзіліся з 1569 г. да 1795 г.) ужо з другой паловы XVI ст. пачаўся крызіс абсалютызма, што, як вядома, у краінах Заходняй Еўропы было праявай фармавання перадіндустрыяльнай цывілізацыі. Але крызіс абсалютызма ў Рэчы Паспалітай завяршыўся не ўсталяваннем буржуазнай дэмакратыі (як у краінах Заходняй Еўропы), а зацвярджэннем "шляхецкай рэспублікі".

Рэч Паспалітая, як кантынентальная дзяржава, не мела магчымасцей для першапачатковага накаплення капіталу традыцыйнымі для марскіх дзяржаў шляхамі (марскія перавозкі, гандаль рабамі, пірацтва, абрабаванне калоній), а слабая каралеўская ўлада

---

[106] Падчас грамадзянскай вайны было прынята шэраг важных урадавых рашэнняў, паспрыяўшых эканамічнаму развіццю краіны, у тым ліку, утварэнне Ціхаакіянскай чыгуначнай кампаніі і "Закон аб Гамстэдах" (1862). Пачатак чыгуначнага будаўніцтва "ад акіяна да акіяна" (у 1869 г. была збудавана першая транскантынентальная магістраль) выклікаў уздым разнастайных галін прамысловасці. А прыняцце Гамстэд-акту, адпаведна якому кожны мог атрымаць зямельны ўчастак на Далёкім Захадзе памерам у 160 акраў і, адпрацаваўшы на ім 5 гадоў, набыць яго ва ўласнасць, садзейнічала перамозе фермерскага шляху ў сельскай гаспадарцы ЗША. (Гл.: "Экономическая история зарубежных стран. – С. 159-162").

[107] **Фальварк** (польск. folwark, ад ням. forwerk – хутар) – від феадальнага зямельнага ўладання ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай: двор феадала з комплексам будынкаў і угоддзяў. (Гл. падрабязней "Фальварк // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 6, кн. II. – Мн., 2003. – С. 23").

не праяўляла зацікаўленасці ў правядзенні **меркантылісцкай палітыкі**,[108] якую, напрыклад, актыўна праводзілі манархі Францыі і Расіі, пачынаючы з Пятра I і Кацярыны II. У суседняй Расіі намаганнямі манархаў здзяйсняецца "рэвалюцыя зверху": ствараецца дзяржаўны капіталізм.

Беларускія землі, да таго ж, у другой палове XVII ст. – першай палове XVIII ст. перажываюць гаспадарчы заняпад, звязаны з няўстойлівымі палітычнымі абставінамі (барацьба магнатаў паміж сабой за ўладу набыла характар грамадзянскай вайны), шматлікімі войнамі і звязанымі з гэтым рэзкім скарачэннем колькасці насельніцтва і змяншэннем колькасці ворыўных зямель.

Ажыўленне ва ўсіх сферах эканомікі Беларусі пачалося толькі ў другой палове XVIII ст. Гэтаму садзейнічалі:

- хуткі рост насельніцтва;
- узрастанне попыту на сельскагаспадарчыя прадукты як у самой Беларусі, так і за яе межамі;
- мерапрыемствы ўрада па развіццю гандлю і шляхоў зносін.[109]

Новай з'явай у эканамічным жыцці Беларусі XVIII ст. стала ўзнікненне мануфактурнай вытворчасці. Першым прадпрыемствам мануфактурнага тыпу з'явілася шкляная мануфактура ў Налібоках (зараз Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). Яна была пабудавана ў пачатку 20-х гг. XVIII ст. жонкай канцлера Вялікага княства Літоўскага Ганнай Радзівіл. У наступны час з'яўляецца яшчэ шэраг вотчынных мануфактур,[110] якія не былі ў поўным сэнсе гэтага слова капіталістычнымі прадпрыемствамі.[111] У другой палове XVIII ст. актыўны ўдзел у развіцці мануфактурнай вытворчасці прыняў кароль Польшчы Станіслаў Аўгуст. Па яго загаду Антоній Тызенгаўз у 60–70-я гг. XVIII ст. стварыў больш за 20 буйных прамысловых прадпрыемстваў у каралеўскіх эканоміях.[112]

**У Рэчы Паспалітай** актыўна распаўсюджваюцца ідэі Асветніцтва і Французскай буржуазнай рэвалюцыі. Пад яе ўплывам **у 1791 г. прымаецца Канстытуцыя** (першая у Еўропе і другая ў свеце, пасля Канстытуцыі ЗША), якая адчыняе шлях развіццю буржуазнай дэмакратыі ў краіне. Такім чынам, да канца XVIII ст. ствараюцца перадумовы для фармавання на беларускіх землях індустрыяльнай цывілізацыі. Але наступны паварот палітычнай гісторыі яшчэ больш чым на 60 гадоў затрымаў гэты працэс.

Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і іх уключэнне ў агульнарасійскі рынак, з аднаго боку, стымулявала рост таварнасці сельскай гаспадаркі, а з другога боку, вяло да кансервацыі феадальна-прыгонніцкіх адносін. Аднак разлажэнне феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі паглыблялася. З сярэдзіны XIX ст. стаў відавочным яе крызіс.

Імкненне памешчыкаў павысіць прыбытковасць сваіх гаспадарак вымушала іх выкарыстоўваць удасканаленыя сельскагаспадарчыя машыны, працу наёмных рабочых,

---

[108] **Меркантылізм** (іт. Mercante – гандляр) – палітыка нацыянальных дзяржаў, накіраваная на павелічэнне грошай ў казне і дасягненне актыўнага гандлёвага балансу за кошт развіцця мануфактур і росту, тым самым, экспарту гатовых вырабаў, захопу галоўных шляхоў заморскага гандлю і каланіяльных кампаній.

[109] Былі пракладзены пінска-слонімскі і пінска-валынскі тракты, праведзены работы па збудаванню рачных партоў, дарог і мастоў. У 1784 г. завершана будаўніцтва канала, які злучыў прыток Немана Шчару з Ясельдай і Прыпяццю (канал Агінскага, альбо "Вялікі Пінскі канал", як яго тады называлі). У 1766 г. уводзяцца адзіныя для Вялікага княства Літоўскага меры вагі, аб'ёму і даўжыні.

[110] **Вотчынныя мануфактуры** – прадпрыемствы мануфактурнага тыпу, якія абслугоўваліся прымусовай працай прыгонных сялян, выкарыстоўвалі рамесную тэхніку і былі заснаваны на кааперацыі і тэхнічным падзеле працы.

[111] У 1751 г. князь Міхаіл Казімір Радзівіл заснаваў у Слуцку фабрыку паясоў. У Ружанах з'явіліся суконная і палатняная фабрыкі князя Сапегі, у мястэчку Ілля (Мінскі павет) – шкляны завод графа Салагуба, у маёнтку Мыш (Навагрудскі павет) - шкляны завод гетмана Масальскага. Прадпрыемствы, акрэсленыя як "фабрыкі" і "заводы" амаль не адрозніваліся ад звычайных майстэрняў па велічыні, аб'ёму вытворчасці і арганізацыі працы, на большасці з іх выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян. Гл.: "Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 114-115".

[112] **Эканоміі** – феадальныя зямельныя ўладанні ў Рэчы Паспалітай, выдзеленыя ў канцы XVIII ст. з дзяржаўных земляў для задавальнення патрэб караля і прыдворнай казны. Мелі ўласнае адміністрацыйна-гаспадарчае кіраванне. На Беларусі існавалі Брэсцкая, Гродзенская, Пінская і Слонімская эканоміі. (Гл.: "Эканомія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 6, кн. II. – С. 252").

уводзіць травасеянне і шматпольныя севазвароты. Гэта сведчыла аб пранікненні капіталістычных рыначных элементаў у гаспадарку. Сведчаннем пранікнення капіталізму на вёску было і развіццё адыходніцтва. Адыход сялян быў звязаны з сезоннымі, сплаўнымі і земляробчымі работамі. Вялікая колькасць сялян працавала ў 50-я гг. XIX ст. на будаўніцтве чыгунак за межамі тэрыторыі Беларусі.

З мэтаю пераадолення крызісных з'яў феадальна-прыгонніцкай сістэмы царскія ўлады рэалізуюць спробы гаспадарчых рэформ. З гэтых рэформ найбольш важнае значэнне мела **рэформа кіравання дзяржаўнымі сялянамі,** распрацаваная міністрам дзяржаўнай маёмасці **П. Д. Кісялёвым**, якая надала імпульс сялянскай ініцыятыве, спрыяла пашырэнню таварна-грашовых адносін і стварэнню рынка наёмнай рабочай сілы.[113] Але захаванне прыгонніцтва перашкаджала працэсу капіталізацыі сельскай гаспадаркі, скоўвала развіццё прамысловасці. Толькі правядзенне сялянскай рэформы 1861 г.[114] расчысціла шлях для свабоднага развіцця капіталістычных адносін.

У парэформенны час развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ішло хутчэй, чым навогул у Расіі. Гэтаму спрыялі наступныя акалічнасці:

- больш ільготныя ўмовы рэалізацыі на Беларусі сялянскай рэформы 1861 г.;
- актыўна разгарнуўшаеся на Беларусі, пачынаючы з 60-70 гг. XIX ст., чыгуначнае будаўніцтва;
- адсутнасць на большай частцы тэрыторыі Беларусі абшчыннага землекарыстання. Напярэдадні рэформы да 64 % сялянскіх двароў належалі да падворнай сістэмы землекарыстання.[115]

Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы праявілася:

– у станаўленні новых форм арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці;
– класавым расслаенні сялянства;
– павышэнні ўзроўня тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі;
– росце гандлёвага земляробства і жывёлагадоўлі, развіцці спецыялізацыі асобных раёнаў на вытворчасці канкрэтных відаў прадукцыі.

Развіццё капіталізма ў прамысловасці ў дарэформенны час здзяйснялася пераважна ў форме дробнатаварнай і мануфактурнай вытворчасці. Прамысловы пераварот на беларускіх землях пачаўся ў 30-я гг. XIX ст., а завершыўся толькі ў 90-я гг., на 10 гадоў пазней, чым у Расіі. Прычым, прамысловы пераварот на Беларусі пачаўся не з тэкстыльнай вытворчасці (як у Англіі), і не з баваўнянай (як у Расіі), а з металаапрацоўчай і вінакурнай прамысловасці. Прамысловасць Беларусі спецыялізавалася на перапрацоўцы сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны, у ёй пераважалі харчовая, гарбарная, тэкстыльная і дрэваапрацоўчая галіны. Па гэтай прычыне большасць прамысловых прадпрыемстваў размяшчалася ў сельскай мясцовасці.

Можна лічыць, што працэс капіталізацыі эканомікі Беларусі завяршыўся да 90-х гг. XIX ст., але далейшы эканамічны рост стрымліваўся перажыткамі прыгонніцтва (захаваннем памешчыцкага землеўладання, абшчыны ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі). Да таго ж Расія заставалася абсалютнай манархіяй.

**Заключэнне.** Як адзначалася раней, ужо ў сярэдзіне XIV ст. пачынаюць праяўляцца прыкметы крызісу сярэднявечнай цывілізацыі, а ў Новы час у Заходняй Еўропе, якая паранейшаму выступае эпіцэнтрам развіцця сусветнага гістарычнага прагрэсу, ствараецца перадіндустрыяльная цывілізацыя. Беларускія землі, якія ў перыяд сярэднявечча развіваліся на еўрапейскім узроўні, паступова губляюць дынамізм развіцця. Прыкметы перадіндустрыяльнай цывілізацыі праяўляюцца тут значна пазней, і толькі да канца XVIII ст. ствараюцца перадумовы індустрыяльнай цывілізацыі.

---

[113] Гл. падрабязней: "Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 136–143".
[114] Гл.: там жа. – С. 143-152.
[115] Аграрнае пытанне // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 1. – С. 36–40.

### *Лекцыя пятая*

## СВЕТ У КАНЦЫ XIX СТ. – ПАЧАТКУ XX СТ.

1. Другая тэхналагічная рэвалюцыя і яе наступствы.
2. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай капіталістычнай гаспадаркі на мяжы XIX – XX стст.
3. Барацьба капіталістычных краін за перадзел свету. Пачатак эпохі імперыялістычных войнаў.

### 1. Другая тэхналагічная рэвалюцыя і яе наступствы

Асноўнай рысай развіцця капіталістычных краін у канцы XIX ст. быў паступовы пераход ад капіталізма, заснаванага на свабоднай канкурэнцыі асобных самастойных прадпрыемстваў, да манапалістычнага капіталізму. Гэты пераход стаў вынікам усяго папярэдняга развіцця эканомікі капіталізму і ўздыму яго прадукцыйных сіл.

У апошнія тры дзясяцігоддзі XIX ст. прадукцыйныя сілы развіваліся вельмі імкліва. Гэтаму садзейнічала **другая тэхналагічначная рэвалюцыя, якая ахапіла прыкладна 50 гадоў (з апошняй трэці XIX ст. і да Першай сусветнай вайны 1914–1918 гг**). У сваю чаргу, тэхнічная рэвалюцыя стала працягам **навуковай рэвалюцыі**, якая кардынальна змяніла асновы навуковага мышлення і **прывяла да ўтварэння адзінай сістэмы навук**. Навуковая рэвалюцыя пачалася ў фізіцы і ахапіла ўсе асноўныя галіны навукі. Былі адкрыты электрон і радыяактыўнасць, распрацавана квантавая тэорыя (М. Планк) і тэорыя верагоднасці (А. Эйнштэйн). Вышэйшым дасягненнем хімічнай навукі стала перыядычная сістэма элементаў Д.І. Мендзелеева. Гэтае адкрыццё дапамагло вырашэнню многіх задач хіміі: здзяйсненню сінтэза рэчываў з загаддзя зададзенымі фукцыямі, распрацоўцы напаўправаднiковых матэрыялаў і розных каталізатараў.

У разглядаемы перыяд **навука ўпершыню атрымала сістэматычнае прыкладанне да вытворчасці**. Гэта вынікала з самой сутнасці тэхналагічнага працэсу буйной машыннай вытворчасці. Развіццё такіх галін прамысловасці, як машынабудаванне, прыборабудаванне, электратэхніка, хімічная вытворчасць стварала неабходную матэрыяльна-тэхнічную базу для навуковых эксперыментаў і, разам з тым, забяспечвала даследчыкаў новай апаратурай, прыборамі, рэактывамі, значна больш дасканалымі, чым на папярэдніх этапах культурнага развіцця. Сувязь навукі з вытворчасцю набывала больш трывалы і сістэматычны характар: усталявалася цесная ўзаемасувязь навукі і тэхнікі, абумоўленая паступовым пераўтварэннем навукі ў непасрэдную вытворчую сілу грамадства. Калі ў канцы XIX ст. навука заставалася “малой” (у гэтай сферы была занята невялікая колькасць людзей), то ў пачатку XX ст. спосаб арганізацыі навукі змяніўся: узніклі буйныя навуковыя інстытуты, лабараторыі, якія валодалі магутнай тэхнічнай базай. “Малая” навука пераўтварылася ў “вялікую”: колькасць занятых у гэтай сферы павялічылася, узніклі спецыяльныя ланцугі навукова-доследнай дзейнасці, задачай якіх стала хутчэйшае давядзенне тэарэтычных рашэнняў да тэхнічнага ўвасаблення, у іх ліку вопытна-канструктарскія распрацоўкі, вытворчыя даследванні, тэхналагічныя, вопытна-эксперыментальныя і інш.

Працэс рэвалюцыйных пераўтварэнняў у вобласці навукі ахапіў затым тэхніку і тэхналогію. Стрыжнем тэхнічнай рэвалюцыі канца XIX ст. – пачатку XX ст. стала **энергетыка**. Ад часу, калі ў пачатку 80-х гг. XVIII ст. Дж. Уатт вынайшоў універсальную паравую машыну, пачалася “эпоха пара, жалеза і вугалю”. Фабрычныя машыны

паўсюдна прыводзіліся ў дзеянне паравымі рухавікамі. Рэвалюцыйнае значэнне для змянення энергетычнай базы вытворчасці мела з'яўленне рухавікоў унутранага згарання, у якіх спачатку выкарыстоўваўся газ, а потым жыдкае паліва. У 1860 г. французскі вынаходнік Ж.Ж. Ленуар пабудаваў першы рухавік унутранага згарання, затым з'явіліся больш дасканалыя рухавікі, якія працавалі ад энэргіі, атрыманай пры згаранні газаў бензіна (Н. Отта) і нафты (Р. Дзізель). Новай тэндэнцыяй у тэхніцы стала з'яўленне электрагенератараў і электрарухавікоў. У 1867 г. ў Германіі В. Сімэнс стварыў электрамагнітны генератар, а ў 1870 г. была вынайдзена дынама-машына, якую можна было выкарыстоўваць не толькі як генератар, але і як рухавік, пераўтвараючы электрычную энэргію ў механічную. У 1883 г. Т. Эдзісон (ЗША) стварыў першы сучасны генератар, а ў 1891 г. – трансфарматар і, такім чынам, вырашыў чарговую задачу – перадачы электраэнэргіі на значныя адлегласці. У выніку **пар быў заменены элетрычнасцю,** пачалася ўсеагульная электрыфікацыя вытворчасці, склалася сучасная тэхналогія атрымання, перадачы і прыёма электраэнэргіі. Яе вытворчасць была арганізава на спецыяльных прадпрыемствах – электрастанцыях. Электрычную энэргію сталі выкарыстоўваць не только на прадпрыемтсвах, але і для прывядзення ў дзеянне сродкаў сувязі і асвятлення. Атрымалі развіццё **новыя галіны вытворчасці – электратэхніка, электрахімія**, з'явіліся першыя трамваі.

Стварэнне **рухавікоў унутранага згарання** здзейсніла пераварот на транспарце (у 1885 г. былі пабудаваны першы аўтамабіль Г. Даймлерам і К. Бенцам), у ваеннай тэхніцы (конная цяга стала выцясняцца механічнай), у сельскай гаспадарцы (з 1906 г. у ЗША з'явіліся трактары). У сувязі з гэтым шматразова павялічылася эканамічная значнасць нафты. Хуткімі тэмпамі стала ўзрастаць яе здабыча: у 1870 г. у свеце было здабыта 0,8 млн.т. нафты, а ў 1890 г. – ужо амаль 20 млн. т.[116] З'явілася **новая галіна вытворчасці – нафтаперапрацоўка**.

Значнае развіццё ў разглядаемы перыяд атрымала **хімічная тэхналогія**. Прамысловасць перайшла да вытворчасці пластмас, штучных матэрыялаў, былі вынайдзены спосаб атрымання зжыжанага паліва з вугалю, з'явілася магчымасць атрымання ўзрыўчатых рэчываў (у 1862 г. А. Нобель наладзіў вытворчасць нітрагліцэрына, а затым перайшоў да вытворчасці дынаміта).

Другая тэхналагічная рэвалюцыя вызначылася не толькі **стварэннем новых галін**, але **закранула і старыя галіны вытворчасці,** перш за ўсё **металургію**. Значныя змены адбыліся ў сталеліцейнай вытворчасці. У сярэдзіне 1850-х гг. англійскі вынаходнік і прадпрымальнік Г. Бесемэр увёў новы спосаб перадзела чугуна (прадуванне паветра цераз расплаўлены чугун, наліты ў асобную пасудзіну, якая круціцца вакол сваёй асі – канвертар). У 1860-я гг. XIX ст. французскі інжэнер Эміль Мартэн і яго сын П'ер Мартэн сталі атрымліваць літую сталь у спецыяльнай печы з паветранагравальным прыстасаваннем (мартэнаўскай печы). Дзякуючы выкарыстанню мартэнаўскага і бесемэраўскага спосабаў сусветная вытворчасць сталі з 1865 да 1870 г. узрасла на 70 %.[117]

Грандыёзныя зрухі адбываюцца ў **машынабудаванні**, што садзейнічае стварэнню масавай няспыннай і аўтаматызаванай вытворчасці. Стандартызаваная, масавая, паточная вытворчасць з выкарыстаннем канвейера ўпершыню атрымала завершаны выгляд у аўтамабільнай прамысловасці ЗША – на заводзе Г. Форда ў 1912–1913 гг.

Рост прамысловай вытворчасці і сусветнага гандлю вызначыў бурнае **развіццё чыгуначнага транспарту**. З 1860 па 1900 г. сусветная чыгуначная сетка павялічылася ў 4 разы.[118] Асабліва інтэнсіўна дарогі будаваліся ў ЗША, Расіі і Германіі. У многіх краінах чыгункі

---

[116] Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 166.
[117] История развития науки и техники. Юнита 2 / Под ред. Н. В. Друк. – М.: Современный гуманитарный институт, 1999. – С. 17.
[118] Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 166.

сталі галоўнымі шляхамі зносін і аказвалі ўплыў на размяшчэнне прадукцыйных сіл, а таксама на ўнутраны і знешні гандаль. Быў здзейснены пераварот на марскім транспарце: парусныя суды замяніліся паравымі. Атрымала развіццё авіяцыйная тэхніка.[119] Вялікае значэнне меў прагрэс сродкаў сувязі. Працягласць тэлеграфных ліній ва ўсіх краінах свету за апошнія 20 гадоў XIX ст. павялічылася амаль утрая.[120] Пачала выкарыстоўвацца тэлефонная сувязь. У 1895 г. А.С. Паповым (Расія) было вынайдзена радыё.

Шырокае развіццё атрымала **ваенная тэхніка**. З'явілася аўтаматычная стралковая зброя (стрэльбы і вінтоўкі з магазінамі, наган, маўзер), станковы кулямёт, стальныя пушкі, ўзрыўчатыя рэчывы (дынаміт, траціл), самарушныя міны – тарпеды, мінаносцы, караблі са сталёвымі карпусамі, падводныя лодкі, браніраваныя аўтамабілі і г. д.

Значэнне **вядучых галін прамысловай рэвалюцыі – тэкстыльнай, вугальнай, чорнай металургіі, паравога транспарту** – не паменшылася, але склаліся і новыя галіны – лідэры: **наўтаздабыча, наўтаперапрацоўка, электраэнергетыка і электратэхніка.**

Другая тэхналагічная рэвалюцыя прывяла да змянення галіновай структуры прамысловасці: галіны цяжкай прамысловасці занялі вядучае месца, значна апярэдзіўшы па тэмпам лёгкую прамысловасць.

## 2. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай капіталістычнай гаспадаркі на мяжы XIX – XX стст.

Зрухі ў тэхніцы і тэхналогіі вытворчасці далі стымул і адначасова стварылі перадумовы для роста канцэнтрацыі вытворчасці. У сваю чаргу, развіццё цяжкай індустрыі, стварэнне новых буйных заводаў, руднікоў, электрастанцый, а таксама пераабсталяванне старых прадпрыемстваў патрабавала буйных капіталаў. **Рост канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу прывёў да змянення характару капіталістычнага рынку: перарастання свабоднай канкурэнцыі ў манаполію[121] ці алігаполію** – падпарадкавання рынка якой-небудзь карпарацыі, ці яго раздзелу паміж некалькімі буйнейшымі фірмамі.

Прычынай манапалізацыі стала рэзкае ўзрастанне мінімальных памераў капіталу, які быў патрэбен для функцыянавання асобных прадпрыемстваў, і імкненне прадпрымальнікаў да атрымання максімальнага прыбытку за кошт выцяснення канкурэнтаў. Выкарыстанне новых спосабаў выплаўкі сталі, развіццё вытворчасці алюмінія, нафтапрадуктаў, аўтамабіляў было эканамічна выгадным толькі пры буйных маштабах вытворчасці. У першую чаргу **манапалістычныя аб'яднанні** і ўзнікалі ў тых галінах прамысловасці, дзе канцэнтрацыя вытворчасці была найвышэйшай і дзе прадпрыемствы павінны былі шукаць новыя шляхі павышэння дадатковага прыбытку: **у горназаводской, горназдабываючай, металургічнай, суднабудаўнічай, электратэхнічнай.** Развіццё капіталістычнай гаспадаркі (энэргазабеспячэння, электрычнага асвятлення, гарадскога транспарту, тэлефоннай сувязі) было мэтазгодным толькі ва ўмовах натуральных манаполій – прадастаўлення ўрадам якой-

---

[119] З 40-х гг. XIX ст. да 1903 г. здзяйсняліся спробы пабудовы самалёта з паравым рухавіком. Самы вялікі ўклад у развіццё авіяцыйнай тэхнікі гэтага перыяду ўнёс рускі марскі афіцэр Л.Ф. Мажайскі, які першым у свеце ў 1885 г. пабудаваў поўнапамерны самалёт з паравым рухавіком. У 1903 г. амерыканскі фізік С. Лэнглі ўпершыню пабудаваў самалёт з рухавіком унутранага згарання. Пачатак прамысловай авіяцыі звычайна звязваюць з пералётам Л. Блерыо праз Ла-Манш 25 ліпеня 1909 г. З гэтага часу ў шэрагу краін сталі ствараць першыя самалётабудаўнічыя заводы, атрымала развіццё авіяцыйная прамысловасць.

[120] Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 167.

[121] **Манаполія** (грэч. – monos – адзін і poleo – прадай) – 1) выключнае права адной асобы ці групы асоб на што-небудзь, напрыклад, на зямлю, вытворчасць чаго-небудзь, гандаль вызначанымі таварамі, знешні гандаль; 2) капіталістычныя манаполіі (картэлі сіндыкаты, трэсты, канцэрны) – буйныя кампаніі, саюзы, пагадненні, альбо аб'яднанні капіталістаў, якія ўзнікаюць на падставе высокага ўзроўню канцэнтрацыі вытворчасці і капітала. Панаванне манаполій эканамічна рэалізуецца ў атрыманні звышпрыбытку

небудзь адной фірме выключнай прывілегіі (пастаўляць газавае паліва, электрычнасць, тэлеграфныя паслугі і г. д.). Геаграфічная лакалізацыя важнейшых выкапняў прамысловай сыравіны і інстытут прыватнай уласнасці дазвалялі найбольш кемлівым прадпрымальнікам манапалізаваць рэсурсы.

Новыя тэхналогіі і ўзросшыя выдаткі патрабавалі вялікага аднаразовага ўкладання капіталу. Асноўных сродкаў нават буйных прадпрыемстваў было недастаткова. Гэтая акалічнасць садзейнічала ўтварэнню акцыянерных таварыстваў, а распаўсюджванне аперацый па выданню пазык вяло да цэнтралізацыі банкаўскага капіталу. **Цэнтралізацыя банкаўскага капіталу** ў некаторых краінах ішла яшчэ хутчэй, чым цэнтралізацыя прамысловасці. Буйныя банкі, паглынаючы, ці падпарадкоўваючы сабе менш моцныя, ператвараліся ў банкаўскія манаполіі. У пачатку XX ст. у Германіі панавала 6 буйных банкаў, у Францыі – 3-4, у ЗША – 2 (яны абслугоўвалі фінансавыя групоўкі Ракфеллера і Моргана). Дзякуючы каласальнай канцэнтрацыі банкаўскага капіталу, банкі сталі распараджацца велізарным грашовым капіталам і ператварыліся ў саўладальнікаў сродкаў вытворчасці і прамысловасці ва ўсёй народнай гаспадарцы. Развіццё працэсу доўгатэрміновага крэдытавання вытворчасці вяло да **зрастання банкаўскага капіталу з прамысловым і ўтварэння фінансавага капіталу.**

Найбольш інтэнсіўна працэс манапілізацыі праходзіў у ЗША і Германіі, якія на пачатку XX ст. выйшлі на 1-е і 2-е, адпаведна, месца па ўзроўню прамысловага развіцця. У ЗША найбольшае распаўсюджванне атрымалі такія формы манапольных аб'яднанняў, як пулы і трэсты, а ў Германіі – картэлі і сіндыкаты.[122]

У нямецкіх банкіраў не было вялікіх капіталаў, сканцэнтраваных у адных руках. Утварэнне сіндыкатаў у Германіі было звязана з нізкай ступенню канцэнтрацыі германскай прамысловасці і вузасцю ўнутранага рынку краіны. Цяжкасці рэалізацыі прадукцыі на ўнутраным рынку Германіі штурхалі прадпрыемствы да заключэння картэльных пагадненняў. Германскія манаполіі аб'ядноўвалі звычайна вялікую колькасць прадпрыемстваў, да некалькіх соцен.

Буйныя картэлі і сіндыкаты скláліся ў вугальнай прамысловасці (Рэйнска-Вестфальскі вугальны сіндыкат кантраляваў 50 % германскай здабычы вугалю), хімічнай (І.Г. "Фарбэніндустры") прамысловасці, вытворчасці ўзбраення (Круп), электратэхнічнай прамысловасці ("АЭГ" і "Сімэнс").

У канцы XIX ст. **ўзмацнілася цыклічнасць капіталістычнай эканомікі, больш глыбокімі сталі крызісы, узрасла нераўнамернасць эканамічнага развіцця краін.** У канцы XIX ст. – пачатку XX ст. найбольш высокія тэмпы развіцця эканомікі мелі адносна маладыя краіны – ЗША і Германія.

Хуткае **эканамічнае развіццё ЗША** у канцы XIX ст. – пачатку XX ст. дазволіла гэтай краіне стаць вядучай індустрыяльнай дзяржавай капіталістычнага свету (з 1870 па 1900 г. вытворчасць чугуна ў краіне павялічылася ў 8 разоў, здабыча вугалю – у 10, выплаўка сталі – у 150 разоў).[123]

Паскораны эканамічны рост краіны быў абумоўлены шэрагам фактараў:

– спрыяльнымі прыродна-геаграфічнымі ўмовамі;

– спрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыяй, якая склалася дзякуючы інтэнсіўнай іміграцыі ў ЗША;

---

[122] Першы трэст у ЗША – нафтавы – узнік у 1882 г. у выніку паглынання фірмай Дж. Д. Ракфелера "Стандарт Ойл" каля 40 больш дробных кампаній. Ракфелераўскі трэст стаў характэрным прыкладам манапалістычнага камбінавання – злучэння ў рамках аднаго прадпрыемства паслядоўных этапаў вытворчасці і збыту тавараў (здабыча сыравіны – транспарціроўка – перапрацоўка – збыт). Другім буйнейшым трэстам стаў сталёвы трэст Э. Карнегі.

[123] Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 185.

– ліквідацыяй рабаўладальніцкай сістэмы і зацвярджэннем буржуазных парадкаў;
– правядзеннем індустрыялізацыі на базе найноўшай тэхнікі і новых тэхналогій;
– свабодным пранікненнем замежнага капіталу;
– пратэкцыяніцкай палітыкай ўраду;
– пачаткам каланіяльнай экспансіі.

У сваю чаргу, хуткі **эканамічны рост Германіі** быў абумоўлены дзвюма галоўнымі падзеямі: палітычным аб'яднаннем Германіі і перамогай Прусіі (гэта было адно з самых магутных германскіх княстваў) над Францыяй у вайне 1870 – 1871 гг. (у выніку вайны Германія захапіла ў Францыі Эльзас і Латарынгію з вялікімі радовішчамі жалезнай руды і іншых карысных выкапняў, атрымала кантрыбуцыю памерам ў 5 млрд. франкаў, якія пайшлі на фінансаванне прамысловасці Германіі). Важнымі фактарамі прамысловага ўздыму Германіі сталі таксама: рост германскага мілітарызму, хуткі рост насельніцтва і палітыка пратэкцыянізму, якая праводзілася з 1879 г.[124]

У той жа час **развіццё эканомікі Англіі** запаволілася. У апошняе дзесяцігоддзе XIX ст. тэмпы прамысловага развіцця гэтай краіны сталі больш маруднымі (у 1870 – 1913 гг. аб'ём прамыслвай прадукцыі ў Англіі павялічыўся ўсяго ў 2,2 разы, у той час, як у ЗША – у 9, у Германії – амаль у 6 разоў).[125] Гэта адбывалася па наступным прычынам:

– прамысловы пераварот у шэрагу краін адбыўся пазней, чым у Англіі, і таму здзяйсняўся на больш высокай тэхнічнай базе;

– прамысловасць краіны, ў сваёй большасці, мела маральна састарэлае абсталяванне. Але англійская буржуазія пайшла не па шляху пашырэння капіталаўкладанняў у сваёй краіне, а па шляху вывазу капітала за мяжу, ў першую чаргу ў калоніі, дзеля атрымання звышпрыбытку.

У выніку "адсутнасці" капіталу працэс манапалізацыі ў Англіі ішоў больш павольна, чым у ЗША і Германіі, прычым пераважнае значэнне атрымала мабілізацыя грашовых сродкаў і капіталаў з дапамогай акцыянерных таварыстваў.

**Расія** ў разглядаемы перыяд па агульным колькасным паказчыку сусветнага сукупнага прыродна-дэмаграфічнага, фінансава-эканамічнага і ваенна-тэхнічнага патэнцыялу займала чацвёртае – пятае месца разам з Францыяй, прычым значна ўступаючы ЗША, Вялікабрытаніі і Германіі. Але па ўзроўні індустрыялізацыі грамадства і эканамічным патэнцыяле Расія разам з Японіяй уваходзіла з трэцюю групу індустрыяльна развіваючыхся краін, адстаючы нават ад другога эшалона прамыслова развітых дзяржаў – Аўстра-Венгрыі і Італіі, дзе працэс індустрыялізацыі грамадства яшчэ не завяршыўся.[126]

У Расіі, якая ў адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, дзе ўсталяваўся лад буржуазнай дэмакратыі, заставалася абсалютнай манархіяй, вялікую ролю ў развіцці эканомікі адыгрывала дзяржава. Дзяржаўны ўплыў на развіццё эканомікі ў канцы XIX ст. істотна ўзмацніўся. У гэты час была распрацавана і рэалізоўвалася эканамічная праграма, аўтарам якой выступіў С.Ю. Вітэ (міністр фінансаў у 1893–1903 гг. і старшыня Камітэта міністраў і Савета міністраў у 1903–1906 гг). Урадавая праграма была накіравана на тое, каб за дваццаць гадоў дагнаць вядучыя краіны свету. Рэалізацыю праграмы планавалася забяспечыць шляхам фарсіраванай індустрыялізацыі, неабходныя сродкі для якой павінны былі даць жорсткая фінансавая палітыка, строгі пратэкцыянізм і фінансавая рэформа 1897 г. Канвертуемасць рубля выклікала актыўнае паступленне замежных капіталаў у Расію, як у выглядзе непасрэдных укладанняў у

[124] Гольдштейн И., Левина Р. Германский империализм. – М., 1947. – С. 91-95.
[125] Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 175.
[126] Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 180.

прадпрыемствы, так і ў выглядзе дзяржаўных аблігацыйных займаў. Агульны аб'ём замежных укладанняў у расійскую прамысловасць за 1893–1913 гг. склаў каля паловы айчынных капіталаўкладанняў. Прычым, доля французскіх капіталаў у агульным аб'ёме інвестыцый склала 31 %, англійскіх – 24 %, германскіх – 20 %.[127]

Павелічэнне інвестыцый у прамысловасць выклікала ў 90-я гг. сапраўдны прамысловы бум. Рэзка ўзрасла ступень канцэнтрацыі вытворчасці, з'явіліся новыя галіны вытворчасці (вугле- і нафтаздабыча, хімічная, машынабудаванне), узніклі новыя прамысловыя раёны. Пачынаючы з 80-х гг. сталі ўзнікаць манапалістычныя аб'яднанні, прычым вельмі часта з удзелам дзяржавы. Першыя картэлі і сіндыкаты з'яўляюцца ў тых галінах прамысловасці, якія апекаваліся дзяржавай, вакол надзвычайных і значных па аб'ёму дзяржаўных заказаў (у галінах, якія абслугоўвалі чыгуначнае будаўніцтва, горназдабываючай, машынабудаўнічай, металургічнай і нафтавай прамысловасці). Дзякуючы гэтаму ступень манапалізацыі прамысловасці і банкаў у Расіі была значна большай, чым у краінах Захаду. Значна ўзрос аб'ём знешняга гандлю Расіі, але пры гэтым вываз тавараў працягваў адыгрываць рашаючую ролю ў параўнанні з вывазам капіталу. Развіццё аграрнага сектару стрымлівалася захаваннем феадальных перажыткаў пры адносна развітым аграрным капіталізме. Гэта давала магчымасць Расіі заставацца галоўнай збожжавай дзяржавай свету і адным з вядучых экспарцёраў збожжа. Збожжа складала 80 % расійскага экспарту. У канцы XIX ст. Расія давала палову сусветнага збору жыта, 1/5 – сусветнага збору пшаніцы, 1/3 – сусветнага збору ячменя.[128] Гандлёвыя партнёры Расіі імкнуліся актыўна вывозіць сельскагаспадарчую сыравіну і навязваць ёй свае прамысловыя тавары.

Беларускія землі ў гэты час адыгрывалі раней вызначаную ім ролю аграрнага прыдатку. Асноўнай галіной эканомікі заставалася сельская гаспадарка, у якой было занята больш за 75 % насельніцтва, а 90 % –атрымлівалі прыбыткі з зямлі. Сельская гаспадарка, якая да 80-х гг. XIX ст. мела збожжавую накіраванасць, пераарыентавалася на мяса-малочную жывёлагадоўлю, вырошчванне кармавых і тэхнічных раслін. Прамысловасць была заснавана на пераапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны і драўніны. У 1908 г. харчовая і дрэваапрацоўчая галіны вытворчасці давалі 70,5 % аб'ёму прадукцыі ўсёй фабрычна-завадской прамысловасці.[129] Нізкай заставалася ступень канцэнтрацыі вытворчасці. У 1913 г. Вытворчасць дробнай і саматужнай прамысловасці Беларусі склала 53,5 % усёй валавой прадукцыі. Неабходнасць развіцця прамысловасці, асабліва новых вытворчасцей (паглыбленая перапрацоўка драўніны: фанерная і папяровая вытворчасці і інш.) стымулявалі пераход да акцыянернай формы арганізацыі прамысловасці (з удзелам расійскага і замежнага капіталу). Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Беларусі існавала 34 акцыянерных таварыствы. Як і ў Германіі, дзе ступень канцэнтрацыі прамысловасці была невысокай, асноўнымі формамі манапалістычных аб'яднанняў сталі сіндыкаты. У прамысловаць актыўна пранікаў замежны капітал (германскі – у лесаапрацоўку, бельгійскі і французскі – у тэкстыльную вытворчасць).[130]

**Францыя** ў канцы XIX ст. заставалася краінай з адносна адсталай сельскай гаспадаркай і павольнымі тэмпамі прамысловага развіцця. Фізічны і маральны знос прамысловага абсталявання, негатыўныя наступствы паражэння ў вайне з Прусіяй, абвастрэнне дэмаграфічнай сітуацыі, вялікія выдаткі на ўмацаванне пазіцый у калоніях прывялі да таго, што Францыя па ўзроўні развіцця прамысловасці з 2-га месца ў свеце перамясцілася на 4-е. Вядучае месца ў французскай прамысловасці займалі трады-

---

[127] Бор М. З. История мировой экономики. – М., 2000. – С. 233.
[128] Изместьева Т. Ф. Россия в системе европейского рынка. – М., 1991. – С. 45.
[129] Саракавік І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. – Мн., 2006. – С. 211.
[130] Гл. падрабязней: "Эканамічная гісторыя Беларусі. – С. 179-194".

цыйныя галіны, у асаблівасці вытворчасць прадметаў раскошы (шаўковых тканін, ювелірных вырабаў, адзення, абутку, парфюмерыі, касметыкі і інш.). Канцэнтрацыя вытворчасці заставалася нязначнай: 94 % усіх прадпрыемстваў мелі ў канцы XIX ст. менш за 10 рабочых. Затое па тэмпам канцэнтрацыі і цэнтралізацыі банкаўскага капіталу Францыя апярэдзіла іншыя краіны. Значная частка капітала экспартавалася, але ў адрозненне ад Англіі, капітал вывозіўся не ў форме прамысловых інвестыцый, а ў выглядзе ссуднага капіталу – дзяржаўных займаў і каштоўных папер, гэта значыць, у рост пад працэнты. Такім чынам, французскі капіталізм набыў ліхвярскі характар.

**Вываз капіталу ў адрозненне ад вывазу тавараў** навогул стаў важнай рысаю манапалістычнага капіталізму. Гэта звязана з узмацненнем нераўнамернасці развіцця асобных краін. З аднаго боку, з'явілася невялікая група найбольш багатых капіталамі дзяржаў – ліхвяраў, а з другога боку, існавала шырокая сфера для ўкладання гэтых капіталаў – шматлікія эканамічна адсталыя краіны з таннай рабочай сілай і сыравінай. Экспарт капіталу ў гэтыя краіны здзяйсняўся ў форме будаўніцтва прадпрыемстваў здабываючай і апрацоўчай прамысловасці, чыгуначных шляхоў і г. д., а таксама ў выглядзе кабальных займаў. Пры гэтым дзяржавы, якія раней ужо захапілі каланіяльныя ўладанні, напрыклад Англія і Францыя, былі ў больш выгадным стане, чым маладыя капіталістычныя дзяржавы – Германія, ЗША, Японія. Гэта ўзмацніла канкурэнцыю, абвастрыла супярэчнасці паміж імперыялістамі.

Манапалістычныя **саюзы капіталістаў буйных дзяржаў пачалі ўступаць у пагадненні паміж сабой**, ствараць міжнародныя картэлі з мэтаю раздзелу рынкаў збыту і сфер уплыву. Аднак утварэнне міжнародных манаполій не прывяло да паслаблення імперыялістычных супярэчнасцей. Наадварот, яно з'явілася ступенню да новага абвастрэння гэтых супярэчнасцей на аснове яшчэ больш вострай канкурэнтнай барацьбы за перадзел сусветнага рынку. Барацьба паміж дзвюма нафтавымі трэстамі-гігантамі – англа-галанцкім "Ройял Датч Шэл" і амерыканскім "Стандарт Ойл" – разгортвалася ў Мексіцы, Інданэзіі, Венесуэле, Румыніі, Галіцыі – паўсюды, дзе былі знойдзены радовішчы нафты, а таксама на ўсіх рынках збыту нафтапрадуктаў. У той жа час сталі складвацца **міжнародныя манаполіі** ў электратэхнічнай сферы і ў некаторых іншых галінах індустрыі.

### 3. Барацьба капіталістычных краін за перадзел свету. Пачатак эпохі імперыялістычных войнаў

Некаторыя даследчыкі вызначаюць перыяд канца XIX ст. – пачатку XX ст. як эпоху імперыялізму[131], калі барацьба капіталістычных дзяржаў за тэрытарыяльны раздзел свету змянілася яшчэ больш вострай барацьбой за яго перадзел. "Старыя" капіталістычныя дзяржавы – Вялікабрытанія, Францыя, паміж якімі былі размеркаваны асноўныя

---

[131] **Імперыялізм** (лац. imperium – улада, панаванне) – 1) сістэма прамога ці ўскоснага палітыка-эканамічнага панавання над насельніцтвам і тэрыторый чужых краін; 2) палітыка асобных эканамічна развітых дзяржаў, якая ажыццяўляецца рознымі сродкамі (палітычнымі, эканамічнымі, культурнымі, ідэалагічнымі) у адносінах да слабаразвітых краін "трэццяга свету". Упершыню слова "Імперыялізм" выкарысталі ў 1876 г. англійскія лібералы для характарыстыкі і крытыкі палітыкі прэм'ер-міністра Б. Дзізраэлі. Потым паняцце "імперыялізм" стала абазначаць экспансіяністцкую палітыку вялікіх еўрапейскіх дзяржаў: Вялікабрытаніі, Францыі, Расіі, Германіі, а з 1870-х г. да Першай сусветнай вайны – і ЗША, і Японіі. Эканамічную інтэрпрэтацыю імперыялізма як агрэсіўнага і паразітычнага капіталізму даў Дж. Гобсан у працы "Імперыялізм" (1902). У кнізе У.І. Леніна "Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму" (1916) адзначаны наступныя асноўныя яго прыкметы: канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу; стварэнне манаполій; зліццё банкаўскага капіталу з прамысловым і ўтварэнне на гэтай аснове "фінансавага капіталу", фінансавай алігархіі; вываз капіталу; утварэнне міжнародных манапалістычных саюзаў, якія дзеляць свет; падзел свету найбуйнейшымі капіталістычнымі дзяржавамі і інш. Аднак, уяўленне Леніна пра імперыялізм як вышэйшую стадыю капіталізму, якая загнівае і памірае, не падцвердзілася. Немарксісцкія гісторыкі і грамадазнаўцы адмовіліся ад чыста эканамічнай інтэрпрэтацыі імперыялізма, лічаць яго універсальна- гістарычным феноменам, які выходзіць за храналагічныя рамкі 19-20 ст. (Гл.: "Імперыялізм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 3. – С. 482-483").

калоніі, імкнуліся ўтрымаць і яшчэ больш пашырыць свае ўладанні.[132] Германія, ЗША, Японія, Італія, якія нядаўна выйшлі на арэну каланіяльнай палітыкі, патрабавалі свайго "месца пад сонцам".

Другая тэхналагічная рэвалюцыя і пераход прамысловага капіталізму ў манапалістычную стадыю змянілі суадносіны сіл у сусветнай эканоміцы. Паскораныя тэмпы развіцця ЗША і Германіі суправаджаліся экспансіяй манапалістычнага капіталізму і барацьбой за калоніі. У ЗША ідэалагічным абгрунтаваннем такога курсу з'яўлялася **дактрына Манро** (прэзідэнт ЗША з 1817 па 1825 г.), якая звязвала рост магутнасці дзяржавы, яе дабрабыту з далучэннем тэрыторый. ЗША актыўна ўмешваліся ў эканамічнае і палітычнае жыццё краін Лацінскай Амерыкі і Усходняй Азіі і ўключыліся ў каланіяльную экспансію. У 1897 г. былі далучаны Гавайскія астравы, у 1898 г. (пасля вайны з Іспаніяй) – іспанскія ўладанні ў Карыбскім моры (Куба і Пуэрта-Рыка) і Ціхім акіяне (Філіпіны).

Каланіяльная экспансія была звязана з імкненнем да захопу каштоўных крыніц сыравіны (нафты Бліжняга Усходу і Інданэзіі, волава Малайі, каўчука Конга, золата і алмазаў Паўднёвай Афрыкі) і рынкаў збыту. У рэзкай форме гэтае імкненне праяўляла Германія, маштабы цяжкай прамысловасці якой значна перавысілі ёмістасць нацыянальнага рынку, а адносны недахоп аграрных рэсурсаў абмяжоўваў развіццё лёгкай і харчовай прамысловасці. Але Германія "спазнілася "да падзелу свету, і яе інтарэсы у трох частках свету сутыкнуліся з інтарэсамі Англіі і Францыі. З мэтаю прапаганды планаў імперыялістычных анэксій была створана спецыяльная арганізацыя – Пангерманскі саюз. Яго прадстаўнікі даказвалі, што Германія абкружана магутнымі дзяржавамі – Англіяй, Францыяй Расіяй, не мае "жыццёвай прасторы", і ёй неабходна набыццё новых тэрыторый. У 1882 г. было створана Германскае каланіяльнае таварыства, у 1884 г. Германія абвясціла свой пратэктарат над тэрыторыямі, раскіданымі па розных берагах Афрыкі – Танганыкай, Камерунам, Паўднёва-Заходняй Афрыкай і над часткай Новай Гвінеі, ў 1885 г. – над Маршалавымі астравамі, у 1900 г. – над шэрагам астравоў у Акіяніі. Тым не менш, калоніі Германіі саступалі англійскім у 11,5 разы па тэрыторыі і у 32 – па насельніцтву[133]. Германія пачала рыхтавацца да вайны за перадзел свету, павялічыўшы выдаткі на армію і флот.

Барацьба паміж вядучымі краінамі свету за валоданне калоніямі стала галоўнай прычынай **першых імперыялістычных войнаў:**

- **іспана-амерыканскай,**[134]

---

[132] Да сярэдзіны XIX ст. Англійская Ост-Індская кампанія завяршыла заваёву Індыі. У хуткім часе, зліквідаваўшы кампанію, брытанскі ўрад узяў кіраўніцтва Індыяй ў свае рукі, а ў 1877 г. англійская каралева Вікторыя была абвешчана імператарам Індыі. У выніку 3-х "опіумных войнаў" Англія дамаглася легалізацыі свайго наркабізнэса ў Кітаі (продаж за серабро індыйскага опіума), адкрыцця для свайго гандлю пяці кітайскіх марскіх партоў, захапіла Ганконг і атрымала магчымасць пранікнення ва ўнутраныя рачныя порты Кітая. Англічане набылі кантроль над Суэцкім каналам, далучылі Кіпр (1877), акупавалі Егіпет (1882), пакарылі Судан (1896-98), усталявалі кантроль над Маскатам і Кувейтам (1899). У 1880-я гг. англічане авалодалі Бірмай, Малайяй, Паўночным Барнэа, Брунэем, Папуа. На захадзе экватарыяльнай Афрыкі яны заваёўваюць Залаты бераг, а пазней – Нігерыю, а на ўсходзе чорнага кантынента – Кенію, Самалі Занзібар, Радэзію, Уганду, Бечуаналенд, Зулулэнд, Ньясалэнд. Дарэчы, англічане разглядалі каланіяльную экспансію як сродак памякчэння сацыяльнай напружанасці у метраполіі. Міністр калоній Чэмберлен абвясціў, што калі англічане не хочуць грамадзянскай вайны, яны павінны быць імперыялістамі.
Францыя да пачатку 80-х гг. дапоўніла панаванне над Алжырам усталяваннем пратэктарата над Тунісам і Марока і падпарадкаваннем яшчэ больш дзесятка краін, аб'яднаных да 1910 г. у Французскую Заходнюю і Французскую Экватэрыяльную Афрыку, захопам вострава Мадагаскар. На паўвостраве Індакітай, дзе з 1863 г. Францыі належала Камбоджа, былі далучаны ў 1874 – 1893 гг. Кахінкін, Асам, Танкін, Лаос. (Гл.: "История экономики. Юнита 1. История мировой экономики. Разр. Г. Д. Гловели. – М.: Современный Гуманитарный Университет, 2000. – С . 37-38").

[133] Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций. – С. 174.

[134] **Іспана-амерыканская вайна 1898 г**. – была развязана амерыканскім імперыялізмам, які імкнуўся пашырыць свае каланіяльныя ўладанні за кошт слабых і адсталых краін. Пад уладаю аслабелай іспанскай манархіі знаходзіліся астравы Куба і Пуэрта-Рыка ў Карыбскім моры, Каралінскія і Марыянскія астравы, Філіпіны, астравы Палау ў Ціхім акіяне і шэраг уладанняў на афрыканскім кантыненце. Выкарыстаўшы ў сваіх мэтах нацыянальна-вызваленчы рух на Філіпінах і Кубе і разгарнуўшы крывадушную прапаганду супраць іспанскай жорсткасці, ЗША дамагліся ў снежні 1898 абвяшчэння "незалежнасці Кубы" (якая на самай справе падпадала пад амерыканскі пратэктарат) і авалодалі Філіпінамі, Пуэрта-Рыка і востравам Гуам, самым вялікім з Марыянскіх астравоў. У падзеле іспанскіх калоній узялі ўдзел і германскія імперыялісты. У 1899 г. Германія прымусіла Іспанію прадаць ёй астравы Каралінскія і Марыянскія (акрамя Гуама і Палау). У тым жа годзе ЗША і Германія падзялілі архіпелаг Самоа. Разам з раней захопленымі Гавайскімі астравамі (1897 г.) гэтыя новыя амерыканскія ўладанні склалі сістэму апорных баз на Ціхім акіяне – на падыходах да Японіі і Карэі, да Кітая і Паўднёва-Усходняй Азіі. (Гл.: "Всемирная история. В 10 томах. Т. VII. – М. 1960. – С. 301-302").

- **англа-бурскай,**[135]
- **руска-японскай.**[136]

Першыя імперыялістычныя войны, падчас якіх "вялікія дзяржавы" дамагліся поспехаў у захопе тэрыторый, прывялі да ўзнікнення ў кіруючых колах капіталістычных краін планаў, якія сведчылі аб іх амаль бязмежных прэтэнзіях. У Англіі – гэта былі планы стварэння "больш Вялікай Брытаніі", уплыву якой будзе падпарадкаваны ўвесь астатні свет. У Германіі банкаўскія і прамысловыя магнаты, юнкерства і звязаная з ім ваеншчына праектавалі стварэнне "Вялікай Германіі", ці "серадзіннай Еўропы", якая, ўсё больш пашыраючыся, ахапіла бы Аўстра-Венгрыю, Балканы, Пярэднюю Азію, Прыбалтыку, Скандынавію, Бельгію, Галандыю, частку Францыі. Акрамя гэтага планавалася стварыць велізарную германскую каланіяльную імперыю ў Афрыцы, у басейне Ціхага Акіяна, шырокую сферу ўплыву ў Паўднёвай Амерыцы.

Французская фінансавая алігархія, распальваючы ў краіне рэваншысцкія настроі, імкнулася не толькі вярнуць Францыі Эльзас і Латарынгію, але і захапіць Рурскі басейн, а таксама пашырыць французскую каланіяльную імперыю, перш за ўсё, за кошт германскіх уладанняў у Афрыцы.

Аўстра-Венгрыя хацела захапіць Сербію і Чарнагорыю, Турцыя –расійскае Закаўказзе, Балгарыя – усходнюю частку Сербіі. Свае агрэсіўныя мэты мелі Японія, Італія і іншыя дзяржавы.

Італьянскія імперыялісты, згадваючы славу старажытнага Рыму, дамагаліся падпарадкавання Італіі Трыеста, Албаніі, удзелу ў перадзеле Малой Азіі і перадзелу каланіяльных уладанняў у Афрыцы, усталявання італьянскай гегемоніі ў басейне Міжземнага мора.

У мілітарысцкіх колах Японіі выспявала думка аб усталяванні японскага панавання над усёй Усходняй Азіяй і прылягаючай часткай Ціхага Акіяну.

Расія імкнулася ўсталяваць сваё панаванне на Балканах, авалодаць Галіцыяй, Канстанцінопалем і Чарнаморскімі пралівамі, уключыць у сферу свайго ўплыву ўвесь Іран, узмацніць сваі пазіцыі на Далёкім Усходзе.[137]

На знешнепалітычную арыентацыю Расіі ўплывала залежнасць краіны ад замежнага капіталу і ад еўрапейскіх рынкаў збыту сельскагаспадарчай прадукцыі. Да 80-х гг. Расія падтрымлівала амаль што сяброўскія адносіны з Германіяй, але шэраг акалічнасцей (мытная вайна з Германіяй, якая стала сапернікам Расіі на еўрапейскім рынку жыта, барацьба паміж Расіяй і Германіяй за сферы ўплыву на Блізкім Усходзе, імкненне Расіі трымаць кантроль над Чарнаморскімі пралівамі – Басфорам і Дарданэламі) прывялі да абвастрэння супярэчнасцей з Германіяй і да збліжэння яе з Англіяй і Францыяй.

Рыхтуючыся да перадзелу свету, **Германія** заключыла ў 1879 г. ваенны саюз з **Аўстра-Венгрыяй,** да якога ў **1882** г. далучылася **Італія,** і такім чынам быў створаны **Траісты саюз.**

---

[135] **Англа-бурская вайна (1899 – 1902).** Англійскія каланіяльныя кампаніі імкнуліся завалодаць і алмазнымі копямі Паўднёвай Афрыкі. Але на шляху брытанцаў стаялі 2 дзяржавы галанскіх перасяленцаў (бураў) – Трансвааль і рэспубліка Аранжавай ракі. У 1899 г. Вялікабрытанія развязала вайну супраць бураў, якая завяршылася тым, што буры сталі брытанскімі падданымі. А ў 1910 г. былыя рэспублікі Трансвааль і Аранжавая ўвайшлі ў склад Паўднёва-Афрыканскага Саюза (новага англійскага дамініёна). (Гл.: "Всемирная история. В 10 томах. Т. VII. – С. 302-306"). **Дамініён** – да 1947 г. дзяржава, якая уваходзіла ў так званую Садружнасць на чале з Вялікабрытаніяй (раней Брытанская імперыя), напрыклад Аўстралійскі саюз, Канада, Новая Зеландыя. (Краткий словарь иностранных слов. Издание пятое. – С. 100).

[136] **Руска-японская вайна 1904-1905 гг.** Вялікую цікавасць імперыялістычныя дзяржавы праявілі да валодання Кітаем і Карэяй. У выніку японa-кітайскай вайны 1894–95 гг. Японія акупавала Карэю, якая раней была васалам Кітая, захапіла Ляадунскі паўвостраў, востраў Тайвань і некаторыя іншыя кітайскія тэрыторыі, пасля чаго пачала рыхтавацца да вайны з Расіяй, імкнучыся выцясніць яе з Маньчжурыі (Паўночна-Усходняга Кітая) і Карэі, а разам з тым захапіць рускія тэрыторыі на Далёкім Усходзе, у прыватнасці, Сахалін. З другога боку, сярод кіруючых колаў царскай Расіі ўзмацніліся імкненні да экспансіі ў Паўночным Кітаі і Карэі. Гэтыя супярэчнасці прывялі да вайны паміж Японіяй і Расіяй. Вайна прынесла паражэнне царскай Расіі. Па Портсмутскаму мірнаму дагавору (5 верасня 1905 г.) Японіі былі перададзены часткі кітайскай тэрыторыі – так званая Квантунская арэндаваная вобласць з Порт-Артурам і паўднёвая галіна кітайска-усходняй чыгункі. Японія атрымала таксама палову вострава Сахалін і правa рыбнай лоўлі ў рускіх тэрытарыяльных водах. Над Карэяй быў усталяваны японскі пратэктарат. (Гл.: Там жа. – С. 306–312).

[137]Першая сусветная вайна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 5. – С. 472-476.

Узмацненне экспансіі[138] германскага імперыялізму прывяло да абвастрэння не толькі галоўнага антаганізму – англа-германскага, але і супярэчнасцей паміж Германіяй і Францыяй, што, ў сваю чаргу, выклікала збліжэнне **Францыі і Англіі і ўтварэнне ў 1904 г. "сардэчнай згоды" (Entente cordiale) – англа-французскай Антанты.** Царская Расія не адразу далучылася да гэтага пагаднення, таму што Англія заключыла ваенна-палітычны саюз з Японіяй, накіраваны супраць Расіі, у той час як германская дыпламатыя прыкладала вялікія намаганні для таго, каб схіліць Расію на свой бок. Германскі прамысловы імперыялізм пры гэтым імкнуўся, з аднаго боку, дамагчыся беспераашкоднага прасоўвання сваёй прадукцыі на расійскі рынак, а з другога боку, падарваўшы французска-расійскі саюз, ізаляваць Францыю на еўрапейскім кантыненце. Але паражэнне Расіі ў руска-японскай вайне паслабіла яе, узмацніла залежнасць ад заходнееўрапейскага капіталу і прымусіла пайсці на збліжэнне з Англіяй. Заключэнне **ў 1907 г.** англа-рускага пагаднення завяршыла стварэнне **Траістай Згоды (Траістай Антанты) – ваенна-дыпламатычнай імперыялістычнай групоўкі Англіі, Францыі і Расіі.**

Вялікую ролю ў нарастанні супярэчнасцей, якія прывялі да Першай сусветнай вайны, мела абвастрэнне "усходняга пытання". Для Расіі гэта было пытанне аб забеспячэнні бяспекі паўднёвых межаў, распаўсюджванні і ўмацаванні палітычнага ўплыву на Блізкаўсходні і Балканскі рэгіёны, усталяванні кантролю над Чарнаморскімі пралівамі, якія ўваходзілі ў сферу асобных эканамічных і ваенна-стратэгічных інтарэсаў Расіі. "Усходняе пытанне" звязала ў тугі вузел супярэчнасці паміж Расіяй, Францыяй, Англіяй, Аўстрыяй (з 1871 г. Аўстра-Венгрыяй), а таксама Прусіяй (з 1871 г. – Германіяй), якія сталі наступствам імкнення гэтых дзяржаў падзяліць, у першую чаргу, еўрапейскія ўладанні слабеючай Асманскай імперыі. Расія дабілася найбольш відавочных поспехаў у вырашэнні гэтага пытання ў працэсе руска-турэцкай вайны 1877–78 гг., калі па Сан-Стэфанскаму міру ёй была вернута паўднёвая частка Бесарабіі, страчанай падчас Крымскай вайны, і далучана Карская вобласць. Асманская імперыя была вымушана прызнаць поўную незалежнасць Румыніі, Чарнагорыі і Сербіі, прадаставіць самакіраванне Босніі і Герцагавіне. Балгарыя атрымала самастойнасць ва ўнутраных справах, але павінна была плаціць даніну султану. Артыкулы дагавору, якія датычыліся Балканскіх краін, садзейнічалі ўзмацненню міжнароднага прэстыжу Расіі і яе ўплыву на Балканах. Але Англія і Аўстра-Венгрыя, выступіўшы ў якасці зачэпкі абарону інтарэсаў Турцыі, адмаўляліся прызнаць умовы Сан-Стэфанскага міру і дабіліся іх перагляду летам 1878 г. на Берлінскім Кангрэсе: тэрыторыя аўтаномнага Балгарскага княства скарачалася ўтрая, пацвярджалася незалежнасць Чарнагорыі, Сербіі і Румыніі, Аўстра-Венгрыя акупавала Боснію і Герцагавіну, а Англія – востраў Кіпр, да Расіі адыходзілі Бесарабія і гарады Карс, Ардагам, Батум.[139]

Боснія і Герцагавіна, акупаваныя Аўстра-Венгрыяй у 1878 г., фармальна засталіся ў складзе Асманскай імперыі. У 1908 г. Аўстра-Венгрыя здзейсніла анэксію гэтых дзвюх правінцый, што паклала пачатак баснійскаму крызісу і яшчэ больш абвастрыла супярэчнасці паміж Расіяй і Сербіяй, з аднаго боку, і Аўстра-Венгрыяй, з другога, а, значыць, – паміж дзвюма імперыялістычнымі групоўкамі – англа-французска-рускай і аўстра-германскай. Далейшае развіццё падзей на Балканах, дзе глыбіня сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцей перапляталася з саперніцтвам вялікіх дзяржаў, прывяло да ўзнікнення І-й Балканскай (1912 г.) і ІІ-й Балканскай (1913 г.) войнаў. Аўстра-Германскі блок выкарыстаў раскол паміж балканскімі народамі ў сваіх інтарэсах: у правячых колах Балгарыі ўзмацніліся

[138] **Экспансія** (лац. – expansio – пашырэнне распаўсюджванне) – палітыка дзяржавы, якая мае на мэце распаўсюджванне свайго ўплыву на іншыя краіны, і здзяйсняецца дыпламатычнымі, эканамічнымі і ваеннымі метадамі; пашырэнне сферы панавання манапалістычных аб'яднанняў. (Краткий словарь иностранных слов. – С. 333).
[139] Всемирная история. В 10 томах. Т. VII. – С. 173-178.

прагерманскія тэндэнцыі, германскі ўрад накіраваў у Турцыю германскую ваенную місію. Будаўніцтва Багдадскай чыгункі і адкрыццё германскай ваеннай місіі сведчыла аб значным узмацненні пазіцый германскага імперыялізму на Блізкім Усходзе.[140]

Да пачатку 1914 г. гонка ўзбраенняў дасягнула вялікіх памераў. Германія разам з Аўстра-Венгрыяй мела 8 мільёнаў чалавек, якія былі абучаны вайсковай справе. У краінах Антанты такіх людзей было болей, але германская армія мела лепшае тэхнічнае аснашчэнне, чым французская і руская, а англійскую, па прычыне яе невялікай колькасці, можна было не браць у разлік. Да таго ж германскі генеральны штаб улічваў, што мабілізацыя і разгортванне германскай арміі здзяйсняецца значна хутчэй, чым арміі Расіі і Францыі. У абодвух лагерах ішла інтэнсіўная праца генеральных штабоў па сагласоўванню планаў вайны. Улічваючы, што да лета 1914 г. суадносіны сіл склаліся на карысць Германіі, германскія правячыя колы вылучылі ідэю “прэвентыўнай” вайны і шукалі зачэпкі, каб пачаць ваенныя дзеянні.

**Заключэнне.** Такім чынам, асноўнай рысай развіцця капіталістычных краін у канцы XIX ст. – пачатку XX ст. быў паступовы пераход ад капіталізма, заснаванага на свабоднай канкурэнцыі асобных самастойных прадпрыемстваў, да манапалістычнага капіталізму. Другая тэхналагічная рэвалюцыя і пераход прамысловага капіталізму ў манапалістычную стадыю змянілі суадносіны сіл у сусветнай эканоміцы, а гэта, у сваю чаргу, актывізавала барацьбу паміж капіталістычнымі краінамі за перадзел свету. Пачалася эпоха імперыялістычных войнаў.

[140] Всемирная история. В 10 томах. Т. VII. – С. 500-503.

*Лекцыя шостая*

## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ СУСВЕТНАГА РАЗВІЦЦЯ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

1. Вынікі Першай сусветнай вайны:
а) тэрытарыяльныя змяненні ў Еўропе ў 1917 – 1918 гг.;
б) Парыжская мірная канферэнцыя 1919 г.;
в) Версальска-Вашынгтонская сістэма ў лёсе народаў.
2. Палітычнае развіццё вядучых краін свету ў міжваенны перыяд.
3. Станаўленне разнастайных сістэм рэгулюемай эканомікі.

Пачатак гісторыі найноўшага часу традыцыйна адлічваюць з 1918 г. – часу, калі была завершана Першая сусветная вайна і адбылося якаснае пераўладкаванне сусветнай палітычнай прасторы.

### 1. Вынікі Першай сусветнай вайны:

**а) тэрытарыяльныя змяненні ў Еўропе ў 1917-1918 гг.** Палітычная карта свету ў час Першай сусветнай вайны беспаваротна змянілася. Лозунг РСФСР аб праве нацый на самавызначэнне не з'яўляўся новым, а прагучаў упершыню яшчэ ў ходзе вядзення Балканскіх войнаў 1912 – 1913 гг. У той час ні Расія, ні Аўстра-Венгрыя не прызнавалі яго. Хаця Першая сусветная вайна была выклікана не нацыянальнымі прычынамі, народы Еўропы паспрабавалі ў ходзе ваенных сутыкненняў выкарыстаць шанц на самавызначэнне. Прычыны абавастрэння пачуцця нацыянальнай самасвядомасці шматлікія, і іх карані трэба шукаць у эканамічных і сацыяльных катаклізмах XIX ст. Надзеі на ўзмацненне нацый і павышэнне жыццёвага ўзроўню ўскосна былі звязаны з далейшай экспансіяй вядучых еўрапейскіх краін, павышэннем нацыянальнай і палітычнай культуры народаў, якія ўваходзілі ў імперыі. Буйныя краіны вымушаны былі ў тактычных мэтах ўлічваць гэтыя тэндэнцыі ў сваёй ваеннай стратэгіі. Пад канец Першай сусветнай вайны краінам-пераможцам стала зразумела, што права на самавызначэнне нацый трэба рэалізаваць ва ўсялякім выпадку ў еўрапейскім маштабе.

Краіны Антанты падтрымалі вызваленчы рух ў Аўстра-Венгрыі, але ў адносінах да Расіі займалі стрыманую пазіцыю. Станоўчую ролю ў гэтым адыгралі Злучаныя Штаты Амерыкі, на палітыку якіх аказвалі ціск групы эмігрантаў з краін, дзе ішла барацьба за незалежнасць. У канцы вайны шматнацыянальныя дзяржавы – Аўстра-Венгерская, Расійская, Германская і Асманская імперыі сталі распадацца. У Германіі сепаратысцкія настроіназіраліся ў Прусіі. Распад Расіі стаў відавочным ўжо ў 1917 г. У дзяржаве Габсбургаў яшчэ ў пачатку ваеннага канфлікту назіраўся рух за нацыянальнае вызваленне сярод славянскіх народаў – чэхаў, славакаў, венграў і харватаў. Гэтыя народы мелі аднаго палітычнага праціўніка, у адрозненне ад Польшчы.

Дыпламатычная гісторыя Першай сусветнай вайны – доказ таму, што дзяржавы, якія падзялілі Рэч Паспалітую, імкнуліся выкарыстаць ваенную сітуацыю ў сваіх інтарэсах. Дэкларацыі Расіі ў адносінах Польшчы насілі неканкрэтны характар – маніфест ад жніўня 1914 г. Расійскага Дзяржаўнага Камітэта дараваў аб'яднаным польскім землям аўтаномію ў складзе Расіі. Далей за ўсіх у абяцаннях пайшлі Германія і Аўстра-Венгрыя, якія абвясцілі ў лістападзе 1916 г., пасля заваявання расійскай часткі Польшчы, "Каралеўства Польскае, залежнае ад іх". Сведчанняў аб аб'яднанні тэрыторый Польшчы пры гэтым не было.

Да польскага пытання Расія вярнулася і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, дэкларуючы ўтварэнне незалежнай і аб'яднанай Польшчы. 5 верасня 1918 г. СНК РСФСР (У. Ленін) выдаў Дэкрэт аб скасаванні Савецкай Расіяй законаў аб падзелах Рэчы Паспалітай, заключаных з Прусіяй і Аўстрыяй, але міжнароднага абвяшчэння гэты дакумент не атрымаў. Канчаткова лёс **утворанай у лістападзе 1918 г. Польшчы** быў вызначаны на Парыжскай мірнай канферэнцыі.

**"Дэкларацыя правоў народаў Расіі" ад 2(15) лістапада 1917 г.**[141] давала права "на свабоднае самавызначэнне ажно да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы" (карты 2.1, 2.2). Са спасылкамі на гэты дакумент 20 лістапада 1917 г. была абвешчана Украінская Народная Рэспубліка, Цэнтральная Рада, якой як фактычна незалежны ад Расіі ўрад, была сфарміравана яшчэ ў сакавіку 1917 г. і прызнана Часовым Урадам А. Керанскага. Дваістасць сітуацыі заключалася ў тым, што **30 снежня 1917** г. у г. Харкаве абвясцілі **ўтварэнне Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі**, а Цэнтральная Рада УНР, якую падтрымлівалі Германія і Аўстра-Венгрыя, была скасавана. 22 студзеня 1918 г. УНР, абапіраючыся на падтрымку Германіі, зноў аддзялілася ад Савецкай Расіі, што было адлюстравана ў **Брэст-Літоўскім мірным дагаворы ад 3 сакавіка 1918 г**. паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, і Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй, з другога боку. Толькі пасля скасавання Брэсцкага дагавору і заканчэння польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) на ўсходняй частцы ўкраінскіх зямель зноў усталявалася савецкая улада.

Утвараліся новыя дзяржавы ў Прыбалтыйскім рэгіёне.[142] У прыватнасці, яшчэ 18–22 верасня 1917 г. узнікла Літоўская Тарыба ў Вільні, а ў снежні 1917 г. Германія прызнала незалежнасць Літвы.[143] 6 снежня 1917 г. была абвешчана незалежнасць Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікі на частцы былой тэрыторыі Расійскай імперыі. Дзейнасць левых партый прывяла да нараджэння на свет **22 студзеня 1918 г. Сацыялістычнай Рэспублікі Фінляндыя,** якую, зразумела, прызнала РСФСР, і не прызнала Германія. У **лютым 1918 г. з'явілася Эстонская Дэмакратычная Рэспубліка,** а пасля скасавання Брэсцкага дагавору – **13 лістапада 1918 г. была абвешчана Латвія.**

У сувязі з крахам нямецкай акупацыі бальшавікі аднавілі Украінскую Савецкую Рэспубліку, у процівагу буржуазным рэспублікам Балтыі ненадоўга ўтварылі Літоўскую, Латвійскую і Эстонскую Савецкія рэспублікі.[144] Частку Літвы з г. Вільняй ў лютым 1919 г. аб'ядналі ў Літоўска-Беларускую ССР. На тэрыторыі Расіі ў рэспубліках Закаўказзя таксама адбываўся працэс утварэння новых краін. Тры паўднёвыя рэспублікі – Арменія, Азербайджан і Грузія – з 1921 г. знайшлі падтрымку РСФСР.

Нягледзячы на дэкларацыю незалежнасці, большасць савецкіх рэспублік не мела вызначаных граніц і не была прызнана краінамі антыгерманскай кааліцыі (Францыяй, Вялікабрытаніяй, ЗША і Італіяй), якія не жадалі прызнаваць савецкую ўладу. Многія з новых краін узаемна не прызналі адна другую, супярэчнасці паміж імі вырашаліся шляхам дыпламатычных перамоў.

**б) Парыжская мірная канферэнцыя 1919 г.** Праблемы, якія былі звязаны з заключэннем перамір'яў, вырашаў узнікшы ў кастрычніку 1918 г. міжсаюзны Вярхоўны Савет Антанты. У выніку яго работы 29 верасня перамір'е з Антантай заключыла Балгарыя, 30 кастрычніка 1918 г. было заключана перамір'е з Турцыяй, 3 лістапада 1918 г. – з Аўстра-Венгрыяй (Венгрыя аддзялілася ад імперыі і 13 лістапада 1918 г. падпісала заключнае перамір'е).

---

[141] З 1918 г. у міжнароднай храналогіі адбыўся пераход на новае летавылічэнне.
[142] Па Брэст-Літоўскаму дагавору ад 3 сакавіка 1918 г. ад Расіі адлучаліся Фінляндыя, Прыбалтыка, Украіна, Данская і Чарнаморская вобласці, Закаўказзе. (Гл.: "Новейшая история стран Европы и Америки XX век / Ред. А. М. Родригеса и М. В. Пономарёва. Ч. 1 1900–1945 гг. – М. 2003. – С. 71").
[143] Навицкас К. Литва и Антанта (1918–1920 гг.). – Вильнюс, 1970. – С. 10.
[144] Круталевич В. На путях национального самоопределения (БНР – БССР – РБ). – Мн. 1995. – С. 28.

9 лістапада 1918 г. рэвалюцыя ў самой Германіі звергла дынастыю Гогенцолернаў, а **11 лістапада 1918 г.** у Камп'енскім лесе пад Парыжам яе прадстаўнікі падпісалі перамір'е з саюзным войскам Антанты на чале з генералам Фошам. Фактычна гэтая падзея азначала **заканчэнне Першай сусветнай вайны**.

Тры еўрапейскіх дзяржавы, якія вызначалі сваі пазіцыі на маючай адбыцца ў Парыжу мірнай канферэнцыі, павінны былі лічыцца са Злучанымі Штатамі Амерыкі. У аснову тэкстаў усіх перамір'яў былі пакладзены знакамітыя **"14 пунктаў Вільсана"**, якія прэзідэнт ЗША апублікаваў 8 студзеня 1918 г. і канкрэтызаваў у сваіх выступленнях. Сутнасць дакумента зводзілася да наступных палажэнняў:

1. Дагавор аб міры павінен заключацца адкрыта, без наступных пагадненняў. Тым самым адмянялася тайная дыпламатыя.
2. Абсалютная свабода суднаходства на моры, знешнетэрытарыяльных водах як у мірны, так і ў ваенны час.
3. Знішчэнне эканамічных бар'ераў і ўстанаўленне роўнага гандлю для краін, якія згадзіліся на мір.
4. Узаемавыгадная гарантыя па скарачэнню ваеннага ўзбраення.
5. Вырашэнне ўсіх каланіяльных праблем пры ўліку інтарэсаў насельніцтва калоній.
6. Эканамічная і палітычная блакада Савецкай Расіі.
7. Аднаўленне Бельгіі.
8. Вызваленне французскай тэрыторыі, далучэнне да яе Эльзаса і Латарынгіі.
9. Выпраўленне граніц Італіі па нацыянальнай прыкмеце.
10. Аўтаномія народам Аўстра-Венгрыі.
11. Вызваленне Румыніі, Сербіі, Чарнагорыі. Незалежнасць Сербіі.
12. Суверэнітэт турэцкай часткі Асманскай імперыі.
13. Утварэнне Польскай дзяржавы, якая б уключыла ўсё этнічнае насельніцтва.
14. Утварэнне Усеагульнай навуковай Асацыяцыі.

Калі ў савецкай гістарыяграфіі "14 пунктаў Вільсана" ацэньваліся выключна негатыўна, то на сёняшні момант пануе сбалансаваная ацэнка: прапанаваная праграмма прызначалася для паляпшэння становішча народаў, якія раней не мелі дзяржаўнасці, але большасць з гэтых прынцыпаў былі адхілены пры падпісанні мірнага дагавора ў Версалі.

**Парыжская мірная канферэнцыя (18 студзеня – 28 чэрвеня 1919 г.)** была склікана для выпрацоўкі ўмоў мірнага дагавору. Вярхоўны Савет быў заменены на так званы "Савет дзесяці", у склад якога ўвайшлі: ад Вялікабрытаніі – прэм'ер-міністр Ллойд Джордж і міністр замежных спраў Бальер, ад Францыі – адпаведна – прэм'ер-міністр Жорж Клемансо і Кімо, ад ЗША – Томас Лэслі і прэзідэнт Вудро Вільсан, ад Італіі – Арнанда і Санніно, ад Японіі – Камочы і Навудакі. За час работы канферэнцыі колькасць савета скарацілася. Старшынёй канферэнцыі быў прызначаны Ж. Клемансо.

Увесь сакратарыят канферэнцыі (больш 2 тысяч чалавек) прадстаўлялі дыпламатычныя перакладчыкі, спецыялісты па гісторыі, лінгвісты. Працавалі спецыяльныя камісіі па тэрытарыяльных і эканамічных пытаннях, па рэпарацыях, па устанаўленню ўзроўня віны за развязванне вайны.

**Вырашэнне польскага і беларускага пытання на Парыжскай мірнай канферэнцыі.** Яшчэ да пачатку работы мірнай канферэнцыі, у Вярхоўным Савеце пасля капітуляцыі Аўстра-Венгрыі і Германіі зарадзілася ідэя дэмаркацыйнай лініі[145], як мяжы

[145] **Дэмаркацыя** – (ад фр. Démarcation – правядзенне, устанаўленне лініі дзяржаўнай граніцы). Дэмаркацыйная лінія – 1) паласа тэрыторыі, якая размежавала войскі праціўнікаў у час перамір'я, ці 2) тая, што падзяляе на зоны акупацыі тэрыторыю краіны, а таксама 3) лінія, часова ўстаноўленая на спрэчнай тэрыторыі паміж суседнімі краінамі да ўстанаўлення пастаяннай граніцы. (Гл.: "Краткий политический словарь. – М., 1989. – С. 140").

Польшчы на Ўсходзе. Для яе абмеркавання была створана асобая следчая камісія ў Варшаве, а на тэрыторыю Беларусі, Усходняй Украіны і Літвы былі высланы дэлегацыі для збірання канкрэтнага матэрыялу аб пануючым становішчы польскага насельніцтва, што магло абгрунтаваць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Польшчы. Гэта мяжа была ўвасоблена ў жыццё маршалам Фошам 25 студзеня 1919 г., калі, прымаючы за аснову лінію трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, ён аддаў нямецкім акупацыйным сілам у акрузе Беласток – Гродна загад аб перадачы палякам тэрыторыі на захад ад лініі Брэст – Нарва – Крынкі – Кузніца – Новы двор – Сапоцкін.

У час работы канферэнцыі была створана камісія па польскіх справах (пад кіраўніцтвам француза Ю. Камбона), адна з галоўных задач якой заключалася ў збіранні дасканалых фактаў для таго, каб мірная канферэнцыя згадзілася на ўключэнне новых зямель у склад Польшчы. Для гэтага, на думку новых палітыкаў, трэба было садзейнічаць адрыву ад Расіі прыгнечаных ею народаў – беларусаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў, фінаў. Былі састаўлены адпаведныя карты, на якіх вызначалася тэрыторыя Польшчы, якая ўключала большую частку беларускіх зямель з Мінскам.

Найбольш аптымальным варыянтам лічылася аднаўленне "Вялікай Польшчы" ў форме ўніі Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны ў межах 1772 г. А ў якасці праграмы-мінімум тэрытарыяльны мемарыял пастанавіў здзейсніць інкарпарацыю Бельскага, Беластокскага, Сакольскага і Брэсцкага паветаў, а таксама Валыні.[146]

Камісія па польскіх справах стварыла падкамісію па пытанню ўсходніх граніц Польшчы, у склад якой уваходзілі Ле Ронд (Францыя, старшыня), Р. Лорд (ЗША), Х. Патан (Вялікабрытанія) і Дэла Тарэта (Італія). Падкамісія працавала з 22 сакавіка па 7 красавіка, а 10 красавіка прадставіла справаздачу на плянарным паседжанні камісіі па польскіх справах Парыжскай канферэнцыі.

На Парыжскай мірнай канферэнцыі знаходзілася і беларуская дэлегацыя. Пытанне аб прысутнасці беларусаў пры падпісанні мірнага дагавора было пастаўлена яшчэ ў канцы 1917 г. на Першым Усебеларускім кангрэсе. Кіраўніцтва Рады БНР з пачатку 1919 г. дабівалася ўдзелу ў рабоце канферэнцыі, пасылала ў Парыж мемарандум, звяртанні, матэрыялы картаграфічнага характару. 29 сакавіка 1918 г. на пасяджэнні Рады БНР была створана камісія па міжнародным справам, якая стала працаваць над апісаннем межаў.[147] За аснову была ўзята этнаграфічная "Карта рассялення Беларускага племені" прафесара Я. Карскага, складзеная ў 1917 г. і выдадзеная ў Санкт-Пецярбурзе Расійскай Акадэміяй Навук. (Аб тым, што аргументацыя гэтага вучонага была пераканаўчай сведчыць тое, што граніцы сучаснай Беларусі, за выняткам Палесся, супадаюць з яго картай). Першым прадстаўніком на канферэнцыі быў Д. Сямашка, які прыбыў у складзе агульнай літоўска-беларускай дэлегацыі ў пачатку 1919 г. Аднак членамі "Савета дзесяці" 12 студзеня 1919 г. было вырашана не дапускаць на пасяджэнні канферэнцыі як прадстаўнікоў Расіі, так і прадстаўнікоў народаў, якія ўваходзілі ў яе склад на 1 жніўня 1914 г., акрамя Польшчы.[148] У той жа час беларуская дэлегацыя папоўнілася: 29 красавіка 1919 г. з Берліна ў Парыж выехалі К. Кандратовіч, Азнабішын, А. Баркоў, а ў маі яны сустрэліся са старшынёй канферэнцыі і атрымалі дазвол на прысутнасць беларускай дэлегацыі. Крыху пазней – 25 мая 1919 г. – у сталіцу Францыі прыехала асноўная частка дэлегацыі на чале з А. Луцкевічам, якая прадставіла мемарандум апальнага беларускага ўрада з просьбай прызнаць незалежнасць БНР. Аднак гэтае патрабаванне засталося непачутым.

---

[146] Materski W. Tarcza Europy. Stosunki Polsko-Sowieckie. 1918–1939. – W-wa. 1994. – S. 22.

[147] Мазец В. Межы БНР // Спадчына. 1993. № 2.

[148] Ціхаміраў А. Беларуская праблематыка на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919–1920 гг. // Весці АН Беларусі. Сер. грам. навук. – 1996. – № 6. – С. 31.

Тая пазіцыя, якую занялі кіраўнікі канферэнцыі спрыяла польскай агрэсіі на беларускія землі. З аднаго боку, яны прызналі расійскую юрысдыкцыю над Беларуссю, з другога – дапамаглі фарміраванню польскай арміі і не перашкаджалі яе прасоўванню ва ўсходнім напрамку. Як бы там ні было, беларуска-польская граніца падчас работы Парыжскай мірнай канферэнцыі канчаткова вызначана не была.

У рэшце рэшт 8 снежня 1919 г. старшыня Вярхоўнага Савета Антанты Ж. Клемансо зацвердзіў беларуска-польскую граніцу па лініі трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай праз Гродна – Ялаўку – Няміраў – Брэст-Літоўск, і з ліпеня 1920 г. яна увайшла ў гісторыю як **"лінія Керзана"**. Аднак гэта не магло вырашыць праблемы, паколькі на той час польска-савецкая лінія фронту праходзіла ўздоўж рэк Дзвіны і Бярэзіны. Палякі не змаглі дыпламатычным шляхам даказаць прыналежнасць беларускіх зямель да Польшчы і паспрабавалі ваенным шляхам уваскрасіць Рэч Паспалітую. Так, Беларусь у чарговы раз стала арэнай барацьбы паміж Расіяй і Польшчай.

**Версальскі мірны дагавор.** Умовы пасляваеннага ўладкавання былі падпісаны **28 чэрвеня 1919 г.** 27 краінамі-пераможцамі ў Люстэркавай зале Версальскага палаца.

Большасць выніковых рашэнняў краін-удзельніц Парыжскай мірнай канферэнцыі зыходзіла з палажэння артыкулу 231, які несправядліва ўскладаў на Германію ўсю адказнасць за развязванне вайны. Адпаведна з дагаворам Германія вярнула Францыі Эльзас і Латарынгію, а таксама на 15 год Саарскую вобласць. Левы бераг Рэйна на 50 міль быў акупаваны войскамі Антанты на тэрмін ад 5 да 15 гадоў у якасьці дэмілітарызаванай зоны. Германія абавязалася паважаць незалежнасць новаўтвораных дзяржаў, нейтралітэт Бельгіі, Люксембурга і Аўстрыі, адмовілася ад правоў на г. Мемель (Клайпеда), які быў у 1923 г. перададзены Літве. Прызнаўшы незалежнасць Польшчы, Германія адмаўлялася на яе карысць ад часткі Верхняй Сілезіі і Памераніі, а таксама ад правоў на г. Данцыг (Гданьск), уключаны ў мытную граніцу Польшчы. Такім чынам, "Польскі калідор" аддзяліў Усходнюю Прусію ад астатняй Германіі і забяспечыў выхад да Балтыйскага мора. Германія пазбаўлялася ўсіх сваіх калоній, якія падзяляліся паміж дзяржавамі-пераможцамі на аснове сістэмы мандатаў. Яна таксама адмаўлялася ад праў і прывілегій у Кітаі.

Германія прызнавала незалежнасць усіх тэрыторый, якія ўваходзілі ў склад былой Расійскай імперыі да 1 жніўня 1914 г. (арт. 116), а таксама адмену як Брэсцкага міру 1918 г., так і іншых дагавораў, якія заключыла з савецкім урадам Расіі. Асаблівую антысавецкую накіраванасць меў арт. 117, па якому Германія павінна была прызнаць усе будучыя дагаворы саюзных дзяржаў з дзяржавамі, "якія ўтвораны і ўтвараюцца на тэрыторыі былой Расійскай імперыі". Яшчэ больш, на Парыжскай канферэнцыі было прынята рашэнне аб інтэрвенцыі ў Савецкую Расію і Турцыю (у апошняй барацьбу за нацыянальную незалежнасць узначаліў Кемаль Атацюрк).

У Германіі адмянялася воінская павіннасць, было дазволена ўтрымліваць армію ў колькасці да 100 тыс. чалавек. Да 1 мая 1927 г. Германія павінна была заплаціць рэпарацыі ў памеры 20 млрд. залатых нямецкіх марак валютай і таварамі краінам-пераможцам. У выпадку нявыплат у Германію ўводзіліся б войскі. (Блізкія да гэтых меры былі прыменены і да яе саюзнікаў). Германская дэлегацыя, якая была выклікана для падпісання тэкста Версальскага дагавору, адмовілася яго прызнаць. У значнай ступені менавіта ўмовы Версальскага міра падрыхтавалі глебу для ўзнікнення нацызма і палітыкі рэваншызма ў Германіі.

У склад Версальскага дагавору ўвайшоў Статут **Лігі Нацый**. Гэтая міжнародная арганізацыя была ўтворана з мэтаю развіцця супрацоўніцтва паміж народамі і гарантыі

міру і бяспекі **19 красавіка 1919 г**. Спачатку Статут Лігі Нацый, штаб-кватэра якой знаходзілася ў Жэневе (Швейцарыя), падпісалі 44 краіны-пераможцы, акрамя ЗША. Савет Лігі ўключыў пастаянных членаў: Францыю, Вялікабрытанію, Італію і Японію, з 1920 г. – ЗША. Бяспрэчнае лідэрства ў кіруючых органах належала французскай і брытанскай дыпламатыі. З 1926 па 1933 г. у яго склад увайшла Германія, а з 1934 да канца 1939 г. – СССР. Іншыя дзяржавы ўдзельнічалі ў рабоце Савета на правах непастаянных членаў. Ліга Нацый стала першай арганізацыяй, якая была прызвана аб'яднаць дзяржавы ўсяго свету сістэмай калектыўнай бяспекі, але ўплыў яе быў абмежаваны.

**в) Версальска-Вашынгтонская сістэма ў лёсе народаў.**

10 верасня 1919 г. краінамі Антанты з Аўстрыяй быў падпісаны **Сэн-Жэрмэнскі дагавор**, які прызнаў падзел Аўстра-Венгрыі, незалежнасць Чэхаславакіі, Польшчы, Венгрыі і Каралеўства Сербаў, Харватаў, Славенцаў (з 1929 г. яно стала называцца Югаславія).[149]

27 лістапада 1919 г. у прадмесці Парыжа Нейі-сюр-Сен быў падпісаны мірны дагавор з Балгарыяй. Па **Нейнскаму дагавору** Балгарыя страціла Заходнюю Фракію, пазбавілася выхаду да Эгейскага мора, частка яе тэрыторыі перайшла да Югаславіі.

Драматычна падзеі разгорталіся ў Венгрыі, дзе па ўзору савецкіх рэспублік Расіі была ўтворана Венгерская Савецкая Рэспубліка. У краіне амаль адразу пачалася грамадзянская вайна, яна ўскладнілася замежнай інтэрвенцыяй, арганізаванай удзельнікамі Парыжскай канферэнцыі, і прывяла да ліквідацыі савецкай улады і ўсталявання дыктатуры адмірала Хорці. 4 чэрвеня 1920 г. з Венгрыяй быў падпісаны **Трыанонскі дагавор**, згодна з якім здзяйсняўся пераход Славакіі да Чэхаславакіі, Харвацыі – да Югаславіі, Трансільваніі – да Румыніі.[150]

Згодна з **Сеўрскім дагаворам** ад 10 жніўня 1920 г. з Турцыяй, яна абавязалася адмовіцца ад арабскіх уладанняў, тэрыторый на Аравійскім паўвостраве, прызнавала пратэктарат Англіі над Егіптам, а Францыі – над Марокка і Тунісам. Канчаткова лёс Турцыі вырашыў Лазанскі дагавор 1923 г. з кіраўніцтвам Кемаля Атацюрка, калі юрыдычна афарміўся распад Асманскай імперыі.

**Версальскі мірны дагавор у сукупнасці з Сэн-Жэрменскім, Нёйнскім, Трыанонскім і Сеўрскім склалі сістэму мірных дагавораў, вядомую пад назваю Версальскай.**

Сенат ЗША не ратыфікаваў Версальскі дагавор у сувязі з нежаданнем гэтай краіны ўступіць у Лігу Нацый і ў жніўні 1921 г. падпісаў сепаратны мір з Германіяй. Амаль усе амерыканскія вучоныя лічаць, што няўдзел Злучаных Штатаў у Лізе Нацый аказаўся фатальным для свету і паклаў пачатак палітыцы ізаляцыянізму. ЗША пераўтварыліся ў буйнейшага сусветнага крэдытора.

Разам з тым, Злучаныя Штаты Амерыкі не маглі аказацца ў баку ад складвання новай сусветнай палітычнай прасторы. У **канцы 1921 – пачатку 1922 г. ў Вашынгтоне** адбылася канферэнцыя, на якой былі прыняты рашэнні, якія перагледжвалі альбо дапаўнялі ранейшыя дагаворы:

1) быў ліквідаваны англа-японскі саюз 1902 г., а замест яго заключаны дагавор 4- х краін (ЗША, Англіі, Францыі, Японіі) па сумеснай абароне, па кітайскаму пытанню (у Кітаі ўведзены прынцып "адчыненых дзвярэй" замест падзелу на сферы ўплыву);

2) Японія вяртала Кітаю паўвостраў Шаньдун;

3) былі абмежаваны марскія ўзбраенні: прапорцыі для развіцця ваенных флатоў ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Італіі, Японіі (адпаведна 5:5:3:1,75:1,75), абмежаваны максімальны танаж ваенных судоў і правы на будаўніцтва ваенна-марскіх баз у Ціхім акіяне.

---

[149] История Европы. – Мн., 1996. – С. 328.

[150] Дарэчы, Румынія ў 1918 г. значна пашырыла сваю тэрыторыю і за кошт зямель, якія раней уваходзілі ў склад Расіі – Паўночнай Букавіны і Бесарабіі.

Такім чынам, Версальска-Вашынгтонская сістэма зафіксавала новыя суадносіны сіл паміж буйнымі краінамі, якія склаліся ў выніку Першай сусветнай вайны. Але сістэма, замацаваўшая раскол света на пераможцаў і пераможаных, была недаўгавечнаю. Захаванне імперыялістычнага характара міжнародных адносін уступала ў супярэчнасць з аб'ектыўным працэсам роста нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў каланіяльных і залежных краінах.

Версальска-Вашынгтонская сістэма юрыдычна зацвердзіла заканчэнне Першай сусветнай вайны, легалізавала працэс фармавання незалежных нацыянальных дзяржаў на аснове былых імперый у Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе. Разам з тым новая дзяржаўна-палітычная карта Еўропы не ўсюды супадала з этнанацыянальнай картай – тым самым былі закладзены асновы для развіцця сепаратысцкіх рухаў, выкарыстання нацыянальнага пытання ў палітычных мэтах.

Супярэчнасці мірнага дагавора выявіліся ў асноўным пры вызначэнні граніц, многія з якіх былі праведзены без уліку гістарычных традыцый і этнічнага склада новых краін. Так, у складзе Югаславіі апынулася насельніцтва трох розных канфесій і менталітэтаў. Версальскі мірны дагавор заблытаў адносіны паміж малымі краінамі, узаконіў каланіяльнае іга, заняў варожую пазіцыю ў адносінах да Савецкай Расіі – заходнія краіны ўступілі на шлях эканамічнай і палітычнай блакады савецкіх рэспублік.

З буйных дзяржаў-удзельніц Першай сусветнай вайны ў найгоршым становішчы апынуліся Расія і Германія, што ўтварыла перадумовы для іх збліжэння. У час міжнароднай Генуэзскай канферэнцыі (красавік – май 1922 г.), у г. Рапала 16 красавіка паміж гэтымі краінамі было падпісана гандлёвае пагадненне, якое перапыніла дыпламатычную і эканамічную блакаду вакол іх. Гэта пагадненне дапамагло Германіі абыйсці абмежаванні Версальскага дагавора ў вобласці ўзбраенняў і да прыхода да ўлады Гітлера весці даволі паспяховае ваеннае супрацоўніцтва з СССР.

Такім чынам, працэс устанаўлення новых дзяржаў па нацыянальнай прыкмеце, які быў распачаты ў час Першай сусветнай вайны ў Цэнтральнай, Паўднёва-Усходняй і Усходняй Еўропе, працякаў ў двух накірунках – з аднаго боку, пры ўзгадненні на Парыжскай мірнай канферэнцыі, з другога боку – у краінах былой Расійскай імперыі – на падставе "Дэкларацыі правоў народаў Расіі". Гэта абумовіла далейшую палітычную накіраванасць нованароджаных краін. Для рэспублік, сумежных з Савецкай Расіяй, якія апынуліся па-за межамі Версальскага дагавора – Беларусі, Літвы, Украіны, Фінляндыі і іншых – "хістанне" ва ўстанаўленні статуса краіны было характэрна да канца грамадзянскай і польска-савецкай вайны. Сучасны беларускі гісторык дзяржаўнасці і права В. А. Круталевіч пры даследаванні першых спроб утварэння дзяржаў (БНР – на Беларусі, Літоўскай Тарыбы – у Літве, Украінскай Народнай Рэспубліці), прыйшоў да высновы, што "слабасць нацыянальнай самасвядомасці беларусаў аблягчыла бальшавікам барацьбу са сваімі праціўнікамі" і ўстанаўленне савецкай улады. На яго думку, неправамочна меркаванне аб тым, што міжнароднае прызнанне БНР і яе ўдзел ў міжнародных канферэнцыях "прымусілі бальшавікоў двойчы абвяшчаць БССР".[151] Палітыка вялікіх дзяржаў у беларускім напрамку насіла антыбеларускую накіраванасць. У выніку пераўтварэнняў у Еўропе з'явілася 9 новых краін, з палітычнай карты знікла Чарнагорыя. Сярод нованароджаных дзяржаў у Цэнтральнай, Паўднёва-Усходняй і Усходняй Еўропе існавалі дзве, якія засталіся шматнацыянальнымі і шматканфесіянальнымі – Югаславія і Чэхаславакія, што ўжо пад канец ХХ ст. вылілася ў серыю міжнацыянальных канфліктаў у іх і канчатковы падзел.

---

[151] Круталевич В.А. На путях национального самоопределения. – С. 25-26.

## 2. Палітычнае развіццё вядучых краін свету ў міжваенны перыяд

Аналіз рэальных падзей і працэсаў першай паловы XX ст. паказаў, што ў гэты час адбываліся не толькі эканамічныя і палітычныя зрухі. Глыбокія змяненні закранулі цывілізацыйныя асновы жыцця, мараль, культуру, навуку, філасофію і рэлігію. Перажываў крызіс рацыяналістычны тып свядомасці і звязаны з ім навуковы падыход. Перамога рацыяналістычнага тыпу мышлення ў свой час стала адным з важнейшымх фактараў, які аказаў вызначальны ўплыў на аблічча еўраамерыканскай цывілізацыі, на развіццё ідэй дэмакратыі, свабоды, маралі і г. д., але вопыт Першай сусветнай вайны паказаў, што рацыяналізма, навукі і прагрэса недастаткова для паўнавартаснаці чалавечага існавання. Менавіта ў гэты перыяд сфарміраваліся праекты і праграмы ўдасканалення сацыяльна-эканамічных і палітычных структур, самой сістэмы жыццеўладкавання народаў. У агульнай іх масе вылучыліся два магістральных альтэрнатыўных адзін аднаму напрамкі, якія прапанавалі свае рэцэпты вырашэння праблем індустрыяльнага грамадства.

Па-першае, гэта **дэмакратычны** накірунак, паслядоўнікі якога (ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Швецыя, Данія, Галандыя і інш.) вылучыўшы рэфармісцкі шлях пераўтварэння грамадцтва, прызнавалі рыначную эканоміку і палітыку дэмакратыі – асэнсавалі неабходнасць пашырэння ролі дзяржавы асабліва ў сацыяльнай і эканамічнай сферах. У аснове іх праграм знаходзіліся прынцыпы лібералізма, кансерватызма і сацыял-дэмакратызма.

Па-другое, **таталітарна-аўтарытарны**[152] накірунак (марксізм, левы і правы таталітарызм), які аддаваў перавагу рэвалюцыйнаму шляху разбурэння старога света і стварэння на яго руінах новага.

Таталітарна-аўтарытарнымі лічацца сацыяльна-палітычныя рухі і ўзнікшыя на іх аснове палітычныя рэжымы спачатку ў Еўропе, потым – у шэрагу краін Азіі і Лацінскай Амерыкі. Гаворка ідзе перш за ўсё аб фашызме і нацызме ў Італіі і Германіі і своеасаблівых гібрыдных рэжымах, устаноўленых у Партугаліі, Іспаніі і іншых еўрапейскіх краінах. У выпрацоўцы асноўных ідэй фашызма і нацызма вызначальную ролю мелі працы А. Гітлера, А. Розенберга, Б. Мусаліні, О. Враслі. Разам з тым, да таталітарна-аўтарытарных адносіцца і бальшавіцкі (або сталінскі) рэжым, які існаваў у СССР з канца 20-х гг. да смерці І. Сталіна ў 1953 г.

Фашысцкія рэжымы, з боку гледжання сістэмных характарыстык, лічацца праварадыкальнымі, а сацыялістычныя – левымі. Істотнае іх адрозненне заключалася ў тым, што марксізм-ленінізм аддаваў маральны і тэарэтычны прыярытэт канцэпцыі класа, дэклараваў дэмакратычныя прынцыпы; а нацыянал-сацыялізм – канцэпцыі нацыі і нават расы, адмаўляў ідэі дэмакратыі і лібералізма. Абодва напрамкі таталітарызма зближала панаванне адзінай ідэалогіі, абавязковай для ўсіх, улада адной рэвалюцыйнай партыі, зліццё ў адзінае цэлае партыі, дзяржаўнага апарата і грамадства, палітызацыя ўсіх сфер жыцця, фізічны і маральны тэрор супраць іншадумства.

Фашысцкія перавароты ў Італіі, Германіі і Іспаніі насілі кансерватыўны характар, у іх аснове ляжалі праварадыкальныя ідэі нацыяналізма, расізма, імперскай вялікадзяржаўнасці, апалогія насілля. Спекулюючы на цяжкасцях пасляваеннага часу, умела гуляючы на незадаволенасці шырокіх слаёў насельніцтва паражэннем ў вайне і яе вынікамі, восенню 1922 г. у Італіі да ўлады прыйшла фашысцкая партыя на чале з Б. Мусаліні. У 1926 г.

---

[152] **Аўтарытарызм** – (ад лац. autoritas – улада. уплыў) неабмежаваная ўлада адной асобы (манарха, дыктатара і г. д.), якая зневажае законы і патрабуе безумоўнага падпарадкавання народа.

**Таталітарызм** – (ад лац. totalitas – поўната) – адна з форм аўтарытарнай дзяржавы XX ст., характэрнымі рысамі якой з'яўляюцца: яго поўны кантроль над усімі сферамі жыцця грамадства, забарона дэмакратычных арганізацый, ліквідацыя канстытуцыонных правоў і свабод, рэпрэсіі супраць іншадумцаў, мілітарызацыя.

дыктатарскі рэжым быў устаноўлены ў Партугаліі. Эканамічны крызіс 30-х гг. садзейнічаў далейшаму распаўсюджванню фашызма. Кульмінацыйным пунктам трыумфа фашысцкіх ідэй у Еўропе стала прызначэнне ў студзені 1933 г. рэйсханцлерам Германіі А. Гітлера і уключэнне членаў нацыянал-сацыялістычнай партыі ў склад урада. Пазней дыктатарскія фашысцкія ці напаўфашысцкія рэжымы былі ўстаноўлены ў 1934 г. – у Аўстрыі, у 1936 г. – Грэцыі, у 1939 г. – дыктатуры генерала Франка ў Іспаніі. Усё гэта сведчыць аб тым, што таталітарызм уяўляў сабой агульнаеўрапейскі феномен, аднак паражэнне фашызма ў Другой сусветнай вайне, крах камуністычных рэжымаў у краінах Усходняй Еўропы і СССР у канцы XX ст., прадэманстравалі, што абедзве разнавіднасці таталітарызма апынуліся тупіковымі шляхамі развіцця сучаснага чалавецтва.

Тым не менш, нельга недаацэньваць станоўчыя дасягненні левaрадыкальных сацыялістычных партый міжваеннага перыяду. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Расіі, у першыя мірныя гады, калі краіны еўраамерыканскай цывілізацыі перажывалі палітычны і эканамічны крызіс, рэзка ўзрасла папулярнасць марксісцкіх і сацыялістычных ідэй. Набіраў абароты міжнародны рабочы рух, вышэйшай арганізацыйнай формай якога становіцца прафсаюзны рух, ішло ўзнікненне новых партый. Менавіта ў пачатку першага этапа гісторыі найноўшага часу (1918 – 1923 гг.) адбыўся глыбокі раскол сацыялістычнай ідэалогіі на дзве плыні – **сацыял-дэмакратычную (рэфармісцкую)** і **камуністычную**. Першая знайшла сваё адлюстраванне ў рамках дэмакратычных палітычных рэжымаў, другая – стала пануючай формай ідэалогіі таталітарнага рэжыму рэспублік СССР. Уся далейшая гісторыя партый, агульныя карані якіх можна знайсці ў марксізме, стала гісторыяй размежаванняў на ідэалагічным грунце і збліжэнняў для пошуку сумеснага рашэння важнейшых праблем XX ст.

У лютым 1919 г. сацыялістамі-рэфармістамі была праведзена канферэнцыя ў Берне (Швейцарыя), дзе прысутнічала 97 дэлегатаў з 26 краін і ішло абмеркаванне пытанняў аб віноўніках вайны, Лізе Нацый, аб тэрытарыяльных змяненнях. У рэзалюцыі з'езда была абвінавачана дыктатура пралетарыята, рабілася стаўка на парламентцкую дэмакратыю як адзіны шлях сацыялістычнай рэарганізацыі грамадства, была пастаўлена задача аднавіць II Інтэрнацыянал (які распаўся ў жніўні 1914 г.). Новую сацыял-рэфармісцкую арганізацыю называлі Бернскім ці Лонданскім Інтэрнацыяналам (па месцу знаходжання штаб-кватэры). Адноўлены фармальна жэнеўскім кангрэсам 1920 г. **II Інтэрнацыянал** ужо тады ўтрымліваў каля 4 млн. чалавек, сярод якіх найбольш уплывовымі былі члены Брытанскай лейбарысцкай партыі, СДПГ, Шведскай сацыял-дэмакратычнай партыі.

Каб падкрэсліць рознабаковасць пастаўленых задач і метадаў іх дасягнення Расійская Сацыял-Дэмакратычная Рабочая Партыя (бальшавікоў) – РСДРП(б) у 1918 г. была перайменавана ў Расійскую Камуністычную партыю (бальшавікоў) (з 1925 г. – Усесаюзная КП(б)), што паўсямесна адбылося і з іншымі філіаламі РСДРП(б) на былых нацыянальных ускраінах Расіі. Першыя камуністычныя партыі ў 1918 г. з'явіліся ў Фінляндыі, Галандыі, Аўстрыі, Венгрыі, Польшчы, Германіі.

На пачаўшайся **2 сакавіка 1919** г. міжнароднай камуністычнай канферэнцыі ў Маскве, якая з 4 сакавіка аб'явіла сябе кангрэсам, 52 дэлегата – прадстаўнікі 35 кампартый і сацыялістычных рабочых партый ад 21 краіны, прынялі рашэнне ўтварыць **Камуністычны Інтэрнацыянал (Камінтэрн ці III Інтэрнацыянал)**. Вялікае прапагандысцкае значэнне мела прыняцце "Маніфесту Камуністычнага Інтэрнацыяналізму" і адозвы "Да працоўных усіх краін". Пад уплывам Камінтэрна ў якасці секцыі **з лістапада 1919** г. працаваў Камуністычны Інтэрнацыянал Моладзі (**КІМ**). На II кангрэсе Камінтэрна ў Петраградзе – Маскве (19 ліпеня

– 7 жніўня 1920 г.) прысутнічала ўжо 217 дэлегатаў ад 67 арганізацый з 37 краін. Пасляваенны крызіс стаў прычынай энтузіазму сабраўшыхся і ўкаранення веры ў хуткую перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Еўропе. Новыя камуністычныя партыі былі зарэгістраваны ў Англіі, Італіі, Румыніі, Чэхаславакіі, і ў 1921 г. колькасць іх членаў дасягнула 2 млн. чалавек у свеце.

Сацыял-рэфармісты трымалі пад сваім кантролем большую частку прафсаюзнага руху вядучых краінах свету. У прафсаюзы імі было аб'яднана каля 40 млн. рабочых і служачых. Найбольш важным міжнародным прафсаюзным цэнтрам стаў **Амстэрдамскі Інтэрнацыянал прафсаюзаў (1919)**, які супрацоўнічаў з II Інтэрнацыяналам і арыентаваў на заключэнне дагавораў паміж працоўнымі і наймальнікамі. У сваю чаргу, яму была супрацьпастаўлена такая арганізацыя як **Чырвоны Інтэрнацыянал (Профінтэрн – утвораны ў Маскве ў 1921 г.**), што аб'яднала 17 млн. чалавек і цесна супрацоўнічала з III Інтэрнацыяналам.[153]

Яшчэ адным адгалінаваннем сацыялістаў стала створанае цэнтрыстамі ў Вене Міжнароднае аб'яднанне сацыялістычных партый – **Інтэрнацыянал 2 ½ (1921)**. У сакавіку 1922 г. на канферэнцыі ў Берліне спачатку адбылася сустрэча Выканкамаў трох Інтарнацыяналаў, і ў маі 1923 г. II і 2 ½ аб'ядналіся ў **Рабочы Сацыялістычны Інтэрнацыянал (РСІ)**, які папранейшаму працягвалі называць II Інтэрнацыянал. РСІ ахапіў вялікую колькасць еўрапейскіх рабочых партый і стаяў на антыкамуністычных, антысавецкіх пазіцыях.

На этапе палітыка-эканамічнай стабілізацыі ў свеце 1924–1929 гг., які ў савецкай гістарыяграфіі называўся перыядам "часовай стабілізацыі капіталізма", уплыў сацыял-дэмакратычных партый на працоўных узмацніўся. Сацыял-дэмакраты ўваходзілі ва ўрады Англіі, Германіі, Швецыі, Даніі, Бельгіі і іншых краін каб выступаць за павышэнне заработнай платы і жыццёвага ўзроўню працоўных. На Марсэльскім (1925) і Брусэльскім (1928) кангрэсах РСІ былі адобраны праграмы, накіраваныя супраць мілітарызму, каланіялізму, у якіх гучалі паўсядзённыя патрабаванні працоўных. Ідэолагі сацыял-рэфармізма прапагандавалі тэорыю "гаспадарчай дэмакратыі" – паступовага перанясення дэмакратыі з палітыкі ў эканоміку ў межах існуючага буржуазнага ладу. Рэфармісцкія ідэі аказвалі значны ўплыў на пралетарыят – у РСІ ў канцы 1920-х гг. налічвалася болей 6 млн. членаў. За сацыял-дэмакратаў галасавала у розных краінах 25 млн. выбаршчыкаў.[154]

У той жа час камуністаў да 1928 г. стала менш – каля 1,8 млн., у тым ліку за мяжою каля 600 тыс. членаў. За камуністаў галасавала ў замежных краінах 6,5 млн. выбаршчыкаў.[155] Як бачым, сацыяльна-дэмакратычныя партыі здолелі ўтрымаць большую частку насельніцтва пад уплывам рэфармісцкай ідэалогіі.

Палітычная сітуацыя ў свеце атрымала новую афарбоўку на трэцім этапе міжваеннага перыяда найноўшай гісторыі (1929 – 1939 гг.) у сувязі з наступленнем сусветнага эканамічнага крызісу 1929 – 1933 г. і яго пераадольваннем, а таксама распаўсюджваннем фашызма. Трэба прызнаць, што Камінтэрн не выпрацаваў на той момант дакладнай стратэгіі антыфашысцкай барацьбы, пераацаніў ступень гатоўнасці мас да сацыялістычнай рэвалюцыі і ў якасці бліжэйшай задачы, як і раней, бачыў усталяванне дыктатуры пралетарыята. Пытанне аб аб'яднанні ўсіх антыфашысцкіх сіл так і не было пастаўлена, паколькі сацыял-дэмакратаў камуністы нярэдка лічылі "памяркоўным крылом фашызму". У адказ лідэры Рабочага Сацыялістычнага Інтэрнацыянала адкрыта праяўлялі варожасць да камуністаў, заяўлялі

[153] Новейшая история зарубежных стран: Европа и Америка, 1917–1945: Учеб. для пед. ин-тов по спец. "История" / Под. ред В. К. Фураева. – М., 1989. – С. 285.

[154] Новейшая история зарубежных стран: Европа и Америка, 1917–1945. – С. 291.

[155] Там же. – С. 293.

што "будуць весці барацьбу ў роўнай ступені як з фашысцкай, так і з камуністычнай дыктатурай". Антаганізм паміж камуністамі і сацыял-дэмакратамі ад гэтага толькі ўзмацніўся. Аднак абставіны штурхалі рабочыя арганізацыі да аб'яднання. Наступленне гітлераўцаў на рабочы рух, як камуністычны, так і сацыял-дэмакратычны, спробы фашысцкіх пераваротаў у Аўстрыі, Францыі, Іспаніі і іншых краінах, ліквідацыя дэмакратычных заваёваў і прафсаюзаў у самой Германіі прадэманстравалі, што чакае народы свету, калі фашызм не атрымае адпору. У Францыі і Іспаніі камуністы і сацыялісты падпісалі важныя пагадненні аб сумеснай абароне дэмакратычных свабод. Профінтэрн перад самароспускам прапанаваў сваім нацыянальным прафсаюзам уступаць у масавыя рэфармісцкія прафаб'яднанні.

На VII кангрэсе Камінтэрна у 1935 г. была пастаўлена мэта стварыць **антыфашысцкі народны фронт,** які б аб'яднаў усе прагрэсіўныя сілы свету, але ў поўнай меры дасягуць яе не ўдалося. Рэалізацыі перашкаджаў дасягнуўшы кульмінацыі культ асобы Сталіна, які не лічыўся ні з кім, не жадаў дапушчэння самастойнасці кампартый, а ў другой палове 30-х гг., не абмяжоўваючыся рэпрэсіямі ўнутры СССР, стаў ініцыятарам расправаў з дзеячамі міжнароднага камуністычнага руху. Нязначную карэкцыю атрымалі антыкамуністычныя і рэфармісцкія пазіцыі Рабочага Сацыялістычнага Інтэрнацыянала, але ў пачатку Другой сусветнай вайны РСІ перастаў існаваць. Рэалізаваць ідэю антыфашысцкага народнага фронта ў поўнай меры ўдалося толькі падчас вайны.

### 3. Станаўленне разнастайных сістэм рэгулюемай эканомікі

У міжваенны перыяд эканоміка краін заходняй Еўропы развівалася паспяхова – эканамічны ўздым назіраўся ўжо да 1924 г., але ж у 1920–1921, 1929–1933 і ў 1937–1938 гг. яна перажывала цяжкія эканамічныя крызісы. У пасляваенныя гады у эканамічнай літаратуры з'явілася слова інфляцыя (ад лац. "уздуццё"). **Францыя** атрымала выгаду з набыццём Эльзаса і Латарынгіі, права эксплуатацыі Саара і германскія рэпарацыі. У пачатку 30-х гг. там сфарміравалася дэмакратычная мадэль рэгулявання эканомікі. Меней паспяховым было эканамічнае развіццё **Англіі**, за 10 гадоў яна так і не дасягнула даваеннага ўзроўню.

24 кастрычніка 1929 г. з краху на фондавай біржы ў Нью-Йорку пачаўся крызіс эканомікі **Злучаных Штатаў Амерыкі**, які атрымаў назву "Вялікай дэпрэсіі". Крызіс закрануў шырокія масы рабочых, служачых, інтэлігенцыі. Асабліва моцна пакутвалі дробныя і сярэднія прадпрымальнікі.

Выхад з крызісу, быў знойдзены на шляху буйнамасштабнага дзяржаўнага рэгулявання эканомікай, якое здзяйсняла адміністрацыя прэзідэнта Ф. Д. Рузвельта. На першым этапе рэформ была ўмацавана банкаўская сістэма: буйныя банкі атрымалі фінансавую дапамогу дзяржавы, мноства дробных банкаў перастала існаваць. Перастаў існаваць залаты стандарт, за кошт дзяржаўнага бюджэта ўрад вылучыў значныя пазыкі прамысловым, гандлёвым і транспартным кампаніям. Галоўнае месца ў так званым **"Новым курсе Рузвельта"** было адведзена аднаўленню прамысловасці. Згодна "Нацыянальнаму акту аб аднаўленні прамысловасці" (дзейнічаў з 1933 г. па 1935 г.) была ўведзена сістэма дзяржаўнага рэгулявання прадпрыемствамі. Былі вылучаны 3,3 млрд. $ на арганізацыю грамадскіх работ для беспрацоўнай моладзі ад 18 да 25 гадоў. На грамадскіх работах у студзені 1934 г. было ўсяго занята 5 млн. чалавек, дапамогу па беспрацоўю атрымлівалі 20 млн. амерыканцаў.

"Акт аб рэгуляванні сельскай гаспадаркі" (1933 г.) ставіў мэту павысіць кошт сельгаспрадукцыі праз скарачэнне яе аб'ёму, што ўзмацніла працэс канцэнтрацыі ў сельскай гаспадарцы ЗША. Паколькі акт супярэчыў Канстытуцыі ЗША, Вярхоўны Суд адмяніў яго ў 1936 г.

На другім этапе "новага курса" праводзіліся сацыяльныя рэформы, адбывалася станаўленне працоўнага заканадаўства. "Нацыянальны акт аб працоўных зносінах" (1935) прызнаў за працоўнымі права на калектыўную абарону сваіх інтарэсаў праз прафсаюзы, калектыўныя дагаворы з прадпрымальнікамі. "Закон аб сацыяльным забеспячэнні" увёў сістэму выплаты пенсій па старасці і дапамогі інвалідам і беспрацоўным.

З дапамогай дзяржаўных інвестыцый урад Ф. Д. Рузвельта стымуляваў попыт, што адпавядала тэорыі англійскага эканаміста **Джона Мейнарда Кейнса** (ад яго імя паходзіць паняцце "кейнсіянства") – прадаўжальніка этатысцкіх традыцый у эканамічнай думцы. Да 1939 г. практыка дэфіцытнага фінансавання ўздзейнічала на аднаўленчыя працэсы ў эканоміке ЗША. Дактрына Кейнса была прызнана тэарэтычнай асновай змешанай эканомікі актыўнага ўмяшальніцтва дзяржавы ў рынак.

"Вялікая дэпрэсія", пачаўшыся ў ЗША, у 1930 г. ахапіла і краіны Заходняй Еўропы. У развітых краінах без работы апынуліся каля 30 млн. чалавек, разараліся цэлыя галіны вытворчасці. Раней за астатнія краіны на шлях выхаду з крызісу ўступіла **Швецыя**. Гэта было звязана з дзейнасцю Стакгольмскай школы эканамістаў і прыходам да ўлады ў 1932 г. урада сацыял-дэмакратаў. Дзяржаўныя інвестыцыі і грамадскія работы, як і ў ЗША, павысілі плацёжаздольнасць насельніцтва. Эканамісты Стакгольмскай школы прапанавалі праграму антыцыклічнай палітыкі. Цэнтральнае аб'яднанне прафсаюзаў і Аб'яднанне прадпрымальнікаў Швецыі заключылі ў 1938 г. "Пагадненне аб мірным спосабе дасягнення калектыўнага дагавору". Такім чынам, быў закладзены падмурак "народнага дома" – шведскай сацыял-дэмакратычнай мадэлі краіны ўсеагульнага дабрабыту.

Супрацьлегла складваўся лёс **Германіі**, дзе крызіс быў найбольш моцным, засілле буйнога карпаратыўнага капіталу выразным, працоўныя, былыя афіцэры, дробныя гаспадары і служачыя навогул былі выбіты з каляіны Першай сусветнай вайной і палітычнай нестабільнасцю. Рэпарацыі паглыбілі дэфіцыт бюджэта Германіі, і ў 1922–1923 гг. у краіне пачалася гіперінфляцыя – рост цэн у сотні мільёнаў разоў. Замежныя інвестыцыі, займы, укараненне навуковай арганізацыі працы дазволілі ў другой палове 20-х гг. аднавіць прамысловасць у Германіі і зноў выйсці на першае месца ў Еўропе і другое ў свеце.

У пачатку 1933 г. да ўлады ў Германіі прыйшлі нацысты. Іх эканамічная праграма арыентавалася на падрыхтоўку да вайны, што азначала мілітарызацыю і курс на аўтаркію – самазабеспячэнне неабходнымі рэсурсамі. Для пераводу эканомікі на ваенныя рэйкі быў утвораны складаны апарат дзяржаўнага рэгулявання. Яго аснову склаў "фюрэр-прынцып" – падпарадкаванне ўсіх сектароў эканомікі і груп прадпрыемстваў загадам упаўнаважаных чыноўнікаў – "віртшафтсфюрэраў". У 1933 г. быў прыняты Закон аб прымусовым картэляванні дробных і сярэдніх прадпрыемстваў", а ў 1934 г. – "Закон аб падрыхтоўцы да арганічнай пабудовы германскай гаспадаркі".

Міністр эканомікі Я. Шахт атрымаў паўнамоцтвы на ўтварэнне, роспуск ці змяненне гаспадарчых аб'яднанняў і назначэнне іх кіраўнікоў. Закон "Аб арганізацыі нацыянальнай працы" (1934 г.) забараняў прафсаюзы, стачкі, пераход працоўных на іншае прадпрыемства, дэклараваў спыненне ў Германіі класавай барацьбы і аб'яднанне працоўных і фабрыкантаў у адзіны "Нямецкі працоўны фронт", у якім заработная плата рэгулявалася міністэрствам. Сродкам скарачэння беспрацоўя стала ўвядзенне ў 1935 г. сярод насельніцтва ўзростам з 18 да 25 гадоў працоўнай павіннасці, з 1938 г. яна стала ўсеагульнай. Для рэгулявання сельскай гаспадаркі было створана "імперскае саслоўе па харчаванню", земляробы былі аб'яўлены "салдатамі фронта харчавання". Уводзілася сістэма прымусовых паставак сельгаспрадукцыі.

Такім чынам, у 30-я гг. склаліся тры розныя мадэлі дзяржаўнага рэгулявання эканамічных працэсаў, якія адпавядалі палітычнай накіраванасці дзяржаў:

1) **таталітарная гаспадарча-эканамічная сістэма,** пры якой фашысты і нацыянал-сацыялісты захавалі прыватную ўласнасць на сродкі вытворчасці і рынкавыя механізмы функцыянавання эканомікі, але пад жорсткім наглядам дзяржавы. Сусветна-эканамічны крызіс 1929–1933 гг. стаў тупіком, у які зайшла індустрыяльная цывілізацыя, а Гітлер адрадзіў сацыяльна-палітычную структуру даіндустрыяльных цывілізацый;

2) **камандна-адміністрацыйнай сістэма,** у працэсе стварэння якой бальшавікі пайшлі на шляху поўнай нацыяналізацыі сродкаў вытворчасці ў гады правядзення палітыкі "ваеннага камунізму" ў 1918–1920 гг., часткова адступілі ад гэтых прынцыпаў ў гады НЭПа (1921–1927 гг.) і канчаткова перайшлі да ўтварэння планавай дзяржаўнай эканомікі ў час правядзення індустрыялізацыі і прымусовай калектывізацыі ў 30-я гг.;

3) **ліберальна-рэфармісцкая мадэль**, у адпаведнасці з якой у дэмакратычных краінах былі сфармуляваны ідэі пашырэння рэгулюючай ролі дзяржавы ў эканоміцы ў мэтах рэалізацыі правоў і свабод чалавека. У гэтай канцэпцыі цэнтральнае месца займаюць праграмы сацыяльнай дапамогі немаёмасным, беспрацоўным, інвалідам, праграмы пенсій і дапамогі па старасці, абгрунтавана дзяржаўнае ўмяшальніцтва пры вырашэнні спрэчных пытанняў паміж прадпрымальнікамі і рабочымі, садзеянне сістэмам адукацыі, аховы здароўя, жыллёвага будаўніцтва. Вялікае значэнне надавалася дзяржаўнай рэгуляцыі эканамічнага працэса, асабліва дзейнасці буйных карпарацый і трэстаў. Практыка гаспадарчага і сацыяльнага развіцця капіталізма 30-х і пасляваенных дзесяцігоддзяў пацвердзілі слушнасць Кейнса адносна шырокіх магчымасцяў дзяржавы ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем грамадства.

У другой палове 1930-х гг. пашыралася сістэма сацыяльнай абароны насельніцтва. Асабліва хуткія тэмпы роста назіраліся ў аўтамабільнай, авіяцыйнай, хімічнай і радыётэхнічнай прамысловасці. Развіваліся міжнародныя гандлёвыя сувязі, раслі аб'ёмы экспарта капітала, укараняліся новыя тэхнічныя вынаходніцтвы. Усё гэта прывяло да памяншэння беспрацоўя, вырашэння жыллёвай і харчовай праблем, росту заработнай платы. Паляпшаліся ўмовы працы, што знізіла сацыяльную напружанасць. Але наступны сусветны эканамічны крызіс 1937–1938 гг. абвастрыў адносіны паміж вядучымі краінамі свету і падштурхнуў іх да пачатку Другой сусветнай вайны.

**Заключэнне.** Першая палова XX ст. азнаменавалася новым рыўком у пашырэнні еўрапацэнтрычнага свету. Рэальнасцю станавілася геапалітычнае, эканамічнае і камунікатыўнае адзінства чалавецтва. Ствараецца Ліга Нацый, складваецца Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных дагавораў – правобраз агульнапланетарнай палітыка-прававой сістэмы. Пры ўсёй адметнасці, супрацьлегласці ліберальна-дэмакратычнай і таталітарнай альтэрнатыў развіцця грамадства, з'яўляюцца і некаторыя агульныя заканамернасці – дэмакратызацыя палітычнага жыцця, сацыялізацыя дзяржавы і ўсёй сістэмы грамадскіх інстытутаў, развіццё інфармацыйнай прасторы, імклівае нарошчванне навукова-тэхнічнага патэнцыяла, больш складаная дыферэнцыяцыя сацыяльнай структуры. Крызіс 1929–1933 гг. паставіў канчатковую кропку ў развіцці свабодна-прадпрымальніцкага капіталізму і зрабіў дзяржаўнае рэгуляванне пастаянным ключавым элементам эканамічнай і сацыяльнай сфер жыцця заходняга грамадства. Гэтыя змяненні ўжо ў другой палове стагоддзя прывядуць да паступовай трансфармацыі індустрыяльнага грамадства і фарміравання сусветнай постіндустрыяльнай інфармацыйнай цывілізацыі.

*Лекцыя сёмая*

# ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА

1. Прычыны Другой сусветнай вайны.
2. Асноўныя этапы Другой сусветнай вайны, іх асаблівасці.
3. Антыгітлераўская кааліцыя: яе стварэнне, развіццё, супярэчнасці паміж удзельнікамі.
4. Закладванне асноў пасляваеннага мірнага ўрэгулявання.

## 1. Прычыны Другой сусветнай вайны

Прычыны, па якіх свет у другі раз апынуўся ў стане глабальнага ваеннага канфлікта, істотна адрозніваліся ад перадумоў любой з папярэдніх войнаў. Стратэгія, выбар саюзнікаў вызначаліся цэлым комплексам фактараў.

**Першая прычына.** Вядучую ролю ў распальванні ваеннага канфлікта адыгралі таталітарныя рэжымы фашысцкай[156] Італіі, мілітарысцкай Японіі і нацысцкай Германіі, якія праследвалі блізкія мэты – арыентаваліся на зацвярджэнне сусветнага панавання сваіх нацый.

Палітыка **Японіі** была арыентавана на тэрытарыяльную экспансію ў ціхаакіянскім рэгіёне і на Далёкім Усходзе. Пры гэтым Германія і Італія былі зацікаўлены ў складванні дастаткова шырокага ваенна-палітычнага блока, здольнага кінуць выклік ваеннай моцы дэмакратычных краін і СССР, а Японія мела патрэбу ў стратэгічных партнёрах, якія маглі блакіраваць умяшальніцтва еўрапейскіх краін у зоне Ціхага акіяна. Усе краіны гэтай групы былі арыентаваны на карэнную трансфармацыю сусветнай палітычна-эканамічнай і геапалітычнай прасторы – утварэнне “новага парадку”.

Абавастрэнне міжнародных абставін спачатку пачалося на Далёкім Усходзе. У 1931 – 1933 гг. Японія захапіла кітайскую тэрыторыю – Маньчжурыю – там і ўзнік **першы асяродак вайны**. Рэзалюцыя Лігі Нацый (люты 1933 г.), якая асуджала агрэсію і патрабавала вяртанне Маньчжурыі, прывяла да выхаду Японіі ў сакавіку 1933 г. са складу гэтай міжнароднай арганізацыі.

**Германія,** ў першую чаргу, дабівалася рэвізіі ўмоў Версальска-Вашынгтонскай сістэмы[157], кансалідацыі германскай этнічнай дзяржаўнасці, а таксама ўтварэння шырокай сферы ўплыву ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. У 1933 г. на чале германскага ўрада апынулася нацысцкая партыя пад кіраўніцтвам А. Гітлера (НСРПГ), якая прапагандавала ідэалогію рэваншызма, нацыяналізма і расізма. Каб уз'яднаць нямецкую нацыю ў межах адзінага Рэйху, нацысты імкнуліся да развязвання татальнай вайны, фарміравання новага светаўладкавання па расавай іерархіі. Ужо ў кастрычніку 1933 г. Германія выйшла са складу Лігі Нацый і адмовілася ад удзелу ў Жэнеўскай канферэнцыі па раззбраенню 1932–1935 гг., стала **другім асяродкам вайны**. Прыняцце курса на мілітарызацыю было азнаменавана ўвядзеннем у 1935 г. усеагульнай вайсковай павіннасці, утварэннем моцных арміі, паветранага і марскога флота. Фюрэр перайменаваў рейхсвер ў Вермахт і прызначыў сябе вярхоўным галоўнакамандуючым узброенымі сіламі Германіі. Летам 1935 г., пасля заключэння англа-германскага пагад-

---

[156] **Фашызм** – (ад італ. fascismo – аб'яднанне) палітычны накірунак, які распаўсюдзіўся ў 20–30-я гг. XX ст. і адлюстраваў інтарэсы найбольш рэакцыйных і агрэсіўных слаёў грамадцтва. Ідэалогія фашызма – антыкамунізм, расізм, шавінізм, культ асобы, мілітарызацыя ўсіх сфер жыцця грамадства, татальная ўлада дзяржавы.

[157] Глядзіце папярэднюю лекцыю.

нення, якое дазволіла немцам павялічыць танаж ваенна-марскога флоту, пачалося будаўніцтва падводных лодак. Ваенная вытворчасць з 1934 па 1940 г. вырасла ў 22 разы,[158] что з'явіліася прычынай узмацнення ваенна-палітычнай агрэсіўнасці нацысцкага кіраўніцтва.

**Італія** імкнулася да замацавання сваей палітычнай і эканамічнай перавагі на Балканах і ў Паўночна-Усходняй Афрыцы. Італьянскія фашысты марылі аб аднаўленні "вялікай лацінскай нацыі", заклікалі да аб'яднання "маладых нацый" у іх барацьбе супраць "старых". Для гэтага Італія дабілася пратэктарата над Албаніяй, праз дагавор аб сяброўстве ад 1927 г. фактычна ўвяла ў арбіту італьянскай палітыкі Венгрыю. У 1928 г. быў падпісаны італа-грэчаскі дагавор аб сяброўстве, у пачатку 1930-х гг. Італія зблізілася з Балгарыяй. Апеліруючы да арбітражу Лігі Нацый, фашысцкі ўрад Б. Мусаліні спадзяваўся на гатоўнасць брытанскага і французскага ўрадаў санкцыянаваць сваё ўзмацненне ў рэгіёне Міжземнамор'я і на Балканах. Італьянскі фашызм даўно планаваў захоп незалежных дзяржаў у Афрыцы. Атрымаўшы згоду Англіі і Францыі, Італія ў пачатку кастрычніка 1935 г. пачала вайну ў Эфіопіі (Абісінія) – так на паўночным усходзе Афрыцы, пабліз марскіх камунікацый узнік **трэці асяродак вайны**. Пасля поўнага захопу Эфіопіі ў маі 1936 г., яе аб'ядналі разам з Эрытрэей і Італьянскім Самалі ў Італьянскую Усходнюю Афрыку.

Калі ў ліпені 1936 г. у Іспаніі пачаўся ваенна-фашысцкі мяцеж супраць рэспублікі Народнага фронту, Германія і Італія арганізавалі ўзброеную інтэрвенцыю. У Іспанію, якая выкарыстоўвалася як палігон для ўдасканалення баявой тэхнікі і адпрацоўкі метадаў вядзення татальнай вайны, імі была накіравана ваенная тэхніка, спецыялісты, а таксама вайсковыя падраздзяленні. Краіна стала крыніцаю стратэгічнай сыравіны для агрэсараў, што стварыла непасрэдную пагрозу марскім камунікацыям Францыі і Англіі, якія звязвалі іх з метраполіямі. Савецкі Саюз выступіў у падтрымку іспанскага ўрада і патрабаваў спынення італа-германскай інтэрвенцыі. Вялікабрытанія і Францыя, у сваю чаргу, зноў праводзілі **палітыку "неўмяшання"** ў іспанскія справы, што было разнавіднасцю "замірэння" агрэсараў, заснаванага на антыкамунізме: у жніўні 1936 г. у Лондане быў утвораны Камітэт па неўмяшанню пры ўдзеле 27 краін, які забараняў экспарт у Іспанію зброі, ваенных матэрыялаў і тэхнікі. Па сутнасці была арганізавана эканамічная блакада Іспанскай рэспублікі, у той час як фашысцкаму ўраду Франка, які ўзначаліў мяцежнікаў, працягвалі пастаўляць узбраенне. У кастрычніку 1936 г. СССР аказаў дапамогу Іспаніі пастаўкамі ўзбраення і боепрыпасаў, прадаставіў крэдыт на суму 85 млн. долараў. Савецкія спецыялісты розных радоў войскаў дапамагалі ўзмацненню арміі і ў правядзенні баявых аперацый.

25 лістапада 1936 г. быў падпісаны германа-японскі "Антыкамінтэрнаўскі пакт", праз год да яго далучылася Італія. Так, ужо да канца 1937 г. склаўся ваенна-палітычны блок фашысцкіх дзяржаў ("ось Токіо – Рым – Берлін"), які працягваў актыўную захопніцкую палітыку. Бакі дамовіліся аб размежаванні зон сваіх эканамічных інтарэсаў ў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе, вызначылі агульную лінію паводзін пры падтрымцы рэжыма Франко ў Іспаніі.

Здзяйсненне сваіх захопніцкіх планаў урад "Трэцяга Рэйха" вырашыў пачаць з краін Цэнтральнай Еўропы – суседніх Германіі Аўстрыі і Чэхаславакіі. Дырэктыва па падрыхтоўцы ваеннага пахода ў Аўстрыю ("план Отта") была зацверджана у чэрвені 1937 г., план захопу Чэхаславакіі (кодавае назва "Грюн") – у снежні 1937 г. У ноч на 12 сакавіка 1938 г. армія

[158] Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) / А. А. Коваленя и др. – Мн., 2004. – С. 19.

Вермахта ўварвалася ў Аўстрыю, на наступны дзень Гітлер абвясціў сябе кіраўніком гэтай дзяржавы. Аншлюс (далучэнне да Германіі), які быў праведзены пад лозунгам аб'яднання ўсіх зямель населеных немцамі, у хуткім часе быў прызнаны заходнееўрапейскімі краінамі.

У ліпені 1938 г. Камітэт па неўмяшанню прыняў рашэнне аб вывадзе з Іспаніі ўсіх іншаземных добраахвотнікаў, на што дало згоду рэспубліканскае кіраўніцтва. Але італа-германскія інтэрвенты не перасталі ваяваць ў зоне канфлікту і, калі становішча рэспублікі пагоршылася, 27 лютага 1939 г. Лондан і Парыж парвалі дыпламатычныя адносіны з Іспаніяй і прызналі ўрад мяцежнікаў.

У 1937 г. Японія зноў пачала наступленне на Кітай у районе Тяньцзяня і Пекіна, аднак і на гэты раз вядучымі краінамі свету праводзілася палітыка папусціцельства агрэсіі – "неўмяшання": Ліга Нацый адмовілася разглядаць скаргу Кітая і абмежавалася "маральнай падтрымкай". Адзіным саюзнікам Кітая выступіў СССР, які ў жніўні 1937 г. заключыў пакт аб ненападзе і прадаставіў крэдыты на суму 250 млн. $. Міжнародная сітуацыя абавастрылася з пачаткам у 1938 – 1939 гг. нападаў японскіх захопнікаў на савецкую тэрыторыю ля возера Хасан і ракі Халхін-Гол.

**Другая прычына.** Агрэсіўнаму фашысцкаму блоку супрацьстаялі дзяржавы, зацікаўленыя ў захаванні статус-кво ў сістэме міжнародных адносін, – Францыя, Вялікабрытанія, ЗША. Гатовыя пайсці на пэўныя ўступкі дзяржавам, пацярпеўшым ад нераўнапраўных дагавораў Версальскай сістэмы, яны не маглі дапусціць карэннай перабудовы палітычнай карты свету.

Замірэнне агрэсараў уяўляла сабою палітыку вядучых заходнееўрапейскіх краін у 1930-я гг. у адносінах да краін фашысцкага блоку з мэтай накіраваць іх ваенна-палітычную агрэсію на Усход, супраць камуністычнага рэжыму СССР. **Палітыка замірэння** агрэсараў з боку вядучых дзяржаў прывяла да заключэння ў ліпені 1933 г. у Рыме пакта аб супрацоўніцтве паміж Вялікабрытаніяй, Францыяй, Германіяй і Італіяй пад эгідай Лігі Нацый, але ратыфікацыя яго была сарвана, па прычыне адмовы апошніх ад раззбраення.

ЗША аб'явілі, што вяртаюцца да традыцыйнай палітыкі ізаляцыянізму – у канцы жніўня 1935 г. кангрэс прыняў закон аб нейтралітэце, які ў 1937 г. быў пашыраны і пераўтвораны ў пастаянны закон. У прыватнасці, згодна з ім забаранялася прадаваць зброю і амуніцыю ваюючым краінам, выдаваць пазыкі і крэдыты.

Але праводзячы палітыку неўмяшальніцтва і замірэння агрэсара, вядучыя дэмакратычныя краіны толькі садзейнічалі разгортванню фашысцкай пагрозы. Так, у час дыпламатычнага крызіса вакол Чэхаславакіі, **29–30 верасня 1938 г.** на канферэнцыі ў Мюнхене Вялікабрытанія і Францыя падпісалі дагавор з Германіяй і Італіяй, які прадугледжваў пераход Судэцкай вобласці да германскай тэрыторыі. У выніку **"мюнхенскага зговару"** 1 кастрычніка 1938 г. гэтая вобласць была акупавана, а ў сакавіку 1939 г. Германія заняла ўсю Чэхаславакію. Славакія, у якой утварыўся марыянетачны фашысцкі ўрад, была абвешчана "самастойнай" дзяржавай пад апекай Германіі. Падпісаная ў Мюнхене Гітлерам і прэмьер-міністрам Вялікабрытаніі Чэмберленам дэкларацыя аб ненападзе, прадаставіла Германіі свабоду дзеянняў у краінах Усходняй Еўропы, перш за ўсё ў СССР. Аналагічная дэкларацыя была падпісана 6 снежня 1938 г. паміж Германіяй і Францыяй.

Новыя акты фашысцкай агрэсіі вымусілі заходнееўрапейскія краіны змяніць тактыку і прадпрыняць меры па ўмацаванню свайго ваенна-палітычнага становішча. Парламенты Англіі і Францыі, баючыся непрадказальнай палітыкі Германіі, зацвердзілі вялікія ваенныя асігнаванні, зноў пайшлі на кантакты з СССР. Вясной і летам 1939 г. праходзілі

трохбаковыя перагаворы паміж СССР, Англіяй і Францыяй па палітычных, а потым і ваенных пытаннях. Разам з тым аналіз дакументаў і матэрыялаў сведчыць, што іх удзельнікі не праяўлялі гатоўнасці да кампрамісаў перад тварам фашызму, у жніўні 1939 г. стала відавочна, што перагаворы зайшлі ў тупік. Адначасова брытанскія палітычныя колы не пакінулі спроб дамовіцца з Германіяй.

Такім чынам, Вялікабрытанія, Францыя і ЗША абаранялі сваё палітыка-эканамічнае панаванне, а таксама выступалі за зацвярджэнне прынцыпаў ліберальнай дэмакратыі як асноватворных для цывілізацыйнага развіцця чалавецтва. Але на жаль, на той час склаліся супярэчнасці паміж названымі капіталістычнымі краінамі і Савецкім Саюзам, што не дазволіла загадзя стварыць магутны антыфашысцкі фронт, сістэму калектыўнай бяспекі ў Еўропе.

**Трэцяя прычна**. На думку замежных даследчыкаў, адным з віноўнікаў вайны можна назваць і **СССР**. Яшчэ па ініцыятыве У. І. Леніна было створана міжнароднае аб'яднанне камуністычных партый – Камінтэрн (глядзіце папярэднюю лекцыю), якое ставіла задачу пабудовы Сусветнай Сацыялістычнай рэспублікі, што расцэньвалася як пагроза бальшавіцкай экспансіі. Устаноўкі Камінтэрна і савецкага ўрада, рэпрэсіі ў нашай краіне пасеялі сумненні сярод кіруючых колаў Захаду ў ацэнцы магутнасці СССР, якія адштурхоўвалі ад Савецкага Саюза прагрэсіўныя сілы. З улікам супярэчнасцей паміж фашысцкімі і дэмакратычнымі дзяржавамі Савецкі Саюз атрымаў магчымасць гнуткага выбару стратэгічнай лініі з магчымасцю ўключэння ў перадзел сфер уплыву ва Усходняй Еўропе, паколькі ён станавіўся незваротным. Разам з пашырэннем зоны савецкага эканамічнага і палітычнага ўплыву гэта давала магчымасць экспарта камуністычных ідэалаў.

Напярэдадні вайны, **23 жніўня 1939 г.** паміж СССР і Германіяй быў падпісаны пакт аб ненападзе (**пакт Молатава-Рыбентропа**), які быў дапоўнены сакрэтнымі пратаколамі, па якіх размяжоўваліся "сферы інтарэсаў" абодвух бакоў. Германія атрымала Францыю, Брытанію і іх афрыканскія калоніі, СССР – Фінляндыю, Прыбалтыку, Бесарабію і права пашырацца на поўдзень у бок Пярсідскага заліва. На тэрыторыі Літвы і Польшчы па рэках Нараў, Вісла, Сан павінна была ўсталявацца германа-савецкая мяжа. Гэта азначала, што Савецкі Саюз атрымаў магчымасць акрамя заходніх частак Беларусі і Украіны далучыць тэрыторыю Польшчы да Варшавы. Сам факт размежавання інтарэсаў сацыялістычнай і фашысцкай дзяржаў, прыняты ў абыход законаў, і парушэнне абавязацельстваў перад трэцімі краінамі адлюстраваў грэбаванне нормамі права і маралі. Пакт Молатава–Рыбентропа нанёс урон міжнароднаму прэстыжу СССР, які ўспрымаўся раней як флагман барацьбы з фашызмам.

Адначасова, СССР выступіў супраць буйнамаштабнай прымусовай перакройкі палітычнай карты Еўропы і быў зацікаўлены ва ўмацаванні сістэмы калектыўнай бяспекі як спосабе блакіраваць патэнцыяльную пагрозу капіталістычнага асяроддзя.

Пагроза вайны вымусіла ўсе вядучыя краіны свету ўжо ў сярэдзіне 1930-х гг. здзейсніваць пэўныя крокі па нарошчванню ўзбраенняў. Адносна пасіўная стратэгія Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША, СССР, абумоўленая прыярытэтам дыпламатычных, а не ваенных метадаў палітыкі, не дазволіла гэтым краінам правесці поўную мабілізацыю напярэдадні вайны. Нягледзячы на заключэнне гарантыйных дагавораў Францыі і Вялікабрытаніі з шэрагам усходніх еўрапейскіх краін ваенныя дактрыны абедзвюх краін зыходзілі з прыярытэту абаронччых задач. У Англіі была ўведзена ўсеагульная вайсковая павіннасць. Ваенная стратэгія ЗША таксама насіла абарончы характар і была звязана з ізаляцыяніцскім знешнепалітычным курсам.

Краінам фашысцкага блока ўдалося не толькі завяршыць мабілізацыю рэсурсаў перад вайной, але і пашырыць ваенна-прамысловую базу. Японская армія адрознівалася высокай

ступенню падрыхтоўкі асабістага складу, распрацаванай стратэгіяй паэтапнага наступлення ў ціхаакіянскім рэгіёне. Італьянскія ўзброеныя сілы былі пераважна арыентаваны на вядзенне лакальных баёў у Паўночна-Усходняй Афрыцы і на Балканах. Тэхнічная база германскіх узброеных сіл – Вермахта – была дастаткова застарэлай, але моцным бокам арміі была наватарская тактыка вядзення вайны. Яе аснову саставілі планы "бліцкрыга" – маланкавай вайны – імклівага нападзення пры цесным узаемадзеянні ўсіх радоў войск, бамбардзіроўцы гарадоў і камунікацый ў першыя дні вайны, шырокім выкарыстанні дыверсійных груп і дэсантных падраздзяленняў у тыле праціўніка. У спалучэнні з руплівай распрацоўкай аператыўна-стратэгічных планаў кожнай кампаніі, хуткім нарошчваннем ваеннай вытворчасці Вермахт атрымаў шанц дастаткова эфектна весці ваенныя дзеянні на тэрыторыі большай часткі еўрапейскага кантынента, у тым ліку і на два фронта.

Такім чынам, акрамя прамога суперніцтва вядучых сусветных дзяржаў, Другая сусветная вайна была народжана сутыкненнем грамадскіх сістэм, ідэалагічных канцэпцый дэмакратыіі, камунізма, фашызма і іх геапалітычнага ўвасаблення. Сусветны эканамічны крызіс 1937 – 1938 гг. абвастрыў адносіны паміж вядучымі краінамі і падштурхнуў рэакцыйныя рэжымы да пачатку агрэсіўных дзеянняў.

## 2. Асноўныя этапы Другой сусветнай вайны, іх асаблівасці

**У гістарыяграфіі вылучаюць пяць асноўных перыядаў Другой сусветнай вайны:**

**Першы перыяд (1 верасня 1939 г. – 21 чэрвеня 1941 г.)** уключае пачатак вайны і захоп германскімі войскамі і іх сатэлітамі краін Заходняй Еўропы (карта 1). Пачатак Другой сусветнай вайны храналагічна звязваецца з падзеямі **1 верасня 1939 г**., калі гітлераўская Германія напала на Польшчу. 3 верасня 1939 г. Францыя і Англія аб'явілі вайну Германіі.[159] З аб'яўленнем вайны Германіі выступілі таксама Аўстралія, Новая Зеландыя, Канада, Індыя, Южна-Афрыканскі Саюз – вайна набыла сусветны характар. Паступова ў вайну была ўцягнута 61 краіна, баявыя дзеянні адбываліся на тэрыторыі 40 дзяржаў, а таксама на марскіх і акіянскіх прасторах. Палітычнае кіраўніцтва краін Захаду і СССР не здолела выпрацаваць сумесней пазіцыі па стрымліванню агрэсіўных замахаў Германіі і яе саюзнікаў. Больш таго, Вялікабрытанія, Францыя, Польшча, і нават Савецкі Саюз аддалі перавагу кампрамісу з агрэсарам замест супрацьстаяння. Менавіта ў гэтых складаных знешнепалітычных умовах восенню 1939 г. адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.[160] Палітычныя ўзаемаразлікі былі такімі, што 25 верасня ў Брэсце нават

[159] Абарона маршала Польскай Арміі Рыдз-Сміглы была разлічана на падтрымку саюзнікаў, але 110 французскіх і 5 англійскіх дывізій на Заходнім фронце супраць 13 германскіх так і не выступілі, як бы працягваючы палітыку "супакойвання агрэсара" і жадаючы скіраваць агрэсію Германіі на СССР. Такая сітуацыя ўвайшла ў гісторыю пад назвай "дзіўная вайна". Францыя планавала пачаць наступленне на 15 дзень вайны, але да гэтага часу тэрыторыя этнічнай Польшчы была акупавана. 16 верасня польскі ўрад эміграваў у Румынію, а затым – у Лондан.

[160] **Аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.** У першыя дні германа-польскай вайны савецкі ўрад заняў пазіцыю чакання, з 6 верасня ў СССР быў праведзены частковы прызыў рэзервістаў, а 11 верасня народны ваенны камісар К. Варашылаў аддаў загад аб арганізацыі Беларускага і Украінскага франтоў. Толькі 17 верасня было аддадзена распараджэнне Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі перайсці савецка-польскую граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходніх Украіны і Беларусі. У першы дзень паходу былі вызвалены Баранавічы, 18 верасня – Навагрудак, Ліда і Слонім, 19 верасня – Вільня і Пружаны, 20-га – Гродна, 21-га – Пінск, 22 верасня – Беласток і Брэст. Ні польскі, ні савецкі ўрад не аб'яўлялі вайны адзін аднаму, але згодна з афіцыйнымі паведамленнямі Галоўнакамандавання Чырвонай Арміі, за час верасноўскай кампані загінула 737 і было паранена 1862 савецкіх салдаты і афіцэры. Акрамя загінуўшых, з польскага боку больш 250 тыс. ваеннаслужачых апынуліся ў савецкім палоне. 5 кастрычніка 1939 г. часовая ўправа г. Беластока звярнулася да ўсіх часовых упраў краю з прапановай склікання Народнага сходу для вырашэння пытанняў аб дзяржаўнай уладзе і самавызначэнні. Пасля выбараў 22 кастрычніка, ў якіх галасавала 90,7 % насельніцтва, 28 кастрычніка ў будынку Беластоцкага гарадскога тэатру Народны Сход Заходняй Беларусі пачаў сваю работу, а 29-га – зацвердзіў лёсавызначальную Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў БССР. Ратыфікацыя гэтага рашэння адбылася 2 лістапада на V нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета СССР першага склікання і 12 лістапада 1939 г. на нечарговай сесіі ВС БССР. У студзені – сакавіку 1940 г. былі створаны мясцовыя органы савецкай улады, фарміраванне якіх скончылася толькі ў канцы года.

адбыўся парад патэнцыяльных ворагаў – савецкіх і нямецкіх войскаў, а **28 верасня 1939 г.** быў падпісаны **"Дагавор аб сяброўстве і граніцы"** паміж СССР і Германіяй. Дзеянні Чырвонай Арміі на тэрыторыі Заходніх Украіны і Беларусі, хаця і тлумачыліся мэтай абароны прыгнечаных нацыянальных меншасцяў у Польшчы, былі парушэннем пагадненняў паміж урадамі СССР і Польшчы (Рыжскага дагавору 1921 г., дагавору аб ненападзе 1932 г.), а таксама канвенцыі аб вызначэнні агрэсара, якая прызнавала такім дзяржаву, узброеныя сілы якой, нават без аб'яўлення вайны, уступілі на тэрыторыю іншай дзяржавы.

У час падпісання вышэйназванага дагавору Сталін прапанаваў Гітлеру абмяняць Літву на Люблінскае і частку Варшаўскага ваяводстваў. Абапіраючыся на дасягнутыя з Германіяй пагадненні, у 1939 г. СССР заключыў дагаворы аб узаемадапамозе з **Эстоніяй** (28 верасня), **Латвіяй** (5 кастрычніка) і **Літвой** (10 кастрычніка)[161], а **ў жніўні 1940 г.** гэтыя прыбалтыйскія рэспублікі **увайшлі ў склад СССР**. Бесарабія і Паўночная Букавіна, акупаваныя Румыніяй з 1918 г., былі вернуты ў склад Малдаўскай АССР (2 жніўня 1940 г. стала МССР). У выніку, СССР папоўніўся чатырма новымі рэспублікамі. Лічылася, што яшчэ больш ўзмацнілася яго баяздольнасць пасля Савецка-Фінляндскай вайны[162] – дзякуючы павелічэнню тэрыторыі нашай краіне ў час Вялікай Айчыннай вайны ўдалося адстаяць ад поўнага разгрому Ленінград (Санкт-Пецярбург), захаваць незамерзаючы порт у Мурманску. З іншага боку, зацягнуўшаяся вайна ў Фінляндыі паказала няўменне Чырвонай Арміі весці вайну сучаснымі сродкамі – армія была дрэнна падрыхтавана і панесла вялікія страты. Геапалітычныя ракіроўкі бальшавіцкага ўрада ў 1939–1940 гг. былі асуджаны, у час вайны з Фінляндыяй Савецкі Саюз быў прызнаны краінай-агрэсарам і выключаны 16 снежня 1939 г. са складу Лігі Нацый.[163] Знешнепалітычныя меры, якія прадпрымаліся савецкім кіраўніцтвам, адсунулі, але не прадухілілі вайну на тэрыторыі СССР. Сталін ў абстаноўцы разгарнуўшайся сусветнай вайны праводзіў палітыку замірэння Германіі, прыняўшы ўдзел у баявых дзеяннях і выконваючы ўсе ўмовы пакта Рыбентропа-Молатава.

9 красавіка 1940 г. нямецкім узброеным сілам паступіў загад перайсці граніцу Даніі і Нарвегіі: Данія была захоплена на працягу аднаго дня, поўнасцю зламаць супраціўленне нарвежскай арміі гітлераўцам удалося толькі ў пачатку чэрвеня. 10 мая таго ж года Германія выступіла супраць Бельгіі (28 мая тая капітулявала), Нідэрландаў, Люксембурга і Францыі. 5 чэрвеня пачалася рэалізацыя германскага плана наступлення на цэнтральныя раёны Францыі "Рот", а 10 чэрвеня супраць Францыі выступіла і Італія, што прымусіла прагерманскі ўрад "Вішы" падпісаць акт капітуляцыі 22 чэрвеня 1940 г. На працягу лета 1940 г. германская авіяцыя праводзіла бамбардзіроўкі Вялікабрытаніі, і

[161] Згодна з савецка-літоўскім пагадненнем ад 10 кастрычніка 1939 г узамен на згоду размясціць ваенныя базы да Літвы адыходзілі беларускія этнічныя тэрыторыі: г. Вільня і так званая Віленская вобласць (Віленска-Трокскі павет, частка тэрыторыі Свянцянскага і Браслаўскага паветаў) агульнай плошчай 6900 км².

[162] **Савецка-фінляндская вайна** была распачата СССР для захавання бяспекі галоўнай базы Балтыйскага флота – Кранштадта і сваёй паўночнай сталіцы – горада Ленінграда, граніца ад якога з германскай саюзніцай Фінляндыяй праходзіла ўсяго ў 32 км. Вайна падзяляецца на 3 этапы: 1) ад 30 лістапада да 26 снежня 1939 г., калі Чырвоная Армія, атрымаўшая загад адсунуць граніцу на Карэльскім перашэйку і выйсці на лінію Кексгольм-Выбарг, няўдала штурмавала абарончую "лінію Манэргейма"; 2) з 27 снежня па 31 студзеня 1940 г., які характарызаваўся стабілізацыяй становішча, баямі мясцовага значэння; 3) з 1 лютага па 12 сакавіка 1940 г. – калі адбыліся наступленне Чырвонай Арміі, прарыў умацаванняў і заключэнне Маскоўскага мірнага дагавору. У выніку была адноўлена гістарычная руска-фінляндская граніца, якая існавала да 1809 г. Да СССР адыйшлі Карэльскі перашэек з Выбаргам, заходняе і паўночнае ўзбярэжжа Ладажскага возера, заходняя частка паўвостравоў Рыбачы і Сярэдні ў Баранцавым моры. Фінляндыя згадзілася здаць у арэнду на 30 гадоў п-аў Ханко ў Фінскім заліве для стварэння там ваенна-марской базы. (Гл.: "Новейшая история зарубежных стран. Европа и Америка. 1917–1945. – С. 357-359").

[163] Гэта прывяло да выключэння і з такой арганізацыі як Чырвоны Крыж, таму савецкія ваеннапалонныя ўтрымліваліся ў намнога горшых умовах, чым іншыя.

хаця аперацыя “Марскі леў” па яе захопу, запланаваная спачатку на 17 ліпеня 1940 г., была адкладзена на невядомы тэрмін, англійскі народ быў пастаўлены на край нацыянальнай катастрофы. Летам 1940 г. паспяховыя баявыя дзеянні ў Афрыцы вяла Італія: яна захапіла Брытанскае Самалі, частку Кеніі і Судана, а ў верасні праз Лівію італьянская армія ўвайшла ў Егіпет.

Умацаванню гітлераўскай групоўкі садзейнічаў **“Траісты пакт”** – пагадненне аб ваенна-палітычным супрацоўніцтве на 10-гадовы тэрмін паміж **Германіяй, Італіяй і Японіяй (27 верасня 1940 г., Берлін)**. Асобная ўвага надавалася ўмацаванню адносін з Балгарыяй, Румыніяй, Венгрыяй і Фінляндыяй, якія павінны былі стаць важнымі плацдармамі наступлення на Савецкі Саюз. 1 сакавіка 1941 г. аб далучэнні да “Траістага пакту” заявіў царскі ўрад Балгарыі, 25 сакавіка 1941 г. – югаслаўскі ўрад Д. Цвятковіча, звергнуты праз два дні. 5 красавіка 1941 г. залючылі дагавор аб сяброўстве і ненападзе Каралеўства Югаславія і СССР, у адказ на што 6 красавіка пачаліся новыя заваяванні – ужо 12 красавіка 1941 г. Югаславія была раздзелена Германіяй, Італіяй, Венгрыяй і Балгарыяй, акт аб капітуляцыі ў Сараева быў падпісаны 17 красавіка 1941 г. За перыяд красавіка – мая Германіяй і Італіяй была падпарадкавана і Грэцыя.

**У час другога перыяда (22 чэрвеня 1941 г. – 18 лістапада 1942 г.)** адбываецца пашырэнне маштабаў баявых дзеянняў і крах германскага плана “маланкавай вайны” на Усходзе. Асабліва цяжкімі аказаліся першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны: 22 чэрвеня 1941 г. пасля нападзення гітлераўскіх войск на СССР, пачынаецца яго акупацыя. На баку Германіі выступілі Італія, Румынія, Венгрыя, Фінляндыя, Іспанія, фашысцкі ўрад Славакіі, урад Вішы (Францыя), які парваў дыпламатычныя адносіны з СССР. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне савецкіх ваеннаслужачых, да канца лістапада 1941 г. былі захоплены Украіна, Беларусь, Літва, Латвія, Эстонія, шэраг заходніх абласцей Расійскай федэрацыі. Цэнтральнае месца ~~ў комплексе абарончых мерапрыемстваў Савецкага Саюза заняла~~ **бітва за Маскву (30 верасня 1941 г. – 20 красавіка 1942 г.)**. Агульнае наступленне Чырвонай Арміі, якое пачалося ў студзені 1942 г., прывяло да таго, што праз 4 месяцы вораг быў адкінуты на 150-400 км на захад. Перамога пад Масквой развеяла міф аб непераможнасці нямецкага Вермахта.

7 снежня 1941 г. Японіяй быў здзейснены напад на ваенную базу ЗША ў Пёрл-Харбар і на Філіпіны, у сувязі з чым 8 снежня Злучаные Штаты і Вялікабрытанія аб'явілі ёй вайну. У адказ на аб'яўленне вайны Германіяй і Італіяй, кангрэс ЗША 11 снежня таксама аб'явіў ім вайну.

**Трэці перыяд (19 лістапада 1942 г. – 31 снежня 1943 г.)** ахоплівае **наступальны перыяд Сталінградскай бітвы (19 лістапада 1942 г. – 2 лютага 1943 г.)**, пераможныя аперацыі Чырвонай Арміі на падыходах да Каўказа і пад **Курскам (5 ліпеня – 23 жніўня 1943 г.)**. Гэты прамежак часу звязаны з карэнным пераломам у вайне, зрывам наступальнай стратэгіі фашысцкага блока і пераходам стратэгічнай ініцыятывы да краін антыгітлераўскай кааліцыі.

Адначасова з паспяховымі для краін антыгітлераўскай кааліцыі падзеямі на Усходнім фронце, англа-амерыканскія войскі да лета 1943 г. вызвалілі Паўночную Афрыку, што садзейнічала высадцы арміі саюзнікаў у Італіі. 3 верасня 1943 г. новы італьянскі ўрад Бадальо безагаворачна капітуляваў, а 13 кастрычніка аб'явіў Германіі вайну, што стала пачаткам распада фашысцкага блока. Да канца 1943 г. Чырвоная Армія вызваліла большую палову захопленых зямель.

**Чацвёрты перыяд (1 студзеня 1944 г. – 9 мая 1945 г.)** уключае, у першую чаргу, разгром фашысцкага блока, выгнанне гітлераўскіх войскаў з тэрыторыі СССР. Сярод

асноўных стратэгічных **наступальных аперацый у 1944 г. па вызваленню тэрыторый Савецкага Саюза** вылучаюць:
- **Дняпроўска-Карпацкую** (24 снежня 1943 г. – 28 сакавіка 1944 г.) па вызваленню Правабярэжнай Украіны (28 сакавіка савецкія войскі ўпершыню выйшлі на дзяржаўную граніцу ля ракі Прут);
- **Крымскую** (8 красавіка – 12 мая);
- **Ленінградска-Наўгародскую** (14 студзеня – 2 сакавіка), у час якой быў канчаткова вызвалены Ленінград (27 студзеня);
- **Калінкавіцка-Мазырскую** (16 кастрычніка 1943 г. – 14 студзеня) і **Рагачоўска-Жлобінскую** (21–24 лютага), калі была вызвалена ўсходняя частка Беларусі;
- **Выбаргска-Петразаводскую** (10 чэрвеня – 9 жніўня) па вызваленню Карэла-Фінскай ССР;
- **"Баграціён"** (23 чэрвеня – 29 жніўня), у час якой была поўнасцю вызвалена Беларусь, часткі Літвы, Латвіі і Польшчы;
- **Львоўска-Сандамірскую** (13 ліпеня – 29 жніўня) па вызваленню Украіны;
- **Ясса-Кішанёўскую** (20 – 29 жніўня) па вызваленню Малдавіі, вывядзенню са складу фашысцкага блоку Румыніі;
- **Прыбалтыйскую** (14 верасня – 24 лістапада), якая ўключала Рыжскую, Мемельскую і Маанзундскую франтавыя аперацыі.

Вызначальнымі падзеямі чацвёртага перыяда сталі адкрыццё Другога фронта ў Еўропе, заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны, вызваленне ад германскай акупацыі краін Еўропы, разгром Германіі ў час стратэгічных наступальных **Вісла-Одэрскай** (12 студзеня – 3 лютага 1945 г.) і **Берлінскай аперацый** (16 красавіка – 8 мая 1945 г.) і яе капітуляцыя (чытайце падрабязна аб гэтым у наступным раздзеле).

**Пяты перыяд (9 мая – 2 верасня 1945 г.)** звязаны з разгромам мілітарысцкай Японіі, вызваленнем народаў Азіі ад японскіх акупантаў і заканчэннем Другой сусветнай вайны.[164]

## 3. Антыгітлераўская кааліцыя: яе стварэнне, развіццё, супярэчнасці паміж удзельнікамі

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны 22 чэрвеня 1941 г. радыкальна змяніў палітычную расстаноўку сіл у свеце. У гэты ж дзень кіраўнік англійскага ўрада У.Чэрчыль і прэзідэнт ЗША А. Рузвельт заявілі аб гатоўнасці аказаць усю магчымую дапамогу Савецкаму Саюзу ў барацьбе з германскай агрэсіяй. Ужо 12 ліпеня паміж Вялікабрытаніяй і СССР было заключана пагадненне аб узаемнай дапамозе і падтрымцы. Тым самым быў пакладзены пачатак фарміраванню антыгітлераўскай кааліцыі. У жніўні 1941 г. у бухце Арджэнція на ўзбярэжжы Ньюфаўнленда адбылася першая сустрэча У. Чэрчыля і Ф. Рузвельта, на якой ішло абмеркаванне сумесных дзеянняў. Па выніках сустрэчы была падпісана так званая **Антлантычная хартыя**. У ёй змяшчалася ўказанне на тое, што саюзнікі не імкнуцца да якіх-небудзь тэрытарыяльных захопаў, з павагай ставяцца да права народаў выбіраць форму праўлення, дэкларавалася гатоўнасць выступіць гарантам дэмакратычнага сусветнага парадку і пасля завяршэння вайны.

У ходзе трохбаковых перамоў у Маскве (29 верасня – 1 кастрычніка 1941 г.) да Атлантычнай хартыі далучыўся СССР ~~і яшчэ 10~~ краін, было дасягнута пагадненнне аб узаемных пастаўках ЗША і Вялікабрытаніі Савецкаму Саюзу, вядомае як **Першы (Маскоўскі) пратакол**. Ён прадугледжваў больш як 70 асноўных відаў ваенных паставак і 80 прадметаў медыцынскага прызначэння агульным весам 1,5 млн. т. Савецкі Саюз, у сваю чаргу, выказаў імкненне здзейсняць у адказ пастаўкі розных тавараў, ці выплочваць золата.

Англія на аснове "Пагаднення аб сумесных дзеяннях у вайне супраць Германіі" прадаставіла СССР крэдыт у 10 млн. фунтаў сцерлінгаў тэрмінам на 5 год. Пад гэтыя крэдыты

---

[164] Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны). – С. 36.

адразу пайшлі пастаўкі ўзбраення і іншых стратэгічных матэрыялаў. Восенню 1941 г. на СССР распаўсюдзіўся закон аб **ленд-лізе** (перадачы ўзаймы ці ў арэнду), прыняты кангрэсам ЗША ў сакавіку 1941 г.[165] Усяго за гады вайны ў СССР паступіла 22195 самалётаў, 12980 танкаў, 13 тыс. зенітных і працітанкавых арудзій, 427 тыс. аўтамабілей, 560 караблёў і суднаў, прамысловае абсталяванне, паліва, узрыўчатыя рэчывы, 11156 чыгуначных вагонаў і 1981 паравозаў. (Для параўнання адзначым, што за гады вайны ў нас было пабудавана ўсяго 92 паравоза і крыху больш 1 тыс. вагонаў). Ішлі пастаўкі прадуктаў (4,3 млн. т.) і медыкаментаў, нафты і хімічнай сыравіны (842 тыс. т.), асабліва значнымі сталі пастаўкі з 1942 г. алюмінія і легіраванай сталі.[166] Савецкія спецыялісты лічылі, што пастаўкі па ленд-лізу складалі 4 % аб'ёма прамысловай прадукцыі Савецкага Саюза ў 1941–1945 гг., у заходняй літаратуры лічыцца што 10–11 %. Зразумела, нельга рабіць вымярэнне па адной шкале ваенных паставак з мільёнамі жыццяў, якія аддавалі савецкія людзі на шляху да перамогі над агульным ворагам. Гэта не аднойчы падкрэслівалі і знакамітыя дзяржаўныя дзеячы ЗША, Англіі, іншых дзяржаў – У. Чэрчыль, Д. Эйзенхаўэр, Г. Гопкінс. "Мы ніколі не лічылі, што наша дапамога па ленд-лізу з'яўляецца галоўным фактарам у савецкай перамозе над Гітлерам на Усходнім фронце, – адзначыў саветнік прэзідэнта ЗША Г. Гопкінс, – яна была дасягнута гераізмам і кроў'ю рускай арміі".[167] Вельмі важна на сёняшнім гістарычным этапе памятаць гэта. Важна ведаць і тое, што рух тавараў па ленд-лізу быў двухбаковым: СССР пастаўляў саюзнікам станкі, зенітныя пушкі, абсталяванне для заводаў, стратэгічную сыравіну, каштоўныя металы – марганец, хром, асбест, плаціну.

У снежні 1941 г. брытанскі ўрад прыняў рашэнне аб аб'яўленні вайны сатэлітам Германіі, якія ўдзельнічалі ў вайне супраць СССР. Пасля пачатку ваенных дзеянняў на Ціхім акіяне адбылося і канчатковае далучэнне ЗША да антыгітлераўскай кааліцыі. На вашынгтонскай сустрэчы Чэрчыля і Рузвельта ў студзені 1942 г. была ўзгоднена стратэгія абедзвюх краін у вядзенні баявых аперацый у ціхаакеянскай зоне, а таксама планы дэсантнай аперацыі ў Паўночнай Афрыцы.

У той жа час ў Вашынгтоне прадстаўнікі 26 краін, у тым ліку ЗША, СССР, Вялікабрытаніі, Кітая, Чэхаславакіі, Польшчы, Югаславіі, брытанскіх дамініёнаў падпісалі **Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый**. Яны абавязаліся выкарыстоўваць усе свае рэсурсы для барацьбы супраць фашысцкага блока, адмовіцца ад заключэння сепаратных мірных дагавораў, далучаліся да прынцыпаў пасляваеннага ўладкавання, замацаваных ў Атлантычнай хартыі.

Пры знешней ізаляванасці асноўных тэатраў ваенных дзеянняў карэнны пералом адбываецца ў канцы 1942 – пачатку 1943 г. практычна на кожным з іх. Стратэгічная ініцыятыва перайшла да праціўнікаў германскага блока. Тады ж адбываецца і кансалідацыя самой антыгітлераўскай кааліцыі. Штуршок да гэтага дало падпісанне ў маі–чэрвені 1942 г. савецка-англійскага саюзнага дагавора, згодна з якім Вялікабрытанія брала на сябе абавязак аказаць СССР "ваенную і іншую дапамогу ўсялякага кшталту"[168], а таксама савецка-амерыканскага пагаднення аб прынцыпах вядзення вайны супраць агрэсіі. Амерыканскае кіраўніцтва, у адрозняннe ад урада Вялікабрытаніі, ужо з 1942 г. выступала за актывізацыю падрыхтоўкі буйнамасштабнай дэсантнай аперацыі ў Заходняй Еўропе. Праблема адкрыцця Другога фронта стала цэнтральнай ва ўзаемаадносінах саюзнікаў.

---

[165] На ўмовах ленд-ліза пастаўкі з Англіі пачаліся з 6 верасня 1941 г., з ЗША – з лістапада таго ж года. Прэзідэнт ЗША Рузвельт аддаў загад аказаць Савецкаму Саюзу дапамогу на суму 1 млрд. долараў на аснове беспрацэнтнага займа з выплатай праз 5 гадоў пасля вайны на працягу 10-гадовага тэрміну. Дастаўка грузаў у СССР ажыццяўлялася па 4-х асноўных маршрутах:
1. Паўночны, самы кароткі – праз Паўночную Атлантыку і Арктыку ў Мурманск, Архангельск, Северадзвінск і Палярны;
2. Пярсідскі калідор – ад портаў Пярсідскага заліва праз пустыні і горы Ірана і савецкага Закаўказзя;
3. Перагон самалётаў праз Аляску і Сібір;
4. Ціхаакіянскі – ад Каліфорніі на Савецкі Далёкі Усход

[166] Баранов М., Стародубцев В. Миллионы тонн на весах победы // Деловые люди. – 1995. – Май. – С. 68.

[167] Там жа. – С. 68.

[168] Новейшая история стран Европы и Америки XX век/Ред. А.М. Родригеса и М.В. Пономарёва. Ч. 1. 1900 – 1945. – М., 2003. – С. 110.

На сустрэчы Рузвельта і Чэрчыля ў Касабланцы ў студзені 1943 г. брытанскі лідэр выступіў за перанос ваенных дзеянняў пасля разгрома паўночна-афрыканскай групы праціўніка ў Паўднёвую Еўропу – на тэрыторыю Італіі ці Грэцыі. Прыярытэт быў аддадзены італьянскаму накірунку ў мэтах недапушчэння вызвалення Еўропы савецкімі войскамі і "экспарта камунізма" на Захад. На іх наступнай сустрэчы ў Квэбеку (Канада) было падцверджана рашэнне адкрыць Другі фронт не пазней 1 мая 1944 г.

26 жніўня 1943 г. СССР, каб актывізаваць узнаўленне актыўных баявых дзеянняў ў Заходняй Еўропе, устанавіў дыпламатычныя адносіны з "Французскім камітэтам нацыянальнага вызвалення", створаным ў чэрвені 1943 г. начале з генералам Шарлем дэ Голем[169].

Для скарачэння тэрмінаў вайны **ў кастрычніку 1943 г. у Маскве** адбылася **канферэнцыя** міністраў замежных спраў СССР (В. Молатаў), ЗША (К. Хэл) і Вялікабрытаніі (А. Ідэн). Было разгледжана германскае пытанне, вялікае маральна-палітычнае значэнне мела прыняцце Дэкларацыі аб адказнасці гітлераўцаў за злачынствы.

У ходзе **Тэгеранскай канферэнцыі (лістапад-снежань 1943 г.)**, дзе ўпершыню сустрэліся кіраўнікі ўрадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (І. В. Сталін, Ф. Д. Рузвельт, У. Чэрчыль), ішло абмеркаванне адкрыцця Другога фронту ў Заходняй Еўропе, якое было запланавана на май наступнага года. **Другі фронт быў адкрыты 6 чэрвеня 1944 г.** у ходзе Нармандскай дэсантнай аперацыі ("Аверлорд").[170] На канферэнцыі выявіліся супярэчнасці паміж саюзнікамі адносна пасляваеннага лёсу Германіі: СССР не падтрымаў прапанову Рузвельта і Чэрчыля аб расчляненні Германіі на некалькі дзяржаў.

Наступная сустрэча прэзідэнта ЗША, старшыні СНК СССР і прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі адбылася **4 – 11 лютага 1945 г.** у Ялце. **Крымская (Ялцінская) канферэнцыя** працавала над каардынацыяй ваенных дзеянняў па канчатковаму разгрому ворага, над планам пасляваеннага ўладкавання. Вялікі палітычны рэзананс мела рашэнне ўтварыць Арганізацыю Аб'яднаных Нацый (ААН). Дзеля недапушчэння германскіх мілітарызма і нацызма было вырашана пасля вайны распусціць усе германскія ўзброеныя сілы, ліквідаваць Генеральны штаб, аддаць пад суд міжнароднага трыбунала ваенных злачынцаў. Кожнай краіне-пераможцы (ЗША, СССР, Англіі, уключаючы Францыю) была вызначана свая зона акупацыі Германіі, у тым ліку ў яе сталіцы Берліне. Каб кампенсаваць страты, нанесеныя краінамі фашысцкага блока, у Маскве стваралася спецыяльная камісія па рэпарацыях.

Саюзныя дзяржавы прынялі **"Дэкларацыю аб вызваленай Еўропе"**, па якой ўзялі на сябе абавязак узгадняць палітыку ў дачыненні да краін, якія былі акупаваны Германіяй. Пасля працяглых дыскусій па польскаму пытанню, было дасягнута пагадненне аб рэарганізацыі існуючага Часовага Урада. Таксама было вырашана, што "усходняя мяжа Польшчы павінна прайсці ўздоўж лініі Керзана з адступленнямі ад яе ў некаторых раёнах ад пяці да васьмі кіламетраў на карысць Польшчы"[171], што непасрэдна закранала інтарэсы БССР і насіла антыбеларускі характар. Да жніўня 1945 г. Беластоцкая вобласць нашай рэспублікі была вернута Польшчы. Сакрэтная дамоўленасць аб гэтым паміж урадам СССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення была дасягнута 27 ліпеня 1944 г.[172]

---

[169] Новейшая история зарубежных стран. Европа и Америка. 1917–1945. – С. 390-400.

[170] У прыватнасці, 6 чэрвеня з Брытанскіх астравоў цераз праліў Ла-Манш на паўночным узбярэжжы Францыі высадзіўся вялікі дэсант англа-амерыканскіх сіл пад кіраўніцтвам генерала Эйзенхаўэра. У гэтай, самай буйной марской дэсантнай аперацыі Другой сусветнай вайны таксама ўдзельнічалі войскі Канады, Францыі, Польшчы і іншых краін антыгітлераўскай кааліцыі – усяго разам каля 3 млн. чалавек, 6 тыс. танкаў, 15 тысяч арудзій і мінамётаў, 11 тыс. баявых самалётаў, каля 7 тыс. караблёў, транспартных і дэсантных судоў. 15 жніўня 1944 г. у падтрымку пачалося наступленне саюзных армій на поўдні Францыі.

[171] Снапкоўскі У. Ялта – Сан-Францыска – Патсдам: ад падвядзення вынікаў Другой сусветнай вайны да пасляваеннага ўладкавання свету // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 7. – С. 4.

[172] Канчаткова пытанне аб граніцах паміж Польшчай і СССР было ўзгоднена ў Маскве 16 жніўня 1945 г. Прадстаўнікі ўрадаў БССР, УССР і Літоўскай ССР да падрыхтоўкі і падпісання гэтага дагавору не былі запрошаны, між тым дакумент прадугледжваў адступленне ад лініі Керзана не на 5-8 км, а на 30 км у глыбіню Украіны і на 17 км – у Беларусі. Ад тэрыторыі Савецкай Беларусі былі адлучаны 17 раёнаў Беластоцкай вобласці, 3 раёны Брэсцкай вобласці і частка Белавежскай пушчы. (Гл.: "Снапкоўскі У. Ялта – Сан-Францыска – Патсдам… – С. 10").

На Ялцінскай канферэнцыі былі ўзгоднены межы, да якіх маглі рухацца англа-амерыканскія і савецкія войскі ў час наступлення на Германію. Пасля акружэння Берліна, калі гітлераўскі фронт быў рассечаны, савецкія і англа-амерыканскія войскі ўпершыню сустрэліся на р. Эльбе ў раёне Таргау. Сталін атрымаў свабоду дзеянняў ва Усходняй Еўропе, у сувязі з чым Чырвоная Армія дапамагла народам Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Балгарыі вызваліцца ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, а ў ходзе Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацый (студзень – май 1945 г.) завяршыла разгром берлінскай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск. Уклад у перамогу ўнеслі народы ЗША, Англіі, Францыі і іншых краін.

8 мая 1945 г. у прадмесці Берліна Карлсхорсце ў прысутнасці прадстаўнікоў камандавання армій СССР, ЗША, Англіі і Францыі прадстаўнікі адоленай Германіі падпісалі Акт аб безагаворачнай капітуляцыі. **9 мая 1945 г.** у СССР было аб'яўлена святам Перамогі. Вайна ў краінах Паўднёва-Усходняй Азіі, на Далёкім Усходзе і ў басейне Ціхага акіяна таксама чакала завяршэння.

Апошняй канферэнцыяй саюзных дзяржаў у перыяд вайны стала **Берлінская (Падсдамская) канферэнцыя (17 ліпеня – 2 жніўня 1945 г.)**, галоўнымі асобамі на якой выступалі кіраўнікі краін-пераможцаў – І. Сталін, новы прэзідэнт ЗША Г. Трумэн, У. Чэрчыль (пазней – новы прэм'ер-міністр К. Этлі). Да пачатку работы Берлінскай канферэнцыі адносіны паміж галоўнымі саюзнымі дзяржавамі яшчэ больш ускладніліся. У. Чэрчыль загадаў англійскаму генштабу падрыхтаваць даклад "аб магчымасцях ваенных дзеянняў супраць Расіі ў выпадку, калі ў ходзе далейшых перагавораў з ёй узнікнуць складанасці". Аднак будучы зацікаўленымі ва ўдзеле СССР у вайне супраць Японіі, ЗША і Вялікабрытанія прадоўжылі падрыхтоўку перагавораў на вышэйшым узроўні. 16 ліпеня, за дзень да адкрыцця канферэнцыі, ЗША правялі першае выпрабаванне атамнай бомбы, што мела на мэце аказаць псіхалагічны ціск на савецкую дзяржаву.

Галоўным вынікам канферэнцыі і пагаднення трох дзяржаў стала партнёрства і супрацоўніцтва ў імя міра без вайны і насілля на аснове баланса законных інтарэсаў. Саюзнікі дасягнулі пагаднення аб рэпарацыях з Германіі. Прэтэнзіі кожнай акупацыйнай дзяржавы задавальняліся за кошт матэрыяльных рэсурсаў яе зоны акупацыі, але Савецкі Саюз, як найбольш пацярпелая дзяржава, павінен быў дадаткова атрымаць 25 % прамысловага абсталявання, якое канфіскоўвалася ў зонах акупацыі ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі. Горад Кёнігсберг (з 4 ліпеня 1946 г. прынята назва Калінінград) і раёны Усходняй Прусіі, якія прылягалі да яго былі перададзены ў склад РСФСР. У склад Польшчы ўключалася частка Усходняй Прусіі і горад Данцыг (Гданьск). Па настаянню савецкай дэлегацыі было пастаноўлена апублікаваць да 1 верасня 1945 г. першы спіс нацысцкіх ваенных злачынцаў. На канферэнцыі быў створаны Савет міністраў замежных спраў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая, на які ў якасці першачарговай задачы ўскладалася падрыхтоўка мірных дагавораў з былымі саюзнікамі гітлераўскай Германіі – Італіяй, Румыніяй, Балгарыяй, Венгрыяй і Фінляндыяй. Дзяржавы-пераможцы дамовіліся, што ніколі не дазволяць паўтор агрэсіі з боку Германіі, ці любой іншай дзяржавы, вызначылі ўмовы безагаворачнай капітуляцыі Японіі. У прыватнасці, 26 ліпеня кіраўнікі ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая падпісалі **"Патсдамскую дэкларацыю"** аб адносінах з Японіяй. Яна змяшчала патрабаванне да ўрада Японіі пра безагаворачную капітуляцыю на наступных умовах: ліквідацыя ўлады і ўплыву мілітарыстаў, акупацыя саюзнікамі вызначаных пунктаў на японскай тэрыторыі, пакаранне ваенных злачынцаў, абмежаванне японскага суверэнітэту астравамі Хакайда, Хонсю, Кюсю, Сікоку, менш буйнымі астравамі і іншыя ўмовы. Берлінская канферэнцыя

завяршылася падпісаннем кіраўнікамі краін-удзельніц Пратакола Берлінскай канферэнцыі і Паведамлення аб Берлінскай канферэнцыі.

6 і 9 жніўня ЗША падвергла атамнай бамбардыроўцы г. Хірасіму і г. Нагасакі, "што паклала пачатак палітыцы ядзернага застрашвання"[173]. Урад імператара Японіі Хірахіта прыняў меры, каб інфармацыя аб гэтым не стала вядомай жыхарам краіны. Аднак не атамныя бамбардзіроўкі, а актыўныя наступальныя аперацыі савецкіх войскаў прадвызначылі хуткае паражэнне мілітарысцкай Японіі. СССР далучыўся да ўмоў Патсдамскай дэкларацыі і 8 жніўня аб'явіў вайну. За 11 дзён была разгромлена Квантунская армія ў Кітаі, вызвалены г. Дальні, г. Порт-Артур, Паўднёвы Сахалін, Курыльскія астравы, Паўднёвая Карэя.

**2 верасня 1945 г.** на борце амерыканскага лінкора "Міссуры", які стаяў у Такійскім заліве, у прысутнасці прадстаўнікоў ЗША, Францыі, СССР, Кітая, іншых краін, адбылася цэрэмонія падпісання Акта аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі, што азначала **канец Другой сусветнай вайны** і перамогу краін антыгітлераўскай кааліцыі.

Другая сусветная вайна цягнулася доўгія 6 гадоў і была самай кровапралітнай за ўсю гісторыю чалавецтва. У яе ходзе было забіта і памерла ад раненняў звыш 60 млн. чалавек, больш 90 млн. чалавек атрымалі раненні і былі пакалечаны. Найбольшыя страты – звыш 27 млн. загінуўшых – панёс савецкі народ, толькі адна Беларусь згубіла кожнага чацвёртага свайго жыхара. Вайна нанесла незаменную страту чалавецтву, прывяла да гібелі найбольш працаздольнай, актыўнай, гераічнай, творчай – самай лепшай часткі кожнай нацыі. Вайна прынесла страты і самой Германіі – звыш 13 млн. чалавек былі забіты, паранены, папалі ў палон, зніклі без вестак.

## 4. Закладыванне асноў пасляваеннага мірнага ўрэгулявання

Яшчэ на Тэгеранскай канферэнцыі кіраўнікі краін антыгітлераўскай кааліцыі прынялі рашэнне аб утварэнні міжнароднай арганізацыі, якая была б здольна кваліфікавана і аўтарытэтна вырашаць глабальныя праблемы сусветнага жыцця, стаць гарантам захавання міру і бяспекі. Пасля заканчэння вайны кожная з вялікіх краін была заклапочана не толькі тым, каб як мага грунтоўней абараніць свае інтарэсы ў гэтай арганізацыі. Вялікае маральнае значэнне для народаў свету, якія пацярпелі ад зланчынстваў акупацыйнага рэжыму мела падрыхтоўка і ажыццяўленне актаў сусветнага асуджэння і пакарання кіраўнікоў фашысцкага блоку (Мусаліні быў пакараны італьянскімі патрызанамі 28 красавіка 1945 г.).

**Утварэнне ААН.** Для вырашэння міжнародных праблем і мірнага супрацоўніцтва ўтваралася Арганізацыя Аб'яднаных Нацый са штаб-кватэрай у Нью-Йорку. 25 красавіка 1945 г. у Сан-Францыска была праведзена ўстаноўчая канферэнцыя ААН, удзельнікамі якой маглі стаць усе краіны, якія абвясцілі вайну Германіі і Японіі да 1 сакавіка 1945 г. Украіна і Беларусь атрымалі асобнае запрашэнне стаць дзяржавамі-заснавальніцамі гэтай установы, як краіны, ўнёсшыя вялікі ўклад у разгром фашызма.[174] 6 мая беларуская урадавая дэлегацыя начале з наркамам замежных спраў К. В. Кісялёвым прыехала ў Сан-Францыска, дзе актыўна ўключылася ў работу. **26 чэрвеня 1945 г.** 49 краін свету падпісалі

---

[173] Снапкоўскі У. Ялта – Сан-Францыска – Патсдам: ад падвядзення вынікаў Другой сусветнай вайны да пасляваеннага ўладкавання свету. – С. 10.

[174] Дыскусію яшчэ на Ялцінскай канферэнцыі выклікала пытанне пра прынцып вызначэння членаў-заснавальнікаў ААН. Ф. Рузвельт заявіў, што ў выпадку выпучэння І. Сталіным прапановы пра членства 16 рэспублік, ён будзе настойваць на членстве ў арганізацыі ўсіх 48 штатаў сваёй дзяржавы. Гэта было вядома Сталіну, і ім была ўнесена прапанова пра ўключэнне ў лік заснавальніц трох рэспублік: Украіны, Беларусі і Літвы. (У далейшым савецкі ўрад не выпучаў кандыдатуру Літвы ў сувязі з непрызнаннем ЗША і Вялікабрытаніяй інкарпарацыі рэспублік Прыбалтыкі ў склад СССР). Аргументуючы пазіцыю, В. Молатаў падкрэсліў: "Названыя рэспублікі панеслі найвялікшыя ахвяры ў вайне і былі першымі тэрыторыямі, на якія ўварваліся немцы . ". Саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі аднесліся да савецкай прапановы станоўча.

Статут міжнароднай арганізацыі. Удзел Беларусі ў рабоце ААН садзейнічаў развіццю яе міжнародных сувязей, дыпламатычнага вопыта і культуры. Па ініцыятыве БССР было вырашана, што ваенныя злачынствы не маюць тэрміна даўнасці.[175]

Устаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая дала краінам свету надзею на мірнае суіснаванне і абарону ад самавольства, быў прыняты 24 кастрычніка 1945 г. 50 краінамі свету.

**Нюрнбергскі працэс (20 лістапада 1945 г. – 1 кастрычніка 1946 г.**). Нацысцкая ідэалогія была асуджана яшчэ задоўга да вайны, але толькі пасля яе заканчэння пачалася падрыхтоўка да судовага працэса над нямецкімі ваеннымі злачынцамі. У верасні 1945 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Міжнароднага ваеннага трыбунала: упершыню ў сусветнай прававой практыцы збіраліся судзіць кіраўнікоў Германіі – дзяржавы, якая развязала вайну. Маштабы нацысцкіх злачынстваў супраць чалавецтва і зараз уражваюць сваімі памерамі: з 18 млн. грамадзян Еўропы, якія апынуліся ў канцэнтрацыйных лагерах, гітлераўцы знішчылі 11 млн. Галоўнымі ваеннымі злачынцамі былі названы Герынг, Борман, Розэнберг, Кэйтэль, Гес, Йодль. Гітлер, Гімлер і Гебельс скончылі жыццё самагубствам у час штурму Берліна ў красавіку 1945 г. Працэс у Нюрнбергу (Германія) упершыню прызнаў агрэсію цяжкім міжнародным злачынствам, процізаконнымі былі названы арганізацыі СС, СД, СА, гестапа і кіруючы склад нацысцкай партыі, але не было вынесена рашэнне аб прызнанні злачыннымі вярхоўнага камандавання і генштаба Германіі, з чым не пагадзіўся член трыбунала ад СССР. Міжнародны ваенны трыбунал прыгаварыў 12 нацыстаў да смяротнага пакарання 16 кастрычніка 1946 г., астатнія былі асуджаны на розныя тэрміны турэмнага зняволення. Нюрнбергскі працэс – пакуль адзіны класічны сімвал гуманізма і правасуддзя, які адчыніў эру міжнароднага правасуддзя, зафіксаваў існаванне ў свеце нормаў, заснаваных на ўяўленні аб адзінстве чалавечай Цывілізацыі і на ідэі агульных для ўсяго свету каштоўнасцяў. Дасягненні Нюрнберга былі падрыхтаваны папярэдняй гісторыяй Заходняй Еўропы, паступовым укараненнем ідэалаў гуманізма і свабоды.

Трыбунал у Нюрнбергу, дзейнасць судовых устаноў ААН зафіксавалі верхавенства агульных гуманістычных, цывілізаваных норм над тым ці іншым правам. Дзякуючы ім у пасляваенныя гады актывізаваліся нацыянальна-вызваленчыя рухі, распалася каланіяльная сістэма. Менавіта гэтыя абставіны зрабілі апраўданай дзейнасць міжнародных праваахоўных арганізацый, міжнародных трыбуналаў і судоў, такіх як Гаагскі ці Страсбургскі, увогуле прыняцце абавязковых для ўсіх краін рашэнняў. Такім чынам, ужо ў першы бягучы год пасля заканчэння Другой сусветнай вайны былі закладзены асновы пасляваеннага ўладкавання, якія садзейнічалі працэсу глабалізацыі сярод краін свету.

На жаль, ніколі больш свет не аказваўся так адзінадушны ў сваім пачуцці агіды да насілля і вайны, як ў 1945-м. У выніку канферэнцый "вялікай тройкі" у Ялце і Падстаме, а таксама ўстаноўчай канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Сан-Францыска паўстала новая "ялцінска-патсдамская" сістэма міжнародных адносін. Яе асновай з'явіліся спачатку ўзаемадзеянне дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі ў барацьбе з фашызмам і стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі на аснове ААН. Затым пачаліся распад гэтай кааліцыі і "халодная вайна" паміж Усходам і Захадам. У выніку змянення расстаноўкі палітычных сіл у сусветнай прасторы дамінавалі звышдзяржавы – ЗША і СССР. Жалезная заслона, у многім небяспечная канкурэнцыя паміж імі, барацьба за ўплыў нярэдка

---

[175] Адзінай ў СССР жанчынай, растралянай пасля вайны па рашэнню суда ў 1979 г. была ваенная злачынца, жыўшая ў Лепеле (БССР) Антаніна Макарава-Гінзбург, яна мела дачыненне да забойства ў час вайны не меней 168 чалавек

прымушалі гэтыя дзяржавы падтрымліваць сумніўныя рэжымы і ўкрываць іх злачынствы, усё гэта падрывала асновы міжнароднага правасуддзя. Аслаблі пазіцыі еўрапейскіх краін, Германія была падзелена, негатыўныя наступствы аказаў факт адстутнасці мірнага дагавору з ёю. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што пасляваеннае ўрэгуляванне міжнародных адносін не мела трывалага характару, нарастанне супярэчнасцей паміж звышдзяржавамі, якое пачалося яшчэ ў ходзе вайны, прывяло да ўзнікнення ваенна-палітычных блокаў сацыялістычных і капіталістычных краін.

Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін праіснавала да пачатку 1990-х гг., калі распалася ў выніку народна-дэмакратычных рэвалюцый ва Усходняй Еўропе, пасля заканчэння "халоднай вайны" і распаду Савецкага Саюза.

*Лекцыя восьмая*

## СВЕТ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

1. Міжнародныя адносіны ў пасляваенны перыяд.
2. Вядучыя капіталістычныя краіны ў пасляваенны перыяд: вызначальныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця, інтэграцыйныя групоўкі.
3. Асноўныя этапы гісторыі сацыялістычнага лагеру.
4. Краіны "трэцяга свету": новы этап развіцця.

### 1. Міжнародныя адносіны ў пасляваенннны перыяд

**Пад пасляваенным перыядам** найноўшай гісторыі звычайна разумеюць прамежак часу ад заканчэння Другой сусветнай вайны да канца 1980-х гг. – пачатку 1990-х гг.

Пасляваенны перыяд – перыяд існавання трох светаў – **света сталага капіталізму, сацыялістычнага лагера і "трэцяга свету"**. Менавіта супярэчнасць паміж першым і другім светамі была галоўнай супярэчнасцю дадзенага перыяду.

**Свет сталага капіталізму** быў прадстаўлены развітымі капіталістычнымі краінамі на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Ядро гэтай групы краін складалі ЗША, Злучанае каралеўства Велікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Францыя, Італія, Федэратыўная Рэспубліка Германія, Японія, Канада. Да **сацыялістычнага лагера** належалі краіны Азіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, у якіх статус кіруючых мелі камуністычныя партыі, якія ажыццяўлялі свае ўладныя функцыі манапольна. **"Трэці свет"** аб'ядноўваў групу краін, якія развіваюцца. Кожны з гэтых светаў выступаў як падсістэма глабальнай сістэмы міжнародных адносін.

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны пачала адлік свайго існавання так званая **ялцінска-пастдамская** сістэма міжнародных адносін. На Ялцінскай канферэнцыі ў лютым 1945 г. былі акрэслены абрысы ўладкавання пасляваеннага свету, удакладнёныя на Пастдамскай канферэнцыі (ліпень – жнівень 1945г.). Сутнасць гэтай сістэмы – падзел свету на сферы ўплыву паміж СССР і яго саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі – ЗША, Вялікабрытаніяй, Францыяй.

У другой палове 1940-х гг. стала рэальнасцю набыццё ЗША і СССР статусу супердзяржаў. Вашынгтон і Масква пастаянна імкнуліся падмацоўваць дасягненне дадзенага якасна новага стану пашырэннем сфер уплыву. Гэта азначала пераход ад супрацоўніцтва, саюзных адносін да супрацьборства. Гэта супрацьборства азначала наяўнасць біпалярнасці (двухпалярнасці) свету. Сацыялістычны лагер на чале з СССР супрацьстаяў зоне сталага капіталізму на чале з ЗША. Перманентнае міжсістэмнае супрацьстаянне паміж дадзенымі групоўкамі дзяржаў, якое мела на мэце дасягненне стратэгічнай перамогі адной сістэмы над другой, атрымала назву **"халодная вайна"**.

"Халодная вайна" канкрэтна выразілася ў наступным:

Па-першае, кожная з супердзяржаў (СССР і ЗША), кіруючыся выключна ўласнымі геапалітычнымі меркаваннямі, імкнулася да максімальнай глабальнай уцягненасці.

Па-другое, бесперапынна вялася міжсістэмная ідэалагічная барацьба, у працэсе якой прад'яўляліся аргументы, якія грунтаваліся як на рэальных здабытках, так і на ідэалізацыі кожнай з супрацьлеглых сістэм.

Па-трэцяе, сталі рэальнасцю арганізацыйныя структуры міжсістэмнага супрацьстаяння. З ваенна-палітычным аспектам дадзенага супрацьстаяння было звязана стварэнне **НАТО, СЕАТО, СЕНТО, АНЗЮС, Арганізацыі Варшаўскага Дагавора,** з эканамічным –

**Савета Эканамічнай Узаемадапамогі і Еўрапейскага Эканамічнага Супольніцтва.** Кожны з бакоў рабіў акцэнт на замкнёны характар падобных структур.

Па-чацвёртае, мела месца штучнае стварэнне вобраза ворага. Кожны з бакоў свядома перабольшваў у афіцыйнай прапагандзе рэальную пагрозу з боку патэнцыяльнага праціўніка.

Па-пятае, прадстаўнікі кожнага з варагуючых блокаў ігнаравалі каштоўнасць перамоўных механізмаў для зняцця праблем у міждзяржаўных стасунках.

Па-шостае, ключавым сродкам забеспячэння мэт знешняй палітыкі зрабілася яе ваенна-сілавое забеспячэнне. Гонка ўзбраенняў, якая па сваіх маштабах супярэчыла прынцыпу разумнай дастатковасці абароны, шырокае распаўсюджванне ваенных баз паблізу межаў патэнцыяльнага праціўніка былі накіраваны на тое, каб апошні зразумеў, што з ім збіраюцца размаўляць толькі з пазіцыі сілы. Выкарыстанне сілы або пагроза яе выкарыстання – тыповая з'ява эпохі "халоднай вайны".

Па-сёмае, для нанясення шкоды інтарэсам нацыянальнай бяспекі супрацьлеглага боку мэтанакіравана выкарыстоўваліся спецслужбы. Найбольш яскравы прыклад таму – антысавецкая накіраванасць працы супрацоўнікаў Цэнтральнага Разведвальнага Ўпраўлення ЗША, антыамерыканскія акцыі афіцэраў Камітэта Дзяржаўнай Бяспекі СССР.

"Халодная вайна" працягвалася з сярэдзіны 40-х да канца 80-х – пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя.

**Гісторыю "халоднай вайны" можна падзяліць на 4 этапы**:

1. Этап "пастаяннага напружання ўсяго свету", які быў падзелены на сферы "жыццевых інтарэсаў" двух супердзяржаў (сярэдзіна 1940-х – канец 1960-х гг.).

2. Разрадка міжнароднай напружанасці (першая палова 1970-х гг.), якая трымалася на парытэце стратэгічных ядзерных сіл СССР і ЗША.

3. Адмова ад разрадкі, вяртанне да канфрантацыі ў адносінах паміж СССР і ЗША, Усходам і Захадам (другая палова 1970-х гг. – першая палова 1980-х гг.).

4. Пераход ад "халоднай вайны" да постканфрантацыйнага свету, ад двухполюснага светапарадку да шматполюснага (другая палова 1980-х гг. – пачатак 1990-х гг.).

Змест першага этапа заключаўся ў наступным. У выніку супрацьборства супердзяржаў адбыліся расколы Германіі, Карэі, В'етнама, былі ўтвораны НАТО (Арганізацыя Паўночнаатлантычнага Дагавора) і Арганізацыя Варшаўскага Дагавора, паміж якімі стала праходзіць галоўная канфліктная лінія. Супердзяржавы мелі дачыненне да Берлінскіх крызісаў 1948 – 1949 гг., 1958 – 1961 гг., карэйскай вайны 1950 – 1953 гг., вайны ў В'етнаме, іншых лакальных канфліктаў, дзе сутыкаліся іх інтарэсы.

Масква экспартавала сваю мадэль сацыялізму ў тыя дзяржавы Еўропы і Азіі, якія знаходзіліся ў сферы яе ўплыву. У адказ на імкненне СССР пашыраць свае межы яго заходнія апаненты распачынаюць "крыжовы паход супраць уплыву камунізму". З нагоды з'яўлення новых саюзнікаў Масквы ў Азіі тут пачынаюць функцыянаваць падкантрольныя лідэрам заходняга свету блокі СЕАТО, СЕНТО, АНЗЮС.

Вынікам "халоднай вайны" з'явілася нарастанне міжнароднай напружанасці, узмацненне пагрозы ўзнікнення сусветнай вайны, рэзкае скарачэнне гандлёва-эканамічных, культурных і іншых сувязей паміж сацыялістычнымі і капіталістычнымі краінамі.[176]

Раскрыццё зместа другога этапа мэтазгодна пачаць з вызначэння тэрміна "разрадка міжнароднай напружанасці". **"Разрадка міжнароднай напружанасці"** – працэс зняцця напружанасці і нармалізацыі адносін паміж дзяржавамі з розным грамадскім ладам, перабудовы міжнародных адносін увогуле на пачатках мірнага суіснавання".[177] Аб тым, што тэндэнцыя да разрадкі ў першай палове 1970-х гг. была дамінуючай, сведчылі наступныя факты:

---

[176] "Холодная война" // Дипломатический словарь в 3 томах. Т. 3. – М., 1986. – С. 537.
[177] Разрядка международной напряженности // Дипломатический словарь в 3 томах. Т. 2. – С. 446.

- Масква і Вашынгтон падпісалі ў 1972 г. пагадненні аб абмежаванні стратэгічных узбраенняў.
- ФРГ заключыла дагаворы з СССР (1970 г.), ПНР (1970 г.), ЧССР (1973 г.). 3 верасня 1971 г. было падпісана Чатырохбаковае пагадненне па Заходняму Берліну.
- у 1973 г. была спынена вайна ў В'етнаме.
- у 1975 г. распачаўся **Хельсінскі працэс** або працэс НБСЕ (Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе).

Найбольш небяспечнымі падзеямі трэцяга этапа з'явіліся: разгортванне ў СССР ракет "СС-20" з 1976 г., савецкая інтэрвенцыя ў Афганістане ў 1979 г., аднабаковае парушэнне Масквой Дагавора АСУ-2, вылучэнне прэзідэнтам ЗША Р. Рэйганам Стратэгічнай Абарончай Ініцыятывы (САІ) у 1983 г., пачатак размяшчэння на тэрыторыі Заходняй Еўропы амерыканскіх ракет "Першынг–2" і "Тамагаўк" у 1983 г. – гэтыя падзеі паклалі канец разрадцы міжнароднай напружаннасці.

На працягу чацвёртага этапа адбыліся кардынальныя зрухі, якія прывялі да заканчэння "халоднай вайны".

## 2. Вядучыя капіталістычныя краіны ў пасляваенны перыяд: вызначальныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця, інтэграцыйныя групоўкі

У гісторыі зоны сталага капіталізму ў 1945 – канцы 1980-х гг. можна вылучыць наступныя перыяды:

1) пасляваеннае адраджэнне (з 1945 г. да пачатку 1950-х гг.);

2) структурныя змены ва ўмовах ліберальнага рэфармізма, фарміраванне постіндустрыяльнай цывілізацыі, узмацненне яе лідзіруючых пазіцый у глабальным інтэр'еры (1950-я – 1970-я гг.);

3) удасканаленне постіндустрыяльнай цывілізацыі на грунце манетарызма і эканомікі прапановы (канец 1970-х – 1980-я гг.).

Стартавая кропка пасляваеннага перыяду ў зоне сталага капіталізму была адзначана вельмі вялікім разрывам паміж ЗША і іншымі дзяржавамі, якія ўваходзілі ў гэтую зону. Злучаныя Штаты ўсё больш замацоўвалі ўнушальную дынаміку ў сацыяльна-эканамічным развіцці. Краіна ўступала ў пасляваенны перыяд, з'яўляючыся гегемонам **брэтан-вудскай сістэмы**, адметнай жорсткай арыентацыяй на золатадоларавы эталон, устойлівым прытрымліваннем фіксаваных валютных курсаў. Аналагічнай была роля Злучаных Штатаў Амерыкі ў дзейнасці **Міжнароднага валютнага фонда (МВФ)**, **Сусветнага банка (СБ).** Як палітычны, эканамічны і ваенны лідэр свабоднага свету, яны мэтанакіравана выкарыстоўвалі наяўныя рэсурсы для яго кансалідацыі, для гарантавання лідзіруючых пазіцый зоны сталай рынкавай эканомікі ў міжсістэмным спаборніцтве. У гэтай сувязі трэба асабліва адзначыць план Маршала.

Аўтарам плана быў дзяржаўны сакратар Злучаных Штатаў Амерыкі **Джордж Маршал** (1880 – 1959 гг.). Дата абнародавання плана – 5 чэрвеня 1947 г. Менавіта ў гэты дзень з вуснаў самаго дыпламата аб дадзеным плане ўпершыню даведаліся студэнты і выкладчыкі Гарвардскага універсітэта. Усе сур'ёзныя спецыялісты па эканамічнай гісторыі лічаць слушным, што Маршал прадстаўляў свой план як праграму адраджэння Еўропы. **План Маршала** грунтаваўся на цывілізаваных прынцыпах міждзяржаўных стасункаў, адрозніваўся паслядоўным улікам баланса інтарэсаў.[178]

---

[178] У Вашынгтоне добра разумелі, што пасля Другой сусветной вайны еўрапейцам не патрэбна дапамога дзеля дапамогі. У Лондане, Парыжы, Вене, Бруселі, Капенгагене, Афінах, Дубліне, Рэйк'явіку, Рыме, Люксембургу, Гаазе, Осла, Лісабоне, Стакгольме, Берне, Анкары быў наступны агульны назоўнік у падыходах: амерыканская дапамога дае гістарычны шанц для дасягнення пераканаўчай дынамікі ў аб'ёмах прадукцыі, выпускаемай галінамі матэрыяльнай вытворчасці, для

4 гады 16 еўрапейскіх краін былі аб'ектамі "маршалізацыі". Памер амерыканскай дапамогі ў іх адрас склаў 13 млрд. долараў. Канчатковае мэтавае прызначэнне не меней як 8 млрд. з іх выразілася ў тым, што ў якасці аб'екта куплі-продажу выступала прадукцыя, якая паходзіла з краіны-донара.

Дзякуючы рэалізацыі плана Маршала ў краінах-атрымальніках хутка абазначыўся эканамічны рост, істотна ўмацавалася нацыянальная валюта, значна павялічыўся аб'ём валавага нацыянальнага прадукта, стварыліся рэальныя магчымасці для пашырэння сацыяльнай функцыі дзяржавы. Адначасова стаў відавочным унушальны прарыў у валютна-фінансавай і гандлёва-эканамічнай складовых у экспансіі ЗША ў "маршалізаваныя" краіны, была знята праблема асваення новых рынкаў для нямалай часткі амерыканскіх кампаній.

Ужо ў час пасляваеннага адраджэння можна прасачыць вытокі **ліберальнага рэфармізма** ў эканамічнай палітыцы вядучых капіталістычных краін, які грунтаваўся на **кейнсіянстве.** З пачатку 1950-х гг. гэты варыянт макраэканамічнай стратэгіі аформіўся ў стройную сістэму, перманентна абапіраўся на шырокую падтрымку з боку розных сацыяльных слаёў.

Прыхільнікі кейнсіянства зыходзілі з таго, што пасляваенныя рэаліі былі такія, што альтэрнатывы рэзкаму пашырэнню функцый дзяржавы ў галіне эканамічнай палітыкі быць не магло. Паводле гэтага падыходу навукоўцы, уладныя структуры на грунце ўліку аб'ектыўных эканамічных законаў былі здольныя трывала, з доўгатэрміновай гарантыяй зняць наступныя праблемныя комплексы:

1) арытмію, пагрозу спадаў у развіцці народнай гаспадаркі;
2) перавышэнне прапановы над попытам на рынку працы;
3) вялікі разрыў паміж беднасцю і багаццем.

Пераадоленне гэтых комплексаў азначала фармаванне з дапамогай макраэканамічнай стратэгіі сацыяльнай дзяржавы. Станаўленне інстытутаў дадзенай дзяржавы адбывалася ў выніку стварэння рэальнай сістэмы сацыяльнага партнёрства, у якой у якасці бакоў выступалі суб'екты гаспадарання, прафсаюзы, уладныя структуры. Кейнсіянскія рэцэпты матэрыялізаваліся ў фактычным дачыненні працаатрымальнікаў да размеркавання прыбыткаў, якія атрымліваліся суб'ектамі гаспадарання, у пераўтварэнні "народных акцый" у стабільную крыніцу даходаў для малазабяспечаных слаёў насельніцтва, у істотным павелічэнні падатковай нагрузкі для працадацеляў і, натуральна, яе зніжэння для працаатрымальнікаў, у пашырэнні маштабаў эмісійнай палітыкі дзяржавы.

Важна спецыяльна адзначыць, што **ліберальны рэфармізм** склаў канцэптуальны грунт фармавання эканамічнага базісу **постіндустрыяльнай цывілізацыі.** Лідзіруючыя пазіцыі апошняй няўхільна ўзмацняліся ў глабальным інтэр'еры ў 1950-я – 1970-я гг.

Постіндустрыяльную цывілізацыю трэба разглядаць як вынік не толькі буйных сацыяльна-эканамічных змяненняў, але і кардынальных зрухаў навукова-тэхнічнага і культурнага кшталту.

---

доўгатэрміновага зняцця праблем, звязаных з гіперінфляцыяй. У гэтых еўрапейскіх сталіцах было адзінства думак і наконт таго, што да іх і іх партнёраў у знешнегандлёвай галіне недапушчальныя высокія бар'еры у адпаведных аперацыях, што чым менш будуць гэтыя бар'еры, тым хутчэй будзе прагрэс у міжнародным гандлі. Аднадушша прасочвалася і ў тым, што краіна-донар, гэта значыць ЗША, павінна надзейна, гарантавана атрымліваць ад аб'ектаў давання дапамогі таварныя пазіцыі, попыт на якія не задавальняецца айчыннай эканомікай. Еўрапейскія краіны, якія ўвайшлі ў зону дзеяння плана Маршала, палічылі прынцыпова важным надаць ранг дзяржаўнай палітыкі сістэматычнай падтрымцы тых амерыканскіх недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання, якія здзяйсняюць фінансавую падпітку іх эканомік. У працэсе гэтай падтрымкі ствараліся ўмовы для няўхільнага роста адпаведных інвестыцый. Названыя краіны былі згодны з тым, каб прадукцыя з маркай "Made in USA" заняла значна большае месца на іх рынках. З'яўляючыся' прававымі дзяржавамі, яны абавязаліся поўнасцю інфармаваць на рэгулярнай аснове вышэйшы орган заканадаўчай улады ЗША аб усіх сваіх дзеяннях, звязаных з планам Маршала. Такога кшалту інфармаванне меркавалася ў выглядзе штогадовых справаздач. Пералічаныя моманты поўнасцю адпавядалі падыходам распрацоўшчыкаў аналізуемага плана.

Рэальнасцю стала "грамадства, у якім першаступеннае значэнне мае не павелічэнне аб'ёма вытворчасці, а развіццё навукі, тэхнікі".[179] У 1950-я гг. у свеце пачалася **навукова-тэхнічная рэвалюцыя**. "Яе перадумовамі сталі авалоданне атамнай энергіяй, вынаходніцтва паўправаднікоў і рэактыўнага рухавіка, дасягненні генетыкі. Скараціўся час ад навуковага адкрыцця да яго практычнага выкарыстання. Навука стала непасрэднай прадукцыйнай сілай".[180]

Шэраг фактаў сведчыць аб тым, што ў эру навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ўступаў і сацыялістычны лагер, што рабіла яе глабальнай з'явай. Аднак тут навука не стала прадукцыйнай сілай. Праўда, нельга недаацэньваць тое, што было напрацавана ў сацыялістычным лагеры ў галіне навукова-тэхнічнага прагрэсу.

У сярэдзіне XX ст. у краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі ўзнік новы тып культуры постіндустрыяльнага грамадства – **"масавая культура"** (ад англ. "mass culture"). Яна арыянтавана на масавае распаўсюджванне сваіх духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей на ўзроўні "усярэдненага масавага спажыўца".

У пасляваенны перыяд канчаткова сфарміравалася **"новая, некласічная навука,** якая мела пераважна не эмпірычны, а тэарэтычны характар. У навуцы ўзмацняліся плюралізм (разнастайнасць поглядаў і падыходаў) і рэлятывізм (адноснасць, усведамленне ісціннасці тэорыі толькі ў межах пэўнай сістэмы каардынат).[181]

Ліберальна-рэфармісцкія рэцэпты плённа працавалі да сярэдзіны 1970-х гг. **Энергетычны, сыравінны, харчовы крызісы сярэдзіны 1970-х** сведчылі аб тым, што **ўмяшальніцтва органаў цэнтральнага дзяржаўнага кіравання** ў эканоміку шляхам рэгулявання перавышэння масай папяровых грошаў патрэбнасцяў грашовага абарота **зайшло ў тупік**. Да наступлення ўказаных крызісаў дадзены накірунак рэгулюючай функцыі дзяржавы меў на мэце максімальнае задавальненне патрэб патэнцыяльных працаатрымальнікаў у працаўладкаванні. Прычым гэта мэта ўвогуле паспяхова дасягалася. Аднак у сувязі з аналізуемымі крызісамі стаў рэальнасцю прынцыпова новы праблемны комплекс, які складаўся з трох момантаў:

1) інфляцыі выдаткаў;

2) беспрэцэдэнтнага павелічэння колькасці асоб, якія рэгістраваліся на біржы працы;

3) відавочнага зніжэння аб'ёмаў прадукцыі, якая выраблялася ў валаўтваральных галінах матэрыяльнай вытворчасці.

Дадзены комплекс ідэнтычны паняццю **"стагфляцыя".** Кіруючыя колы зоны сталага капіталізма вырашалі яе пераадольваць на грунце **манетарызма** і **эканомікі прапановы.**[182]

---

[179] Всемирная история новейшего времени. Учеб. пособие для 9-го кл. общеобразов. шк. с рус. языком обучения / Г.А. Космач, Г.Г. Лазько, С.В. Панов и др. Под ред. Г.А. Космача. – 2-е изд. – Мн., 2000. – С. 4-5.

[180] Капіталізм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 4. – С. 99.

[181] Там жа.

[182] Для высвятлення сутнасці **манетарызма** трэба разабрацца ў суадносінах паміж суб'ектам і аб'ектам эканамічнай палітыкі. Суб'ект гэтай палітыкі – цэнтральныя органы дзяржаўнага кіравання, якія распацоўваюць макраэканамічную стратэгію і на грунце заканадаўча акрэсленай кампетэнцыі садзейнічаюць яе ажыццяўленню. Манетарызм мяркуе такі варыянт дадзенай стратэгіі, які адметны мінімізацыяй зместу аб'екта эканамічнай палітыкі. На думку прыхільнікаў аналізуемага падыходу, гэта мінімізацыя павінна ў першую чаргу закрануць наступныя элементы ўказанага аб'екта: фіскальны, крэдытна-грашовы. Логіка іх мыслення такая: гэтыя элементы, не з'яўляючыся сферай жорсткага дзяржаўнага рэгулявання, арганічна ўпісваюцца ў функцыянаванне механізмаў самарэгуляцыі ўнутры эканамічнай сістэмы, вызначальным чынам уплываюць на дасягненне паступальнай дынамікі па ключавых паказчыках развіцця народнай гаспадаркі незалежна ад эканамічнай кан'юнктуры. У якасці структураўтваральнага кампанента такога кшталту эканамічнага механізма была названа грашовая прапанова. Па заканчэнні фінансавага года інфляцыя павінна была раўняцца <= 4 %. Ва ўмовах такой інфляцыі дасягаюцца аб'ёмы выпуску прамысловай, сельскагаспадарчай прадукцыі, якія задавальняюць як прадпрымальніцкі корпус, так і працаатрымальнікаў, рэзка скарачаецца кліентура бірж працы, набывае рэальныя абрысы коштавая сітуацыя, спрыяльная для грамадзян з сярэднім узроўнем даходаў і малазабяспечанай катэгорыі насельніцтва

Указаныя падыходы ўтварылі канцэптуальны грунт эканамічнай палітыкі адміністрацыі ЗША ў эру **Рональда Рэйгана** і ўрадавага кабінета Злучанага каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, які ўзначальваўся лідэрам кансерватыўнай партыі **Маргарэт Тэтчэр**. У сувязі з тым, што гэтым выдатным дзяржаўным дзеячам удалося дасягнуць карэляцыі арганізацыйна-прававога, канцэптуальнага, практычнага аспекта гэтай палітыкі, уяўляецца слушным увядзенне паняццяў "**рэйганоміка**", "**тэтчэрызм**".

**Ключавыя аспекты дадзенай палітыкі наступныя**:

Па-першае, уладныя структуры скарацілі выдаткі, звязаныя з выкананнем сацыяльнай функцыі дзяржавы.[183]

Па-другое, адміністрацыя Рональда Рэйгана і ўрад Маргарэт Тэтчэр лічылі неабходным істотнае павелічэнне колькасці недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання пры мінімізацыі тых аспектаў функцыянавання гэтага сегмента эканамічнай сістэмы, якія ўваходзяць у кампетэнцыю вышэйшых органаў выканаўчай і заканадаўчай улады.

*Асабліва прыкметнымі былі зрухі ў суадносінах паміж дзяржаўным і недзяржаўным сектарамі эканомікі Злучанага каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Рост недзяржаўнага сектара забяспечваўся перш за ўсё вынікамі рэпрыватызацыі. Апошнюю трэба разглядаць у кантэксце кардынальных адрозненняў эканамічных канцэпцый кансерватараў і лейбарыстаў, якія напаўняліся рэальным зместам у час іх урадавай адказнасці. У пасляваенны перыяд лейбарысцкая партыя ўзначальвала вышэйшую выканаўчую ўладу ў 1945 – 1951, 1964 – 1970, 1974 – 1979 гг., кансерватыўная партыя – у 1954 – 1964, 1970 – 1974, 1979 – 1990 гг. Эры кіравання лейбарыстаў адзначаны зменай формы ўласнасці ў галінах, якія дагэтуль належалі да прыватнага сектару. Дзяржава стала выконваць працадаўчыя функцыі ў адносінах да працаатрымальнікаў, якія былі задзейнічаны ў Банку Англіі, нафтагазавым комплексе, вугледабычы, па выпуску караблёў, шырока вядомых марак аўтамабіляў, самалётаў, ракетнай тэхнікі, у сферы забеспячэння краіны электраэнергіяй. Маргарэт Тэтчэр, члены яе кабінета, адказныя за эканамічны блок, прыйшлі да абгрунтаванай высновы аб тым, што гэтыя галіны па сваёй эфектыўнасці не адпавядаюць патрабаванням часу і, натуральна, павінны быць уключаны ў сферу рэпрыватызацыі. У працэсе рэпрыватызацыі быў увогуле вытрыманы баланс інтарэсаў паміж працаатрымальніцкім корпусам і новымі ўласнікамі. Працаатрымальнікі былі ўцягнуты ў арганізацыйныя структуры "народнага капіталізма". Кожны з іх атрымаў статус трымальніка акцый. Маштабы акцыяніравання былі беспрэцэдэнтнымі ў брытанскай гісторыі. Для паказа дынамікі ў гэтым працэсе возьмем два кантрольныя рубяжы. Першы рубеж – стартавая кропка ўрадавай адказнасці кабінетаў М. Тэтчэр, другі рубеж – 1987 г. – год апошніх у яе кар'еры на пасадзе прэм'ер-міністра выбараў у палату абшчын. Кантрольная лічба для першага рубяжа пры самых строгіх падліках не перавышала 2 мільёны брытанцаў, для другога рубяжа была роўная аж 9 мільёнам. У 1987 г. сяброўскі корпус брытанскіх трэд-юніёнаў быў меншы за корпус акцыянераў. Улічваючы, што трэд-юніёны з'яўляюцца калектыўнымі сябрамі лейбарысцкай партыі, урад М. Тэтчэр імкнуўся шляхам акцыяніравання істотна скараціць яе электарат на сваю карысць. Безумоўна, акцыяніраванне давала працаатрымальнікам пэўны грунт для аптымізму, што пацвярджалася далейшым ходам падзей. Пасля таго, як скончылася структурная перабудова, даходы сярэднестатыстычных акцыянераў сталі пакрысе расці, што з'явіліся адной з прычын*

[183] Пры гэтым прынцыпова важна падкрэсліць, што дзяржава па-ранейшаму заставалася сацыяльнай. Ва ўмовах акцэнта дзяржавы на манетарысцкія метады ў эканамічнай палітыцы яна была здольна задзейнічаць рычагі для гарантавання сваім грамадзянам узроўня жыцця, які быў на некалькі парадкаў вышэй, чым у краінах сацыялістычнага лагеру.

*таго, што партыя, якую прадстаўляла М. Тэтчэр, бесперапынна трымала ўладу ў руках 18 гадоў. Разам з тым акцэнт кансерватараў на манетарысцкія метады не мог не мець сваім наступствам звужэння свабоды манеўра трэд-юніёнаў у плане выканання імі абарончай функцыі.*

Па-трэцяе, Р. Рэйган і М. Тэтчэр пакончылі з "фінансавым алкагалізмам" сваіх папярэднікаў.[184]

Па-чацвёртае, кансерватары зрабілі звышжорсткі акцэнт на стымулюючую функцыю падаткаабкладання, маючы ў якасці аб'екта падатковай палітыкі корпус недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання. Пры гэтым меліся на ўвазе як асабісты падаходны падатак, так і падатак на прыбытак карпарацый. 1986-м годам адзначана ў ЗША прыняцце Закона "Аб падаходным падатку", які з'явіўся найбольш яскравым прыкладам аналізуемай палітыкі.

Такім чынам, **у канцы 1970 – 1980-х гг. адбылося відавочнае ўдасканаленне сацыяльна-эканамічнай структуры постіндусірыяльнай цывілізацыі на грунце манетарызма і эканомікі прапановы.**

У пасляваенны перыяд Захад прадэманстраваў здольнасць да паспяховых інтэграцыйных працэсаў. Яскравым сведчаннем таму з'явіўся вопыт функцыянавання НАТО і ЕЭС.

4 красавіка 1949 г. па ініцыятыве ЗША быў падпісаны ў Вашынгтоне Паўночнаатлантычны Дагавор, які прадугледжваў стварэнне Арганізацыі Паўночнаатлантычнага Дагавора (**НАТО**). Яго падпісалі Бельгія, Вялікабрытанія, Данія, Італія, Ісландыя, Канада, Люксембург, Нідэрланды, Нарвегія, Партугалія, ЗША і Францыя.[185] З лютага 1952 г. членамі НАТО сталі Грэцыя і Турцыя, з чэрвеня 1955 г. – ФРГ, з мая 1982 г. – Іспанія",[186] з сакавіка 1999 г. – Венгрыя, Польшча, Чэхія, са студзеня 2004 г. – Балгарыя, Літва, Латвія, Румынія, Славакія, Славенія, Эстонія.

**Ваенная дактрына НАТО** ў сваім развіцці прайшла ў пасляваенны перыяд **4 этапы.**

У 1949 – 1954 гг., гэта значыць **на першым этапе,** панавала перакананне, што будучая вайна павінна весціся па вобразу і падабенству другой сусветнай, і ядзерная зброя толькі павялічыць магутнасць стратэгічнага арсенала блока.

У ходзе **другога этапа** (1954 – 1967 гг.) развіцця НАТО адбылося значнае пашырэнне арсеналаў ядзернай зброі, укараненне яе ў асноўныя фармаванні (Аб'яднаных Узброеных Сіл) альянса – ад дывізіі і вышэй. Лічачы, што ў дадзенай галіне блок, і ў прыватнасці ЗША, мае "бясспрэчную перавагу" над Савецкім Саюзам, кіраўніцтва альянса палічыла неабходным радыкальна змяніць свае погляды на характар магчымых войнаў і будаўніцтва ўзброенных сіл. Гэта знайшло адлюстраванне ў амерыканскай ваеннай стратэгіі "масіраванай адплаты" ("масіраванага адказнага удару"), трансфармаванай ў кааліцыйную, атрымаўшую назву "шчыта і мяча". Ролю "шчыта" краін-удзельніц Паўночнаатлантычнага саюза павінны былі адыгрываць АУС блока ў Еўропе, і перш за ўсе сухапутныя сілы заходнегерманскай арміі – **бундэсвера**, а "мяча" – ядзерная зброя і яе носьбіты.

Аднак пасля здзейсненых Савецкім Саюзам пэўных крокаў у адказ, напрыклад, стварэння прынцыпова новага віда зброі – ракетна-ядзернага, так званая "бясспрэчная

---

[184] Неакадэмічны выраз "фінансавы алкагалізм" лепш за ўсё праілюстраваць на прыкладзе некаторых постсавецкіх краін. Высокі узровень інфляцыі – вынік празмернай працы друкарскага варштата. Кіраўнікі дадзеных краін свядома на гэта ідуць, імкнучыся тым самым надаць мабільнасць народнагаспадарчаму арганізму. У адрозненне ад іх моцныя каманды Р.Рэйгана і М.Тэтчэр арыентаваліся на тое, каб своечасова спыняць друкарскі варштат з тым, каб пазбегнуць абесцэньвання амерыканскага долара і англійскага фунта стэрлінгаў. Канчатковы вынік дадзенай палітыкі вядомы: зняты сур'ёзныя праблемы, звязаныя з функцыянаваннем фінансавай сістэмы.

[185] Организация Североатлантического договора // Дипломатический словарь в 3 томах. Т. 2. – С. 311.

[186] Там же.

перавага" Паўночнаатлантычнага саюза, у прыватнасці Злучаных Штатаў, была скасавана, што прывяло да падрыву асноў стратэгіі "шчыта і мяча", якая па ацэнцы натаўскіх спецыялістаў не змагла б забяспечыць дасягненне ўсіх палітычных і ваенна-стратэгічных мэт блока.

**Трэці этап** распачаўся у 1967 г., калі стратэгія "гнуткага рэагавання"[187] была абвешчана кіраўніцтвам НАТО ў якасці афіцыйнай.[188]

**Чацвёрты этап** супаў з этапам пераходу ад "халоднай вайны" да пастканфрантацыйнага свету. Яго спецыфіка заключалася ў прывядзенні "стратэгіі гнуткага рэагавання" ў адпаведнасць з новымі рэаліямі, змяншэнні ў ёй ролі ядзернай складовай.

Дагавор, які заснаваў **Еўрапейскае Эканамічнае Супольніцтва**, падпісаны ў Рыме 25 сакавіка 1957 г., заключаны на неабмежаваны тэрмін, уступіў у сілу 1 студзеня 1958 г.[189] Са снежня 1991 г. гэта структура называецца Еўрапейскі Саюз (Еўрасаюз). Яе членамі з'яўляюцца Бельгія, Італія, Люксембург, Нідэрланды, Францыя, ФРГ (з моманту заснавання), Вялікабрытанія, Данія, Ірландыя (з 1973 г.), Грэцыя (з 1981 г.), Іспанія, Партугалія (з 1986 г.), Аўстрыя, Швецыя, Фінляндыя (з 1995 г.), Венгрыя, Кіпр, Латвія, Літва, Мальта, Польшча, Славакія, Славенія, Чэхія, Эстонія (з 2004 г.), Балгарыя, Румынія (з 2007 г.).

Рымскі дагавор выразна акрэсліў асноўную задачу ЕЭС – фармаванне агульнага рынка шляхам скасавання паміж дзяржавамі-членамі мытных пошлін і колькасных абмежаванняў для ўвоза і вываза тавараў, усталявання агульнага мытнага тарыфа і ўзгодненай гандлевай палітыкі ў адносінах трэціх краін; стварэння ўмоў для свабоднага перамяшчэння рабочай сілы, капіталаў, паслуг; правядзення адзінай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі і транспарта; каардынацыі эканамічнай, сацыяльнай, валютнай і інвестыцыйнай палітыкі.[190]

**Першы этап гісторыі ЕЭС** ахоплівае 1967 – 1968 гг. За гэты час сталі рэальнасцю здыманне мытных пошлін, уніфікацыя фінансавага заканадаўства, правядзенне адзінай аграрнай палітыкі.

Адлікам **другога этапа** стаў пачатак ажыццяўлення **праграмы завяршэння, паглыблення і пашырэння інтэграцыі ў 1969 г.,** якая да пачатку 90-х гг. напаўнялася канкрэтным зместам на працягу чатырох перыядаў.

**Першы перыяд (1969 – 1972 гг.)** адметны тым, што адбылося першае пашырэнне ЕЭС, і з пачатку 70-х гг. распрацоўваліся праграмы стварэння валютнага саюза, цеснай палітычнай стратэгіі ЕЭС.

**Другі перыяд (1972 – 1978 гг.)** развіцця інтэграцыйных працэсаў у Заходняй Еўропе можна ахарактарызаваць як крызіс ЕЭС, які быў выкліканы сусветным эканамічным крызісам 1974 – 1975 гг. Важнейшымі прычынамі крызіса былі не толькі вонкавыя фактары (крушэнне ў 1971 г. золатавалютнага стандарта, увядзенне нафтавага эмбарга у 1973 г.), але і прычыны ўнутранага парадку, звязаныя з пераходам супольніцтва з экстэнсіўнага на інтэнсіўны шлях развіцця. Гэтыя абставіны прымусілі адмовіцца ад фарсіравання інтэграцыі. Тым не менш, у гэты перыяд удалося дасягнуць умацавання асноў сельскагаспадарчай палітыкі (праграма "Зялёная Еўропа"). Былі ажыццяўлены

---

[187] Стратэгія "гнуткага рэагавання" прадугледжвае магчымасць вядзення як татальнай ядзернай вайны, так і абмежаваных войнаў з выкарыстаннем і звычайнай, і ядзернай зброі. Ракетна-ядзерныя сілы у адпаведнасці са стратэгіяй "гнуткага рэагавання" не абавязкова павінны выкарыстоўвацца адразу ж пасля ўзнікнення ваеннага канфлікта і не пры ўсіх сітуацыях. Гл.: "Стратегия гибкого реагирования // Дипломатический словарь. Т. 1. – М., 1985. – С. 259.

[188] Строев В. Некоторые аспекты применения сухопутных войск ФРГ // Зарубежное военное обозрение. – 1998. – № 4. – С. 19.

[189] Европейское экономическое сообщество // Дипломатический словарь в 3 томах. Т. 1. – С. 354.

[190] Там же.

зусім удалыя першыя агульнаеўрапейскія праекты, такія як стварэнне авіяцыйнага кансорцыума "Aribus Industrie", буйнамаштабныя тэхналагічныя распрацоўкі ў авіякасмічнай і абарончай сферах.

З канца 70-х гг. распачаўся **трэці перыяд (1978 – 1985 гг.)**, які характарызаваўся значным узрастаннем ролі Савета ЕЭС, удзел у працы якога часцей сталі прымаць кіраўнікі ўрадаў і дзяржаў супольніцтва. З 1978 г. пачалі праводзіцца прамыя выбары ў Еўрапарламент, якія павысілі статус і гэтага наднацыянальнага інстытута.На мяжы 70 – 80-х гг. значна пашырылася тэхналагічнае супрацоўніцтва краін ЕЭС, што дазволіла пераўтварыць Заходнюю Еўропу ў адзін з вядучых сусветных цэнтраў інавацыйнага развіцця эканомікі.

Сур'езнай спробай пераадольвання адставання заходнееўрапейскіх краін у галіне навукі і тэхнікі стала праграма "ЭЎРЫКА", ажыццяўляемая з 1985 г. Гэта праграма выходзіць за межы ЕЭС, аб'ядноўваючы кампаніі 19 заходнееўрапейскіх краін, і з'яўляецца крокам да стварэння "тэхналагічнай" Еўропы.

Галоўнай падзеяй трэцяга перыяда (1978 – 1985 гг.) было стварэнне Еўрапейскай Валютнай Сістэмы, якая пачала дзейнічаць з 13 сакавіка 1979 г. Паскарэнне інтэграцыйных працэсаў у галіне фінансаў дазволіла супольніцтву пераадолець сусветную рэцэсію пачатку 80-х гг., стварыць у Еўропе шырокую зону манетарнай стабільнасці, у рамках якой станавіліся рэдкімі карэктыроўкі валютных курсаў.

У 1985 г. эканоміка Заходняй Еўропы ўступіла ў фазу ўздыма, якая працягвалася сем гадоў. Паступальны рух інтэграцыі ў 80-х гг. быў замацаваны падпісаннем Адзінага еўрапейскага акта на Люксембургскім саміце ў снежні 1985 г., абвясціўшым у якасці першачарговай мэты поўную інтэграцыю рынку да канца 1992 г., што паклала пачатак чацвертаму этапу развіцця ЕЭС.

Зместам **чацвертага перыяда (1986 – 1992 гг.)** стаў паслядоўны рух супольніцтва па шляху стварэння адзінага унутранага рынка, які адрозніваўся ад агульнага рынка 60-х гадоў свабодай руху не толькі тавараў, але і паслуг, капіталаў, рабочай сілы, а таксама значна большай па зместу агульнай эканамічнай і валютнай палітыкай дзяржаў-членаў.[191]

## 3. Асноўныя этапы гісторыі сацыялістычнага лагеру. СЭУ, АВД, іх роля ў міжнародных адносінах

У пасляваенны перыяд свет сацыялізма быў прадстаўлены Венгерскай Народнай Рэспублікай (ВНР), Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай (ГДР), Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай (КНДР), Кітайскай Народнай Рэспублікай, Кубай, Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай (ЛНДР), Мангольскай Народнай Рэспублікай (МНР), Народнай Рэспублікай Балгарыяй (НРБ), Народнай Сацыялістычнай Рэспублікай Албаніяй (НСРА), Польскай Народнай Рэспублікай (ПНР), Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам (СРВ), Сацыялістычнай Рэспублікай Румыніяй (СРР), Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікай Югаславіяй (СФРЮ), Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР), Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікай (ЧССР). У сусветным маштабе на ўтвораны імі лагер прыходзілася 26,1 % тэрыторыі і 32,5 % насельніцва, не меней 2/5 прамысловай прадукцыі і адна трэць нацыянальнага дахода.[192]

Сацыялістычны лагер прайшоў у сваім развіцці наступныя этапы:

1) першая паласа народна-дэмакратычных рэвалюцый (1944 – 1948 гг.);

---

[191] Мировая экономика / Под ред. И. П. Николаевой. – М., 2000. – С. 426.

[192] Советский энциклопедический словарь. – М. 1980. – С. 820.

2) станаўленне камандна-размеркавальнай сістэмы (1948 – 1956 гг.);
3) спробы трансфармацыі існуючых грамадска-палітычных сістэм (1956 – канец 1980-х гг.);
4) другая паласа народна-дэмакратычных рэвалюцый (1989 – 1990 гг.).

Вызначальнай рысай **першага этапа** для большасці краін Усходняй Еўропы (Польшча, Венгрыя і іншых) быў пошук уласных шляхоў прасоўвання да сацыялізму. Партыйным кіраўніцтвам гэтых дзяржаў вылучаліся мадэлі сацыялістычнага будаўніцтва, альтэрнатыўныя савецкай, якія б абапіраліся на нацыянальны патэнцыял. Гэтыя народна-дэмакратычныя канцэпцыі прадугледжвалі ўмацаванне саюза рабочага класа, сялянства і дробнай буржуазіі, абапіранне на шматукладную эканоміку з шырокім развіццём прыватнага сектара. Фарсіраванымі тэмпамі ў гэты перыяд сацыялістычныя пераўтварэнні ішлі толькі ў Югаславіі, дзе з самага пачатку была ўспрынята мадэль, у многім падобная на савецкую.

**Другі этап** распачаўся з таго моманту, калі па прычыне відавочнага ўмяшання СССР стаў перарывацца працэс народна-дэмакратычных рэвалюцый ва Ўсходняй Еўропе. СССР праводзіў палітыку "кансалідацыі" тых краін Усходняй Еўропы, дзе былі моцныя пазіцыі камуністаў і дзе ён змог бы аднаасобна кантраляваць сітуацыю.Эканамічнай, палітычнай і грамадскай мадэллю стаў для гэтых краін Савецкі Саюз.

Рэалізаваная на практыцы **мадэль таталітарнага сацыялізму** характарызавалася:

- у сацыяльна-палітычнай сферы – ўсеўладдзем партыйнага і дзяржаўнага апарату, падпарадкаваннем асабовых і калектыўных інтарэсаў дзяржаве, разрывам паміж дэмакратычнымі канстытуцыйнымі нормамі і практыкай дзяржаўнага жыцця, парушэннем законнасці, рэпрэсіямі;
- у эканоміцы – панаваннем дзяржаўнай уласнасці, цэнтралізацыяй кіравання, камандна-адміністрацыйнымі метадамі кіраўніцтва, курсам на паскораную індустрыялізацыю, крыніцай назапашвання сродкаў для якой з'явілася сельская гаспадарка;
- у ідэалогіі – панаваннем марксізма-ленінізма ў адзінай дагматычнай форме;
- у адносінах з СССР – "сатэлізацыяй", падтрымкай Савецкага Саюза.[193]

Ужо да сярэдзіны 50-х гг. стала відавочна, што рэалізуемая ў краінах Усходняй Еўропы мадэль будаўніцтва сацыялістычнага грамадства не вядзе да адпаведнасці дэкларуемых мэт.

Сутнасць **трэцяга этапа** развіцця краін Усходняй Еўропы вызначаецца ўзнікненнем грамадска-палітычных і эканамічных крызісаў, якія часта ставілі пад пагрозу рэжымы, якія склаліся ў гэтых краінах. З другой паловы 50-х гг. тут пачаўся складаны, але не прамалінейны, працэс адыходу ад успрынятай дагматычнай сталінскай канцэпцыі пабудовы сацыялізма праз вяртанне да альтэрнатывы 40-х гг. У гэты перыяд усе радыкальныя спробы дэмантажа камандна-адміністрацыйнай сістэмы расцэньваліся кіраўніцтвам кіруючых партый як праява рэвізіянізму. Гэта не спрыяла стварэнню цэласнай канцэпцыі пераходу да новай мадэлі пабудовы сацыялізму.

У 60-я гг. кіраўніцтвам краін Усходняй Еўропы былі здзейснены спробы правядзення рэформ, накіраваныя на дэмакратызацыю, скасаванне празмернай цэнтралізацыі і адміністравання ў розных галінах жыцця. Аднак адчувальных вынікаў гэтыя рэформы не далі. Асноўнай прычынай няўдач было тое, што рэформы, як правіла, закраналі галіну эканомікі, тады як палітычная сістэма не рэфармавалася.

**Чацвёрты этап** ахоплівае 1989–1990 гг. Гэта – этап рэвалюцыйных змен. Галоўныя храналагічна падзеі гэтага этапа выстрайваюцца ў наступны рад:

- чэрвень 1989 г. – свабодныя выбары ў Польшчы, якія прывялі да страты ўлады кіруючай партыяй ПАРП і фармаванне кааліцыйнага ўрада на чале з "Салідарнасцю";
- верасень 1989 г. – скасаванне аднапартыйнага рэжыма ў Венгрыі;

---

[193] Вайц В. Ф., Петровская О. В., Стрелец М. В. Изучение стран Восточной Европы в курсе новейшей истории (методические рекомендации для учителей средних школ). – Брест, 1990. – С. 8-9.

- кастрычнік-снежань 1989 г. – змена ўсіх кіруючых дзяржаўных і партыйных структур у ГДР, Балгарыі, Чэхаславакіі, Румыніі;
- 1990 г. – посткамуністычны этап распачынаецца ў Албаніі і Манголіі.

Неад'емнай складовай часткай гісторыі сацыялістычнага лагеру была сацыялістычная садружнасць. Такое найменне з цягам часу было замацавана за аб'яднаннем дзяржаў, якія былі звязаны членствам у Савеце Эканамічнай Узаемадапамогі і Арганізацыі Варшаўскага дагавора (АВД).

**Савет Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ)** быў створаны па рашэнню эканамічнай нарады прадстаўнікоў Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі, СССР і ЧССР, якая адбылася ў Маскве 5 – 8 студзеня 1949 г. У 1950 г. у СЭУ ўступіла ГДР, у 1962 – МНР, а ў 1972 – Рэспубліка Куба, у 1978 – СРВ, у 1949 – 1960 гг. у СЭУ ўвайшла Албанія.[194]

Гісторыю **міжнародных эканамічных адносін** у рамках **сацыялістычнай садружнасці** можна падзяліць на наступныя этапы:

I – 1949 – сярэдзіна 1950-х гг.

II – сярэдзіна 1950-х – пачатак 1960-х гг.

III – 1960-я гг.

IV – 1970-я – 1980-я гг.

На **першым этапе** акцэнт рабіўся на **знешні гандаль.**

На 1956 – 1960 гг. краіны-члены СЭУ **скаардынавалі народнагаспадарчыя планы,** што з'явілася першай у гісторыі сацыялістычнай садружнасці спробай доўгатэрміновага ўзгаднення развіцця народных гаспадарак на велізарнай тэрыторыі і ўвязцы эканамічных патэнцыялаў, якія хутка раслі.

Замыканне сістэмы сацыялістычнай эканомікі ў рамках СЭУ прывяло да перавагі экстэнсіўнага, рэсурсаёмкага роста, які, дзякуючы здольнасці да мабілізацыі усіх унутраных рэсурсаў, прыносіў несумненныя эканамічныя поспехі на пачатковай стадыі індустрыялізацыі (але з высокай сацыяльнай цаной).

"Галоўная **адметная рыса трэцяга этапа – спроба перабудовы сістэмы і метадаў супрацоўніцтва** ў цеснай увязцы з рэфармаваннем нацыянальных эканомік. Гэта пытанне было прадметам абмеркавання на нарадах кіраўнікоў партый і кіраўнікоў урадаў краін-членаў СЭУ, адбыўшыхся ў чэрвені 1962 г. і ліпені 1963 г., якія вызначылі шляхі такой перабудовы... У якасці праграмнага дакумента былі прыняты "Асноўныя прынцыпы міжнароднага сацыялістычнага падзелу працы", у якіх падкрэслівалася, што мэтай міжнароднага сацыялістычнага падзелу працы з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, садзейнічанне дасягненню высокіх тэмпаў роста эканомікі і дабрабыту працоўных ва ўсіх сацыялістычных краінах, індустрыялізацыі і паступоваму пераадольванню гістарычна склаўшыхся адрозненняў ва ўзроўнях эканамічнага развіцця краін сацыялізма, стварэнню матэрыяльнай базы для іх больш або меньш адначасовага, у межах адной гістарычнай эпохі, пераходу да камунізму".[195]

Аднак рэаліі 1960-х гг. і пазнейшага часу былі іншымі. Маруднае фармаванне механізмаў міжнароднага падзелу працы ў рамках СЭУ перашкаджала каардынацыі народнагаспадарчых планаў і ажыццяўленню сумесных праектаў. У выніку, ўжо ў сярэдзіне 80-х гг. у Заходняй Еўропе ўзровень міжнароднага падзелу працы апынуўся на парадак вышэй, чым ва Усходняй. Буйным крокам наперад у інтэграцыі краін СЭУ з'явілася прынятая ў 1971 г. комплексная праграма далейшага паглыблення і ўдасканалення супрацоўніцтва, якая была разлічана на 15-20 гадоў.

---

[194] Совет Экономической Взаимопомощи // Дипломатический словарь в 3-х томах. Т. 3. – С. 51-52.

[195] Белорусская ССР и социалистические страны: Укрепление дружбы, сотрудничества, братства (1945 – 1987 гг.) / Сергеева Г.Г., Языкович Л.В., Снапковский В.Е. и др. – Мн., 1987. – С. 96-97.

Указаная комплексная праграма паклала **пачатак чацвёртаму этапу** гісторыі СЭУ. Далейшая канкрэтызацыя і развіццё адпаведных палажэнняў знайшлі адлюстраванне ва ўхваленных у 1978 – 1979 гг. на XXXII і XXXIII сесіях СЭУ пяці Доўгатэрміновых мэтавых праграмах супрацоўніцтва (ДМПС) у галіне энергіі, паліва і сыравіны, сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці, машынабудавання, вытворчасці прамысловых тавараў народнага спажывання і транспарта.

У 1985 г. была прынята комплексная праграма навукова-тэхнічнага прагрэса краін-членаў СЭУ да 2000 г. Яна арыентыравала на паскоранае развіццё атамнай энергетыкі, стварэнне новых матэрыялаў і тэхналогій, электранізацыю народнай гаспадаркі, комплексную аўтаматызацыю.

Аднак большасць пунктаў пералічаных праграм не было рэалізавана. У 1980-я гг. унутры СЭУ стала панаваць тэндэнцыя да дэзінтэграцыі. СЭУ афіцыйна праіснаваў да 1 красавіка 1991 г.

**14 мая 1955 г.** быў падпісаны **Варшаўскі Дагавор** аб сяброўстве, супрацоўніцтве і узаемнай дапамозе паміж Албаніяй, Балгарыяй, Венгрыяй, ГДР, Польшчай, Румыніяй, СССР і Чэхаславакіяй. Ён быў заключаны на 20 гадоў з аўтаматычным прадаўжэннем на далейшыя 10 гадоў для тых дзяржаў, якія не дэнансуюць Дагавор за год да сканчэння гэтага тэрміна. Дагавор уступіў у сілу 5 чэрвеня 1955 г. пасля перадачы ратыфікацыйных грамат на захаванне польскаму ўраду. Албанія з 1962 г. у працы органаў Варшавскага Дагавору не ўдзельнічала, у 1968 г. абвясціла аб яго дэнансацыі.

26 красавіка 1985 г. дзяржавы-удзельніцы **Арганізацыі Варшавскага Дагавору (АВД)** падпісалі ў Варшаве Пратакол аб прадленні тэрміна дзеяння Дагавора аб сяброўстве, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе. У адпаведнасці з Пратаколам, які ўступіў у сілу 31 мая 1985 г., Варшаўскі Дагавор быў прадоўжаны на 20 гадоў з магчымасцю пазнейшай пралангацыі яшчэ на 10 гадоў".[196] Аднак АВД праіснавала да 1 красавіка 1991 г.

Арганізацыя Варшавскага Дагавора не была сапраўдным саюзам, аб'яднаннем раўнапраўных партнераў. Масква ўцягнула краіны Усходняй Еўропы ў гэту арганізацыю. Яе мэта заключалася ў тым, каб юрыдычна замацаваць свае стратэгічныя пазіцыі ў дадзеным рэгіене.

Каб падтрымліваць існаванне гэтага псеўдасаюза, СССР прыходзілася не толькі дорага плаціць, але і раз за разам прыбягаць да ўзброенага ўмяшання. Кожны раз гэта вяло да абвастрэння напружанасці, пагаршэння адносін з Захадам, падсцёгвала гонку ўзбраенняў. І пакуль існаваў не сапраўды добраахвотны, а заснаваны на прымусу саюз, існавала і магчымасць новых інтэрвенцый з усімі іх магчымымі наступствамі, аж да буйнога ўзброенага канфлікту ў Еўропе.

На нарадах Палітычнага кансультацыйнага камітэта (ПКК) Арганізацыі Варшавскага Дагавора рэгулярна вылучаліся прапановы на прадмет міжнароднай бяспекі і раззбраення. Аднак толькі пасля таго, як СССР стаў перабудоўваць сваю знешнюю палітыку па прынцыпах новага палітычнага мышлення, ініцыятывы АВД пачалі падмацоўвацца рэальнымі справамі.

## 4. Краіны "трэцяга свету": новы этап развіцця

Пасляваенны перыяд быў адзначаны і новым этапам у гісторыі краін **"трэцяга свету"**. Яго адметныя рысы наступныя:

1. Адбылося беспрэцэдэнтнае па маштабах і тэмпах пашырэнне геаграфічных межаў дадзенай групы краін. У гэты адрэзак часу звыш 100 былых калоній набылі статус новых суб'ектаў міжнародных адносін і міжнароднага права. Аб дынаміцы гэтага працэсу

[196] Варшавский Договор 1955 г. о дружбе, сотрудничестве и взаимной помощи // Дипломатический словарь в 3 томах. Т. 1. – С. 170-171.

сведчылі наступныя лічбы і факты. Адразу пасля заканчэння Другой сусветнай вайны каланіяльны свет ўяўляў сабой велізарнейшы абшар, які насяляла 675 млн чалавек. У 1977 г., гэта значыць, меней, чым праз трэць стагоддзя, дадзены паказчык не перавышаў нават 12 млн чалавек. Да пачатку 1960-х гг. распад каланіяльнай сістэмы ажыццяўляўся адносна павольнымі тэмпамі. Сапраўдны пералом у аналізуемым працэсе адбыўся ў 1960 г., калі ў Афрыцы толькі за адзін гэты год 17 (!) краін дасягнулі дзяржаўнай незалежнасці. У сярэдзіне 1970-х гг. каланіялізм па вялікаму рахунку стаў гісторыяй і, натуральна, у канчатковым выніку кардынальна змянілася палітычная карта амаль ўсёй Афрыкі, большай часткі Азіі і Лацінскай Амерыкі.[197]

2. Зыходным пунктам у развіцці посткаланіяльных краін з'явілася наяўнасць **камбінаванага грамадства**. Гэта – грамадства, якое характарызуецца вельмі слабай унутранай інтэграванасцю тых кампанентаў яго структуры, якія разнастайныя фармацыйна або тыпалагічна.

3. Новыя незалежныя дзяржавы зоны "трэцяга свету" адрозніваліся спецыфікай генезіса структур грамадзянскага грамадства. "Працэс фарміравання грамадзянскага грамадства тут пачаўся ў асноўным зверху. І толькі па меры ўмацавання і афармлення грамадзянскага грамадства яно магло пачаць аказваць ціск, які нарастае, на афіцыйную дзяржаву, вымушаючы яе да далейшай эвалюцыі".[198]

4. У посткаланіяльных краінах у якасці ключавых груп унутры буржуазнага класа выступілі манапалістычная буржуазія і бюракратычная буржуазія. Прычым бюракратычная буржуазія вядома як чыста ўсходняя з'ява.

5. У манархіях, якія захаваліся дзесьці на Усходзе – у Марока, Іарданіі, Іране (да 1979 г.), у Брунеі і арабскіх дзяржавах Пярсідскага заліва ўзнікла новая сацыяльная агульнасць – **ФБК** (феадальна-бюракрарычны капітал). Гэта, бадай, найбольш моцная група кіруючых эліт, якія спалучаюць адначасова выкарыстанне метадаў эканамічнага і пазаэканамічнага прымусу, перавагі знатнага паходжання і спадчыннага кіравання, патрыярхальна-кланавага аўтарытэта, які асвячаецца звычаем і традыцыяй.

6. Пасляваенны "трэці свет" стаў нашмат больш урбанізаваным, у структуры яго насельніцтва рэзка ўзрасла ўдзельная вага гараджан.

7. Набывалі ўсё большую трываласць фактары, якія прадвызначалі ў доўгатэрміновай перспектыве маргіналізацыю аналізуемай зоны. Паўперы і люмпены, а таксама іншыя сацыяльныя нізы (галоўным чынам гарадскія) складалі ў 1960 – 1980-х гг. ад 20 % да 40 % насельніцтва Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

8. Няўхільна павялічваўся працаатрымальніцкі корпус. У 1970 – 1990-я гг. ўжо да 40-50 % жыхароў Усходу працавалі па найму.

9. У адрозненне ад мінулых часоў сярэднія слаі сталі ўсё больш актыўна ўплываць на фармаванне агульнага сацыяльнага партрэта "трэцяга свету". Палітычнае і сацыяльнае развіццё Ўсходу ў разглядаемы перыяд пастаянна стымулявала рост сярэдніх слаёў.[199]

10. Яшчэ больш выразнай стала дыферэнцыяцыя ўнутры аналізуемай групы дзяржаў па ключавых макраэканамічных паказчыках, аб чым перш за ўсё сведчыла вылучэнне новых індустрыяльных краін (Ганконга, Паўднёвай Карэі, Сінгапура, Тайваня і г. д.).

11. Пасляваенны перыяд – гэта і перыяд узнікнення канфлікта паміж багатай Поўначчу і бедным Поўднем, які набыў вастрыню да сярэдзіны 1970-х гг. і застаецца нявырашаным і ў пачатку XXI ст. (Поўнач – краіны зона сталага капіталізму, Поўдзень – краіны, якія развіваюцца).

---

[197] Советский энциклопедический словарь. – С. 610.

[198] Новейшая история стран Азии и Африки: XX век. Учеб. для студ. высш. учебн. заведений. В 3 ч. / Под ред. А. М. Родригеса. – М. 2001. Ч. 2: 1945 – 1990. – С. 7-11.

[199]Новейшая история стран Азии и Африки: XX век. Ч. 2: 1945 – 1990. – С. 62-66.

12. На развіццё краін Усходу істотны адбітак наклалі рэаліі халоднай вайны, звязаныя з барацьбой паміж капіталістычнымі і сацыялістычнымі дзяржавамі за ўплыў на краіны трэцяга свету. Вынікам удзелу сацыялістычнага лагеру ў дадзенай барацьбе было з'яўленне дзяржаў, якія абвясцілі аб тым, што ўступаюць на шлях так званай "сацыялістычнай арыентацыі". Фінансавая дапамога гэтым краінам з боку Савецкага Саюзу, як і гонка ўзбраенняў, падрывала стан савецкай эканомікі. І ўсё ж нягледзячы на такія намаганні, якія былі несумяшчальныя з яго нацыянальнымі інтарэсамі, СССР так і не змог зраўнавацца з Захадам па ступені ўплыву ў зоне трэцяга свету. Разам з тым відавочна прасочвалася тэндэнцыя да паслаблення пазіцый вядучых капіталістычных краін у дадзенай зоне. "Усход другой наловы XX ст. паступова ператвараўся з залежнага аб'екта каланіяльнай і неакаланіяльнай палітыкі Захаду ў самастойную сілу на міжнароднай арэне".[200] Аб гэтым, напрыклад, сведчыў актыўны ўдзел абсалютнай большасці яго краін у **руху недалучэння**, які **бярэ адлік з 1961 г**.

**Заключэнне**. Такім чынам, змест пасляваеннага перыяда найноўшай гісторыі склалі спаборніцтва паміж капіталізмам і сацыялізмам, "халодная вайна" і пачатак пераходу да постканфрантацыйнага свету, крах сусветных каланіяльных імперый і ўзнікненне "трэцяга свету", развіццё, станаўленне і крах сацыялістычнага лагеру, пачатак пераходу да посткамуністычнага этапу часткі краін, якія да яго належалі, якасныя зрухі ў прыродзе капіталізма, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, узнікненне і абвастрэнне канфлікту паміж Поўначчу і Поўднем. Асноўны вынік гэтага перыяду – ператварэнне заходняй цывілізацыі ў галоўную ўплывовую сілу сусветнага развіцця.[201]

[200] Там же. – С. 32.

### *Лекцыя дзевятая*

## СВЕТ І БЕЛАРУСЬ НА МЯЖЫ ХХ–ХХІ СТАГОДДЗЯЎ

1. Міжнародныя адносіны пасля краху камунізму: асноўныя тэндэнцыі і праблемы.
   1.1. Перадумовы пераходу ад "халоднай вайны" да постканфрантацыйнага свету. Канцэпцыя новага палітычнага мышлення і яе роля ў перабудове міжнародных адносін.
   1.2. Асноўныя цэнтры сілы ў сучасным свеце.
   1.3. НАТО: спецыфіка ваеннай і ваенна-палітычнай стратэгіі ў новых умовах. Пашырэнне НАТО на Ўсход і міжнародная бяспека. Удзел Рэспублікі Беларусь у праграме НАТО "Партнёрства дзеля міру".
   1.4. Кардынальныя зрухі ў ЕС. Маастрыхцкі і Амстэрдамскі дагаворы, дагавор у Ніццы і іх наступствы. Пашырэнне ЕС на Ўсход і нацыянальныя інтарэсы Беларусі.
   1.5. Садружнасць Незалежных Дзяржаў і яе месца ў сістэме сучасных міжнародных адносін. Будаўніцтва Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі: дасягненні і праблемы.
2. Усходняя Еўропа: новы этап гісторыі.
   2.1. Народна-дэмакратычныя рэвалюцыі ў краінах Усходняй Еўропы: прычыны, характар, рухаючыя сілы.
   2.2. Трансфармацыя палітычных і сацыяльна-эканамічных сістэм у постсацыялістычных дзяржавах: павучальныя ўрокі для Беларусі.

### 1.1. Перадумовы пераходу ад "халоднай вайны" да постканфрантацыйнага свету. Канцэпцыя новага палітычнага мышлення і яе роля ў перабудове міжнародных адносін

Другая палова 80-х гг. ХХ ст. характарызавалася складваннем перадумоваў для заканчэння "халоднай вайны". На Захадзе і Ўсходзе адбывалася пераадольванне стэрэатыпаў, якія ляжалі ў аснове мышлення часоў міжсістэмнай канфрантацыі. Перадумовы для пераходу да постканфрантацыйнага свету былі наступныя:

1) тэндэнцыя да глабалізацыі стала вызначальнай. У сусветным маштабе ў якасці новай рэальнасці выступала наяўнасць мноства надзвычай вострых праблем, якія існавалі адначасова і патрабавалі неадкладных агульных намаганняў Захаду і Ўсходу (прыродныя катаклізмы, пагроза тэхнагенных катастроф, СНІД і г. д.);

2) тупік, у які завяла стаўка галоўных апанентаў у халоднай вайне на ваенна-сілавы аргумент. З-за гэтай стаўкі ў міжсістэмных узаемадачыненнях набыў хранічны характар праблемны комплекс, які пры пэўных абставінах мог прывесці да трэцяй сусветнай вайны. Чалавецтва вельмі блізка падыходзіла да дадзенай вайны ў час Суэцкага 1956 г., Берлінскага 1958 – 1961 гг., Карыбскага 1962 г. крызісаў. У сярэдзіне 1980-х гг. беспрэцэдэнтныя тэмпы і маштабы гонкі ўзбраенняў арганічна спалучаліся з новым этапам рэвалюцыі ў ваеннай тэхніцы, з упартым нежаданнем НАТО і АВД лакалізаваць рэгіянальныя канфлікты, якія маглі перарасці ў такога кшталту крызісы. Гэта прывяло да таго, што бессэнсоўнасць далейшай гонкі ўзбраенняў стала відавочнай, як ніколі раней;

3) уцягненнасць цытадэлі ўсходняга блока (СССР) у гонку ўзбраенняў з'явілася адной з галоўных прычын сістэмнага крызісу ў яго народнагаспадарчым комплексе;

4) апазіцыя ў шэрагу вядучых краін Захаду, якая была беспрэцэдэнтнай у плане палітычнай вагі, структураванасці, у той ці іншай ступені дыстанцыравалася ад палітыкі НАТО. Напрыклад, у ФРГ у 1983 г. ў склад парламента ўвайшла пацыфісцкая, антынатаўская па яе тагачаснаму ідэалагічнаму профілю, партыя "Зелёных", а буйнейшая апазіцыйная партыя – СДПГ – распрацавала канцэпцыю партнёрства Захаду і Ўсходу ў імя бяспекі;

5) натуральнае імкненне людзей, якія жылі па абодва бакі "жалезнай заслоны", развіваць народную дыпламатыю.

На грунце вышэйазначаных перадумоў асабліва дынамічна мяняліся падыходы Усходу, што трэба, больш за ўсё, звязваць з імем **Міхаіла Гарбачова**, генеральнага сакратара ЦК КПСС з 1985 па 1991 гг., прэзідэнта СССР з 1990 па 1991 гг.

Лінія М. Гарбачова ў міжнародных справах грунтавалася на канцэпцыі **новага палітычнага мышлення.** Сутнасць гэтай канцэпцыі выразна прасочвалася ў наступных момантах:

1) перакананне ва ўзаемазалежнасці, узаемасувязі, цэласнасці свету;
2) прынцыповая адмова ад вырашэння праблем з выкарыстаннем сілы;
3) замест традыцыйнага баланса сіл абвяшчаўся баланс інтарэсаў;
4) дэідэалагізацыя міжнародных адносін;
5) прызнанне відавочнага прыярытэта агульначалавечых каштоўнастяў у параўнанні з класавамі;
6) павага да свабоды выбару, неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў;
7) празрыстасць у ваеннай галіне;
8) ажыццяўленне раззбраення на грунце прынцыпаў роўнасці і аднолькавай бяспекі бакоў;
9) стварэнне ўстойлівых двухбаковых, рэгіянальных і глабальных структур кааперыцыі, супрацоўніцтва замест структур міжсістэмнага супрацьборства.

Пасля вылучэння аналізуемай канцэпцыі ў міжнародных адносінах адбыліся наступныя змены:

1) СССР ажыццявіў дэмантаж **дактрыны Брэжнева**, сутнасць якой заключалася ў правамернасці ўмяшання СССР ва ўнутраныя справы дзяржаў сацыялістычнага лагеру;
2) быў ліквідаваны клас ядзерных сістэм сярэдняй і малой далёкасці, значна паменшыліся арсеналы звычайных узбраенняў дзяржаў-членаў НАТО і АВД;
3) СССР вывеў свае войскі з Афганістана;
4) станоўчымі зрухамі быў азначаны кітайскі вектар савецкай знешняй палітыкі;
5) больш збалансаваным стаў падыход Масквы да рэгіянальных канфліктаў на поўдні Афрыкі, на Блізкім Усходзе;
6) было дасягнута аднаўленне германскага адзінства.

## 1.2. Асноўныя цэнтры сілы ў сучасным свеце

Звычайна працэсы ў свеце вызначаюцца перш за ўсё **цэнтрамі сілы**. Сярод іх вылучаюць **глабальныя і рэгіянальныя**.

Зразумела, **глабальны цэнтр** сілы мае эканамічны, ваенны патэнцыял, палітычную вагу, якія даюць яму падставу для ўцягненасці ў глабальныя працэсы. На працягу апошніх шасцідзесяці гадоў усім названым крытэрыям поўнасцю адпавядалі толькі **ЗША**. У эпоху біпалярнасці свету другім глабальным цэнтрам сілы быў **СССР**, але яго эканамічны патэнцыял намнога саступаў амерыканскаму. Праўда, СССР, як і ЗША меў стратэгічны ядзерны патэнцыял, які быў здольны неаднаразова знішчаць увесь зямны шар. Такога патэнцыялу не было ў Заходняй Еўропы, Японіі, якія ў той час, разам з ЗША, выступалі як асноўныя цэнтры сусветнай капіталістычнай эканомікі. Палітычная ж вага заходняй часткі Старога Свету, Краіны Ўзыходзячага Сонца далёка не адпавядала іх эканамічнай моцы.

Пералічаныя крытэрыі цэнтра сілы трэба улічваць і ў рэгіянальным аспекце. Спачатку возьмем кантынентальны ўзровень.

У пасляваеннай Еўропе хутка набірала эканамічны моц **Федэратыўная Рэспубліка Германія**[202]. Але яна так і заставалася эканамічным волатам і палітычным карлікам.

[202] Ужо ў 1957 г. ФРГ па прамысловаму патэнцыялу ўваходзіла ў тройку лідэраў у несацыялістычнай прасторы, прапускаючы наперад толькі ЗША і Вялікабрытанію, а па золатавалютным рэзэрвам яна саступала ў глабальным маштабе толькі ЗША. У 1960-х гг. гэта дзяржава становіцца кантынентальным эканамічным лідэрам. Калі краіна ўступала ў 1970-я гады, 10 прамысловых рабочых рабілі такую ж працу, што 10 гадоў назад іх 16 калег. Толькі за 1960-я гады германскі аграрны і харчовы экспарт павялічыўся больш чым утрая. // Стралец М.В. Краіназнаўства. – Брэст, 2005. – С. 81-88.

У азіяцкім інтэр'еры вельмі пераканаўча выглядала **Японія** пасля так званага "эканамічнага цуду". Поспех палітыкі чатырох мадэрнізацый прадвызначыў істотнае ўмацаванне кантынентальных пазіцый Кітая.[203]

У Лацінскай Амерыцы ключавую ролю адыгрывалі **Бразілія і Аргенціна**.

У якасці субкантынентальных цэнтраў сілы выступалі **Паўднёвая Карэя**, **Тайвань**, **Сінгапур**, **Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка**, **Ізраіль**.

"Пасля заканчэння халоднай вайны афіцыйны характар і практычна агульнае прызнанне набыла схема **аднаполюснага свету**, паводле якой гісторыя нібыта спыніла свой ход, парадзіўшы **pax Americana**, дзе шэрыфам, вышэйшым суддзёй і выканаўцай прысуду выступае адна і тая ж краіна, якая змагла захаваць і міфы адзінай звышдзяржавы. Калі нефармальна, то на справе скасаваны ўсе асновы папярэдняга перыяду міжнародных адносін – прынцып роўнасці ўсіх дзяржаваў, прытрымліванне ўзятых раней абавязацельстваў, нарматыўны характар міжнароднага права ўвогуле. Склалася сітуацыя, калі Злучаныя Штаты Амерыкі, зыходзячы са сваіх уласных інтарэсаў, імкнуцца вызначаць, што добра і што дрэнна для свету, прычым лічаць сябе свабоднымі ў выбары сродкаў для рэалізацыі сваіх рашэнняў, не звяртаючы ўвагу ні на каго і ні на што. Міжнародныя нормы вызначаюцца імі ад выпадка да выпадка, "зыходзячы з мэтазгоднасці".[204]

Ва ўмовах рэзкага ўзмацнення ўплыву і магутнасці ЗША ЕС стаў адзінай сілай, якая здольна выступаць паслядоўным апанентам амерыканскай уседазволенасці ў сусветнай палітыцы. У пачатку XXI ст. краіны Еўропы здольны прад'явіць мацнейшы эканамічны аргумент у глабальнай расстаноўцы сіл. "Ім належыць 20 % усяго сусветнага ўнутранага прадукта (ВУП). Разам з ЗША, Канадай і Японіяй яны ўваходзяць у так званы "**залаты мільярд**" – групу самых багатых **прамыслова развітых краін (ПРК)**, на долю якіх прыходзіцца каля 80 % сусветных даходаў. Бясспрэчна, буйнейшай з'явай сусветнага значэння стала развіццё на кантыненце ўглыб і ўшыр інтэграцыйнага працэса, якое прывяло да ўтварэння **Еўрапейскага Саюза**, які валодае магутным інтэграваным прамысловым і фінансавым патэнцыялам, здольным у многім канкураваць з ЗША".[205]

На пераўтварэнне ў самастойны, прычым у зусім уплывовы цэнтр сілы, нават у большай ступені, чым Заходняя Еўропа, прэтэндуе Японія. Ужо дастаткова даўно вызначылася тая сфера, на кантроль над якой прэтэндуе "Краіна Ўзыходзячага Сонца", – **Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён**. Пазбавіўшыся ад неабходнасці пастаянна азірацца, у сілу наяўнасці СССР, на свайго стратэгічнага партнёра ЗША, Японія, абапіраючыся на магутны патэнцыял, які хутка развіваецца, несумненна, мае ўсе шанцы ўжо ў недалёкай будучыні стаць прызнаным лідэрам **АЦР**. Калі гэта адбудзецца, то прэтэнзіі ЗША на фармаванне аднаполюснай мадэлі міжнародных адносін будуць пахаваны.

Аднак на шляху рэалізацыі гэтага сцэнарыя ёсць адна перашкода – Кітай, які буйна прагрэсуе, валодае гіганцкім патэнцыялам. Гэта відавочны прэтэндэнт на тое, каб праз 10-15 гадоў стаць супердзяржавай у поўным сэнсе гэтага слова. У стварэнні яму пэўнай супрацьвагі ў роўнай ступені зацікаўлены і ЗША, і Японія, і гэта запавольвае развал япона-амерыканскага альянсу.[206]

---

[203] У КНР з 1978 па 1990 гг. адбылося падваенне валавога нацыянальнага прадукта, даходы гарадскога і сельскага насельніцтва павялічыліся ўтрая, да пачатку 1990-х гг. была знята праблема забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання і адзеннем, толькі за перыяд шостай пяцігодкі (1981 – 1985) тэмпы роста прамысловай вытворчасці штогод узрасталі ў сярэднім на 11 % (Гл.: "Новейшая история стран Азии и Африки: XX век. Ч. 2: 1945–2000. – С. 151").

[204] Максимычев И. Ф. Мир в поисках равновесия // Современная Европа. – 2002. – № 4. – С. 5–6.

[205] Шенаев В. Экономика Евросоюза на рубеже веков // Современная Европа. – 2002. – № 4. – С. 17.

[206] Новиков С. В., Маныкин А. С., Дмитриева О. В. Всеобщая история. Справочник студента. – М., 2000. – С. 627.

## 1.3. НАТО: спецыфіка ваеннай і ваенна-палітычнай стратэгіі ў новых умовах. Пашырэнне НАТО на Ўсход і міжнародная бяспека. Удзел Рэспублікі Беларусь у праграме НАТО "Партнёрства дзеля міру"

Пасля заканчэння "халоднай вайны" адбылася відавочная трансфармацыя ваеннай і ваенна-палітычнай стратэгіі НАТО, аб чым сведчылі стратэгічныя канцэпцыі, ухваленныя на сесіях Савета гэтай арганізацыі ў 1991 і 1999 гг. У дадзеных канцэпцыях надавалася асаблівае значэнне развіццю супрацоўніцтва НАТО з былымі праціўнікамі і прадугледжвалася магчымасць выкарыстання ваеннага патэнцыяла альянса для сілавога ўрэгулявання канфліктаў за межамі яго зоны адказнасці, усталяванай Паўночнаатлантычным дагаворам.

Ужо з прыняццем стратэгічнай канцэпцыі 1999 г. узніклі ўсе падставы для таго, каб сцвярджаць, што адбылася радыкальная трансфармацыя канцэптуальнай асновы дзейнасці НАТО. Пасля 1999 г., і асабліва пасля верасня 2001, НАТО фактычна паварочваецца да сваіх вытокаў – прынцыпаў, якія былі сфармуляваны ў Паўночнаатлантычным дагаворы, і мае ўсе шанцы з часам пераўтварыцца з ваеннага саюза, які накіраваны на канкрэтнага праціўніка, у сістэму калектыўнай бяспекі.[207]

Яшчэ з 1991 г. у Еўропе стаяла пытанне аб пашырэнні НАТО. Ініцыятарамі яго з'яўляліся ўсходнееўрапейскія краіны. У студзені 1994 г. Савет НАТО ўхваліў прапанаваную ЗША праграму **"Партнёрства дзеля міру"**, якую разглядаў як альтэрнатыву пашырэнню НАТО на Ўсход. Да праграмы далучыліся практычна ўсе былыя рэспублікі СССР. Гэта, аднак, не азначала адмовы НАТО ад пашырэння.[208]

Натаўскі саміт (ліпень 1997 г, Мадрыд, Іспанія) запрасіў далучыцца да гэтай арганізацыі **Польшу, Чэхію, Венгрыю**. Яны сталі паўнапраўнымі членамі альянса з 12 сакавіка 1999 г. Сесія Савета НАТО (лістапад 2002 г., Прага, Чэхія) прыняла аналагічнае рашэнне ў дачыненні да **Літвы**, **Латвіі**, **Эстоніі**, **Славакіі**, **Балгарыі**, **Румыніі**, **Славеніі**. Гэтыя краіны ўвайшлі ў дадзеную арганізацыю ў 2004 г.

Пашырэнне НАТО на Ўсход не прывяло да ўмацавання міжнароднай бяспекі. Рэзка пашыраны альянс аказаўся пакуль няздольным эфектыўна супрацьстаяць міжнароднаму тэрарызму, арганізаванай злачыннасці, прадухіляць рэгіянальную нестабільнасць, гэта значыць выконваць задачы, якія закладзены ў яго сучаснай стратэгічнай канцэпцыі. Больш таго, некаторыя ваенныя мерапрыемствы, якія ажыццяўляюцца на тэрыторыях новых краін – членаў НАТО, накіраваныя на падрыў рэгіянальнай і глабальнай стабільнасці.

У кастрычніку 1993 г. дзяржаўны сакратар ЗША У. Крыстафер наведаў Рэспубліку Беларусь і запрасіў яе да ўдзелу ў праграме НАТО "Партнёрства дзеля міру" (ПДМ). Афіцыйна Беларусь далучылася да ПДМ 11 студзеня 1995 г. На працягу 1995 г. урадам распрацоўваўся Прэзентацыйны дакумент аб супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з НАТО, зацверджаны ў штаб-кватэры НАТО 29 красавіка 1996 г. У гэтым дакуменце вызначаны асноўныя кірункі супрацоўніцтва Беларусі з НАТО: абмен інфармацыяй, рэгулярнае правядзенне двухбаковых кансультацый па пытаннях бяспекі, прыцягненне новых тэхналогій у галіне канверсіі, экалогіі і скарачэння ўзбраенняў. У 1997 г. распрацавана і ўхвалена Індывідуальная праграма партнёрства Беларусі з НАТО на 1997–1999 гг., у якой прадугледжваўся ўдзел прадстаўнікоў Беларусі ў сумесных з НАТО мерапрыемствах па ўзгодненых кірунках супрацоўніцтва (такая практыка была працягнута ў далейшым).[209]

---

[207] Иванов П. А. Трансформация НАТО: век нынешний и век минувший // Мировая экономика и международные отношения. – 2003. – № 1. – С. 15-16.

[208] Новейшая история Отечества. XX век: Учебник для студентов вузов: В 2-х т. / Под ред. А. Ф. Киселёва, Э. М. Щагина. – М., 1999. Т. 2. – С. 915-916.

[209] Міжнародныя арганізацыі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 5. – С. 135-136.

## 1.4. Кардынальныя зрухі ў ЕС. Маастрыхцкі і Амстэрдамскі дагаворы, дагавор у Ніццы і іх наступствы. Пашырэнне ЕС на Ўсход і нацыянальныя інтарэсы Беларусі

У 1992 г. з падпісання ў **Маастрыхце Дагавора аб Еўрапейскім саюзе** пачаўся сучасны этап развіцця еўрапейскай інтэграцыі. У гэтым Дагаворы былі замацаваны важнейшыя прынцыпы арганізацыі аб'яднанай Еўропы: прынцып адзінага грамадзянства, прыхільнасць адзінай палітыцы ў галіне адукацыі, культуры і аховы здароўя, а таксама ўзгодненай рэгіянальнай і прыродаахоўнай палітыкі; сфармуляваны фундаментальныя правы грамадзян. Было прынята рашэнне аб уводзінах адзінай валюты.[210]

У 1993 г. узнік **Еўрапейскі ўнутраны рынак**. Ён ахоплівае 27 членаў **ЕС**, **Ісландыю**, **Нарвегію і Ліхтэнштэйн**, якія ўтвараюць разам з ЕС еўрапейскую эканамічную прастору. На ўнутраным рынку прызнаны 4 асноўныя свабоды: свабоднае перамяшчэнне асоб, тавараў, паслуг і капіталу.[211]

З 1999 г. створана еўразона з 12 дзяржаў, якая атрымала найменне "**Еўралэнд**", з адзінай валютай – **еўра**, якая зрабіла сучасную валютную сістэму біпалярнай.[212] З 1 студзеня 2007 г. 13-й дзяржавай Еўразоны стала Славенія.

У 1997 г. краіны ЕС падпісалі Амстэрдамскі дагавор, які практычна адкрыў дарогу да пашырэння Саюза на Ўсход і сфармуляваў асноўныя правілы, па якіх будзе мяняцца яго інстытуцыянальная структура пры хуткім павялічэнні складу краін-удзельніц.[213]

У 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст. можна прасачыць два этапы пашырэння ЕС.

**Першы этап – 1995 г. –** уступленне ў дадзеную інтэграцыйную групоўку **Аўстрыі**, **Фінляндыі**, **Швецыі**.

**Другі этап –** пашырэнне ЕС на Ўсход. Цэнтральная падзея гэтага этапа – саміт ЕС у Афінах (Грэцыя) запрасіў **16 красавіка 2003 г.** далучыцца да дадзенай арганізацыі **Літву**, **Латвію**, **Эстонію**, **Чэхію**, **Славакію**, **Польшчу**, **Венгрыю**, **Славенію**, **Кіпр**, **Мальту**. Усе яны, за выключэннем Кіпра і Мальты, уваходзяць у постсацыялістычную прастору ў Еўропе. Новыя члены папоўнілі шэрагі ЕС з 2004 г. З 1 студзеня 2007 г. такі ж статус набылі **Балгарыя і Румынія.**

Сучасны этап пашырэння ЕС характэрызуецца цэлым шэрагам асаблівасцяў у параўнанні з папярэднімі. На папярэдніх этапах ў ЕС уступалі краіны з даўно склаўшыміся рынкавымі эканомікамі, хоць некаторыя з іх і не адносіліся да разраду развітых краін. Тым не менш, яны былі трывала інтэграваны ў сусветную гаспадарку і, як правіла, мелі вопыт удзелу ў заходнееўрапейскай інтэграцыі.

У адрозненне ад гэтага, новыя члены ЕС яшчэ нядаўна былі планавымі гаспадаркамі (гэта не тычыцца толькі Кіпра (грэч.), Мальты, а таксама Славеніі) і належаць да катэгорыі краін з пераходнай эканомікай, якім яшчэ спатрэбіцца прайсці вялікі шлях да фармавання нармальных рынкавых гаспадарак. Захоўваецца пакуль што вялікі разрыў ва ўзроўні эканамічнага развіцця старых членаў ЕС і новых.

На папярэдніх этапах пашырэнне ЕС (ЕЭС) дэтэрмінавалася пэўным спалучэннем эканамічных, палітычных і іншых фактараў, аднак пераважалі першыя. Ад пашырэння супольніцтва эканамічна, відавочна, выйгравалі як члены ЕС, так і тыя краіны, што ў яго

---

[210] Иноземцев В. Л., Кузнецова Е. С. Объединённая Европа на пути к лидерству в мировой политике // Мировая экономика и международные отношения. – 2002. – № 4. – С. 6.

[211] Европа изнутри // Deutschland. – 2001. – № 6. – С. 42.

[212] Шенаев В. Н. Экономика Евросоюза на рубеже веков. – С. 24.

[213] Иноземцев В. А., Кузнецова Е.С. Возвращение Европы. Объединённая Европа на пути к лидерству в мировой политике // Мировая экономика и международные отношения. – 2002. – № 4. – С. 6.

уступалі. Зусім іншая карціна складваецца на цяперашнім этапе. Так як сярод дэтэрмінуючых фактараў відавочна пераважаюць палітычныя, эканамічна на выйгрыш ад пашырэння ЕС, па меншай меры ў агляднай перспектыве, могуць разлічваць толькі новыя члены".[214]

Новы этап у гісторыі Еўрасаюза адкрыў дагавор, падпісаны кіраўнікамі дзяржаў-членаў у **Ніццы** (2000 г.). Паводле дагавора скасоўвалася галасаванне на грунце кансэнсуса па шэрагу пытанняў. Рашэнні сталі прымацца на грунце кваліфікаванай большасці.

На сучасным этапе развіцця Еўрапейскага Саюза якасна новай асаблівасцю інтэграцыйных працэсаў з'яўляецца яго пераўтварэнне ў палітычную сілу. Ідзе актыўны пошук новых форм і механізмаў стварэння агульнай палітычнай прасторы Еўрасаюза.

У 90-я гг. XX ст. – пачатку XXI ст. набылі рэальнае напаўненне палітычныя кампаненты Еўрасаюза, якія ўтвараюць тры апоры: агульны рынак, агульную знешнюю палітыку і палітыку бяспекі, а таксама правасуддзе і юстыцыю. Пашыраюцца функцыі Еўрапарламента, які з гэтага часу зацвярджае склад Камісіі і важнейшыя міжнародныя дагаворы. Намечана пашырэнне ЕС і абнаўленне яго інстытуцыянальнай структуры. Амстэрдамскі дагавор (1997 г.), Дагавор у Ніццы (2000 г.) і шэраг іншых дакументаў ЕС прадугледжваюць не толькі агульную валюту і сацыяльнае вымярэнне, еўрапейскую ідэнтычнасць у сферы абароны і бяспекі. Уводзіцца еўрапейскае грамадзянства. У 2002 г. пачаў функцыянаваць **Канвент**, які ўключыўся ў працу над праектам Канстытуцыі, якая павінна аб'яднаць усе існуючыя дагаворы. Тэкст Канстытуцыі быў падпісаны 9 кастрычніка 2004 г. Аднак гэты дакумент быў адвергнуты на рэферэндумах у Францыі і ў Галандыі ў 2005 г. і, як вынік, далейшы лёс Еўраканстытуцыі застаецца невызначаным.

Канешне, эфектыўнасць палітычнай інтэграцыі магла б быць больш высокай. З моманту кёльнскага саміта ЕС існуе "**сумесная знешняя палітыка і палітыка бяспекі**" (**CFSP**). У рамках ЕС сталі функцыянаваць войскі хуткага рэагавання. Аднак практычная выніковасць гэтых новых крокаў сціплая.

Першыя афіцыйныя кантакты паміж Беларуссю і ЕС устаноўлены ў ліпені 1992 г. у час візіту ў Мінск прэзідэнта Еўрапарламента **Э. Клепша**. ЕС аказвае рэспубліцы садзейнічанне ў рамках праграмы **TACIC** (тэхнічная дапамога краінам СНД), пераадоленні вынікаў Чарнобыльскай катастрофы 1986 г. У сакавіку 1995 г. у выніку візіту Прэзідэнта Лукашэнкі ў Брусель падпісана пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж ЕС і Рэспублікай Беларусь. Яно было разлічана на 10 гадоў і ўстанаўлівала рамкі для развіцця палітычных, эканамічных, гандлёвых і культурных сувязей паміж Беларуссю і 15 краінамі ЕС. ЕС прызнаў Беларусь краінай з пераходнай эканомікай, прадаставіў ёй рэжым найбольшага спрыяння ў гандлі, быў гатовы садзейнічаць правядзенню эканамічных рэформ, ліквідацыі бар'ераў у гандлі паміж краінамі ЕС і Беларуссю. Пагадненне прадугледжвала паляпшэнне магчымасцей для дзейнасці кампаній з ЕС у Беларусі і наадварот, а таксама ўмоў для прамых інвестыцый і найму, руху капіталу, плацяжоў, паслуг. Але яно не ўступіла ў сілу. Пасля лістападаўскага рэферэндуму 1996 г. у РБ кіруючыя органы ЕС спынілі праграмы дапамогі для Беларусі за выключэннем тых, мэтай якіх, на іх думку, з'яўляецца падтрымка дэмакратыі і свабоды сродкаў масавай інфармацыі.[215]

"Беларусь лічыць, што яна павінна стаць неад'емнай часткай непадзельнай Еўропы. З такім разуменнем будучыні сваёй краіны, непарыўна звязанай з перспектывай фарміравання адзінай Еўропы, Мінск падыходзіць да супрацоўніцтва з Еўрасаюзам. На думку кіраўніцтва РБ, яго пашырэнне здольна наблізіць гэту перспектыву. Аднак Мінск бачыць і адмоўны ўплыў пашырэння Еўрасаюза. Гэта тычыцца двухбаковых сувязяў з краінамі

---

[214] Мировая экономика: Учебник / Под ред. проф. А. С. Булатова. – М., 2001. – С. 453-454.

[215] Міжнародныя арганізацыі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. Т. 5. – С. 135.

Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, якія ўступілі ў 2004 – 2007 гг. ў ЕС. Многія з іх далучаюцца да абмяжоўваючых мераў Еўрасаюза па шэрагу экспартных пазіцый. Беларусь хвалююць візавыя бар'еры, якія перашкаджаюць трансгранічным кантактам і далейшаму развіццю дзелавых і культурных сувязяў паміж ёю і новымі краінамі-членамі ЕС. На думку беларускага кіраўніцтва, эфектыўным інструментам па пераадольванню гэтых перашкод уяўляецца праект "**Вялікай Еўропы**". Гэта мяркуе актыўнае ўзаемадзеянне Еўрасаюза з яго будучымі суседзямі, стварэнне агульнай прасторы для эканамічнага, палітычнага і культурнага супрацоўніцтва і бяспекі, умацавання трансгранічнага ўзаемадзеяння. Беларусь лічыць, што такая канцэпцыя "Вялікай Еўропы" дазволіць нейтралізаваць пагрозу ўзнікнення раздзяляльных ліній. Кіраўніцтва Беларусі перакананa, што яго краіна з'яўляецца адным з найбольш надзейных і прадказальных эканамічных партнёраў не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе". [216]

## 1.5. Садружнасць Незалежных Дзяржаў і яе месца ў сістэме сучасных міжнародных адносін. Будаўніцтва Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі: дасягненні і праблемы.

Пасля распаду СССР з'явілася 15 рэальных суб'ектаў міжнародных адносін і міжнароднага права. Новыя дзяржавы па-рознаму вызначылі прыярытэты сваёй знешняй палітыкі. Літва, Латвія, Эстонія адназначна абралі заходнюю арыентацыю. **Азербайджан**, **Арменія**, **Беларусь**, **Грузія**, **Казахстан**, **Кыргызстан**, **Туркменістан**, **Узбекістан**, **Украіна** ўвайшлі ў склад **Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)**.

Утварэнне ў снежні 1991 г. Садружнасці стала найбольш значнай падзеяй апошняга часу на постсавецкай прасторы. Сёння ў СНД дзейнічае звыш 60 міждзяржаўных (міжурадавых) каардынацыйных і кансультатыўных органаў. Асноўныя з іх: **Савет кіраўнікоў дзяржаў**, **Савет кіраўнікоў урадаў**, **Савет міністраў замежных спраў**, **Савет міністраў абароны**, **Эканамічны суд**, **Міжпарламенцкая асамблея**, **Выканаўчы камітэт СНД**, прычым, найбольш важныя міждзяржаўныя саветы ўзначальваюць прадстаўнікі Беларусі.

Дзейнасць большасці міждзяржаўных органаў галіновага супрацоўніцтва, перш за ўсё ў сацыяльна-эканамічнай сферы, вызначае рэальнае ўзаемадзеянне дзяржаў-удзельнікаў Садружнасці. Ад эфектыўнасці працы гэтых міждзяржаўных органаў у многім залежыць не толькі далейшы лёс СНД як інтэграцыйнага аб'яднання, але і сацыяльна-эканамічнае становішча новых незалежных краін, якія ў яго ўваходзяць.

З чыста фармальнага погляду, можна лічыць, што СНД актыўна ўдзельнічае ў сусветнай палітыцы. Арганізацыя мае сваіх назіральнікаў пры Генеральнай Асамблеі ААН, Савеце па гандлі і развіцці (ЮНКТАД). Прадстаўнікі Выканаўчага камітэта СНД удзельнічаюць у буйнейшых нарадах і форумах, якія праводзяцца па лініі ААН, ЕС, АБСЕ і іншых міжнародных арганізацый. Фактычны ж аспект дае падставы для адваротнай высновы. Рэальная роля СНД у сучасных міжнародных адносінах даволі сціплая. Гэта тлумачыцца нізкімі вынікамі трансфармацыйных працэсаў у краінах-удзельніцах, перш за ўсё, у сацыяльна-эканамічнай сферы, іх нядольнасцю стварыць эфектыўныя механізмы інтэграцыі.

"На долю СНД прыпадае толькі 3 % сусветнага валавага ўнутранага прадукту... Узаконена канцэпцыя рознахуткаснай інтэграцыі ўнутры Садружнасці. З сярэдзіны 1990-х гг. у СНД развіваюцца цэнтрабежныя сілы, надзеі на хуткую і цесную інтэграцыю яе краін-членаў не апраўдаліся. Асноўныя прычыны такога негатыўнага працэсу: розныя падыходы дзяржаў СНД да праблем рэфармавання органаў Садружнасці, вызначэння іх структуры і функцый..., рознагалоссі ў выпрацоўцы агульнай эканамічнай канцэпцыі на

[216] Крапивина Л. Саммит глав правительств стран ЦЕИ // Рэспубліка. – 2003. – 27 лістапада. – С. 2

макра- і мікраўзроўні і агульнай палітыкі ў забеспячэнні калектыўнай бяспекі; боязнь страціць значную частку суверэнітэту і магчымасці прысваення гэтых функцый Расіяй; неэфектыўнасць дагавароў і пагадненняў у рамках СНД; розніца сфер, інтарэсаў і мэт знешняй палітыкі краін-удзельніц СНД".[217] За час існавання СНД частка яе членаў стварыла паміж сабой розныя інтэграцыйныя групоўкі. Беларусь уваходзіла і ўваходзіць у наступныя з іх: **Адзіную эканамічную прастору (АЭП)**, **Арганізацыю Дагавора аб калектыўнай бяспецы**, **Еўразійскае эканамічнае супольніцтва (Еўразэс)**, **Мытны саюз**, **Саюз Беларусі і Расіі**. Еўразэс узнікае на грунце Мытнага саюза. Есць сэнс спецыяльна спыніцца на **АЭП** і **Саюзе Беларусі і Расіі**.

19 верасня 2003 г. ў ялцінскім ліваДзійскім палацы прэзідэнты Расійскай Федэрацыі, Украіны, Беларусі, Казахстана падпісалі пагадненне аб стварэнні Адзінай эканамічнай прасторы.

Быў падпісаны, ў значнай ступені, рамачны дакумент, які разам з тым уяўляе сабой добрую базу для рашэння эканамічных праблем супольна. Дакументы аб Адзінай эканамічнай прасторы ляжалі выключна ў плоскасці эканамічнага ўзаемадзеяння, яны былі накіраваны на зніжэнне інфраструктурнай нагрузкі пры вытворчасці, перамяшчэнні і рэалізацыі тавараў, якія вырабляюцца ў краінах СНД. Удзельнікі пагаднення былі ўпэўнены, што яго здзяйсненне можа прывесці да павышэння канкурэнтаздольнасці іх тавараў на міжнародных рынках, аблегчыць узаемадзеянне вытворцаў на прасторах СНД і стварыць добрыя ўмовы для развіцця іх эканомік.

Абмеркаванне станаўлення і развіцця саюзных адносін паміж Беларуссю і Расіяй адбывалася на працягу ўсяго постсавецкага перыяду. Можна вызначыць наступныя этапы і галоўныя падзеі фармавання саюзу дзвюх дзяржаў:

1) 1991 – 1994 гг. – падпісваецца дамова аб аб'яднанні грашовых сістэм, якая ў сілу шэрагу прычын так і не была рэалізавана;

2) 1995 – 1996 гг. заключаецца дамова (2 сакавіка 1996 г.) аб стварэнні **Супольніцтва Беларусі і Расіі**;

3) 1997 – 1998 гг. – падпісваюцца (2 красавіка 1997 г). **Дамова аб Саюзе Беларусі і Расіі – Статут Саюза Беларусі і Расіі** (25 мая 1997 г.) і **Дэкларацыя аб далейшым яднанні Беларусі і Расіі** (25 снежня 1998 г.)

4) 1999 – па наш час – заключаецца Дамова аб стварэнні **Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі** (8 снежня 1999 г.).

Далейшы лёс праекта аб'яднання Расіі і Беларусі цесна звязаны з унутрыпалітычнымі працэсамі ў абедзвюх дзяржавах, з канкрэтнай канфігурацыяй палітычных сіл. У дадзенай сітуацыі, акрамя аб'ектыўных фактараў, важнае значэнне набывае так званы суб'ектыўны фактар, а менавіта пазіцыя вядучых палітычных лідэраў у пытанні аб'яднання і асабасныя характарыстыкі і пажаданні людзей, якія адказныя за рэалізацыю гэтага праекта.

У прававым плане першачарговым уяўляецца вырашэнне праблемы нацыянальных канстытуцый. Дамова 1999 г. не прадугледжвае прамога змянення канстытуцыйных асноў дзвюх краін, але ні ў Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі, ні ў Асноўным Законе Рэспублікі Беларусь няма аніякіх узгадванняў аб **Саюзнай дзяржаве**, любых наднацыянальных органах кіравання і прадстаўніцтва. Такі падыход, у аснове якога ляжаў прынцып захавання суверэнітэту, незалежнасці РФ і РБ, натуральна, не накіраваны і на пераход да адзінай канстытуцыйнай асновы расійска-беларускай дзяржавы. Кампетэнцыя Саюзнай дзяржавы аказалася мінімізіраванай. Краіны-удзельніцы па-ранейшаму захоўвалі тэрытарыяльную цэласнасць, усю паўнату дзяржаўна-палітычнай, заканадаўчай і судовай улады, працягваючы будаваць адносіны паміж сабой на грунце "суверэннай роўнасці". Дамова не

---

[217] Крапивина Л. Саммит глав правительств стран ЦЕИ // Рэспубліка. – 2003. – 27 лістапада. – С. 2.

прадугледжвала хуткага, глыбокага і сапраўднага ўз'яднання дзвюх дзяржаў. Зараз працягваецца праца над канстытуцыйным актам Саюзнай дзяржавы, у якім бакі збіраліся ліквідаваць усе пералічаныя недахопы. На ўзроўні афіцыйных заяў Мінск і Масква разумеюць тэрміновую неабходнасць унясення адпаведных зменаў у свае канстытуцыі.

Па логіцы рэчаў, адной з ключавых складовых у працэсе фармавання саюзнай дзяржавы павінен стаць трывалы эканамічны саюз, у якім выразна прасочваюцца роўнасць умоў для дзейнасці суб'ектаў гаспадарання, наяўнасць адзінай валюты, функцыянаванне адзінай мытнай прасторы. На жаль, першыя дзве пазіцыі так і не напоўніліся канкрэтным зместам, часта маюць месца праблемы па трэццяй пазіцыі. На сучасным этапе саюзнае будаўніцтва стрымліваецца праблемным комплексам, звязаным с паліўна-энергетычнай сферай. Аб гэтым сведчаць несумяшчальныя з нацыянальнымі інтарэсамі РБ беларуска-расійскія дамоўленасці ў дадзенай сферы, падпісаныя ў канцы 2006 – пачатку 2007 гг. Чарговае ўзмацненне жорсткасці лініі Расіі адносна гандлёва-эканамічнага аспекта беларускага вектара яе знешняй палітыкі чакаецца ў сувязі з маючым адбыцца ўступленнем РФ у Сусветную гандлёвую арганізацію (СГА). Пры гэтым Масква парушыла дадзенае Мінску трывалае абяцанне аб сінхранізацыі дзеянняў абедзвюх саюзных краін на прадмет уваходжання ва ўказаную арганізацыю.

Супрацоўніцтва абаронных ведамстваў Расіі і Беларусі па сваёй інтэнсіўнасці і па значнасці сумесна вырашаемых задач не мае аналагаў у адносінах якіх-небудзь іншых удзельнікаў СНД аднаго з адным. З 31-га красавіка 1996 г. нацыянальныя сілы СПА абедзвюх краін нясуць сумеснае баявое дзяжурства, што кардынальным чынам павышае узровень іх бяспекі. 19 снежня 1997 г. міністры абароны Расіі і Беларусі падпісалі Пагадненне аб сумесным забеспячэнні рэгіянальнай бяспекі ў ваеннай сферы і дагавор аб ваенным супрацоўніцтве. Вельмі паспяхова рэалізуецца Канцэпцыя адзінага абароннага заказа, якую падпісалі прэзідэнты саюзных дзяржаў у красавіку 1999 г. Ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва ўключае таксама ўзгадненне экспарта-імпарта ўзбраенняў, ваеннай тэхнікі і прадукцыі двайнога прызначэння.

Да вясны 2001 г. была падрыхтавана **Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы**. У аснову дакумента лягла нацыянальная Ваенная дактрына РФ. Падкарэктаваны былі толькі некаторыя моманты, якія тычыліся пытанняў ядзернага стрымлівання з улікам без'ядзернага статусу Беларусі. Савет Міністраў Саюзнай дзяржавы, які адбыўся ў Маскве 29 жніўня 2001 г., ухваліў указаны дакумент".[218]

Такім чынам, у працэсе фармавання Саюзнай дзяржавы. Беларусі і Расіі прасочваюцца як дасягненні, так і праблемы. Разам з тым ад Мінска і Масквы патрабуецца яшчэ шмат намаганняў з тым, каб давесці да лагічнага канца арганізацыйна-прававы, канцэптуальны, практычны аспекты гэтага працэсу.

## 2.Усходняя Еўропа: новы этап гісторыі

### 2.1. Народна-дэмакратычныя рэвалюцыі ў краінах Усходняй Еўропы: прычыны, характар, рухаючыя сілы

У 1989 г. пачаўся новы этап у гісторыі Ўсходняй Еўропы. Яго стартавая кропка – народна-дэмакратычныя рэвалюцыі. Прычыны **народна-дэмакратычных рэвалюцый** у краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы наступныя:

1) вычарпала сябе сацыяльна-эканамічная мадэль, якая грунтавалася на адміністрацыйна-каманднай сістэме. Дадзеная сістэма відавочна прайграла спаборніцтва з сістэмай сацыяльнай рыначнай эканомікі па макраэканамічных паказчыках, ключавых

[218] Федулова Н. Т. Перспективы российско-белорусского объединения // МэиМО. – 2002. – № 7. – С. 94, 98.

сацыяльных стандартах, тэхналагічным базісе народнагаспадарчага комплексу. Здавальняючыя сацыяльныя стандарты не маглі тут вытрымліваща па прычыне арганічна ўласцівага сацыялістычнай сістэме бюджэтнага дэфіцыту, недасягальнасці трывалага балансу ў працэсе фунцыянавання ўнутранага рынку, хранічнага недахопу шэрагу неабходных таварных пазіцый. Краіны сацыялістычнага лагеру не закранулі вызначальныя тэндэнцыі трэцяй прамыслова-тэхналагічнай рэвалюцыі, якая з'явілася адметнай рысай постіндустрыяльнай цывілізацыі.

1989 г. адзначаны кульмінацыя крызісу аналізуемай сацыяльна-эканамічнай мадэлі;

2) шматгадовая манаполія камуністычных партый на ўладу ў краінах сацыялістычнага лагеру прадвызначыла поўную адсутнасць грамадзянскага грамадства, прававой дзяржавы, рэальнага краху дэмакратыі. Няздольнасць кіруючых партый своечасова прапанаваць адэкватнае нацыянальным інтарэсам іх краін выйсце з сістэмнага нацыяльна-эканамічнага крызісу рэзка павышала рэйтынг апазіцыйных партый і грамадскіх рухаў. Не маючы моцных аргументаў супраць набыўшай структураванасць апазіцыі, камуністы страцілі неабходнае для захавання ўлады электаральнае поле.

Ключавой рухаючай сілай аналізуемых рэвалюцый, якія па свайму характару былі антытаталітарныя, антыкамуністычныя, дэмакратычныя, з'яўлялася нацыянальна свядомая інтэлігенцыя, якая выступала ў саюзе з прасунутымі часткамі рабочага класа і сялянства.

Распад сацыялістычнай сістэмы быў непазбежны, але сцэнарыі змены дзяржаўнага ладу залежалі ад наступстваў сацыялістычнай эпохі. У тых краінах, дзе ў перыяд перабудовы актывізаваліся рэформы, ідэалагічны плюралізм быў найбольшым, і камуністычнае кіраўніцтва ўсведамляла непазбежнасць падзей, якія адбываліся, пераход здзяйсняўся больш плаўна і на прававым грунце.

У **Польшчы** чэрвенскія 1989 г. выбары ў сейм сталі відавочным поспехам для апанентаў камуністычнага рэжыма. Неўзабаве пасля выбараў адбылася перагрупіроўка сіл, якая ўнесла кардынальныя змены на капітанскім мосціку польскай палітыкі. Сталі супрацьстаяць адзін аднаму два блокі: першы блок ("Салідарнасць", АСП, СД) і другі блок (ПАРП). Менавіта першы блок узяў на сябе з канца жніўня 1989 г. урадавую адказнасць. У Польшчы быў створаны першы ў пасляваеннай гісторыі Ўсходняй Еўропы некамуністычны ўрад, які ўзначаліў вядомы дзеяч "**Салідарнасці**" **Тадэвуш Мазавецкі**.

Пасля ўсевянгерскай канферэнцыі **ВСРП (май 1988 г.)** **у Венгрыі** распачаліся трансфармацыйныя працэсы ў эканамічнай сферы. Галоўны вынік Пленума ЦК ВСРП (люты 1989 г.) – быў дадзены старт такім жа працэсам у сферы палітычнай. Сапраўдны расклад сіл быў адлюстраваны вынікамі парламенцкіх выбараў (вясна 1990 г.) Самыя лепшыя вынікі былі дасягнуты лідэрам антыкамуністычных сіл – Венгерскім дэмакратычным форумам (ВДФ). **ВДФ** стаў урадавай партыяй. Урадавую адказнасць з ім раздзялілі Хрысціянска-дэмакратычная партыя (ХДП) і Партыя дробных гаспадароў (ПДГ).

У канцы **1980-х гг.** умацаваліся пазіцыі прыхільнікаў сістэмных пераўтварэнняў **і ў СФРЮ.** Аднак гэты працэс супаў з цэнтрабежнымі тэндэнцыямі. Вядома, што **Саюз камуністаў Югаславіі** (СКЮ) быў станавым хрыбтом СФРЮ. Ужо ў пачатку 1990 г. стала відавочна, што ў шэрагу рэспублік Югаславіі камуністы губляюць пазіцыі. У красавіку 1990 г. статус урадавых атрымліваюць у сваіх рэспубліках "**Дэмакратычная апазіцыя Славеніі**" (ДЭМАС), "**Харвацкая дэмакратычная садружнасць**" (ХДС). ДЭМАС і ХДС адразу ж узялі курс на дэмантаж сацыялістычнай сістэмы, дасягненне рэальнай дзяржаўнай незалежнасці.

На парламенцкіх рэспубліканскіх выбарах **у Сербіі і Чарнагорыі ў 1990 г.** адпаведна перамаглі **Сацыялістычная партыя Сербіі** (СПС) і **Саюз камуністаў Чарнагорыі** (СКЧ). Іх праграмы ва ўнутранай галіне былі меней радыкальнымі, але прадугледжвалі істотныя пераўтварэнні па шэрагу пазіцый. Аб рэформах абвясцілі новыя ўрады **Босніі і Герцагавіны, Македоніі.** У 1991 г. СФРЮ фактычна распалася.

**У кастрычніку 1989 г.** адбылася рэвалюцыя **ў ГДР.** Пераемнік **Э. Хонекера Э. Крэнц** распачаў трансфармацыйныя працэсы.

**25 лістапада 1989 г. Кампартыя Чэхаславакіі** бярэ курс на глыбокія рэформы. Праз некалькі дзён было юрыдычна вырашана пытанне аб шматпартыйнасці, аб скасаванні манаполіі камуністаў на ўладу. **У снежні 1989 г.** апазіцыя на чале з **М. Чалфай** фармуе ўрад, яе ключавы дзеяч **В. Гавел** становіцца кіраўніком дзяржавы. Пасля парламенцкіх выбараў (чэрвень 1990 г.) яна займела рашучую перавагу ў вышэйшым заканадаўчым органе краіны.

**У Балгарыі** вырашальныя падзеі адбываліся **з лістапада 1989 г. па снежань 1990 г.** У лістападзе 1989 г. БКП займела новага генеральнага сакратара **Пятра Младэнава**. Апошні лічыў, што настаў час трансфармацыйных працэсаў. Аднак набіралі палітычную вагу саапернікі камуністаў, якія больш радыкальна разумелі змест гэтых працэсаў, выступалі за больш хуткія тэмпы іх ажыццяўлення. Да іх ліку адносіліся сацыял-дэмакраты, радыкал-дэмакраты, прадстаўнікі **Балгарскага земляробчага народнага саюзу (БЗНС)**. 3 снежня 1989 г. БКП супрацьстаяў вельмі моцны канкурэнт – **Саюз дэмакратычных сіл** (СДС). 3 красавіка 1990 г. скончылася гісторыя **Балгарскай камуністычнай партыі** і распачалася гісторыя Балгарскай сацыялістычнай партыі (БСП). Вынікі парламенцкіх выбараў (чэрвень 1990 г.) далі падставу БСП для захавання ўлады. Аднак рэйтынг апазіцыі па-ранейшаму ўзрастаў і сацыялісты вымушаны былі з гэтым лічыцца. Яны пайшлі на дзве істотныя саступкі. Па-першае, 1 жніўня 1990 г. прэзідэнтам Балгарыі стаў лідэр СДС **Жэлю Жэлеў**. Па-другое, з снежня 1990 г. урадавую адказнасць з БСП сталі падзяляць СДС, БЗНС. Урад узначаліў **Д. Папоў**.

Найбольш драматычным быў румынскі сцэнарый. У **Румыніі** для свайго выратавання дыктатарскі рэжым Чаушэску звярнуўся да сілавога аргументу, выкарыстаў аналаг савецкіх чэкістаў – "**Секурытатэ**", якім супрацьстаялі або бяззбройны народ, або армія. Супрацьстаянне працягвалася восем дзён – з 17 па 25 снежня 1989 г. Аб яго вастрыні сведчыць наступны факт: не менш тысячы румын былі пазбаўлены жыцця. **25 снежня 1989 г.** настае эра кіравання **Фронта нацыянальнага выратавання** (ФНВ). Першай асобай і ў ФНВ, і ў краіне быў **Іон Ііеску**. ФНВ адразу абвяшчае праграму, у якой выразна прасочваліся ключавыя моманты сацыяльна-эканамічнай і палітычнай трансфармацыі. Фронт лічыў нармальным свабоднае спаборніцтва ідэй, партый, дзяржаўнай і недзяржаўнай форм уласнасці. З цягам часу ФНВ стаў мець справу з канкурэнтамі: нацыянал-цэрэніцкай, нацыянал-ліберальнай, сацыял-дэмакратычнай партыямі, сацыялістычнай партыяй працы. Апошняя аказалася зусім слабым саапернікам, астатнія мелі значна большы рэйтынг. Аднак узятыя ўсе разам, апазіцыйныя партыі набралі на парламенцкіх выбарах (май 1990 г.) менш галасоў, чым ФНВ. Зразумела, Ііеску стаў першым дэмакратычна абраным кіраўніком дзяржавы ў постсацыялістычнай Румыніі.

**1991–1992 гг.** былі пераломнымі для **Албаніі.** Старт трансфармацыйным працэсам быў дадзены форумам камуністаў (Албанскай партыі працы) у 1991 г. У 1992 г. пачалася эра антыкамуністычнай Дэмакратычнай партыі і яе першай асобы **Салі Берышу** ў албанскай гісторыі. Партыя на сапраўды дэмакратычных пачатках атрымала большасць у парламенце, сфармавала ўрад, Салі Берышу стаў кіраўніком дзяржавы.

**У пачатку 90-х гг.** распачаліся трансфармацыйныя працэсы **ў Манголіі.** Яшчэ да распаду СССР стаў прасочвацца постсацыялістычны этап у гісторыі Літвы, Латвіі, Эстоніі. Распад СССР супаў з уступленнем у гэты этап шэрагу іншых былых савецкіх рэспублік.

Камуністы засталіся ва ўладзе ў **Кітаі**, **В'етнаме**, **Паўночнай Карэі**, на **Кубе**. Кітай працягваў ісці курсам рэформ, старт якім быў дадзены ў 1978 г. У В'етнаме кіруючыя колы абвясцілі праграму рынкавых пераўтварэнняў. У 1990-х гг. – пачатку XXI ст. не адбылося істотных змен у сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці Паўночнай Карэі, Кубы.

## 2.2. Трансфармацыя палітычных і сацыяльна-эканамічных сістэм у постсацыялістычных дзяржавах: павучальныя ўрокі для Беларусі

Стартавая кропка постсацыялістычнага этапа ў гісторыі Усходняй Еўропы – пачатак ажыццяўлення канцэпцыі "**шокавай тэрапіі**". Краіны рэгіёна зрабілі шэраг паслядоўных крокаў ў дадзеным накірунку. Першы крок – "макраэканамічная стабілізацыя, якая ўключае барацьбу з інфляцыяй, узмацненне жорсткасці крэдытнай і падатковай палітыкі, урэгуляванне вонкавай запазычанасці... У якасці наступнага кроку меркавалася татальная лібералізацыя эканомікі. Асаблівую важнасць мела фармаванне камерцыйнай банкаўскай сістэмы, развіццё недзяржаўных фінансавых рынкаў. Усе абмежаванні дзейнасці прыватнага сектара належалі адмене. Развіццё інстытута прыватнага прадпрыймальніцтва меркавала таксама ўводзіны працэдуры банкруцтва, скасаванне манаполіі, адмову ад штучнага прыярытэту тых ці іншых галін і відаў вытворчасці... Дзяржава пераходзіла да сістэмы ўскоснага рэгулявання".[219]

Асноўныя пераўтварэнні "шокавай тэрапіі", якія былі ажыццёўлены ва ўсходне-еўрапейскіх краінах на працягу 1990–1992 гг., прывялі да дваістых вынікаў... Імкліва сфармавалася рынкавая інфраструктура. Быў ліквідаваны дэфіцыт спажывецкіх тава-раў. У сферу прадпрымальніцкай дзейнасці ўключылася значная частка насельніцтва. Аднак негатыўныя наступствы шокавай тэрапіі пераўзышлі ўсе самыя песімістычныя чаканні. Паследаваў глыбокі спад вытворчасці. Беспрацоўе ўвогуле па рэгіёну ахапіла больш $1/_{10}$ працаздольнага насельніцтва. Велізарныя маштабы набыла інфляцыя.[220] Яна ў Польшчы, Балгарыі, Харватыі межавала з гіперінфляцыяй. Фактычна ж знізіўся жыццёвы ўзровень насельніцтва краін.

Абвастрэнне сацыяльнай абстаноўкі, відавочная неабходнасць карэктыроўкі рэфарматарскага курсу выклікалі перабудову партыйна-палітычнага спектру і прыход да ўлады левацэнтрысцкіх сіл. Канцэптуальную аснову абноўленай стратэгіі рынкавых пераўтварэнняў склаў так званы **градуалістычны падыход**.[221] Ключавым кампанентам усіх градуалістычных канцэпцый стала ідэя сацыялізацыі рэформ, якія ажыццяўляюцца, змяншэння іх выдаткаў, неўзіраючы на павелічэнне тэрміну рэалізацыі і адступленне ад мадэлі "**капіталізму без прыметнікаў**". Але столь жа агульным недахопам з'явілася адсутнасць выразных адказаў на ключавыя праблемы, якія выяўлены лібералізацыйнымі шокамі.

Працэс вяртання да ўлады прыхільнікаў сацыялістычнага шляху развіцця супаў з падзеннем папулярнасці неакансерватараў на Захадзе і перамогай сацыялістаў у шэрагу краін Заходняй Еўропы. Аднак агульная стратэгічная лінія рынкавых рэформ у краінах ЦУЕ аказалася непахіснай. Нават прэзідэнт-камуніст **Аляксандр Кваснеўскі**, які змяніў **Валенсу** ў Польшчы, па-ранейшаму праводзіў курс, які быў зададзены яго папярэднікам. Размова, хутчэй, можа ісці толькі аб большай сацыяльнай функцыі дзяржавы, большых гарантыях насельніцтву ва ўмовах рынкавай эканомікі, якая склалася.

Разам з пачаткам "шокавай тэрапіі" стартавала "**малая**" **прыватызацыя**. Перадача ў прыватны сектар часткі сярэдніх прадпрыемстваў у форме арэнды, продажу і рэстытуцыі адбылася ў пачатку 90-х гг. даволі паспяхова. Магазіны, рэстараны, майстэрні малых і сярэдніх памераў былі распроданы за грошы. "Малая" прыватызацыя ў краінах ЦУЕ ажыццяўлялася пры большым уліку інтарэсаў спажыўцоў. Так, у Чэхіі і Славакіі забаранялася на працягу пэўнага часу пераарыентацыя дзейнасці прыватызаванага аб'екта на больш прыбытковую, але менш грамадска значную.[222]

У сярэдзіне 90-х гг. распачаўся новы этап прыватызацыі. У адрозненне ад перыяду "шокавай тэрапіі", прыватызацыя стала распаўсюджвацца на базавыя галіны і буйныя

---

[219] Новейшая история стран Европы и Америки. XX век: Учебник для студентов высших учебных заведений. В 3 ч. / Под ред. А. М. Родригеса и М. В. Пономарева. – М. 2001. Ч. 3: 1945–2000. – С. 163.
[220] Там жа. – С. 164.
[221] Слова "градуалістычны" паходзіць ад лацінскага gradus – крок, прыступка, ступень. Маецца на ўвазе замена шокавага падыходу да эканамічных пераўтварэнняў пакрокавым.
[222] Мировая экономика: Учебник / Под ред. проф. А. С. Булатова. – М., 2001 – С. 647.

прадпрыемствы, у тым ліку нерэнтабельныя, якія былі абцяжараны збытачнай занятасцю, састарэлым абсталяваннем, вялікай сацыяльнай інфраструктурай. Больш шырока выкарыстоўваліся **аўкцыённыя формы прыватызацыі**, жорсцка выкаранялася практыка паўлегальнай распрадажы дзяржаўнай маёмасці, выкарыстання дзяржаўных сродкаў для некамерцыйнага фінансавання прыватных фірм.[223]

Нягледзячы на адносную сінхроннасць рэформаў і падабенства агульнай стратэгіі, яны прывялі да вельмі розных вынікаў. Пяць краін – Чэхія, Польшча, Венгрыя, Славакія, Славенія – сфармавалі групу лідэраў. Для іх была характэрна не толькі больш паслядоўная і мэтанакіраваная рэфарматарская палітыка, але і высокая стартавая хуткасць рэформ. З 1992 – 1994 гг. ва ўсіх пяці краінах захаваўся ўпэўнены эканамічны рост. Значна ўзрасла актыўнасць інвестараў, памяркоўнай стала інфляцыя. Прынцыпова важнай рысай сучаснага развіцця краін-інсайдэраў усходнееўрапейскага рэгіёна стала набліжэнне галіновай структуры да постіндустрыяльнага тыпу. Зусім іншым застаецца эканамічнае становішча ўсходнееўрапейскіх краін-аўтсайдэраў, у ліку якіх апынуліся Албанія, Балгарыя, Румынія, а таксама большасць паўднёва-славянскіх дзяржаў. Несбалансаванасць і нізкая эфектыўнасць "шокавых" эканамічных пераўтварэнняў выклікалі тут асаблівае абвастрэнне сацыяльных праблем і сталі прычынай палітычнай дэстабілізацыі. Толькі да канца 90-х гг. у эканамічным развіцці Румыніі, Балгарыі, Харватыі вызначыўся станоўчы зрух. Албанія, Боснія і Герцагавіна, Македонія, абноўленая Югаславія, наадварот, апынуліся за рысай беднасці.[224]

Такім чынам, у краінах ЦУЕ зацвердзіліся асновы рынкавай эканомікі: скасавана цэнтралізаванае планаванне, адбылася лібералізацыя цэн на большасць тавараў і паслуг, уведзена ўнутраная частковая канвертуемасць нацыянальных валют, знік таварны дэфіцыт. У ходзе рынкавых рэформ у 90-я гг. пераважалі тры галоўныя накірункі: **лібералізацыя**, **фінансавая стабілізацыя**, **прыватызацыя**. Менавіта такім шляхам павінна ісці і Беларусь. Альтэрнатывы быць не можа.

Аналіз сучаснага этапа найноўшай гісторыі дае падставы для наступных высноў:

1) ва ўмовах аднапалярнай структуры міжнародных адносін свет не стаў стабільным. Мадэль паводзін на міжнароднай арэне, якую абрала звышдзяржава – ЗША, не заўсёды адпавядае інтарэсам глабальнай і рэгіянальнай бяспекі;

2) распад біпалярнай сістэмы паставіў перад усімі дзяржавамі задачу адаптацыі сваіх дзяржаўных інтарэсаў да новых рэалій. Не трэба больш далучацца да якога-небудзь з блокаў, якія супрацьстаяць. Зараз у буйных дзяржаў з'явілася магчымасць адыгрываць у большай, ці меньшай ступені самастойную ролю. Перш за ўсё гэта адносіцца да заходнееўрапейскіх дзяржаў. Унутры самой Еўропы з'явілася рэгіянальная супердзяржава Германія, патэнцыял якой зусім дастатковы для таго, каб у перспектыве выканаць ролю аднаго з цэнтраў сілы у шматпалярным свеце;

3) НАТО мае ўсе шанцы з часам пераўтварыцца з ваеннага саюза, які накіраваны на канкрэтнага праціўніка, у сістэму калектыўнай бяспекі. Рэалізацыя гэтых шанцаў прывяла б да станоўчага стаўлення Беларусі да пашырэння гэтага альянса на Усход, да павышэння эфектыўнасці ўдзелу Беларусі ў праграме НАТО "Партнёрства дзеля міру";

4) СНД у яе цяперашнім стане не можа прэтэндаваць на ролю аднаго з цэнтраў сілы ў сусветнай палітыцы. Рознахуткасная інтэграцыя ў рамках СНД захаваецца і ў будучым. Без карэляцыі арганізацыйна-прававога, канцэптуальнага, практычнага аспектаў Саюз Беларусі і Расіі не мае перспектывы;

5) народна-дэмакратычныя рэвалюцыі ў краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы – заканамерная з'ява сучаснай гісторыі;

6) найбольш значнымі аспектамі трансфармацыйных працэсаў у ЦУЕ з'явіліся лібералізацыя, фінансавая стабілізацыя, прыватызацыя.

---

[223] Новейшая история стран Европы и Америки. XX век. Ч. 3: 1945–2000. – С. 168.

[224] Там жа. – С. 169-170.

## БІБЛІЯГРАФІЯ:

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. – Мн.: "Беларуская Энцыкла-педыя" імя Петруся Броўкі, 1993.
2. Баранов М., Стародубцев В. Миллионы тонн на весах победы // Деловые люди. 1995. Май.
3. Белорусская ССР и социалистические страны: Укрепление дружбы, сотрудничества, братства (1945 – 1987 гг.) / Сергеева Г. Г., Языкович Л. В., Снапковский В. Е. и др. – Мн., 1987.
4. Бор М. З. История мировой экономики. – М., 2000.
5. Вайц В. Ф., Петровская О. В., Стрелец М. В. Изучение стран Восточной Европы в курсе новейшей истории (методические рекомендации для учителей средних школ). – Брест: Брестский областной институт усовершенствования учителей, 1990.
6. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) / А. А. Коваленя и др. – Мн.: Издательский центр БГУ, 2004.
7. Виппер Р. Ю., Реверсов И. П., Трачевский А. С. История Нового времени. – М.: Республика, 1995.
8. Всемирная история. В 3 ч.: Учебн. пособ. / О. А Яновский, О. В. Бригадина, П. А. Шупляк и др. – Мн.: Юнипресс, 2002.
9. Всемирная история Новейшего времени: Справочное пособие / Е. А. Долгучиц, Е. Г. Колб, В. И. Меньковский и др. – Мн.: ИП "Экоперспектива", 1998.
10. Всемирная история Новейшего времени. Учеб. пособие для 9-го кл. общеобразов. шк. с рус. языком обучения / Г. А. Космач, Г. Г. Лазько, С. В. Панов и др. Под ред. Г. А. Космача. – 2-е изд. – Мн.: Народная асвета, 2000.
11. Всемирная история. В 10 томах. – М.: Государственное издательство политической литературы, 1955 – 1965.
12. Гісторыя Беларусі. У 6 тамах. ТТ. 1, 3, 4, 5 / Рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд) і інш. – Мн.: Экаперспектыва, 2000 – 2006.
13. Гісторыя Беларусі: У 2 ч.: Курс лекцый / І. П. Крэнь, І. І. Коўкель і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000, 2002.
14. Гольдштейн И., Левина Р. Германский империализм / Под общ. ред. Е. Варга. – М.: Государственное издательство политической литературы, 1947.
15. Дипломатический словарь в 3 томах. – М.: Наука, 1985 – 1986.
16. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 2001.
17. Европа изнутри // Deutschland. 2001. № 6.
18. Иванов П. А. Трансформация НАТО: век нынешний и век минувший // Мировая экономика и международные отношения. – 2003. – № 1.
19. Изместьева Т.Ф. Россия в системе европейского рынка. – М., 1991.
20. Иноземцев В. А., Кузнецова Е.С. Возвращение Европы. Объединённая Европа на пути к лидерству в мировой политике // Мировая экономика и международные отношения. – 2002. – № 4.
21. История государства и права зарубежных стран / Под ред С. К. Лазарева. – М., 2000.
22. История Древнего Востока: Учеб. для студ. вузов, обучающихся по спец. "История" / А. А. Вигасин, М. А. Дандамаев, М. В. Крюков и др. Под ред. В. И. Кузищина. – М.: Наука, 1999.
23. История древнего мира. Ч. 2. Учеб. пособие для пединститутов / Под ред. Ю. С. Крушкол. – Л. – М.: Просвещение, 1971.
24. История Древнего Рима. Учеб. для вузов по спец. "История" / В. И. Кузищин, И. Л. Маяк, И. А. Гвоздева и др. Под ред. В. И. Кузищина 4-е изд. перераб. и доп. – М: Просвещение, 2000.
25. История Европы / Альдебер Ж. и др. Научное редактирование и предисловие к рус. изд. В. С. Кошелева. – Мн. – М., 1996.
26. История развития науки и техники. Юнита 2 / Под ред. Н. В. Друк. – М.: Современный гуманитарный институт, 1999.
27. История экономики. Юнита 1. История мировой экономики / Разр. Г. Д. Гловели. – М.: Современный Гуманитарный Университет, 2000.
28. Ковалева Н. Н. Ритмы цивилизаций в Беларуси // Вестник Брестского государственного технического университета. Гуманитарные науки. – 2002. – № 6.
29. Котов А. И. История Беларуси и мировая цивилизация: Учебное пособие для студентов естественноведческих факультетов. 3-е изд. – Мн.: БГУ, 2004.
30. Крапивина Л. Саммит глав правительств стран ЦЕИ // Рэспубліка. – 2003. – 27 лістапада.

31. Краткий политический словарь. – М.: Политиздат, 1989.
32. Краткий словарь иностранных слов. Изд. 5. – М: Русский язык, 1977.
33. Круталевич В. На путях национального самоопределения (БНР – БССР – РБ). – Мн.: Право и экономика, 1995.
34. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996.
35. Мазец В. Межы БНР // Спадчына. – 1993. – № 2.
36. Максимычев И.Ф. Мир в поисках равновесия // Современная Европа. – 2002. – № 4.
37. Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2 изд. Т. 21. М.
38. Мировая экономика / Под ред. И.П. Николаевой. – М., 2000.
39. Мировая экономика: Учебник. / Под ред. проф. А. С. Булатова. – М.: Юристъ, 2001.
40. Навицкас К. Литва и Антанта (1918 – 1920 гг.). – Вильнюс: Моклас, 1970.
41. Новейшая история зарубежных стран: Европа и Америка, 1917 – 1945: Учеб. для пед. ин-тов по спец. "История" / Под. ред. В. К. Фураева. – М.: Просвещение, 1989.
42. Новейшая история Отечества. XX век: Учебник для студентов вузов: В 2-х т. / Под ред. А.Ф. Киселёва, Э. М. Щагина. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1999.
43. Новейшая история стран Азии и Африки: XX век. Учеб. для студ. высш. учебн. заведений. В 3 ч. / Под ред. А. М. Родригеса. – М.: Гуманит. издательский центр ВЛАДОС, 2001.
44. Новейшая история стран Европы и Америки: XX век. Учебник для студентов высших учебных заведений. В 3 ч. / Ред. А. М. Родригеса и М. В. Пономарёва. – М.: Гуманит. издательский центр ВЛАДОС, 2001 – 2003.
45. Новейший философский словарь. 2-е изд., перераб. и дополн. – Мн.: Интерпрес-сервис, Книжный Дом, 2001.
46. Новиков С. В., Маныкин А. С., Дмитриева О. В. Всеобщая история. Справочник студента. – М.: Филологическое общество "СЛОВО", ООО Фирма "Издательство АСТ", 2000.
47. Погорлецкий А. И. Экономика зарубежных стран: Учебник. – СПб: Изд-во Михайлова В. А., 2000.
48. Саракавік І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. – Мн.: Современная школа, 2006.
49. Семёнов В. Ф. История средних веков. – М.: Просвещение, 1975.
50. Снапкоўскі У. Ялта – Сан-Францыска – Патсдам: ад падвядзення вынікаў Другой сусветнай вайны да пасляваеннага ўладкавання свету // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 7.
51. Советский энциклопедический словарь. – М.: Советская энциклопедия, 1980.
52. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1988.
53. Стралец М. В. Краіназнаўства. – Брэст: Выд-ва БрДТУ, 2005.
54. Строев В. Некоторые аспекты применения сухопутных войск ФРГ // Зарубежное военное обозрение. – 1998. – № 4.
55. Федулова Н.Т. Перспективы российско-белорусского объединения // Мировая экономика и международные отношения. – 2002. – № 7.
56. Франциск Скарина и его время. Энциклопедический справочник. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1990.
57. Ціхаміраў А. Беларуская праблематыка на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 –1920 гг. // Весці АН Беларусі. Сер. грам. навук. – 1996. – № 6.
58. Шенаев В. Экономика Евросоюза на рубеже веков // Современная Европа. – 2002. – № 4.
59. Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад рэд. В. І. Галубовіча. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996.
60. Экономическая история зарубежных стран. Курс лекций / Н. И. Полетаева, В. И. Голубович, Л. Ф. Пашкевич и др. Под общ. ред. В. И. Голубовича. – Мн.: НКФ "Экоперспектива", 1996.
61. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 тамах. – Мн: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1993 – 2003.
62. Юхо І. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права. – Мн.: Беларусь, 1991.
63. Яковец Ю. В. История цивилизаций: Учебное пособие для студентов вузов гуманитарного профиля 2-е изд. перераб. и доп. – М.: Гуманитар. центр ВЛАДОС, 1997.
64. Materski W. Tarcza Europy. Stosunki Polsko-Sowieckie. 1918 – 1939. – W-wa. 1994.

## ЗМЕСТ

Уступ ....................................................................................................3
Лекцыя першая. **Першыя цывілізацыі** ................................................4
Лекцыя другая. **Еўропа ў сярэднявеччы** .............................................20
Лекцыя трэцяя. **Адраджэнне і Рэфармацыя ў Еўропе** ..........................31
Лекцыя чацвертая. **Развіццё і зацвярджэнне капіталізму ў Еўропе і Амерыцы** .........................................................................................42
Лекцыя пятая. **Свет у канцы XIX ст. – пачатку XX ст.** .........................50
Лекцыя шостая. **Асноўныя тэндэнцыі сусветнага развіцця ў міжваенны перыяд** ...............................................................................61
Лекцыя сёмая. **Другая сусветная вайна** ...............................................74
Лекцыя восьмая. **Свет пасля Другой сусветнай вайны** ........................88
Лекцыя дзевятая. **Свет і Беларусь на мяжы XX – XXI стагоддзяў** ..........102
Бібліяграфія .........................................................................................115

# Карта 1. Еўропа ў час Другой сусветнай вайны (1-ы перыяд)



## Карта 2.1. Усходняя Еўропа ў 1919 г.-пачатку 1920 г.



## Карта 2.2. Усходняя Еўропа ў 1919 г.-пачатку 1920 г.



## ВАРВАРСКИЕ КОРОЛЕВСТВА В VI В.




Карта 3

## Карта 4. Усходняя Еўропа ў X ст.



## Карта 5. Вялікія геаграфічныя адкрыцці (XV-XVII стст.)



## Карта 6. Старажытны Егіпет



## Карта 7. Франкскае каралеўства ў VIII ст. – пачатку IX ст.



## Карта 8. Падзелы Каралінгскай імперыі ў IXст.






Карта 9. Эліністычныя дзяржавы ў III ст. да н.э.)

Вучебна-метадычнае выданне

**Кавалева Наталія Мікалаеўна**
**Стралец Міхаіл Васільевіч**
**Малыхіна Людзміла Юр'еўна**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (У КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ): выбраныя лекцыі

Адказны за выпуск: *Кавалёва Н. М.*
Рэдактар: *Строкач Т. У.*
Кампьютарная вёрстка: *Баравікова А.А.*
Карэктар: *Нікітчык Е. В.*

Лицензия № 02330/0148711
Подписано к печати 28.05.2007. Формат 60x84 1/16. Бумага «Снегурочка».
Гарнитура Arial Narrow. Усл. п. л. 7,7. Уч.-изд. л. 8,25. Тираж 500 экз. Заказ № 701.
Отпечатано на ризографе учреждения образования
«Брестский государственный технический университет».
224017, ул. Московская, 267, г. Брест.
Лицензия № 02330/0133017 от 30.04.2004.

ISBN 978-985-493-061-9

9 789854 930619